
К. А. АНЦІПАВА, В. М. ГУЗАВА

ГЕАГРАФІЯ


САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАЯ ГЕАГРАФІЯ СВЕТУ



10

Узровень чалавечага развіцця краін свету

(вызначаецца на падставе Індэкса чалавечага развіцця, распрацаванага Праграмай развіцця ААН)



Узровень чалавечага развіцця краін свету, 2019 год:

вельмі высокі | высокі | сярэдні | нізкі

К. А. АНЦІПАВА, В. М. ГУЗАВА

ГЕАГРАФІЯ

САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАЯ ГЕАГРАФІЯ СВЕТУ

Вучэбны дапаможнік для 10 класа
ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай мовай навучання
(з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню)

Дапушчана
Міністэрствам адукацыі
Рэспублікі Беларусь

Мінск
«Адукацыя і выхаванне»
2020

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

УДК 911.3:[30+33](100)(075.3=161.3)
ББК 65.04я721
А74

А ў т а р ы: К. А. Анціпава (ад аўтараў, уводзіны, § 1–30 (асноўны матэрыял), заключэнне); В. М. Гузава (ад аўтараў, § 1–30 (метадычнае забеспячэнне)

Пераклад з рускай *Т. К. Слауты*

Р э ц э н з е н т ы: кафедра турызму і краіназнаўства ўстановы адукацыі «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна» (прафесар кафедры, доктар геаграфічных навук, прафесар *К. К. Красоўскі*); настаўнік геаграфіі кваліфікацыйнай катэгорыі «настаўнік-метадыст» установы адукацыі «Мінскі дзяржаўны абласны ліцэй» *Л. Р. Альгамец*

Электронны дадатак для павышанага ўзроўню размешчаны на рэсурсе profil.adu.by

Пры мастацкім афармленні вучэбнага дапаможніка выкарыстаны ілюстрацыі, набытыя ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку на гандлёвай пляцоўцы Shutterstock

ISBN 978-985-599-136-7

© Анціпава К. А., Гузава В. М., 2020
© Слаута Т. К., пераклад на беларускую мову, 2020
© Афармленне. РУП «Выдавецтва “Адукацыя і выхаванне”», 2020

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

АД АЎТАРАЎ

Паважаныя вучні!

Вы прыступаеце да вывучэння асноўнага школьнага курса па сацыяльна-эканамічнай геаграфіі. Ён называецца «Сацыяльна-эканамічная геаграфія свету» і цесна звязаны з ведамі, якія вы атрымалі раней. Вы вывучылі пачатковы курс сацыяльна-эканамічнай геаграфіі і ведаеце асновы геаграфіі насельніцтва. Вы атрымалі веды аб рэгіёнах, краінах свету — аб іх прыродных рэсурсах, гаспадарцы і яе спецыялізацыі, асноўных эканамічных цэнтрах. Вы навучыліся адрозніваць краіны па ўзроўні сацыяльна-эканамічнага развіцця. Вучэбная дысцыпліна «Геаграфія Беларусі» таксама ўзбагаціла вас ведамі па эканамічнай геаграфіі. Цяпер кожны з вас зможа расказаць пра асаблівасці насельніцтва нашай краіны, з якіх галін і відаў эканамічнай дзейнасці складваецца наш гаспадарчы комплекс, і растлумачыць, чаму склалася такая спецыялізацыя. А выкарыстоўваючы геаграфічныя карты, вы ўжо ўпэўнена пракладаеце маршруты з адной вобласці ў іншую і ведаеце, дзе і якія размешчаны гарады, асноўныя эканамічныя цэнтры і галоўныя транспартныя артэрыі. Усе гэтыя веды спатрэбяцца і дапамогуць нам пры вывучэнні сацыяльна-эканамічнай геаграфіі свету.

Наперадзе ў нас займальнае падарожжа, таму што ні адзін раздзел геаграфічнай навукі так моцна не звязаны з развіццём грамадства і нашым паўсядзённым жыццём, як сацыяльна-эканамічная геаграфія свету. Кожная краіна і кожны з нас сваімі штодзённымі дзеяннямі, звязанымі з дэмаграфічнымі падзеямі, вытворчасцю і спажываннем тавараў і паслуг, гандлем, міжнароднымі эканамічнымі адносінамі, становяцца часткай адзінага цэлага — сацыяльна-эканамічнай геаграфіі свету — і фарміруюць яе новы геаграфічны вобраз. Але наша падарожжа не будзе простым, таму што менавіта сацыяльна-эканамічная геаграфія свету як ніякі іншы раздзел геаграфічнай навукі вельмі дынамічна і імкліва развіваецца. Паспець атрымаць самыя актуальныя веды, каб стаць сучаснай і пісьменнай асобай, якая выкарыстоўвае новыя тэрміны на новай мове сацыяльна-эканамічнай геаграфіі і ўмее тлумачыць не толькі прычыны і наступствы, але і рабіць прагноз працэсаў, — вось нашы асноўныя задачы.

Вывучаючы сацыяльна-эканамічную геаграфію свету, вы станеце па некаторых пытаннях кансультантамі для сваіх бацькоў. Але пра гэта — наперадзе.

Наш вучэбны дапаможнік складаецца з трох асноўных раздзелаў. У першым мы даведаемся аб палітычнай геаграфіі і геапалітыцы, аб найноўшых працэсах на палітычнай карце свету, у тым ліку звязаных з канфліктамі. Другі раздзел прысвечаны вывучэнню геаграфіі насельніцтва — асаблівасцям і заканамернасцям натуральнага руху насельніцтва, міжнароднай міграцыі, размяшчэння, рассялення і ўрбанізацыі. Трэці раздзел — самы вялікі. У ім будуць раскрыты асноўныя фактары развіцця сусветнай гаспадаркі, іх уплыў на геаграфію галін і відаў эканамічнай дзейнасці. Асаблівая

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

ўвага нададзена пытанням геаграфіі сферы паслуг, таму што яна найбольш актыўна развіваецца ў эпоху постындустрыялізацыі і развіцця інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій.

Для таго каб вам было больш лёгка і цікава засвойваць няпросты матэрыял, у вучэбным дапаможніку ў кожным параграфе вы ўбачыце дзве групы маркераў на старонцы злева: маркеры-памочнікі і маркеры-кантралёры.

На *пачатку параграфа* вам прапануюцца два маркеры. Маркер **«Успамінаем»**  патрэбны нам для актуалізацыі раней атрыманых ведаў, неабходных для далейшага вывучэння матэрыялу. Маркер **«Для чаго мы гэта вывучаем?»**  змяшчае пытанні, якія раскрываюць практычную значнасць вывучаемага матэрыялу або накіраваны на вырашэнне праблем развіцця грамадства і свету.

У *тэксце параграфа* вы таксама ўбачыце некалькі розных маркераў. Новыя тэрміны і паняцці, акрэсленыя ў вучэбнай праграме, вы заўважыце па маркеры  **«Геаграфічны слоўнік»**, яны вылучаны паўтлустым шрыфтам. Маркер **«У свеце ўсё ўзаемазвязана»**  накіраваны на ўстанаўленне сувязей паміж вучэбнымі прадметамі, унутры ўжо вывучаных геаграфічных прадметаў, а таксама на выкарыстанне ведаў з навуковых абласцей, не звязаных з геаграфіяй. Пад маркерам  **«Паразважаем»** прадстаўлены заданні, накіраваныя на актывізацыю вашай пазнавальнай дзейнасці і ўстанаўленне прычынна-следчых сувязей. Гэтыя заданні патрабуюць уважлівага вывучэння тэксту і паказваюць вашу чытацкую пісьменнасць. Напэўна, сярод вас ёсць тыя, хто найбольш захоплены сацыяльна-эканамічнай геаграфіяй. Для вас мы падрыхтавалі рубрыку **«У свеце цікавага»** з маркерам  і дадатковай інфармацыяй па тэме пазнавальнага характару. А тым, хто вырашыць звязаць сваю будучую прафесію з эканамічнай геаграфіяй, мы прапануем уступіць у **«Клуб знаўцаў-эканомікагеографаў»** —  . Пад гэтым маркерам будзе прадстаўлена дадатковая інфармацыя па тэме інфармацыйна-пошукавага характару. Якая ж геаграфія без карты, яна заўсёды побач з маркерам  — **«Папрацуем з атласам»**. Вывучаючы сацыяльна-эканамічную геаграфію свету, важна ведаць, якую пазіцыю ў свеце займае або якую спецыялізацыю мае наша краіна — Рэспубліка Беларусь. Для гэтага ў параграфе вы ўбачыце маркер  — **«Свет і Беларусь»**. Сучасную геаграфію сусветнай гаспадаркі ўжо немагчыма ўявіць без транснацыянальных кампаній (ТНК). Матэрыял пра іх вы сустрэнеце пад маркерам  — **«У свеце ТНК»**.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Праграмная наменклатура вылучана ў тэксце параграфаў чырвоным колерам.

У *канцы параграфа* ўспомніць самае галоўнае з яго дапаможа маркер **«Падвядзём вынікі»**  . Далей ідуць некалькі маркераў-кантралёраў з заданнямі рознага ўзроўню для самакантролю і праверкі ведаў і ўменняў — **«Праверым свае веды»**  , **«Ад простага да складанага»**  , **«Ад тэорыі да практыкі»**  . Дадзены блок змяшчае рознаўзроўневыя пытанні, творчыя і праблемныя заданні. У самастойны блок, які пазначаны маркерам **«Падарожжа па Глабальнай сетцы»**  , уключаны спасылкі на рэсурсы інтэрнэту па вывучаемай тэме. Гэтыя спасылкі прыведзены ў выглядзе QR-кодаў, якія адсылаюць да афіцыйных сайтаў міжнародных арганізацый або ТНК.

Для ўрокаў абагульняльнага паўтарэння, якія прадугледжаны вучэбнай праграмай, мы прапануем заданні трох відаў: «Праверым свае веды», «Папрацуем з атласам» і з новым для вас маркерам у вучэбным дапаможніку — **«Прагназуем»**  .

Адсылка да павышанага ўзроўню — 

и 

.

Матэрыял для павышанага ўзроўню размешчаны на нацыянальным адукацыйным партале (http://profil.adu.by). З матэрыяламі павышанага ўзроўню могуць працаваць і тыя вучні, якія вывучаюць геаграфію на базавым ўзроўні. Такім чынам, кожны з вас можа выстройваць сваю індывідуальную адукацыйную траекторыю.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



§ 1. Сацыяльна-эканамічная геаграфія свету, прадмет і задачы ў забеспячэнні ўстойлівага развіцця

Успамінаем. Хто з навукоўцаў першым выкарыстаў тэрмін «геаграфія»? Чаму карту называюць «альфай і амегай» геаграфіі? Чаму геаграфія мае права называцца самастойнай навукай?

Для чаго мы гэта вывучаем? Чаму сучаснаму чалавеку настолькі неабходныя веды ў галіне сацыяльна-эканамічнай геаграфіі? Выкажыце здагадку, як адсутнасць ведаў па геаграфіі можа перашкаджаць развіццю эканомікі дзяржавы. Ці ўзрастае роля геаграфіі як навукі ва ўмовах глабалізацыі?

Прадмет і задачы сацыяльна-эканамічнай геаграфіі свету. Кожная навуковая дысцыпліна ўносіць свой уклад у фарміраванне нашых уяўленняў аб свеце. Сацыяльна-эканамічная геаграфія свету (СЭГ свету) з'яўляецца адной з найцікавейшых геаграфічных дысцыплін, таму што толькі яна дазваляе адначасова адказаць на тры пытанні аб любой тэрыторыі або краіне: якія маюцца рэсурсы, чым характарызуецца насельніцтва і як развіваецца гаспадарка. А калі да атрыманага адказу дадаць гістарычныя веды і геаграфічнае мысленне, можна зрабіць прагноз дэмаграфічнай і сацыяльна-эканамічнай будучыні краіны.

Сацыяльна-эканамічная геаграфія свету — гэта галіна навукі, якая вывучае геаграфічныя заканамернасці развіцця насельніцтва, сусветнай гаспадаркі і светагаспадарчых сувязей, працэсаў на палітычнай карце свету або ў цэлым тэрытарыяльную арганізацыю грамадства ў свеце і асобных краінах у розных рэгіёнах планеты. Таму ***прадметам вывучэння*** сацыяльна-эканамічнай геаграфіі свету з'яўляюцца: дынаміка палітычнай карты свету, працэсаў, звязаных з вывучэннем геаграфіі насельніцтва; узаемаабумоўленасць прыродных рэсурсаў, гаспадаркі і грамадства; прасторава-часавыя заканамернасці дынамікі сектараў сусветнай гаспадаркі.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Спецыфічная асаблівасць сацыяльна-эканамічнай геаграфіі свету — гэта тое, што яна вывучае свае аб'екты пад пунктам гледжання іх тэрытарыяльнай арганізацыі, г. зн. узаемаразмяшчэння, узаемадзеяння, узаемадапаўнення і кіравання. У гэтым заключаецца яе прыкладная значнасць.

Ва ўмовах глабалізацыі і пераходу да постындустрыяльнай стадыі перад сацыяльна-эканамічнай геаграфіяй свету стаіць шырокі пералік задач (мал. 1).

1. Вывучэнне фактараў змен на палітычнай карце свету

2. Тлумачэнне геаграфіі палітычных канфліктаў, асаблівасцей геапалітычных працэсаў

3. Комплекснае вывучэнне ў геаграфіі насельніцтва фактараў развіцця, дэмаграфічных працэсаў і працэсаў рассялення

4. Вывучэнне асноўных фактараў і дынамікі развіцця сусветнай гаспадаркі

5. Комплекснае вывучэнне мінеральна-сыравінных рэсурсаў, фактараў размяшчэння і геаграфіі сектараў сусветнай гаспадаркі

6. Тлумачэнне эколага-арыентаваных змен у структуры сусветнай гаспадаркі і пераходу да постындустрыялізацыі

Мал. 1. Асноўныя задачы сацыяльна-эканамічнай геаграфіі свету

Эканоміка-геаграфічнае вывучэнне краін, або краіназнаўства, у цяперашні час становіцца ўсё больш гарманічнай часткай трох асноўных аб'ектаў СЭГ свету — палітычнай карты свету, насельніцтва і сусветнай гаспадаркі.

Уклад вядомых вучоных у развіццё сацыяльна-эканамічнай геаграфіі свету. Кожная навука ганарыцца імёнамі навукоўцаў, даследчыкаў, якія сваёй працай фарміруюць яе сусветны і грамадскі імідж. На працягу многіх стагоддзяў сфарміраваліся нацыянальныя навуковыя школы эканамічнай геаграфіі: нямецкая, французская, брытанская, расійская, амерыканская, беларуская і інш. Мы пазнаёмімся з навукоўцамі, якія ўнеслі найбольш значны ўклад у разуменне тых пытанняў, якія вам трэба будзе засвоіць у час вывучэння вучэбнага прадмета «Геаграфія. Сацыяльна-эканамічная геаграфія свету».



Мал. 2. В. М. Тацішчаў (1686–1750)

Уласнае бачанне сацыяльна-эканамічнай геаграфіі свету як навуковы напрамак, які вывучае прыроду, насельніцтва і гаспадарку ва ўзаемнай абумоўленасці і ўзаемазалежнасці, выклаў у сваіх працах расійскі вучоны В. М. Тацішчаў (мал. 2). Ён даказаў практычную значнасць геаграфіі для «ваеннага і земскага кіравання». Гэта думка пацвярджаецца

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Мал. 3. М. В. Ламаносаў (1711–1765)



Мал. 4. М. М. Баранскі (1881–1963)



Мал. 5. Ю. Г. Саушкін (1911–1982)

запатрабаванасцю сучаснай сацыяльна-эканамічнай геаграфіі ў практыцы рэгіянальнага кіравання.

Аб узаемасувязі прыродных і эканамічных з'яў, насельніцтва, гаспадаркі краін і фактараў размяшчэння прадукцыйных сіл пісаў вядомы рускі навуковец М. В. Ламаносаў (мал. 3). Яго ўклад у развіццё сацыяльна-эканамічнай геаграфіі свету заключаецца таксама ў доказе неабходнасці вывучэння насельніцтва як крыніцы «магутнасці дзяржавы», прычын скарачэння колькасці насельніцтва і прыняцця мер, якія б спрыялі яе росту.

Аб неабходнасці вывучэння сацыяльна-эканамічнай геаграфіі на розных тэрытарыяльных узроўнях упершыню было сказана ў працах выдатнага савецкага эканамікагеографа М. М. Баранскага (мал. 4). Распрацоўка паняцця «геаграфічны падзел працы» і асноў краіназнаўства таксама належыць гэтаму навукоўцу.

Прынцыпы прыродна-гаспадарчага раяніравання і геаграфічнага прагназавання сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны былі распрацаваны вядомым савецкім эканамікагеографам Ю. Г. Саушкіным (мал. 5) разам з яго іншымі шматлікімі навуковымі адкрыццямі.

Свет і Беларусь. Успомніце з вучэбнага курса 9-га класа «Геаграфія Беларусі» імёны беларускіх навукоўцаў-эканамікагеографаў і раскажыце аб іх укладзе ў развіццё сацыяльна-эканамічнай геаграфіі.

Месца сацыяльна-эканамічнай геаграфіі ў сістэме навук. Сацыяльна-эканамічная геаграфія свету пашырае і паглыбляе веды аб свеце як складанай сацыяльнай, эканамічнай, палітычнай, культурнай і экалагічнай сістэме, цесна ўзаемадзейнічаючы са многімі навукамі.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



У свеце ўсё ўзаемазвязана. З якімі навукамі сацыяльна-эканамічная геаграфія мае найбольш цесныя сувязі? Прывядзіце прыклады, якім чынам звязаны паміж сабой GPS-навігатар і геаграфія.

Сацыяльна-эканамічная геаграфія знаходзіцца ў цесным кантакце з фізічнай геаграфіяй і картаграфіяй. Яна звязана са многімі напрамкамі *фізічнай геаграфіі* — кліматалогіяй, гідралогіяй, метэаралогіяй, глебазнаўствам, біягеаграфіяй і інш. Напрыклад, без ведаў фізічнай геаграфіі аб тэктанічнай будове, прыродных умовах, кліматычных і глебавых асаблівасцях тэрыторыі або краіны немагчыма растлумачыць заканамернасці размяшчэння карысных выкапняў, спецыялізацыю і геаграфію сельскай гаспадаркі, галіновую структуру і геаграфію прамысловасці і інш.

Выкарыстоўваючы *картаграфічныя спосабы* малюнка розных аб'ектаў, СЭГ свету распрацоўвае картаграфічныя мадэлі развіцця розных галін гаспадаркі.

Гістарычны падыход пры вывучэнні палітычнай геаграфіі, насельніцтва, галін сусветнай гаспадаркі выступае адным з асноўных пры тлумачэнні сучасных працэсаў, якія адбываюцца. Таму СЭГ свету цалкам абапіраецца на сувязі з *гісторыяй*.

Пры вывучэнні насельніцтва той ці іншай краіны неабходна ведаць вялікі пералік дэмаграфічных паказчыкаў. Для гэтага сацыяльна-эканамічная геаграфія свету на працягу ўсёй гісторыі звяртаецца да *дэмаграфіі*.

Цесныя сувязі склаліся ў СЭГ свету з *эканомікай*. Напрыклад, без ведання паказчыкаў эканамічнага развіцця, знешняга гандлю, маштабаў вытворчасці нельга зрабіць дакладны аналіз тэрыторыі або краіны па ўзроўні сацыяльна-эканамічнага развіцця, вызначыць гаспадарчую спецыялізацыю, таварную і геаграфічную структуру гандлю. У даследаваннях аб'ектаў лакальнага, рэгіянальнага і нацыянальнага ўзроўняў сацыяльна-эканамічная геаграфія ўзаемадзейнічае з *рэгіянальнай эканомікай*.

У апошнія гады XX ст. умацавалася сувязь эканамічнай і сацыяльнай геаграфіі з *экалогіяй*. Гэта дазваляе па-новаму падысці да вырашэння тэрытарыяльных праблем рацыянальнага прыродакарыстання і аховы навакольнага асяроддзя.

Асноўныя напрамкі сацыяльна-эканамічнай геаграфіі свету. Традыцыйнымі напрамкамі сацыяльна-эканамічнай геаграфіі свету з'яўляюцца палітычная геаграфія, геаграфія насельніцтва і геаграфія сусветнай гаспадаркі, якая, у сваю чаргу, падзяляецца на геаграфію сельскай гаспадаркі, геаграфію прамысловасці і геаграфію сферы паслуг.

Аднак гэтыя тры асноўныя напрамкі развіваюцца ў цяперашні час у новых умовах. Для іх характэрныя рэгіянальныя канфлікты ў свеце, бурнае развіццё навукі і тэхналогій, дэмаграфічны пераход і постындустрыяльныя тэндэнцыі, транснацыяналізацыя і глабалізацыя. Дадзеныя працэсы адбываюцца ў сусветнай гаспадарцы настолькі

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Мал. 6. Новыя напрамкі сацыяльна-эканамічнай геаграфіі свету

маштабна ў XXI ст., што змяняюць звыклую структуру СЭГ свету. Гэта прыводзіць да з'яўлення новых напрамкаў у яе структуры (мал. 6).

Роля СЭГ ва ўмовах глабалізацыі і ў забеспячэнні ўстойлівага развіцця. На пачатку XXI ст. сацыяльна-эканамічная геаграфія стала найважнейшай і найбольш дынамічнай з геаграфічных навук, якія маюць вялікае практычнае значэнне для аптымізацыі размяшчэння грамадства, удасканалення тэрытарыяльнай арганізацыі гаспадаркі і інш.

Ва ўмовах глабалізацыі і значных змен у геаграфіі насельніцтва і сусветнай гаспадаркі пашырыўся сацыяльна-эканамічны заказ геаграфічнай навуцы. Практычная значнасць СЭГ выходзіць на першы план.

У цяперашні час эканомікагеографы ўдзельнічаюць у вырашэнні найважнейшых пытанняў менеджменту тэрытарыяльнага развіцця (мал. 7).

Эканомікагеографы ажыццяўляюць сацыяльна-эканамічнае раяніраванне краіны, вылучаюць рэгіёны, іх межы, аналізуюць структуру і функцыі гаспадаркі, прымаюць актыўны ўдзел у распрацоўцы прагнозаў і праграм сацыяльна-эканамічнага развіцця тэрыторый. Яны таксама ўдзельнічаюць у распрацоўцы нацыянальных стратэгій устойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Мал. 7. Практычнае значэнне сацыяльна-эканамічнай геаграфіі

Свет і Беларусь. Рэспубліка Беларусь адна з першых на постсавецкай прасторы ў 1997 г. распрацавала Нацыянальную стратэгію ўстойлівага развіцця (НСУР) на перыяд да 2010 г. Пасля яе рэалізацыі былі распрацаваны НСУР на перыяд да 2020 і да 2030 гг. У цяперашні час распрацоўваецца праект новай стратэгіі да 2035 г. У распрацоўцы ўсіх стратэгій удзельнічалі вядучыя навукоўцы-эканомікагеографы Беларусі, у тым ліку з Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Такім чынам, выхад у практыку гаспадарчага планавання стаў адметнай рысай сучасных эканоміка-геаграфічных даследаванняў.

Падвядзём вынікі. Сацыяльна-эканамічная геаграфія вывучае ... . Асноўнымі напрамкамі развіцця сацыяльна-эканамічнай геаграфіі з'яўляюцца ... . Ва ўмовах глабалізацыі роля геаграфічнай навукі пастаянна ўзрастае, паколькі ... .

Сацыяльна-эканамічная геаграфія мае вялікае практычнае значэнне для аптымізацыі размяшчэння грамадства і ўдасканалення тэрытарыяльнай арганізацыі гаспадаркі.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

П$_1$

Праверым свае веды. 1. Што з'яўляецца прадметам сацыяльна-эканамічнай геаграфіі свету? 2. Якія новыя навуковыя напрамкі ў ёй вылучаюцца і з чым гэта звязана? 3. У чым заключаецца практычнае значэнне сацыяльна-эканамічнай геаграфіі ў сучасным свеце?



Ад простага да складанага. Складзіце схему «Сувязь сацыяльна-эканамічнай геаграфіі з іншымі навукамі».



Падарожжа па Глабальнай сетцы.

Сайт факультэта геаграфіі і геаінфарматыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Сайт Беларускага геаграфічнага таварыства.

Карты Google.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

РАЗДЗЕЛ

I

СУЧАСНАЯ ПАЛІТЫЧНАЯ КАРТА СВЕТУ І ПАЛІТЫЧНАЯ ГЕАГРАФІЯ



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



§ 2. Аб’екты палітычнай карты свету

Успамінаем. Што такое палітычная карта свету? У чым заключаецца дынамічнасць палітычнай карты свету? Якія этапы фарміравання прайшла сучасная палітычная карта свету? Якія дзяржавы маюць самую вялікую плошчу?

Для чаго мы гэта вывучаем? Чаму сучаснаму вучню неабходна ведаць асаблівасці фарміравання палітычнай карты свету? Выкажыце здагадку, для якіх спецыяльнасцей у будучыні гэта тэма стане найбольш актуальнай. У якіх установах адукацыі і на якіх спецыяльнасцях магчыма атрымаць адукацыю, звязаную з глыбокімі ведамі працэсаў, што адбываюцца на палітычнай карце свету?



Мал. 8. Аб’екты палітычнай карты свету

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Аб'екты палітычнай карты свету. Палітычная карта свету дынамічная з-за змен, якія адбываюцца з межамі, плошчай дзяржаў і тэрыторый у сувязі з аб'яднаннем, распадам або з'яўленнем суверэнных дзяржаў, зменай формы кіравання або ладу і інш. Таму асноўнымі *аб'ектамі*, якія ўзаемадзейнічаюць і ўплываюць на развіццё палітычнай карты свету, з'яўляюцца *дзяржавы* і *тэрыторыі* (мал. 8).

Сярод дзяржаў вылучаюць *самакіравальныя (незалежныя, суверэнныя) і самаабвешчаныя (непрызнаныя)*.

Успамінаем. Якімі асаблівасцямі можна ахарактарызаваць суверэнную дзяржаву?

Суверэнныя дзяржавы і залежныя тэрыторыі. На палітычнай карце свету XXI ст. пераважаюць *суверэнныя дзяржавы*. Гэта 193 краіны — члены ААН і 2 назіральнікі асаблівага статусу (Ватыкан і Палестына). Колькасць суверэнных дзяржаў расце. Так, калі ў 1900 г. у свеце было 55 суверэнных дзяржаў, то напярэдадні Другой сусветнай вайны — 71, а ў 1947 г. — 81. Да 2000 г. суверэнітэтам валодала ўжо больш за 190 краін.

У свеце ўсё ўзаемазвязана. Прывядзіце прыклады з мастацкай літаратуры, якія адлюстроўваюць падзеі на палітычнай карце свету («Аповесць мінулых гадоў», «Слова пра паход Ігараў»).

Свет і Беларусь. Вызначыце, да якіх падзей на палітычнай карце свету адносяцца радкі Янкі Купалы:

Ты з Заходняй, я з Усходняй
Нашай Беларусі,
Больш з табою ўжо ніколі
Я не разлучуся...

Матэрыялы якіх вучэбных прадметаў вам неабходна ведаць пры вывучэнні тэмы? Адказ абгрунтуйце, канкрэтызуйце прыкладамі.

На палітычнай карце свету існуюць несамакіравальныя (залежныя) тэрыторыі. Яны ўяўляюць з сябе частку зямной паверхні з пэўнымі межамі, якой кіруе іншая дзяржава. Такая тэрыторыя не валодае палітычнай незалежнасцю, хоць можа карыстацца аўтаноміяй. Колькасць залежных тэрыторый у свеце скарачаецца. У цяперашні час іх налічваецца каля 30, з якіх 17 афіцыйна ўключаны ў спіс ААН.

Папрацуем з атласам. Знайдзіце на карце залежныя тэрыторыі. Якая з залежных тэрыторый знаходзіцца бліжэй за ўсё да Рэспублікі Беларусь?

Напрыклад, у Азіяцка-Ціхаакіянскім рэгіёне — гэта Новая Каледонія і Французская Палінезія, якія належаць Францыі; Гуам (ЗША); Піткэрн (Вялікабрытанія). Астатнія ўяўляюць *заморскія тэрыторыі, дэпартаменты, асацыіраваныя дзяржавы* (гл. мал. 8). Самая вялікая па колькасці насельніцтва залежная тэрыторыя — Пуэрта-Рыка, а самая вялікая па плошчы — Грэнландыя.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Клуб знаўцаў-эканомікагеографаў. Прыкладамі залежных краін або калоній могуць таксама служыць Гібралтар, Бермудскія і Фалклендскія астравы, востраў Святой Алены (Вялікабрытанія), Гвіяна, Марцініка, Рэюньён (Францыя), Усходняе Самоа (ЗША), Аруба і Кюрасао (Нідэрланды) і інш.

П$_2$

Самаабвешчаныя дзяржавы. З-за канфліктаў на сучаснай палітычнай карце свету, звязаных з імкненнем аддзяліцца і атрымаць суверэнітэт, узнікаюць самаабвешчаныя дзяржавы. Яны валодаюць усімі прыкметамі дзяржаўнасці (насельніцтва, тэрыторыя, урад, суверэнітэт), але ў той жа час не маюць поўнага або частковага міжнароднага прызнання. Сярод самаабвешчаных дзяржаў вылучаюць *непрызнаныя* і *часткова прызнаныя дзяржавы*.



Папрацуем з атласам. Выкарыстоўваючы карты атласа, назавіце самаабвешчаныя дзяржавы на тэрыторыі краін — суседзей Рэспублікі Беларусь, а таксама дзяржаў — членаў СНД.

Усяго на палітычнай карце свету існуе каля 120 непрызнаных дзяржаў. У Азіі іх налічваецца каля 40, у Еўропе — 30. *Непрызнанымі лічацца дзяржавы, якія не прызнала ні адна дзяржава — член ААН*. Гэта, напрыклад, Прыднястроўская Малдаўская Рэспубліка, Нагорна-Карабахская Рэспубліка, Данецкая Народная Рэспубліка, Ісламская дзяржава, заходні Курдыстан. *Дзяржавы, якія не маюць магчымасці ўступлення ў ААН, але прызнаныя ў якасці дзяржаў некаторымі дзяржавамі — членамі ААН, атрымалі назву часткова прызнаных.*

Да іх адносяцца, напрыклад, Турэцкая Рэспубліка Паўночнага Кіпра, Рэспубліка Косава, Рэспубліка Абхазія і Рэспубліка Паўднёвая Асеція, Дзяржава Палестына.

Вялікая колькасць непрызнаных дзяржаў рознага статусу на палітычнай карце свету прывяла да з'яўлення іх абагульненай назвы.



Квазідзяржава — гэта палітыка-тэрытарыяльнае ўтварэнне, якое, валодаючы асноўнымі прыкметамі дзяржавы, пазбаўлена міжнароднага прызнання, з прычыны чаго не валодае суверэнітэтам.

П$_3$

Роля ААН у фарміраванні палітычнай карты свету. З моманту стварэння ў 1945 г. Арганізацыя Аб'яднаных Нацый (ААН) садзейнічае ўмацаванню міру і спрыяе аднаўленню міру пры ўзнікненні ўзброеных канфліктаў. Аперацыі ААН па падтрыманні міру з'яўляюцца адным з найбольш эфектыўных інструментаў для забеспячэння міру і бяспекі.



Свет і Беларусь. З якога года Рэспубліка Беларусь з'яўляецца членам ААН?


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Міратворчая дзейнасць ААН знаходзіць шырокае прымяненне ў сітуацыях, звязаных з унутрыдзяржаўнымі канфліктамі і грамадзянскімі войнамі. З моманту заснавання ААН ажыццявіла 71 аперацыю па падтрыманні міру (мал. 9).



Мал. 9. «Блакітная каска» — сімвал міратворчай дзейнасці ААН

Клуб знаўцаў-эканомікагеографаў. У канцы 1990-х гг. міратворчыя аперацыі былі праведзены ў ДР Конга, ЦАР, Сьера-Леонэ і Косава. У пачатку XXI ст. міратворцы ААН выконвалі свае задачы ў Ліберыі, Кот-д'Івуары, Паўднёвым Судане, Гаіці і Малі. У цяперашні час ажыццяўляецца 14 міратворчых аперацый (мал. 10).



1. Гаіці
2. Заходняя Сахара
3. Цэнтральна-Афрыканская Рэспубліка
4. Малі
5. Дэмакратычная Рэспубліка Конга
6. Дарфур, *Судан*
7. Кіпр
8. Галаны, *Сірыя*
9. Ліван
10. Блізкі Усход
11. Аб'ей, *Судан*
12. Косава
13. Паўднёвы Судан
14. Індыя і Пакістан

Мал. 10. Геаграфія сучаснай міратворчай дзейнасці ААН

ААН непасрэдна не ўплывае на фарміраванне палітычнай карты свету. Аднак членства ў ААН у сучаснай сістэме міжнародных адносін стала найважнейшым сімвалам усеагульнага прызнання дзяржаўнасці, свайго роду «залатым стандартам» міжнароднай законнасці.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Клуб знаўцаў-эканомікагеографаў. Цікава, што асноўным і адзіным міжнародным дакументам, у якім пералічваюцца прыкметы дзяржаўнасці з пазіцыі міжнароднага права, з'яўляецца Канвенцыя Монтавідэа, падпісаная ў 1933 г. У ёй замацаваны чатыры асноўныя прыкметы дзяржавы: пастаяннае насельніцтва, пэўная тэрыторыя, уласны ўрад, здольнасць да ўступлення ў адносіны з іншымі дзяржавамі.

П$_4$

Прасторавыя формы дзяржаў. Дзяржаўная тэрыторыя ў межах дзяржаўных рубяжоў ахоплівае: 1) частку паверхні зямной сушы; 2) унутраныя і тэрытарыяльныя воды; 3) паветраную прастору, якая распасціраецца над сушай і водамі. Важным параметрам дзяржаўнай тэрыторыі з'яўляецца канфігурацыя і форма тэрыторыі краіны.

Клуб знаўцаў-эканомікагеографаў. Напрыклад, *кампактная форма* будзе спрыяць роўнааддаленай даступнасці асобных рэгіёнаў і меншай расцягнутасці камунікацый. У дзяржавах *выцягнутай* або *няправільнай формы* або тэрытарыяльна раз'яднаных (размешчаных на архіпелагах) цяжэй забяспечыць раўнамернае эканамічнае развіццё, арганізаваць ахову дзяржаўнай мяжы; у аддаленых раёнах з этнічнымі меншасцямі можа развівацца сепаратызм.

На аснове канфігурацыі дзяржаўнай тэрыторыі вылучаюць некалькі прасторавых форм дзяржаў:


1) *Дзяржавы выцягнутай* або *няправільнай формы* (напр., Чылі, Нарвегія, В'етнам, Італія, Гамбія). Тэрыторыя гэтых краін працягнулася ўздоўж марскога ўзбярэжжа або даліны буйных рэк на многія сотні кіламетраў (мал. 11).



Мал. 11. Выцягнутая форма дзяржаўнай тэрыторыі Італіі

Клуб знаўцаў-эканомікагеографаў. Напрыклад, размешчаная ў цэнтры сталіца Чылі — Сант'яга — мае слабыя эканамічныя сувязі з пустыннымі раёнамі паўночных меж з Перу і Балівіяй, а таксама палярнымі марскімі раёнамі Вогненнай Зямлі. Вялікая працягласць Італіі з поўначы на поўдзень з'яўляецца адной з прычын эканамічных адрозненняў краіны.

2) *Дзяржавы з кампактнай тэрыторыяй*, якія маюць форму, блізкую да квадрата або круга (напр., Францыя, Іспанія, Польшча, Венгрыя і інш.) (мал. 12). Пры такой форме назіраецца роўная аддаленасць усіх прыгранічных раёнаў ад цэнтра краіны.



Мал. 12. Кампактная форма дзяржаўнай тэрыторыі Польшчы

Клуб знаўцаў-эканомікагеографаў. Аднак пры адносна спрыяльнай знешняй форме на тэрыторыі краіны могуць знаходзіцца буйныя прыродныя бар'еры і цяжкадаступныя раёны. Гэтыя натуральныя перашкоды робяць цяжкім

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

функцыянаванне дзяржавы. Напрыклад, Перу падзелена на дзве часткі высокімі хрыбтамі Анд, а пустынныя раёны Егіпта слаба заселены і часткова ізаляваны ад галоўнай паласы рассялення па даліне і дэльце Ніла.



Мал. 13. Фрагментарная форма дзяржаўнай тэрыторыі Малайзіі

3) *Фрагментаваныя дзяржавы*, якія складаюцца з некалькіх частак, падзеленых тэрыторыяй іншых краін або міжнароднымі водамі (напр., дзяржавы-архіпелагі — Інданезія і Філіпіны, «падвоеная» Малайзія (мал. 13), размешчаная на паўвостраве Малака і востраве Калімантан).

4) *Дзяржавы, якія маюць у сваім складзе анклавы/эксклавы* — невялікія раёны, адрэзаныя ад асноўнай тэрыторыі дзяржавы землямі іншых краін або размешчаныя ўнутры тэрыторыі іншых дзяржаў (напр., анклаўнае становішча займаюць Калінінградская вобласць Расіі, Нахічавань у Азербайджане, аддзеленая ад яго тэрыторыяй Арменіі (мал. 14)).



Мал. 14. Эксклаў Азербайджана — Нахічаванская Аўтаномная Рэспубліка, аддзеленая тэрыторыяй Арменіі

Папрацуем з атласам. Выкарыстоўваючы карты атласа, прапануйце свае варыянты канфігурацыі дзяржаў на аснове іх прасторавай формы.

Клуб знаўцаў-эканомікагеографаў. Паняцці «анклаў» і «эксклаў» шырока прымяняюцца ў геаграфіі і геапалітыцы для характарыстыкі своеасаблівага становішча адасобленых частак асобных дзяржаў свету. Згодна з вызначэннем Э. Б. Алаева, паняцце «анклаў» выкарыстоўваецца, калі гавораць аб тэрыторыі чужой дзяржавы. Тая ж тэрыторыя, але ў адносінах да сваёй дзяржавы будзе называцца «эксклавам». Таму розніца паняццяў ляжыць толькі ў прававой плоскасці. З пункту гледжання геаграфіі, гэта адзін і той жа ўчастак.

Падвядзём вынікі. Аб'ектамі палітычнай карты свету з'яўляюцца ... . На палітычнай карце налічваецца ... незалежных дзяржаў і ... залежных тэрыторый.

Колькасць залежных тэрыторый пастаянна скарачаецца.

Асноўная роля ААН у фарміраванні сучаснай палітычнай карты свету заключаецца ў забеспячэнні калектыўнай бяспекі краін-удзельніц, прадухіленні развіцця палітычных канфліктаў.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Праверым свае веды. 1. Назавіце асноўныя аб'екты палітычнай карты свету. 2. Назавіце асноўныя прасторавыя формы дзяржаў. 3. Якія тэндэнцыі характэрныя для сучаснай палітычнай карты свету?

Ад простага да складанага. 1. Пра якія бягучыя аперацыі ААН вы чулі з інфармацыйных крыніц на працягу апошняга месяца? 2. Падрыхтуйце паведамленне пра служачых міратворчай місіі ААН.

Падарожжа па Глабальнай сетцы.

Афіцыйны сайт ААН.

Афіцыйны сайт ААН у Беларусі.

§ 3. Рэгіянальныя і лакальныя канфлікты ў свеце

Успамінаем. Чаму ўзнікаюць канфлікты паміж людзьмі? Прывядзіце прыклады вядомых вам канфліктаў, якія адбываюцца на планеце. Якая арганізацыя адыгрывае важную ролю ў вырашэнні рэгіянальных і лакальных канфліктаў?

Для чаго мы гэта вывучаем? Чаму ў цяперашні час выклікаюць трывогу ўзнікаючыя канфлікты? Падумайце, чаму з'явіўся новы напрамак у геаграфіі — геаканфлікталогія. Сферай дзейнасці якіх спецыялістаў з'яўляецца вырашэнне рэгіянальных і лакальных канфліктаў?


Прычыны, класіфікацыя і наступствы канфліктаў у свеце. Сучасны свет характарызуецца праявай розных канфліктаў паміж дзяржавамі і рэгіёнамі.

Клуб знаўцаў-эканомікагеографаў. У аснове канфліктаў ляжаць *тры групы фактараў*: лакальныя, рэгіянальныя і глабальныя. *Лакальныя* дзейнічаюць на канкрэтнай тэрыторыі і ў пэўнай краіне. Яны могуць быць звязаны, напрыклад, з асаблівасцямі нацыянальнага складу і гісторыка-культурнага развіцця. *Рэгіянальныя* фактары дзейнічаюць у пэўным рэгіёне ў выніку рознагалоссяў інтарэсаў палітычных, эканамічных аб'яднанняў дзяржаў (напр., НАТА і СНД). *Глабальныя* фактары ўключаюць буйныя палітычныя працэсы ў развіцці сусветнай супольнасці. Напрыклад, крушэнне каланіяльнай сістэмы, сацыялістычнай сістэмы гаспадарання, глабалізацыя.

Асноўнымі прычынамі павелічэння колькасці канфліктаў у свеце з'яўляюцца нацыянальна-этнічныя, міжканфесійныя, тэрытарыяльныя, дэмаграфічныя супярэчнасці, але часцей за ўсё іх спалучэнне. Найбольш часта рознагалоссі адбываюцца на этнічнай і міжканфесійнай глебе з імкненнем стварэння новай дзяржавы.

Сепаратызм — рух за аддзяленне часткі дзяржавы і стварэнне новага дзяржаўнага ўтварэння або за прадастаўленне частцы краіны аўтаноміі па нацыянальных, моўных або рэлігійным прынцыпах.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Мал. 15. Класіфікацыя канфліктаў у свеце

Разнастайнасць прычын, маштабаў, форм праяўлення і іншых прыкмет сучасных канфліктаў выклікала неабходнасць іх класіфікацыі. У абагульненай форме віды існуючых у свеце канфліктаў прадстаўлены на малюнку 15.

Канфлікты ў краінах і рэгіёнах свету прыводзяць да негатыўных наступстваў. Сярод іх адрозніваюць верагодныя бліжэйшыя і аддаленыя наступствы.

Найбольш верагоднымі бліжэйшымі наступствамі ваенных канфліктаў з'яўляюцца: гібель, траўмы, хваробы; забруджванне навакольнага асяроддзя; псіхалагічнае і інфармацыйнае ўздзеянне; парушэнне кіравання; разбурэнне эканомікі і сістэм жыццезабеспячэння насельніцтва. *Аддаленымі наступствамі* канфліктаў з'яўляюцца: экалагічныя, эканамічныя, медыцынскія, сацыяльныя і дэмаграфічныя.


Клуб знаўцаў-эканомікагеографаў. Экалагічныя наступствы праяўляюцца ў выглядзе забруджвання навакольнага асяроддзя, знішчэння відавой біялагічнай разнастайнасці, крызісу ў сельскай гаспадарцы і інш. Эканамічныя наступствы — у беднасці і голадзе. Сацыяльныя наступствы — у выглядзе нацыянальнай варожасці, дэфармацыі культуры сям'і і інш. Дэмаграфічныя наступствы — у рэзкім зніжэнні долі мужчынскага насельніцтва і наступных хвалях спаду нараджальнасці.

Рэгіянальныя і лакальныя канфлікты характарызуюць маштаб уздзеяння супярэчнасцей. Рэгіянальны канфлікт прадугледжвае ўдзел дзвюх і больш дзяржаў аднаго рэгіёна. Лакальны канфлікт адбываецца, як правіла, паміж дзвюма дзяржавамі і закранае пераважна іх інтарэсы (тэрытарыяльныя, эканамічныя, палітычныя і інш.).

Для кожнага рэгіёна характэрныя як рэгіянальныя, так і лакальныя канфлікты. Частка іх адбываецца ў мірнай/няўзброенай форме, а некаторыя — у форме ўзброенага канфлікту (мал. 16).

У выніку пашырэння інтэграцыі ў Еўропе, якая выступае адносна стабільным рэгіёнам свету, тут застаецца шэраг рэгіянальных канфліктаў. У іх аснове ляжаць

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



1. Трыпура, *Індыя*
2. Шан, *Бірма*
3. Таміл-Ілан, *Шры-Ланка*
4. Ачэх, *Інданезія*
5. Паўночны Кейп, *ПАР*

1. Паўночная Ірландыя, *Вялікабрытанія*
2. Краіна Баскаў, *Іспанія*
3. Патані, *Тайланд*
4. Паўднёвая Эрытрэя, *Эрытрэя*
5. Самалілэнд, *Самалі*
6. Пунтленд, *Самалі*
7. Цэнтр. шт. Самалі, *Самалі*
8. Галмудуг, *Самалі*
9. Фронт супраціўлення Раханьен, *Самалі*
10. Джубаленд, *Самалі*
11. Дарфур, *Судан*
12. Ківу, *Конга*
13. Бакасі, *Камерун*
14. Ніжняе Конга, *Конга Кіншаса*
15. Кабінда, *Ангола*
16. Сектар Капрыві, *Намібія*

1. Косава
2. Прыднястроўе, *Малдова*
3. Абхазія, *Грузія*
4. Паўднёвая Асецыя, *Грузія*
5. Нагорны Карабах, *Азербайджан*
6. Курдыстан, *Турцыя*
7. Курдыстан, *Іран*
8. *Сірыя*
9. Палестына, *Ізраіль*
10. Вазірыстан, *Пакістан*
11. Джаму і Кашмір, *Індыя*
12. Суар, *Кітай*
13. Тыбет, *Кітай*
14. Тайвань, *Кітай*
15. Дэльта Нігера, *Нігер*

Мал. 16. Лакальныя, рэгіянальныя і глабальныя канфлікты ў свеце

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

сепаратызм, эканамічныя, культурна-рэлігійныя і іншыя прычыны. Прыкладамі лакальных канфліктаў у Еўропе па этнаканфесійных і сацыяльна-эканамічных прычынах з'яўляюцца Каталонія, Краіна Баскаў. Прыкладамі канфліктаў на глебе сепаратызму выступаюць Косава, Чачня, Прыднястроўе, Абхазія, Нагорны Карабах.

Свет і Беларусь. Назавіце тэрыторыі, бліжэй за ўсё размешчаныя да меж Рэспублікі Беларусь, дзе сёння працягваюцца рэгіянальныя або лакальныя канфлікты.

Азія з другой паловы XX ст. характарызуецца шматлікімі канфліктамі па палітычных і эканамічных прычынах. Асаблівае месца ў рэгіёне займаюць узброеныя канфлікты. Асноўнымі краінамі, дзе яны адбываюцца, з'яўляюцца Ізраіль, Емен, Сірыя (мал. 17), Іран, Ірак, краіны Персідскага заліва і інш. У Азіі адбываюцца канфлікты і на глебе сепаратызму (напр., Курдыстан, Кашмір).



Мал. 17. Наступствы канфлікту ў Сірыі

Афрыка ў апошнія дзесяцігоддзі стала самым канфліктанебяспечным рэгіёнам свету. На працягу многіх гадоў балючымі кропкамі рэгіёна з'яўляюцца Самалі, Судан, ДР Конга, Нігерыя, Эфіопія і іншыя краіны. Большасць канфліктаў адбываецца па этнічных і рэлігійных прычынах, на глебе сепаратызму і вырашаецца ўзброеным шляхам.

На канфлікты ў *Амерыцы* найбольшы ўплыў аказалі этнаканфесійны і сацыяльна-эканамічны фактары, часам — сепаратызм. Прыкладамі з'яўляюцца Квебек у Канадзе, Ч'япас у Мексіцы і інш. Нягледзячы на невялікую колькасць лакальных канфліктаў, у Амерыцы захоўваюцца спрэчныя тэрыторыі і межы. Напрыклад, Калумбія і Венесуэла вядуць даўнюю спрэчку аб падзеле тэрытарыяльных вод у Венесуэльскім заліве. У цэлым у параўнанні з іншымі рэгіёнамі канфлікты ў Амерыцы адносна ўрэгуляваныя.

Узброеныя канфлікты. Перад светам у XXI ст. стаяць пагрозы міжнароднай бяспекі: 1) распаўсюджванне зброі масавага паражэння; 2) міжнародны тэрарызм, этнічныя і рэлігійныя праблемы; 3) гандаль людзьмі, гвалт і інш. Некаторыя канфлікты не могуць быць вырашаны мірным шляхам і адбываюцца з ваенным умяшаннем. У гэтым выпадку гаворка ідзе пра *ўзброеныя канфлікты*. Яны ўяўляюць з сябе адну з форм вырашэння палітычных, нацыянальна-этнічных, рэлігійных, тэрытарыяльных і іншых супярэчнасцей з прымяненнем сродкаў узброенай барацьбы.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Узброены канфлікт мае *міжнародны* (з удзелам дзвюх і больш дзяржаў) або *ўнутраны характар* (у межах тэрыторыі адной дзяржавы). Вылучаюць тры асноўныя прычыны ўзброеных канфліктаў у свеце (мал. 18).

1. Палітычныя і рэлігійныя разлады
2. Расавая і этнічная нецярпімасць
3. Былыя каланіяльныя межы дзяржаў без рэлігійнага і этнічнага фактараў

Мал. 18. Прычыны ўзброеных канфліктаў

Папрацуем з атласам. Выкарыстоўваючы палітычную карту свету, прывядзіце прыклады дзяржаў, дзе маюцца ўзброеныя канфлікты, якія адбываюцца па рэлігійных прычынах, расавай і этнічнай нецярпімасці, а таксама канфлікты, узніклыя на глебе былых каланіяльных меж.

З пачатку 1990-х гг. у свеце адбывалася кароткатэрміновае павелічэнне колькасці ўзброеных канфліктаў.


У 2016 г. іх налічвалася 49: 2 — міждзяржаўныя (паміж Індыяй і Пакістанам і паміж Эрытрэяй і Эфіопіяй), 47 — унутраных (мал. 19). Сярод унутраных канфліктаў каля 40 % адбываецца па палітычных і ідэалагічных прычынах, у тым ліку звязаных з утварэннем самастойных дзяржаў. Кожны трэці ўзброены канфлікт адбываецца на этнічнай або міжканфесійнай глебе.

Афрыка — рэгіён з найбольшай колькасцю канфліктаў (19). Зафіксавана 15 канфліктаў у Азіі, 10 — на Блізкім Усходзе, 3 — у Еўропе і 2 — у Амерыцы. Нягледзячы на тое што ў Азіі і Афрыцы многія канфлікты па-ранейшаму захоўваюцца, у Амерыцы (у прыватнасці ў Калумбіі) атрымліваецца нармалізаваць сітуацыю (мал. 20).

Паразважаем. У многіх раёнах рэгіянальных канфліктаў, дзе ваенныя дзеянні спыніліся, стварылася становішча хутчэй перамір'я, чым трывалага міру. Проста з вострай стадыі яны перайшлі ў стадыю напружаных або патэнцыяльных



Мал. 19. Размеркаванне ўзброеных канфліктаў, %




Мал. 20. Дынаміка ўзброеных канфліктаў у свеце

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

канфліктаў, іншымі словамі, канфліктаў, якія тлеюць. Чым небяспечная такая стадыя? Адказ патлумачце.

Большасць узброеных канфліктаў накіраваны на барацьбу з ісламісцкімі арганізацыямі. 30 % ісламісцкіх канфліктаў адбываецца на Блізкім Усходзе і ў Паўночнай Афрыцы, 30 % — у Афрыцы на поўдзень ад Сахары, астатнія — у Азіі (мал. 21).



Канфлікты з тэндэнцыяй да абвастрэння

1. Талібан у Афганістане
2. Грамадзянская вайна ў Сірыі
3. Насілле ў Цэнтральна-Афрыканскай Рэспубліцы
4. Тэрытарыяльныя спрэчкі ў Паўднёва-Кітайскім моры
5. Крызіс вакол Паўночнай Карэі
6. Канфлікт ва Украіне
7. Грамадзянская вайна ў Паўднёвым Судане
8. Курдскі канфлікт
9. Аль-Шабаб у Самалі
10. Канфлікт паміж Індыяй і Пакістанам
11. Вайна ў Емене

Канфлікты, якія тлеюць

1. Нагорнакарабахскі канфлікт
2. Ісламісты ў Пакістане
3. Міжабшчынны канфлікт у Ліване
4. Ісламісты ў Егіпце
5. Дэстабілізацыя Малі
6. Насілле ў ДР Конга
7. Міжрэлігійнае насілле у М'янме
8. Напружанасць ва Усходне-Кітайскім моры
9. Вайна супраць ДАІШ у Іраку
10. Ісламісты ў Расіі
11. Крымінал у Мексіцы
12. Ізраільска-палестынскі канфлікт
13. Бока Харам у Нігерыі
14. Грамадзянская вайна ў Лівіі
15. Уйгурскія экстрэмісты ў Кітаі
16. Палітычны крызіс у Бурундзі
17. Крызіс бежанцаў у Еўрапейскім саюзе

Мал. 21. Асноўныя ўзброеныя канфлікты ў свеце, 2016 г.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Клуб знаўцаў-эканомікагеографаў. Па даных Стакгольмскага міжнароднага інстытута даследавання праблем свету, у 2017 г. асноўнымі краінамі, дзе адбываліся ўзброеныя канфлікты, былі: у Азіі — Афганістан, Індыя, М'янма, Пакістан, Філіпіны; на *Блізкім Усходзе* і ў *Паўночнай Афрыцы* — Егіпет, Ірак, Ізраіль і Палестына, Лівія, Сірыя, Турцыя і Емен; у *Афрыцы* — Малі, Нігерыя, ЦАР, ДР Конга, Эфіопія, Самалі і Паўднёвы Судан; у Еўропе — Нагорны Карабах (канфлікт Арменіі і Азербайджана), Украіна, Грузія (Абхазія і Паўднёвая Асеція), Малдова (Прыднястроўе), Кіпр, Косава; у Амерыцы — Калумбія, Сальвадор, Мексіка, Парагвай.

Геаканфлікталогія. Праблема канфліктаў у свеце прыцягнула ўвагу шматлікіх навуковых дысцыплін. Узаемасувязь паміж канфліктам і яго характарам, з аднаго боку, і геаграфічнай зонай канфлікту, з другога, фарміруе новы напрамак сацыяльна-эканамічнай геаграфіі — геаканфлікталогію.



Геаканфлікталогія — гэта навука, якая вывучае ў адзінстве геаграфічныя, палітычныя і іншыя фактары, што аказваюць уплыў на ўзнікненне, развіццё і зыход палітычных, у тым ліку ўзброеных канфліктаў.

Найбольш актыўна развіваецца гэты навуковы напрамак у краінах Еўропы.



Падвядзём вынікі. На палітычнай карце свету вылучаюць ... і ... канфлікты. Існуе шэраг прычын узнікнення канфліктаў: ... .

Прыкладам непрызнаных дзяржаў з'яўляецца ... . Квазідзяржава — гэта ... .

Геаканфлікталогія — новы напрамак у сацыяльна-эканамічнай геаграфіі. Асноўная роля ў вырашэнні міжнародных канфліктаў належыць ААН.



Праверым свае веды. 1. Якія асноўныя прычыны і віды канфліктаў у свеце? 2. Што такое сепаратызм? 3. Чым адрозніваецца рэгіянальны канфлікт ад лакальнага? 4. Прывядзіце прыклады канфліктаў у Еўропе і Азіі. 5. Якія асноўныя прычыны ўзброеных канфліктаў? Якая іх геаграфія?



Ад простага да складанага. 1. Пра якія ўзброеныя канфлікты вы чулі з інфармацыйных крыніц на працягу апошняга месяца? 2. Выкарыстоўваючы матэрыялы сайта Стакгольмскага міжнароднага інстытута даследавання праблем свету, зрабіце кароткае паведамленне аб прычынах і асаблівасцях узброеных канфліктаў у Азіі.



Падарожжа па Глабальнай сетцы.

Сайт Стакгольмскага міжнароднага інстытута даследавання праблем свету.





Правообладатель Адукацыя і выхаванне



§ 4. Палітычная геаграфія

Успамінаем. Якую інфармацыю вы можаце атрымаць з палітычнай карты свету? Якія асноўныя рысы незалежных дзяржаў? Якія формы кіравання і дзяржаўнага ладу вы можаце назваць для сучасных краін свету?

Для чаго мы гэта вывучаем? Веды якіх вучэбных прадметаў вам сёння будуць неабходныя пры вывучэнні гэтай тэмы? Сферай дзейнасці якіх спецыялістаў з'яўляецца палітычная геаграфія?

Аб'екты і асноўныя напрамкі палітычнай геаграфіі. Палітычная геаграфія з'яўляецца адным з важных напрамкаў сацыяльна-эканамічнай геаграфіі і знаходзіцца на стыку навук. Таму шэраг навукоўцаў адводзіць ёй самастойную ролю ў геаграфіі.

Узнікшы ў канцы XVIII ст. як прыродазнаўчая навука, палітычная геаграфія вывучала дзяленне свету на дзяржавы, іх тэрыторыю, узаемнае размяшчэнне, межы і тлумачыла палітычныя працэсы характарам прыродных умоў і ландшафтаў.

Клуб знаўцаў-эканомікагеографаў. Вядомы французскі асветнік Шарль Луі Мантэск'ё лічыў форму дзяржаўнага кіравання і ладу функцыяй клімату і памераў краіны. Шырокія імперыі схільныя да дэспатычнага кіравання, таму што для стабільнасці ў вялікай па тэрыторыі дзяржаве неабходна, каб аддаленасць месца, куды рассылаюцца загады, ураўнаважвалася хуткасцю іх выканання. Маленькія дзяржавы па сваёй прыродзе павінны быць рэспублікамі, шырокія імперыі — падпарадкоўвацца манарху. Такім чынам, аптымальнай будзе форма дзяржаўнага ладу, якая спалучае перавагі і вартасці рэспубліканскага кіравання з сілай манархіі. Такой формай кіравання Мантэск'ё лічыў федэрацыю — прасторава адзіны саюз суверэнных рэспублік, здольны супраціўляцца ворагу і захоўваць свае памеры без страты дэмакратыі.

Ці мае рацыю Мантэск'ё? Аргументуйце свае меркаванні «за» і «супраць».

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Дзякуючы працам нямецкага географа Ф. Ратцэля (мал. 22), у канцы XIX ст. асаблівасці палітычнага ладу, унутранай і знешняй палітыкі розных дзяржаў пачынаюць вывучаць з улікам геаграфічнага становішча, геаграфічных умоў і культурна-гістарычных асаблівасцей.


Пазней, калі сталі браць пад увагу прасторавыя і рэгіянальныя асаблівасці развіцця свету, уяўленні аб прадмеце палітычнай геаграфіі значна пашырыліся.



Мал. 22. Ф. Ратцэль, нямецкі географ, аўтар працы «Палітычная геаграфія» (1897)

Палітычная геаграфія — асобная геаграфічная навука, якая вывучае прасторавую арганізацыю палітычнага жыцця грамадства і тэрытарыяльныя спалучэнні палітычных сіл.

З развіццём навукі пашырыўся пералік аб'ектаў палітычнай геаграфіі (мал. 23).



Мал. 23. Аб'екты палітычнай геаграфіі

Асноўнай задачай палітычнай геаграфіі з'яўляецца характарыстыка агульнай прасторавай карціны палітычнага жыцця краіны і сукупнасці фактараў, якія яе абумоўліваюць.

Вялікая колькасць аб'ектаў паслужыла фарміраванню некалькіх самастойных навуковых напрамкаў. Кожны з іх дынамічна развіваецца ў цяперашні час (мал. 24).



Мал. 24. Асноўныя напрамкі палітычнай геаграфіі

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Палітыка-геаграфічнае становішча краіны. Вывучэнне геаграфічнага становішча мае важнае значэнне і шырока прымяняецца ў геаграфіі. Вылучаюць фізіка-геаграфічнае становішча, эканоміка-геаграфічнае становішча, транспартна-геаграфічнае становішча. У палітычнай геаграфіі на першым месцы знаходзіцца палітыка-геаграфічнае становішча (ПГС).

Эканоміка-геаграфічнае становішча і палітыка-геаграфічнае становішча маюць шмат агульнага. Гэта тлумачыцца тым, што геаграфічнае становішча краіны ў адносінах да транспартных шляхоў, патокаў сыравіны, тавараў і паслуг, інтэграцыйных аб'яднанняў і г. д. будзе аказваць уплыў не толькі на эканамічную, але і на палітычную сітуацыю ў краіне і наадварот.

Палітыка-геаграфічнае становішча — гэта становішча аб'екта (краіны, яе часткі, групы краін) у адносінах да іншых дзяржаў і іх груп як палітычных аб'ектаў.

ПГС дзяржавы ў шырокім сэнсе — гэта комплекс палітычных умоў, звязаных з геаграфічным становішчам краіны (рэгіёна), які выяўляецца ў сістэме палітычных узаемаадносін з навакольным светам.

У цэлым пра ПГС можна казаць як пра комплекс адносін дадзенай дзяржавы з іншымі краінамі і тэрыторыямі на трох узроўнях — лакальным, макрарэгіянальным і глабальным, дапоўненых эканамічнымі, гістарычнымі, этнічнымі, канфесійнымі, культурнымі сувязямі.

Свет і Беларусь. Якая форма кіравання і дзяржаўнага ладу характэрная для Рэспублікі Беларусь? Назавіце асноўныя рысы палітыка-геаграфічнага становішча Рэспублікі Беларусь. Як змянілася геапалітычнае становішча Рэспублікі Беларусь пасля распаду СССР?

Дзяржаўныя межы і формы іх змены. Дзяржаўныя межы — гэта асаблівы тып геаграфічных меж, які вывучае палітычная геаграфія. *Дзяржаўная мяжа* ўяўляе з сябе лінію на паверхні зямлі (сушы або воднай прасторы) і ўяўную вертыкальную паверхню з паветранай прасторай і нетрамі, якія вызначаюць рубяжы тэрыторыі краіны і аддзяляюць яе ад іншых дзяржаў і адкрытых мораў.

У палітычнай геаграфіі вылучаюць некалькі відаў меж (мал. 25).


У гісторыі развіцця чалавецтва дзяржаўныя межы змяняюцца. Гэта можа адбывацца ў наступных мірных формах (мал. 26).

Папрацуем з атласам. Прывядзіце прыклады змен дзяржаўных меж на палітычнай карце свету з 1990 г. і да цяперашняга часу.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Прыкметы вылучэння меж	Прыродныя	араграфічныя (горныя, раўнінныя)	напр., Пірэнеі (франка-іспанская мяжа)
		водныя (рачныя, марскія, азёрныя)	напр., р. Меконг (мяжа Лаоса і Тайланда), Вялікія азёры (ЗША і Канада)
		геаметрычныя	напр., Алжыр і Лівія
	Марфалагічныя	астранамічныя	ЗША і Канада — па 49° пн. ш. Егіпет і Судан — па 22° пн. ш.
	Гісторыя і паслядоўнасць узнікнення	каланіяльныя	напр., межы ў рубяжах Французскай Заходняй Афрыкі
		посткаланіяльныя, пасляваенныя, постсацыялістычныя і інш.	напр., мяжа Польшчы пасля Другой сусветнай вайны
		«сталыя» этнакультурныя	напр., паміж Нарвегіяй і Швецыяй
		бар'ерныя (раздзяляльныя)	аддзяляе адну краіну ад іншай з дапамогай мяжы
	Функцыі	кантактныя (злучальныя)	служыць збліжэнню краін, спрыяе трансгранічнаму супрацоўніцтву, развіццю эканамічных і культурных сувязей

Мал. 25. Асноўныя віды дзяржаўных меж



Мал. 26. Формы змены дзяржаўных меж

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Напрыклад, у выніку продажу Аляскі змяніліся дзяржаўныя межы Паўночна-Амерыканскіх Злучаных Штатаў і Расійскай імперыі ў 1867 г. У 1944 г. Тувінская Народная Рэспубліка добраахвотна ўвайшла ў склад СССР. У выніку штучнага прырашчэння сухапутнай тэрыторыі павялічылася плошча Нідэрландаў і змяніліся межы гэтых дзяржаў. Выхад Вялікага Княства Фінляндскага са складу СССР у 1917 г. і Сінгапура са складу Малайзіі ў 1965 г. змяніў іх дзяржаўныя межы. Пасля аб'яднання Федэратыўнай Рэспублікі Германіі (ФРГ) і Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі (ГДР) у 1990 г. змянілася дзяржаўная мяжа ФРГ (мал. 27). Прыкладам змены дзяржаўнай мяжы ў выніку міжнароднага рашэння з'яўляецца змена меж Індыі і Пакістана ў выніку падзелу штата Кашмір у 1949 г.



Мал. 27. Дзяржаўная мяжа ФРГ пасля аб'яднання

Паразважаем. Чым могуць быць выкліканы тэрытарыяльныя спрэчкі паміж дзяржавамі?

Памежныя спрэчкі. Адным з найбольш актуальных пытанняў палітычнай геаграфіі з'яўляецца вывучэнне тэрытарыяльных прэтэнзій, памежных спрэчак паміж дзяржавамі. Сярод іх вылучаюцца чатыры асноўныя віды (мал. 28). Найбольш часта ў свеце адбываюцца *тэрытарыяльныя спрэчкі* з-за кантролю над пэўнай прыцягальнай тэрыторыяй па нейкай прыкмеце.



Мал. 28. Віды памежных спрэчак

Напрыклад, па тапаграфічнай прыкмеце да тэрытарыяльнай спрэчкі адносяць тэрыторыі Літвы і Калінінградскай вобласці Расіі. Гісторыка-культурнай тэрытарыяльнай спрэчкай з'яўляюцца прэтэнзіі Ірландыі на Паўночную Ірландыю.

Рэсурсныя памежныя спрэчкі складаюць значную частку канфліктаў пры засваенні прыродных рэсурсаў на кантынентальным шэльфе (нафта, газ), пры сумесным выкарыстанні водных рэсурсаў у засушлівых раёнах (напр., Малі і Буркіна-Фасо, Турцыя і Сірыя). Для таго каб пазбегнуць такіх спрэчак, прымаюцца рашэнні аб сумесным выкарыстанні рэсурсаў (напр., гідраэнергапатэнцыялу р. Парана паміж Бразіліяй і Парагваем) або вылучаюцца сектары з выразнымі межамі дзяржаў (напр., раздзел нафтагазавых рэсурсаў Паўночнага мора паміж прыбярэжнымі дзяржавамі).

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Клуб знаўцаў-эканомікагеографаў. Адрозніваюць пазіцыйныя і функцыянальныя памежныя спрэчкі. *Пазіцыйныя памежныя спрэчкі* ўзнікаюць у выпадку супярэчнасцей у тлумачэнні дамоваў аб правядзенні меж па прыродных рубяжах — рэках (усходні ўчастак расійска-кітайскай мяжы на Амуры), азёрах (возера Чад паміж Нігерам і Чадам). *Функцыянальныя памежныя спрэчкі* сустракаюцца радзей і ўзнікаюць з прычыны прэтэнзій аднаго з бакоў да рэжыму функцыянавання мяжы, строгасцей памежнага кантролю і мытнай палітыкі, якая ўсталявана суседняй дзяржавай. У дадзенай сітуацыі спрэчка вядзецца не пра змену мяжы, а пра памежную палітыку суседняй дзяржавы.



Папрацуем з атласам. Выкарыстоўваючы матэрыялы вучэбнага дапаможніка і палітычную карту свету, знайдзіце дзяржавы, дзе існуюць памежныя канфлікты і тэрытарыяльныя спрэчкі.

Прыкладная роля палітычнай геаграфіі. Веды палітычнай геаграфіі маюць вельмі шырокі ахоп і выкарыстоўваюцца ў розных галінах. Да асноўных з іх варта аднесці змены адміністрацыйна-тэрытарыяльнага ўладкавання краіны, асаблівасці знешняй палітыкі, прычыны этнічных канфліктаў, геаграфію выбараў і г. д. Запатрабаванасць палітычнай геаграфіі шмат у чым залежыць ад геаграфічнай адукацыі і геаграфічнай культуры грамадства.



Падвядзём вынікі. Палітычная геаграфія — геаграфічная навука, якая вывучае ... .

Палітыка-геаграфічнае становішча краіны характарызуецца наступнымі асаблівасцямі ... . Дзяржаўныя межы (марскія і сухапутныя) аддзяляюць ... .

У адпаведнасці з міжнароднымі правіламі межы праводзяцца ў морах, залівах, пралівах, па рэках.

Асноўная частка дзяржаўных меж праходзіць па ... . Прычынамі памежных спрэчак часцей за ўсё бываюць спрэчная тэрыторыя і асваенне рэсурсаў.



Праверым свае веды. 1. Якія асноўныя напрамкі палітычнай геаграфіі? 2. Якія існуюць віды дзяржаўных меж? 3. Прывядзіце гістарычныя прыклады змены дзяржаўных меж. 4. Чым выкліканы памежныя спрэчкі паміж краінамі? Прывядзіце прыклады.



Ад простага да складанага. 1. Якую ролю адыгралі натуральныя межы (горы, рэкі, азёры) у фарміраванні палітычнай карты Еўропы (Азіі, Афрыкі, Амерыкі)? 2. Назавіце як мага больш памежных фізіка-геаграфічных аб'ектаў.



Ад тэорыі да практыкі. 1. Назавіце краіны, межы якіх праходзяць: па гарах, морах, пустынях, рэках. 2. Вызначыце пяць краін з максімальнай плошчай сухапутнай тэрыторыі і пяць найбуйнейшых краін па колькасці насельніцтва. 3. Параўнайце спіс гэтых дзвюх груп краін. Зрабіце вывады.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

§ 5. Геапалітыка, месца ў сістэме геаграфічных навук

Успамінаем. Што такое палітычная геаграфія? Што з'яўляецца аб'ектам вывучэння палітычнай геаграфіі? Якія асноўныя рысы палітыка-геаграфічнага становішча Рэспублікі Беларусь?

Для чаго мы гэта вывучаем? Для чаго сучаснай дзяржаве неабходна выпрацоўваць геастратэгіі? Якія пытанні складаюць сферу інтарэсаў палітычнай геаграфіі і геапалітыкі? Якімі ведамі павінен валодаць сучасны спецыяліст у галіне геапалітыкі?

Геапалітыка, месца ў сістэме навук. Адным з асноўных напрамкаў палітычнай геаграфіі з'яўляецца геапалітыка. З'явілася яна ў выніку аналізу міжнародных адносін з выкарыстаннем геаграфічных ведаў на рубяжы XIX–XX стст.

У свеце ўсё ўзаемазвязана. Заснавальнікам геапалітыкі лічыцца Арыстоцель, які паказваў на геапалітычную ролю астравоў і пісаў, што в. Крыт па сваім становішчы прызначаны для пануючага ўплыву на Грэцыю. Ці згодны вы са сцвярджэннем Арыстоцеля? Прывядзіце аргументы «за» і «супраць» гэтага выказвання.



Мал. 29. Р. Чэлен, аўтар тэрміна «геапалітыка»

Адно з першых азначэнняў, дадзеных у перакладзе з грэчаскай мовы, характарызавала геапалітыку як навуку аб геаграфічнай абумоўленасці розных палітычных працэсаў.

Шведскі географ Р. Чэлен (1864–1922) быў першым, хто ўвёў паняцце «геапалітыка» (мал. 29).


Геапалітыка — раздзел палітычнай геаграфіі, які вывучае геаграфічныя адносіны паміж цэнтрамі палітычнай сілы ў свеце і залежнасць знешняй і ўнутранай палітыкі дзяржаў і міжнародных адносін ад сістэмы палітычных, ваенна-стратэгічных, эканамічных, экалагічных фактараў і палітыка-геаграфічнага становішча краіны.

Аб'ектам геапалітыкі як навукі з'яўляюцца планетарная прастора з дзяржавамі, іх межамі і рэсурсамі, а таксама геапалітычныя працэсы і з'явы ў сусветнай супольнасці і ў часе. Прадметам геапалітыкі выступаюць узаемаадносіны паміж геапалітычнымі суб'ектамі (мал. 30) пры вырашэнні сусветных і рэгіянальных праблем.



Мал. 30. Асноўныя суб'екты геапалітыкі

Правообладатель Адукацыя і выхаванне




Мал. 31. Асноўныя паняцці геапалітыкі

Асноўнымі паняццямі ў геапалітыцы выступаюць: прастора, баланс сіл, інтарэс і экспансія. Кожнае паняцце дазваляе ацаніць дзяржаву па розных прыкметах (мал. 31).

Прастора ў геапалітыцы. Асноўным у геапалітыцы з'яўляецца паняцце «прастора». Упершыню яно з'явілася ў працах нямецкага вучонага Ф. Ратцэля ў канцы XIX ст. і нясе больш шырокі сэнс, чым тэрыторыя.

У геапалітыцы галоўнае значэнне мае *кантроль над прасторай*.

Прастору, якая кантралюецца дзяржавай або аб'яднаннем дзяржаў, называюць геапалітычным полем.



Мал. 32. Асноўныя віды геапалітычных палёў

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Вылучаюць чатыры асноўныя віды геапалітычных палёў (мал. 32). Напрыклад, эндэмічным полем для Францыі з'яўляюцца арэалы рассялення старажытных плямёнаў продкаў сучасных французаў — галаў. Прыкладам пагранічнага поля выступаюць аддаленыя раёны Расіі — Усходняя Сібір і Далёкі Усход. Тэрыторыя былога СССР з'яўляецца перакрыжаваным полем для Садружнасці незалежных дзяржаў, народы якіх пражывалі ў некалькіх рэспубліках (напр., рускія ў БССР, рускія ў Казахстане, беларусы ў Расіі). Прыкладам метапалёў могуць лічыцца Еўропа (якая асвойваецца ЕС і НАТА) і Паўднёва-Усходняя Азія.

Папрацуем з атласам. Выкарыстоўваючы карты атласа і матэрыялы вучэбнага дапаможніка, назавіце пяць дзяржаў свету з найбольш «моцнай» пазіцыяй у свеце з улікам актуальных геапалітычных крытэрыяў.

Геапалітычныя фактары развіцця краіны. З цягам гістарычных падзей змяняецца месца краіны ў геапалітычнай прасторы свету. Аднак яно будзе вызначацца шэрагам пастаянна дзеючых фактараў (мал. 33).



Мал. 33. Геапалітычныя фактары развіцця краіны

Эканамічна развітыя краіны і шэраг краін, якія развіваюцца, імкнуцца ў цяперашні час заняць больш моцную пазіцыю ў свеце. Таму яны надаюць увагу найбольш актуальным геапалітычным крытэрыям: долі ў сусветным валавым прадукце, кантролю над стратэгічнымі сегментамі сусветнага рынку, канвертавальнасці валюты, валоданню ракетна-ядзернай зброяй, удзелу ў асваенні космасу, інавацыйнаму патэнцыялу эканомікі.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Галоўныя геапалітычныя працэсы ў свеце ў канцы XX – пачатку XXI ст.	
	1. Распад у 1990-я гг. сацыялістычнай сістэмы гаспадарання і звязаныя з гэтым узброеныя канфлікты і геапалітычныя змены ў Еўропе і на постсавецкай прасторы (краіны Балтыі, Украіна, Малдова, Паўднёвы Каўказ, Цэнтральная Азія)
	2. Завяршэнне фарміравання Еўрасаюза, які адыгрывае ўсё больш сур'ёзную геапалітычную і эканамічную ролю ў свеце
	3. Пашырэнне зоны ваеннага блока НАТА за кошт краін Балтыі, Усходняй Еўропы і Балкан, прамы ўдзел узброеных кантынгентаў краін — удзельніц НАТА ў ваенных аперацыях за межамі блока (Балканы, Афганістан, Ірак, Паўночная Афрыка) у 1990–2000 гг.
	4. Эканамічны і ваенна-палітычны прарыў Кітая ў сферу глабальнай эканомікі і геапалітыкі
	5. Узброеныя канфлікты і ваенна-палітычныя крызісы на Блізкім Усходзе і ў Паўночнай Афрыцы
	6. Павышэнне ваенна-палітычнай напружанасці вакол Афганістана і Ірана, якая стварае перадумовы для ўзнікнення небяспечных ачагоў нестабільнасці свету
	7. Рост сепаратызму, марское пірацтва і нарошчванне маштабаў тэрарызму (Нью-Ёрк, Вашынгтон, Лондан, Мадрыд і інш.)

Мал. 34. Галоўныя геапалітычныя працэсы ў свеце ў канцы XX – пачатку XXI ст.

Галоўныя геапалітычныя працэсы ў свеце ў канцы XX – пачатку XXI ст. Геапалітычныя працэсы ўяўляюць з сябе гістарычныя працэсы фарміравання, развіцця, узаемадзеяння і распаду суб'ектаў геапалітыкі. Яны складаюць свайго роду аснову сусветнай гісторыі.

З канца XX ст. па першае дзесяцігоддзе XXI ст. адбыліся падзеі, якія аказалі ўплыў на глабальную геапалітычную карціну, змянілі баланс сіл, які склаўся ў свеце, і спрыяюць узнікненню новых выклікаў і пагроз. Да іх ліку адносяць сем асноўных падзей (мал. 34).

У сучасным свеце можна вылучыць сем асноўных геапалітычных цэнтраў сілы: ЗША, Расія, Еўрапейскі саюз, Кітай, мусульманскі свет, Японія, Індыя. Гэта глабальныя і рэгіянальныя геапалітычныя гульцы, уплыў якіх у сучасным свеце найбольш прыкметны.

Электаральная геаграфія. Электаральная геаграфія з'яўляецца адным з найбольш традыцыйных напрамкаў палітычнай геаграфіі, якія актыўна развіваюцца.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Клуб знаўцаў-эканомікагеографаў. Гэты напрамак узнік у Францыі на пачатку XX ст. працай А. Зігфрыда «Палітычны агляд захаду Францыі ў часы Трэцяй рэспублікі». У ёй аўтар упершыню ўстанавіў заканамернасці паміж прыроднымі характарыстыкамі і вынікамі выбараў у заходняй частцы Францыі. Таму гістарычна электаральная геаграфія вывучала геаграфію выбараў і тэрытарыяльную расстаноўку палітычных сіл.


Электаральная геаграфія — напрамак палітычнай геаграфіі, які вывучае тэрытарыяльныя адрозненні ў палітычных перавагах выбаршчыкаў, выніках выбараў і ўплыў грамадскіх, эканамічных, рэлігійных, этнічных фактараў на іх вынікі.

Вывучэнне геаграфіі выбараў немагчыма без усебаковых ведаў сацыяльна-эканамічнай геаграфіі той тэрыторыі, на якой гэтыя выбары праходзяць, і палітычных працэсаў, якія прывялі да іх вынікаў. Таму для развіцця электаральнай геаграфіі патрэбна ведаць як сацыяльна-эканамічную і палітычную геаграфію, так і гісторыю, эканоміку і сацыялогію.

У электаральнай геаграфіі вылучаюць *тры асноўныя раздзелы*. Першы вывучае геаграфію галасавання, другі — геаграфію фактараў галасавання, трэці — геаграфію прадстаўніцтва партый у выбарных органах улады.

Геаграфія выбараў залежыць ад гісторыка-культурных асаблівасцей тэрыторыі (гісторыка-культурных расколаў паміж нацыямі, сацыяльнымі групамі і інш.). На яе таксама ўплываюць сацыяльна-эканамічныя адрозненні паміж тэрыторыямі ў межах краіны.

Каштоўны зыходны матэрыял электаральнай статыстыкі па выбарчых акругах з'яўляецца вельмі важным для палітычнай геаграфіі і надзвычай цікавым для ўсіх палітычных сіл у кантэксце свайго ўплыву ў краіне. Таму адным з важных вынікаў геаграфіі выбараў з'яўляецца іх картаграфаванне (мал. 35).



Мал. 35. Геаграфія вынікаў рэферэндуму аб незалежнасці Латвіі ў 1991 г.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Падвядзём вынікі. Геапалітыка з'яўляецца раздзелам палітычнай геаграфіі, які вывучае ... .

Асноўнымі суб'ектамі геапалітыкі выступаюць дзяржава, ..., ..., ... і інтэграцыйнае аб'яднанне.

Галоўнымі паняццямі ў геапалітыцы з'яўляюцца ..., ..., ... Геапалітычнымі фактарамі развіцця краіны з'яўляюцца ... . Галоўнымі геапалітычнымі працэсамі ў свеце з'яўляюцца ... .

Прастора, якая кантралюецца дзяржавай або аб'яднаннем дзяржаў, называецца ... .

Электаральная геаграфія займаецца вывучэннем пераваг выбаршчыкаў і вынікаў выбараў.

Праверым свае веды. 1. Хто ўвёў у навуковы ўжытак тэрмін «геапалітыка»? 2. Якімі даследаваннямі займаецца геапалітыка? 3. Якое значэнне электаральнай геаграфіі для сучасных палітычных працэсаў?

Ад простага да складанага. Ці з'яўляюцца, на ваш погляд, геаграфічныя ўмовы галоўнымі для вызначэння шляхоў далейшага развіцця дзяржавы?

П$_1$

Падарожжа па Глабальнай сетцы.
Сайт «Электаральная геаграфія».

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

РАЗДЗЕЛ

II

ГЕАГРАФІЯ НАСЕЛЬНІЦТВА СВЕТУ



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



§ 6. Дэмаграфічныя працэсы і іх геаграфія

Успамінаем. Што такое дэмаграфія? Якія асноўныя сучасныя дэмаграфічныя тэндэнцыі рэгіёнаў свету? У чым сутнасць дэмаграфічных праблем?

Для чаго мы гэта вывучаем? Чаму сёння неабходна ведаць асноўныя дэмаграфічныя тэндэнцыі? Якія праблемы цягне за сабой рост колькасці насельніцтва? Падумайце, галіной дзейнасці якіх спецыялістаў з'яўляецца вывучэнне дэмаграфічных працэсаў. У якіх установах адукацыі і на якіх спецыяльнасцях магчыма атрымаць адукацыю, звязаную з вывучэннем дэмаграфічных працэсаў?

Дэмаграфічная сітуацыя. Геаграфія насельніцтва з'яўляецца асноўным напрамкам сацыяльна-эканамічнай геаграфіі. З аднаго боку, насельніцтва канкрэтнай тэрыторыі аказвае ўплыў на сацыяльна-эканамічнае развіццё, з другога — прыродныя ўмовы, рэсурсы, сацыяльна-эканамічны ўзровень развіцця, палітычная сітуацыя могуць вызначаць характар дэмаграфічных працэсаў і іншыя прыкметы насельніцтва.


Паразважаем. Як могуць паўплываць на дэмаграфічныя характарыстыкі насельніцтва палітычныя канфлікты ў краіне?

У свеце ўсё ўзаемазвязана. 1. Як па дэмаграфічных паказчыках вызначыць узровень сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны? 2. Уявіце сабе, вы — адзін з кіраўнікоў рэгіёна. Прывядзіце прыклады, якія пацвярджаюць неабходнасць ведаў аб асноўных дэмаграфічных тэндэнцыях у вашым рэгіёне.

Геаграфія насельніцтва мае больш цесныя сувязі з дэмаграфіяй. З яе яна запазычвае паказчыкі і вывучае рэгіянальныя адрозненні працэсаў. Вывучэнне дэмаграфічных працэсаў — адна з асноўных задач пры характарыстыцы насельніцтва краіны. Да *дэмаграфічных працэсаў* адносяць нараджальнасць, смяротнасць, натуральны рух насельніцтва, дынаміку колькасці, узнаўленне насельніцтва.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Клуб знаўцаў-эканомікагеографаў. Некаторыя дэмографы адносяць да дэмаграфічных працэсаў колькасць шлюбаў і разводаў насельніцтва. У сучасным свеце назіраецца скарачэнне колькасці шлюбаў і рост колькасці разводаў (мал. 36). Напрыклад, краінамі, дзе больш за ўсё разводзяцца сямейныя пары, з'яўляюцца Расія і Беларусь, а больш за ўсё заключаюць шлюбаў, — Таджыкістан і Егіпет.



Мал. 36. Дынаміка шлюбаў і разводаў у свеце, ‰

Для таго каб атрымаць комплексную характарыстыку дэмаграфічных працэсаў, якія адбываюцца на канкрэтнай тэрыторыі, мы павінны прааналізаваць яе дэмаграфічную сітуацыю.

Дэмаграфічная сітуацыя — гэта стан дэмаграфічных працэсаў і полаўзроставай структуры насельніцтва ў дынаміцы, якія праходзяць на канкрэтнай тэрыторыі (краіна, рэгіён, пасяленне) у вызначаны час. Дэмаграфічную сітуацыю ў любым рэгіёне вызначаюць два асноўныя працэсы — нараджальнасць і смяротнасць насельніцтва.

У свеце ўсё ўзаемазвязана. Выкарыстоўваючы раней атрыманыя веды, растлумачце, якія фактары ўплываюць на рост колькасці насельніцтва ў краінах Афрыкі і Азіі. Чаму ў Еўропе колькасць насельніцтва скарачаецца?

Геаграфія нараджальнасці і смяротнасці насельніцтва свету. Нараджальнасць уплывае на рост насельніцтва і змяняе яго ўзроставую структуру. У сваю чаргу на нараджальнасць аказваюць уплыў многія фактары (мал. 37). Галоўным з'яўляецца здароўе жанчыны і мужчыны.

Фактары нараджальнасці насельніцтва	Фактары смяротнасці насельніцтва
• здароўе жанчыны і мужчыны • узровень сацыяльна-эканамічнага развіцця • дэмаграфічны • палітычны • сацыяльна-культурны • экалагічны • тып рассялення і інш.	• прыродна-кліматычны • генетычны • дэмаграфічны • сацыяльна-эканамічны (узровень дабрабыту, род заняткаў і інш.) • культурны • палітычны • экалагічны і інш.

Мал. 37. Асноўныя фактары, якія ўплываюць на нараджальнасць і смяротнасць насельніцтва

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Клуб знаўцаў-эканомікагеографаў. Яшчэ ў Старажытным Рыме было заўважана, што ў забяспечаных сем'ях нараджальнасць ніжэйшая, чым у бедных. Яна можа змяняцца таксама пад уплывам таго, якое значэнне дзіцяці ў сям'і; становішча жанчыны ў грамадстве, яе адукацыі і даходаў; дэмаграфічных традыцый; тыпу рассялення; рэлігіі; палітычнага становішча; дэмаграфічнай палітыкі і інш.


Для вывучэння нараджальнасці, параўнання і ўстанаўлення адрозненняў паміж краінамі выкарыстоўваюць агульны каэфіцыент нараджальнасці (АКН). Ён разлічваецца як адносіны абсалютнай колькасці нараджэнняў за год да сярэднегадавой колькасці насельніцтва ў разліку на 1000 чалавек, вымяраецца ў праміле (‰).

У свеце цікавага. Цікавыя факты аб хуткасці нараджэнняў насельніцтва ў свеце. Па даных Бюро перапісаў ЗША, штогод у свеце абсалютная колькасць нараджэнняў складае: у год — 133 940 516 чал., у месяц — 10 995 043 чал., у дзень — 361 481 чал., у гадзіну — 15 062 чал., у мінуту — 251 чал., у секунду — 4,2 чал.

Агульны каэфіцыент нараджальнасці насельніцтва свету па даных за 2019 г. склаў 19 ‰.

Геаграфія нараджальнасці насельніцтва ў свеце разнастайная і характарызуецца адрозненнямі паміж рэгіёнамі і групамі краін па ўзроўні сацыяльна-эканамічнага развіцця. У развітых краінах нараджальнасць ніжэйшая за сусветны ўзровень і складае 11 ‰. Гэта тлумачыцца перш за ўсё больш высокім узроўнем сацыяльна-эканамічнага развіцця, становішчам жанчыны ў грамадстве — больш высокім узроўнем яе адукацыі, даходаў і інш. У краінах, якія развіваюцца, нараджальнасць насельніцтва перавышае сусветнае значэнне. У гэтай групе краін на кожную 1000 жыхароў нараджаецца 21 чалавек (мал. 38).

Максімальныя значэнні нараджальнасці характэрныя для краін, якія развіваюцца (пераважна Афрыкі), мінімальныя — для развітых з перавагай краін Еўропы. У 2019 г.



Мал. 38. Дынаміка нараджальнасці насельніцтва свету, ‰

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

максімум нараджальнасці насельніцтва свету знаходзіўся ў **Нігеры** — 48 ‰, мінімум — у **Рэспубліцы Карэя**, **Манака** — 6 ‰.

Свет і Беларусь. Нараджальнасць насельніцтва Беларусі складае 9,9 ‰, што супастаўляльна з сярэднім паказчыкам па Еўропе — 10 ‰. Вялікіх адрозненняў паміж гарадскімі і сельскімі жыхарамі няма. Пачынаючы з 2003 г. нараджальнасць у краіне павялічваецца. Аднак у 2017 г. за-за скарачэння колькасці насельніцтва рэпрадуктыўнага ўзросту нараджальнасць некалькі скарацілася. Смяротнасць насельніцтва ў нашай краіне блізкая да паказчыкаў, напрыклад, Францыі, Вялікабрытаніі, Швецыі.

$П_2$

Папрацуем з атласам. Выкарыстоўваючы карты атласа і матэрыялы вучэбнага дапаможніка, прывядзіце прыклады, якія пацвярджаюць залежнасць працэсаў нараджальнасці і смяротнасці ад палітычнага становішча ў дзяржаве.

Смяротнасць насельніцтва з'яўляецца другім найважнейшым дэмаграфічным працэсам, які залежыць ад вялікай колькасці фактараў. Да ліку асноўных адносяцца: прыродна-кліматычны, генетычны, дэмаграфічны, сацыяльна-эканамічны (узровень дабрабыту, род заняткаў, жыллёвыя ўмовы, санітарыя, доступ да чыстай вады і інш.), культурны, палітычны, экалагічны, характар рассялення і інш. У другой палове XX ст. прычынай павелічэння смяротнасці стаў СНІД, які ўяўляе з сябе сур'ёзную пагрозу для развіцця.


Для вывучэння смяротнасці насельніцтва асноўным паказчыкам выступае агульны каэфіцыент смяротнасці (АКС — адносіны абсалютнай колькасці памерлых за год да сярэднегадавой колькасці насельніцтва ў разліку на 1000 чалавек, вымяраецца ў праміле (‰)).

У свеце цікавага. Па даных Бюро перапісаў ЗША, штогод у свеце абсалютная колькасць смярцей складае: у год — 56 545 138 чал., у месяц — 4 712 095 чал., у дзень — 154 918 чал., у гадзіну — 6455 чал., у мінуту — 108 чал., у секунду — 1,8 чал.

Геаграфія смяротнасці насельніцтва ў свеце ў параўнанні з нараджальнасцю не мае значных рэгіянальных адрозненняў. Гэта тлумачыцца тым, што поспехі аховы здароўя сталі насіць глабальны характар, у выніку чаго з'явілася магчымасць іх распаўсюджвання на ўсе краіны.

Для дынамікі смяротнасці насельніцтва, як і для нараджальнасці, характэрна яе зніжэнне з другой паловы XX ст. Гэта абумоўлена паляпшэннем санітарных умоў (ліквідацыя прычын распаўсюджвання хвароб; кантроль за якасцю ежы, вады, паветра і інш.), развіццём аховы здароўя (адкрыццё пеніцыліну, антыбіётыкаў), паляпшэннем умоў жыцця.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Мал. 39. Дынаміка смяротнасці насельніцтва свету, ‰

Агульны каэфіцыент смяротнасці насельніцтва свету па даных за 2019 г. склаў 7 ‰. Пры гэтым у развітых краінах смяротнасць вышэйшая (10 ‰), чым у краінах, якія развіваюцца (7 ‰) (мал. 39). Гэта тлумачыцца павелічэннем колькасці насельніцтва ў старэйшых узростах — дэмаграфічным старэннем.

П$_3$

Максімальныя значэнні смяротнасці насельніцтва характэрныя як для краін, якія развіваюцца (з перавагай краін Афрыкі), так і для краін Еўропы. Мінімальныя — для дзяржаў Паўднёва-Заходняй Азіі, якія развіваюцца. У 2019 г. максімум смяротнасці быў у **Балгарыі**, **Латвіі**, **Сербіі**, **Лесота** — 15 ‰, мінімум — у **Катары** і **Аб'яднаных Арабскіх Эміратах (ААЭ)** — 1 ‰.

П$_4$

У свеце ўсё ўзаемазвязана. Выкарыстаўшы матэрыялы вучэбнага дапаможніка 8-га класа і ўспомніўшы спецыялізацыю краін у міжнародным падзеле працы, растлумачце, якія фактары могуць аказваць уплыў на нізкую смяротнасць насельніцтва ў краінах Паўднёва-Заходняй Азіі.

П$_5$

Свет і Беларусь. Смяротнасць насельніцтва Беларусі складае 12,7 ‰, што вышэй, чым у сярэднім у Еўропе. З 1980-х гг. з-за старэння ўзроставага складу насельніцтва і іншых фактараў смяротнасць у краіне ўзрастала аж да 2010 г., пасля чаго пачала зніжацца. Смяротнасць у нашай краіне блізкая да паказчыкаў, напрыклад, Расіі, Літвы і Румыніі.

П$_6$

Натуральны рух і ўзнаўленне насельніцтва ў свеце і рэгіёнах. Нараджальнасць і смяротнасць з'яўляюцца асноватворнымі працэсамі натуральнага руху насельніцтва.


Пад натуральным рухам насельніцтва разумеюць сукупнасць нараджэнняў і смярцей, якія змяняюць колькасць насельніцтва натуральным шляхам.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Натуральны рух насельніцтва вывучаецца з дапамогай асноўнага паказчыка — натуральнага прыросту ці змяншэння.

Натуральны прырост — гэта абсалютная велічыня рознасці паміж колькасцю тых, хто нарадзіўся, і памерлых за пэўны прамежак часу. Адмоўнае значэнне гэтага паказчыка называецца натуральнай стратай. Гэтыя два паказчыкі можна разлічыць або ў абсалютным выразе, або ў адносным — у разліку на 1000 чалавек, у праміле.

Натуральны рух насельніцтва ў свеце характарызуецца прыростам, які ў 2019 г. склаў 12 ‰. У той жа час яго дынаміка за 1950–2015 гг. характарызуецца скарачэннем. Паміж развітымі краінамі і краінамі, што развіваюцца, існуюць вялікія адрозненні — 1 і 14 ‰ адпаведна (мал. 40).



Мал. 40. Дынаміка натуральнага руху насельніцтва свету, ‰

Афрыка з'яўляецца рэгіёнам, дзе назіраецца самы высокі натуральны прырост — 26 ‰. У Азіі з-за вялікіх адрозненняў паміж краінамі ва ўзроўні эканамічнага развіцця натуральны прырост складае 10 ‰. Паміж краінамі Паўночнай і Паўднёвай Амерыкі адрозненні вялікія — 2 і 11 ‰ адпаведна. Еўропа ўяўляе з сябе рэгіён, дзе нараджальнасць і смяротнасць насельніцтва ў сапраўдны момант маюць аднолькавыя значэнні, аднак смяротнасць не намнога перавышае нараджальнасць. Тут назіраецца натуральнае змяншэнне — 1 ‰.

Максімальныя значэнні натуральнага прыросту насельніцтва ў свеце характэрныя для **Нігера** — 38 ‰. Натуральнае змяншэнне насельніцтва ў разрэзе краін назіраецца ў Еўропе. Гэта ў асноўным былыя сацыялістычныя краіны. Максімальнае натуральнае змяншэнне характэрнае для **Балгарыі** — 7 ‰.

Свет і Беларусь. У Рэспубліцы Беларусь з 1993 г. адбывалася натуральнае змяншэнне насельніцтва. З 2005 г. яно скарачаецца і ў цяперашні час складае 2,8 ‰. У той жа час для гарадскіх жыхароў уласцівы натуральны прырост, а для сельскіх — змяншэнне.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Дэмаграфічныя працэсы з'яўляюцца асновай узнаўлення насельніцтва і ўплываюць на яго характар.

Пад узнаўленнем насельніцтва разумеецца бесперапыннае аднаўленне і змена людскіх пакаленняў, якія забяспечваюцца працэсамі нараджальнасці, смяротнасці і натуральнага прыросту.

У сучасным свеце атрымалі распаўсюджванне тры тыпы ўзнаўлення насельніцтва — пашыраны, просты і звужаны, асноўныя прыкметы якіх паказаны на малюнку 41.

Пашыраны тып	Просты тып	Звужаны тып
• Пакаленне дзяцей колькасна большае за пакаленне бацькоў • Нараджальнасць значна перавышае смяротнасць • Адбываецца натуральны прырост насельніцтва • Доля асоб 0–14 гадоў большая за долю асоб 65+ гадоў • Колькасць насельніцтва штогод павялічваецца	• Пакаленне дзяцей колькасна роўнае пакаленню бацькоў • Адбываецца простая замена пакаленняў • Нараджальнасць зніжаецца да такога ўзроўню, што ненамнога перавышае смяротнасць • Доля асоб 0–14 гадоў практычна роўная долі асоб 65+ гадоў або ненамнога яго перавышае • Колькасць насельніцтва штогод павялічваецца мінімальна ці не змяняецца	• Пакаленне дзяцей колькасна меншае за пакаленне бацькоў • Смяротнасць перавышае нараджальнасць • Адбываецца натуральнае змяншэнне насельніцтва • Ва ўзроставай структуры доля асоб 65+ гадоў перавышае долю 0–14 гадоў, адбываецца старэнне • Колькасць насельніцтва штогод скарачаецца

Мал. 41. Асноўныя характарыстыкі тыпаў узнаўлення насельніцтва

Для ўсіх дзяржаў Афрыкі, большасці краін Паўднёвай Амерыкі і Азіі характэрны пашыраны тып узнаўлення. Просты тып прадстаўлены ў асобных дзяржавах Еўропы (напр., Францыя, Ісландыя, Ірландыя, Швецыя), Паўночнай Амерыкі (ЗША, Канада), Азіі (Кітай), Аўстраліі.

У большасці краін Еўропы і Японіі сфарміраваўся звужаны тып.

Падвядзём вынікі. Геаграфія насельніцтва з'яўляецца адным з асноўных напрамкаў сацыяльна-эканамічнай геаграфіі. Да дэмаграфічных працэсаў адносяць ..., ..., ..., дынаміку колькасці і ўзнаўленне насельніцтва. У сучасным свеце нараджальнасць выступае асноўным фактарам, які ўплывае на ... . Еўропа з'яўляецца рэгіёнам свету з самай ... нараджальнасцю, Афрыка — з самай ... . Паміж рэгіёнамі свету значных адрозненняў у смяротнасці насельніцтва няма. Натуральны рух насельніцтва ў свеце характарызуецца ... . У сучасным свеце атрымалі распаўсюджванне тры тыпы ўзнаўлення насельніцтва: ..., ... і ... .

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Праверым свае веды. 1. Якія асноўныя тэндэнцыі сучасных дэмаграфічных працэсаў? 2. Ахарактарызуйце асноўныя дэмаграфічныя працэсы ў свеце. 3. Вызначыце асаблівасці іх геаграфіі. 4. Чым можна растлумачыць зніжэнне нараджальнасці насельніцтва ў свеце?

Ад простага да складанага. 1. Абгрунтуйце фразу «Перапіс насельніцтва — усенародная справа». 2. Чаму гэтаму працэсу надаецца такое важнае значэнне?

П7

Ад тэорыі да практыкі. 1. У большасці краін Еўропы, у тым ліку і Беларусі, нізкая нараджальнасць насельніцтва. Падумайце і прапануйце меры дэмаграфічнай палітыкі, якія могуць яе павялічыць у Беларусі. 2. Распрацуйце праекты па рашэнні дэмаграфічных праблем у краінах з пашыраным і звужаным тыпам узнаўлення насельніцтва.

Падарожжа па Глабальнай сетцы.

Афіцыйны сайт Нацыянальнага статыстычнага камітэта Рэспублікі Беларусь.

Афіцыйны сайт Фонду ААН у галіне народанасельніцтва.

§6-1

§ 7. Полаўзроставая структура насельніцтва свету

Успамінаем. Каго на Зямлі больш: жанчын або мужчын? Чаму? У каго больш высокая працягласць жыцця: у жанчын або мужчын? Якія адрозненні па краінах у структуры паводле полу вы можаце назваць?

Для чаго мы гэта вывучаем? Як уплывае полаўзроставая структура насельніцтва на эканоміку краіны? Якія праблемы цягне за сабой старэнне насельніцтва? Як па полаўзроставых пірамідах можна спрагназаваць колькасць эканамічна актыўнага насельніцтва ў будучыні? Якая асноўная задача, на ваш погляд, ускладзена на спецыялістаў у галіне дэмаграфіі?

Полаўзроставая структура насельніцтва свету, паказчыкі, тыпы. Адной з важных дэмаграфічных і эканамічных характарыстык краіны з'яўляецца размеркаванне насельніцтва па ўзросце і поле. Звесткі аб полаўзроставай структуры насельніцтва дазваляюць атрымаць даныя аб колькасці працоўных рэсурсаў або колькасці насельніцтва, якое знаходзіцца на ўтрыманні ў дзяржавы, — пенсіянераў, дзяцей. Ад суадносін колькасці мужчын і жанчын залежаць структура занятасці насельніцтва па відах эканамічнай дзейнасці і гаспадарчая спецыялізацыя краіны. Колькасць жанчын рэпрадуктыўнага ўзросту можа паўплываць на колькасць нараджэнняў і колькасць будучага насельніцтва.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Полаўзроставая структура насельніцтва — гэта размеркаванне насельніцтва канкрэтнай тэрыторыі па ўзроставых групах і паводле полу ў адпаведнасці са значэннямі гэтых дэмаграфічных прыкмет.


Ва ўзроставай структуры насельніцтва размяркоўваецца, як правіла, па аднагадовых або пяцігадовых узроставых групах. Часам выкарыстоўваюць узбуйненае размеркаванне на тры асноўныя групы: 0–14 гадоў, 15–59 гадоў, 60+ гадоў.

Узроставая структура насельніцтва складаецца пад уплывам асаблівасцей яго ўзнаўлення. Таму яе вызначае ўзровень нараджальнасці і смяротнасці. На ўзроставую структуру насельніцтва асобных тэрыторый уплывае таксама міграцыя, паколькі ў адных узростах людзі мяняюць месца жыхарства часцей, чым у іншых. Асабліва моцна ўплываюць на ўзроставую структуру насельніцтва войны: не толькі прамыя ваенныя страты, але і скарачэнне нараджальнасці, павелічэнне смяротнасці грамадзянскага насельніцтва і рост міграцыі.



Мал. 42. Асноўныя паказчыкі для вывучэння ўзроставай структуры насельніцтва

Для вывучэння ўзроставай структуры насельніцтва выкарыстоўваюць шэраг паказчыкаў (мал. 42). Для нагляднага і сумеснага ўяўлення ўзроставай і палавой структур насельніцтва выкарыстоўваюць графічную выяву — *полаўзроставую піраміду* (мал. 43).



Мал. 43. Полаўзроставая піраміда

Клуб знаўцаў-эканомікагеографаў. Піраміда ўяўляе з сябе двухбаковую дыяграму сумеснага размеркавання насельніцтва паводле полу і ўзросту, на якой колькасць людзей пэўнага ўзросту і полу ці іх доля ў насельніцтве адлюстроўваецца гарызантальнай паласой пэўнага маштабу. З правага боку графіка малюецца жаночае насельніцтва, з левага — мужчынскае. Палосы размяшчаюцца адна над другой у парадку павелічэння значэнняў узросту, звычайна ад 0 да 100 гадоў. Вертыкальная вось дыяграмы ўяўляе з сябе шкалу ўзросту, выяўленую ў адна- або пяцігадовых інтэрвалах. Паколькі з прычыны смяротнасці ў старэйшых узростах колькасць людзей, як правіла, меншая, малюнак атрымаў назву піраміды.

П$_1$

Правообладатель Адукацыя і выхаванне


У залежнасці ад суадносін долі насельніцтва ва ўзросце 0–14 гадоў і 60+ гадоў вылучаюць тры тыпы ўзроставай структуры насельніцтва.

1. *Прагрэсіўны* — з вялікай доляй дзяцей у агульнай колькасці насельніцтва, якая пераважае над доляй насельніцтва ва ўзросце 60+ гадоў, і высокім натуральным прыростам. Гэты тып адпавядае пашыранаму тыпу ўзнаўлення насельніцтва і прадстаўлены пераважна ў краінах, якія развіваюцца (напр., **Малаві**, **Тайланд**, **Парагвай**).

2. *Стацыянарны* — з амаль ураўнаважанай доляй насельніцтва ва ўзросце да 15 і 60+ гадоў, невысокім натуральным прыростам або яго адсутнасцю. Гэты тып адпавядае простаму тыпу ўзнаўлення насельніцтва і прадстаўлены ў шэрагу краін, якія развіваюцца, і развітых краінах з вялікім міграцыйным прыростам (напр., **Аўстралія**, **Чылі**, **Эквадор**).

3. *Рэгрэсіўны* — з параўнальна вялікай доляй насельніцтва ва ўзросце 60+ гадоў (больш за 12 %) і натуральнай стратай насельніцтва. Гэты тып адпавядае звужанаму тыпу ўзнаўлення насельніцтва і пераважае ў развітых краінах (напр., **Грэцыя**, **Японія**, **Германія**).

Кожнаму тыпу ўзроставай структуры насельніцтва адпавядае свой тып полаўзроставай піраміды. Прагрэсіўнаму тыпу структуры адпавядае піраміда ў форме правільнага трохвугольніка, стацыянарнаму — у форме звана, рэгрэсіўнаму — у форме ўрны (мал. 44).



Мал. 44. Віды полаўзроставых пірамід:
а — форма правільнага трохвугольніка, *б* — форма звана, в — форма ўрны

Дынаміка ўзроставай структуры насельніцтва свету з другой паловы XX ст. характарызуецца скарачэннем колькасці насельніцтва ў маладым узросце (0–14 гадоў) у сувязі з памяншэннем нараджальнасці і ростам колькасці насельніцтва ў старэйшых узростах. У 2018 г. аснова піраміды прыкметна звужаецца, цэнтральная частка пашыраецца. Гэта сведчыць аб адпаведнасці яе стацыянарнаму тыпу і тэндэнцыях старэння (мал. 45). У сусветнай структуры доля насельніцтва ва ўзросце да 15 гадоў складае 26 %, ва ўзросце 65+ гадоў — 9 %.

П$_2$

П$_3$

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Паміж развітымі краінамі і краінамі, якія развіваюцца, існуюць значныя адрозненні ва ўзроставай структуры. З-за высокай нараджальнасці, што забяспечвае пашыранае ўзнаўленне насельніцтва, у краінах, якія развіваюцца, пераважае прагрэсіўны тып узроставай структуры. Доля дзяцей складае 28 %, насельніцтва, старэйшага за 65 гадоў, — 7 %. У развітых краінах пры скарачэнні нараджальнасці, натуральным змяншэнні і звужаным тыпе ўзнаўлення пераважае рэгрэсіўная структура насельніцтва з доляй насельніцтва ва ўзросце 65+ гадоў 18 % і да 15 гадоў — 16 %.

У выніку скарачэння нараджальнасці, зніжэння смяротнасці і павелічэння працягласці жыцця ўзроставая структура насельніцтва свету пачынае дэмаграфічна старэць і адпавядаць рэгрэсіўнаму тыпу.



Мал. 45. Полаўзроставая структура насельніцтва свету, 2017 г.

Свет і Беларусь. Якія гістарычныя падзеі паўплывалі на форму дэмаграфічнай піраміды Рэспублікі Беларусь? Да якога тыпу адносіцца ўзроставая структура насельніцтва Беларусі? Якая працягласць жыцця мужчын і жанчын у Рэспубліцы Беларусь?


Дэмаграфічнае старэнне — гэта павелічэнне колькасці і долі асоб пажылога і старога ўзросту (60/65+) у структуры насельніцтва, якое з'яўляецца следствам росту ўзроўню сацыяльна-эканамічнага развіцця грамадства.

У свеце цікавага. Працэс старэння ўпершыню стаў назірацца ў XIX ст. у Францыі, калі доля насельніцтва ва ўзросце 60+ гадоў перавысіла 12 %. У 1901 г. парог дэмаграфічнай старасці пераступіла Швецыя, у 1931 г. — Вялікабрытанія, у 1937 г. — Германія.

Насельніцтва свету ва ўзросце 60+ гадоў налічвала ў 2017 г. 962 млн чалавек, што ў два разы больш у параўнанні з 1980 г. У структуры насельніцтва доля

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

пажылога насельніцтва складае 12,7 %, што з'яўляецца сведчаннем наступлення стадыі дэмаграфічнай старасці на глабальным узроўні (мал. 46). Па прагнозах ААН, чакаецца, што да 2050 г. колькасць пажылых людзей зноў падвоіцца і дасягне 2,1 млрд чалавек.



Мал. 46. Дынаміка долі насельніцтва свету ва ўзросце 60+ гадоў, %

Клуб знаўцаў-эканомікагеографаў. Для характарыстыкі дэмаграфічнага старэння краіны выкарыстоўваюцца дзве шкалы старэння. Згодна са шкалой старэння ААН, распрацаванай для насельніцтва ва ўзросце 65+ гадоў, краіна ўступае ў стадыю старэння, калі доля насельніцтва ў гэтым узросце перавышае 7 %. Па шкале польскага навукоўца Э. Росета, мяжой старэння выступае доля насельніцтва ва ўзросце 60+ гадоў, роўная 12 %.

Старэнне разглядаецца як натуральны і сучасны працэс, які адсутнічаў у ранейшых чалавечых цывілізацыях і з'яўляецца доляй насельніцтва эканамічна развітых краін. Развітыя дзяржавы характарызуюцца надзвычай пастарэлай узроставай структурай насельніцтва, дзе 25 %, або кожны чацвёрты жыхар, знаходзіцца ва ўзросце 60+ гадоў. У 2017 г. самымі дэмаграфічна старымі дзяржавамі свету з'яўляліся **Японія** (33,4 %), Італія (29,4 %), Германія (28 %). Пры гэтым найбольшая колькасць пажылых людзей свету — больш за 2/3 — пражывае ў краінах, якія развіваюцца, і яна расце хутчэй, чым у развітых. Паводле прагнозаў, да 2050 г. іх колькасць у дадзенай групе ўзрасце да 1,7 млрд чалавек, або 79 % насельніцтва свету, ва ўзросце 60+ гадоў.

У свеце цікавага. Па прагнозах, да 2050 г. у развітых краінах ва ўзросце 60+ гадоў будзе знаходзіцца больш чым кожны трэці жыхар, ці 32,9 %. У дзясятку першых дзяржаў разам з прадстаўнікамі развітых краін упершыню ўвойдуць краіны, якія развіваюцца, — Рэспубліка Карэя (41,6 %), Тайвань (правінцыя Кітая 41,3 %) і Сінгапур (40,1 %). Самай дэмаграфічна старой краінай прагназуецца Японія — 42,4 %.

Папрацуем з атласам. Знайдзіце на карце краіны з прагрэсіўнай, стацыянарнай і рэгрэсіўнай узроставай структурай насельніцтва. Прывядзіце прыклады краін, дзе адзначаецца дэмаграфічнае старэнне насельніцтва, і краін са значнай доляй маладога насельніцтва.

Структура насельніцтва паводле полу ў свеце. Структура насельніцтва паводле полу на канкрэтных тэрыторыях фарміруецца пад уплывам трох асноўных фактараў: *біялагічнага* — сярод нованароджаных пераважаюць хлопчыкі; *адрозненняў у смяротнасці* — у мужчын у больш ранніх узростах павялічваецца смяротнасць;

Правообладатель Адукацыя і выхаванне


адрозненняў у міграцыі насельніцтва: у мужчын, як правіла, міграцыйная рухомасць вышэйшая, чым у жанчын.

У структуры насельніцтва свету назіраецца перавага мужчынскага насельніцтва — на 100 жанчын прыходзіцца 101,8 мужчыны, ці 49,5 і 50,5 % адпаведна. Перавага ў свеце мужчынскага насельніцтва над жаночым ствараецца ў асноўным за кошт краін, якія развіваюцца. Калі ў развітых краінах на 100 жанчын прыходзіцца 94,6 мужчыны, то ў краінах, якія развіваюцца, — 103,4. У эканамічна развітых краінах пераважаюць жанчыны за кошт павелічэння іх колькасці ў старэйшым узросце з-за розніцы ў працягласці жыцця (мал. 47).



Мал. 47. Структура насельніцтва свету паводле полу

Клуб знаўцаў-эканомікагеографаў. Сярод рэгіёнаў, якія развіваюцца, найбольшай перавагай мужчын характарызуецца Азія — 104,8 на 100 жанчын. Найбольшыя дыспрапорцыі адзначаюцца ў Катары (311 мужчын на 100 жанчын) і ААЭ (228 мужчын на 100 жанчын) (мал. 48). У Афрыцы прыкладна роўныя суадносіны мужчынскага і жаночага насельніцтва ў структуры (99,8). У Еўропе назіраецца найбольшая перавага жаночага насельніцтва: на 100 жанчын 93 мужчыны. Найбольшымі дыспрапорцыямі характарызуюцца Украіна, Эстонія, Латвія (85 мужчын на 100 жанчын). У краінах Паўночнай Амерыкі суадносіны складаюць 100 жанчын на 97,5 мужчыны.



Мал. 48. Дыспрапорцыі мужчынскага і жаночага насельніцтва ў Катары

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Геаграфічнае размеркаванне мужчын і жанчын па ўзроставых групах выглядае наступным чынам: ва ўзроставай групе 0–14 гадоў мужчыны пераважаюць на ўсіх кантынентах; ва ўзроставай групе 15–64 гады мужчыны пераважаюць у Азіі і Акіяніі, у Еўропе суадносіны прыкладна роўныя; ва ўзроставай групе старэй за 65 гадоў на ўсіх кантынентах пераважаюць жанчыны.

Падвядзём вынікі. Полаўзроставая структура насельніцтва краіны фарміруецца пад уплывам шэрага фактараў: ..., ..., ... Вылучаюць ..., ... і ... тыпы ўзроставай структуры насельніцтва. Існуюць значныя адрозненні паміж дзяржавамі развітымі і дзяржавамі, якія развіваюцца, у полаўзроставай структуры насельніцтва. Графічным малюнкам полаўзроставай структуры насельніцтва з'яўляецца ... . У свеце больш ..., чым ... .

Праверым свае веды. 1. Назавіце асноўныя паказчыкі полаўзроставай структуры насельніцтва свету. 2. Што такое дэмаграфічнае старэнне?

Ад простага да складанага. 1. Падумайце і сфармулюйце, што такое дэмаграфічная нагрузка. 2. Да якіх вынікаў праз 50 гадоў прывядзе старэнне насельніцтва ў развітых краінах?

Ад тэорыі да практыкі. 1. Выберыце па пяць краін з прагрэсіўнай, стацыянарнай і рэгрэсіўнай узроставай структурай насельніцтва. Як адрозніваюцца гэтыя групы краін па ўзроўні эканамічнага развіцця? 2. Прааналізуйце полаўзроставую піраміду насельніцтва Рэспублікі Беларусь. 3. Да якога тыпу полаўзроставых пірамід адносіцца дадзеная піраміда? 4. Спрагназуйце змены дадзенай піраміды праз 50 гадоў.

Падарожжа па Глабальнай сетцы.
Сайт Аддзялення насельніцтва ААН.

§7-1

§ 8. Тэорыя дэмаграфічнага пераходу

Успамінаем. Якія фактары ўплываюць на дэмаграфічную сітуацыю ў краіне? Што такое дэмаграфічны выбух? З якімі фактарамі сацыяльна-эканамічнага развіцця звязаны дэмаграфічны выбух?

Для чаго мы гэта вывучаем? Для чаго дзяржаве неабходна рэгуляваць рост колькасці насельніцтва краіны? Якія праблемы цягне за сабой рэзкая змена колькасці насельніцтва? Да якіх наступстваў можа прывесці ўстойлівае зніжэнне нараджальнасці насельніцтва і павелічэнне яго смяротнасці ў выніку старэння?

Першы, Другі і Трэці дэмаграфічныя пераходы. Нараджальнасць, смяротнасць, характар натуральнага руху насельніцтва свету змяняюцца ў гісторыі чалавецтва пад уплывам сацыяльна-эканамічных і шэрага іншых фактараў. У выніку адбываецца змена тыпаў узнаўлення насельніцтва, якая ў рэгіёнах і краінах свету праходзіць у розны час. Тлумачэнне дынамікі дэмаграфічных працэсаў і паслядоўнасці змены тыпаў узнаўлення дае тэорыя дэмаграфічнага пераходу.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Дэмаграфічны пераход — гэта карэнныя дэмаграфічныя перамены ў гісторыі чалавецтва, якія характарызуюцца пераходам ад высокага ўзроўню нараджальнасці і смяротнасці насельніцтва да нізкага і прыводзяць да змены тыпаў узнаўлення насельніцтва.

Упершыню аб гістарычнай змене тыпаў узнаўлення пад уплывам як біялагічных законаў, так і сацыяльна-эканамічных умоў напісаў у 1909 г. французскі дэмограф А. Ландры (мал. 49).

Пазней, у 1945 г., амерыканскім дэмографам Ф. Наутстайнам (мал. 50) быў прапанаваны тэрмін «дэмаграфічны пераход» і яго тлумачэнне.




Мал. 49. А. Ландры (1874–1956)



Мал. 50. Ф. Наутстайн (1902–1983)

Тэорыя дэмаграфічнага пераходу (ДП) тлумачыць асаблівасці дэмаграфічнай сітуацыі ў свеце, рэгіёнах і краінах з эканамічным ростам і сацыяльным прагрэсам. Пасля ён быў названы *Першым дэмаграфічным пераходам*. Вылучаюць чатыры стадыі дэмаграфічнага пераходу (мал. 51). Для *першай стадыі* характэрныя высокі ўзровень нараджальнасці і смяротнасці, ваганні колькасці насельніцтва, нізкі натуральны прырост, якія стрымліваюць рост колькасці насельніцтва. Такая сітуацыя была ўласцівая ўсім грамадствам у першабытную эпоху. У цяперашні час краін на гэтай стадыі няма.



Мал. 51. Стадыі дэмаграфічнага пераходу

На *другой стадыі* захоўваецца высокая нараджальнасць, пачынае знікацца смяротнасць, расце працягласць жыцця. За кошт гэтага павялічваецца натуральны прырост, які да моманту заканчэння стадыі дасягае найвышэйшых у гісторыі значэнняў. Адбываецца пачатковы рост колькасці насельніцтва. Сёння гэта стадыя характэрная для большасці краін Афрыкі і найменш эканамічна развітых краін Азіі.

Клуб знаўцаў-эканомікагеографаў. Зніжэнне смяротнасці было звязана з пераходам ад палявання і збіральніцтва да земляробства і жывёлагадоўлі, калі з'явіліся запасы харчавання на выпадкі засухі, голаду і паводак. Паляпшэнне харчовага забеспячэння стварыла ўмовы для прыросту насельніцтва.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Трэцяя стадыя звязана з пачаткам развіцця капіталізму. Яна характарызуецца працягам зніжэння смяротнасці, але яшчэ больш хуткім зніжэннем нараджальнасці. Натуральны прырост пачынае змяншацца, але рост колькасці насельніцтва захоўваецца. У XXI ст. на гэтай стадыі знаходзіцца большасць краін Лацінскай Амерыкі і асобныя краіны Азіі.


Клуб знаўцаў-эканомікагеографаў. Зніжэнне нараджальнасці тлумачыцца індустрыялізацыяй і ўрбанізацыяй. Павышаецца якасць жыцця, растуць выдаткі на выхаванне дзяцей, жанчыны ўцягваюцца ў вытворчасць. Пачынаюць шырока распаўсюджвацца медыцынскія сродкі рэгулявання нараджальнасці.

На *чацвёртай стадыі*, якая адпавядае пераходу ад індустрыяльнага да постындустрыяльнага грамадства, адбываецца далейшае зніжэнне і стабілізацыя нараджальнасці і колькасці насельніцтва. Смяротнасць пад уплывам старэння насельніцтва пачынае павольна ўзрастаць. Першым рэгіёнам, які ўступіў у гэту стадыю, была Еўропа. У канцы XX ст. да яе далучыліся краіны Паўночнай (ЗША і Канада) і Паўднёвай (Уругвай, Аргенціна) Амерыкі, а таксама Японія, Аўстралія, Новая Зеландыя. У XXI ст. большасць эканамічна развітых краін свету знаходзіцца на гэтай стадыі.

Клуб знаўцаў-эканомікагеографаў. Па меры паляпшэння якасці харчавання і аховы здароўя смяротнасць памяншаецца. Але як толькі людзі ўцягваюцца ў лад жыцця высокаразвітога індустрыяльнага і постындустрыяльнага грамадства, нараджальнасць зніжаецца і тэмпы росту колькасці насельніцтва памяншаюцца.

У свеце ўсё ўзаемазвязана. Як па меры развіцця чалавечага грамадства змянялася ўзнаўленне насельніцтва планеты? Перад вамі, як будучымі кіраўнікамі, стаіць задача палепшыць дэмаграфічную сітуацыю ў вашым рэгіёне. Якую стратэгію вы выбераце, вырашаючы дадзенае пытанне?

У канцы XX ст. у шэрагу эканамічна развітых краін пачынаюць ізноў адбывацца карэнныя дэмаграфічныя перамены, што лягло ў аснову тэорыі *Другога дэмаграфічнага пераходу*, або пятай стадыі Першага дэмаграфічнага пераходу (мал. 52). Галоўнай



Мал. 52. Асноўныя характарыстыкі Другога дэмаграфічнага пераходу

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

яго асаблівасцю з'яўляецца зніжэнне нараджальнасці ніжэй за ўзровень, які забяспечвае простае ўзнаўленне насельніцтва, з-за адсутнасці матывацыі мець дзяцей. Геаграфія Другога дэмаграфічнага пераходу прадстаўлена ў асноўным эканамічна высокаразвітымі краінамі і шэрагам краін з пераходнай эканомікай.

Клуб знаўцаў-эканомікагеографаў. Другі дэмаграфічны пераход праяўляецца ў выглядзе росту сярэдняга ўзросту заключэння шлюбу і нараджэння першага дзіцяці, павелічэння інтэрвалаў паміж родамі, павышэння ролі нараджальнасці па-за афіцыйнага шлюбу, павелічэння долі людзей, якія ніколі не ўступалі ў зарэгістраваны шлюб і не мелі ніводнага дзіцяці.

Тэорыі Першага і Другога дэмаграфічных пераходаў не прымаюць пад увагу міграцыю. Аднак у апошні час яна ўносіць значны ўклад у фарміраванне насельніцтва Еўропы, Паўночнай Амерыкі і Аўстраліі. Да пачатку XXI ст. міграцыйны прырост стаў галоўным працэсам у дынаміцы колькасці насельніцтва большасці еўрапейскіх краін, дзе смяротнасць перавышае нараджальнасць. У сувязі з гэтым узнікла тэорыя *Трэцяга дэмаграфічнага пераходу* — асобай фазы развіцця насельніцтва краіны, на працягу якой на дынаміку колькасці, склад насельніцтва і ў цэлым сацыяльна-эканамічнае развіццё краіны вызначальны ўплыў аказвае міграцыя.

Паразважаем. Ці згодныя вы са сцвярджэннем С. П. Капіцы, вядомага вучонага-фізіка, які займаўся і праблемамі дэмаграфіі, аб тым, што «дэмаграфічны пераход — фундаментальная з'ява ў развіцці чалавецтва, якая закранае ўсе бакі нашага быцця»?

Свет і Беларусь. Прааналізуйце змену дэмаграфічнай сітуацыі ў канцы XX – пачатку XXI ст. у Рэспубліцы Беларусь. Як вы думаеце, які дэмаграфічны пераход характэрны для нашай краіны? Абгрунтуйце свой адказ.

Дынаміка колькасці насельніцтва свету. Дынаміка колькасці насельніцтва — гэта змена колькасці насельніцтва на пэўнай тэрыторыі за пэўны прамежак часу, якая адбываецца пад уплывам двух дэмаграфічных фактараў — натуральнага руху і міграцыі насельніцтва.


У гісторыі развіцця чалавецтва для рэгіёнаў свету было характэрна рознае ўздзеянне гэтых фактараў. Так, сёння дамінуючым фактарам у краінах Еўропы выступае міграцыя, у Азіі і Акіяніі — натуральны прырост і міграцыя, у Афрыцы — натуральны прырост, у Амерыцы і Аўстраліі — міграцыя.

Паразважаем. Першая спроба ацаніць дынаміку колькасці насельніцтва і адказаць на пытанне: «Ці можа Зямля пракарміць усіх, хто на ёй жыве?» звязана з імем Томаса Мальтуса. Ён сцвярджаў, што колькасць насельніцтва ўзрастае ў геаметрычнай прагрэсіі, у той час як харчовыя рэсурсы — у арыфметычнай. Такім чынам, лінія росту насельніцтва перасячэцца з прамой росту харчовых рэсурсаў (мал. 53). Аўтар пісаў, што затармазіць рост

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

насельніцтва могуць толькі войны, галеча і хваробы і папераджальныя сацыяльныя фактары, напрыклад больш позняе ўступленне ў шлюб. Ці магчыма прымяненне тэорыі Т. Мальтуса ў цяперашні час? Адказ аргументуйце.

Колькасць насельніцтва змяняецца таксама пад уплывам знешніх фактараў. У выніку войнаў, эпідэмій і голаду ва ўсіх рэгіёнах свету адбывалася доўгатэрміновае скарачэнне колькасці насельніцтва. Пры гэтым Азія гістарычна заўсёды была рэгіёнам з самай вялікай колькасцю насельніцтва. Астатнія рэгіёны мянялі сваю пазіцыю ў сусветным насельніцтве (табл. 1).




Мал. 53. Мадэль Т. Мальтуса

Табліца 1. Гістарычныя рангі рэгіёнаў свету па колькасці насельніцтва

Ранг	0–1000 гг.	Ранг	1500–1800 гг.	Ранг	1900–1950 гг.	Ранг	2019 г., млн чал.	
1	Азія	1	Азія	1	Азія	1	Азія	4587
2	Еўропа	2	Еўропа	2	Еўропа	2	Афрыка	1305
3	Афрыка	3	Афрыка	3	Амерыка	3	Амерыка	1012
4	Амерыка	4	Амерыка	4	Афрыка	4	Еўропа	746
5	Аўстралія і Акіянія	5	Аўстралія і Акіянія	5	Аўстралія і Акіянія	5	Аўстралія і Акіянія	42

У свеце цікавага. 35–40 тыс. гадоў таму на Зямлі налічвалася ўсяго каля 1 млн прадстаўнікоў Homo sapiens (чалавек разумны). З тых часоў колькасць чалавецтва вырасла ў тысячы разоў. Пад 1650 г. яна складала прыкладна 0,5 млрд і павялічвалася прыблізна на 0,3 % у год, што прыкладна адпавядала часу падваення, роўнаму 250 гадам. Да 1900 г. колькасць насельніцтва дасягнула 1,6 млрд пры гадавых тэмпах прыросту 0,5 % і часу падваення 140 гадоў. У 1970 г. яна ўжо была роўная 3,6 млрд, а тэмпы прыросту павялічыліся да 2,1 % у год.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Мал. 54. Дынаміка колькасці насельніцтва свету, млрд чал.

Па даных за 2019 г., колькасць насельніцтва свету склала 7536 млн чалавек. 60 % яго пражывае ў Азіі, 13 — у Амерыцы, 17 % — у Афрыцы. Доля Еўропы ў сусветным насельніцтве скарачаецца і складае 10 %.

Для дынамікі колькасці насельніцтва свету характэрны рост. Аднак тэмпы росту пастаянна скарачаюцца як у развітых краінах, так і ў краінах, якія развіваюцца. У сярэдзіне XX ст. насельніцтва свету павялічвалася на 2,0 % у год, у XXI ст. — на 1,1 %. У цэлым у другой палове XX – пачатку XXI ст. у свеце назіраецца павелічэнне разрыву ў колькасці насельніцтва паміж развітымі дзяржавамі, і дзяржавамі, якія развіваюцца (мал. 54).

Многія развітыя краіны характарызуюцца адмоўнай штогадовай дынамікай (напр., **Японія**, **Германія**, **Італія**), у той час як большасць краін, якія развіваюцца, — станоўчай (напр., **Нігерыя**, **Егіпет**, **Малайзія**).


Папрацуем з атласам. Знайдзіце на карце краіны з прагрэсіўнай, стацыянарнай і рэгрэсіўнай узроставай структурай насельніцтва. Растлумачце ўзаемасувязь узроставай структуры і характару дынамікі колькасці насельніцтва.

Доля насельніцтва краін, якія развіваюцца, у колькасці насельніцтва свету расце і складае 83 %, доля насельніцтва развітых краін скарачаецца — 17 %.

У сусветнай колькасці насельніцтва за больш чым паўвекавы перыяд гістарычнага развіцця сфарміравалася група дзяржаў, якія лідзіруюць па колькасці насельніцтва. Сярод іх вылучаецца стабільная дэмаграфічная тройка (Кітай, Індыя і ЗША), доля якіх у сусветным насельніцтве складае 40 %. У XXI ст. у першай дзясятцы па колькасці насельніцтва пераважаюць краіны, якія развіваюцца (мал. 55).

Па даных за 2019 г., у першую дзясятку па колькасці насельніцтва ўваходзяць **Кітай** (1398 млн чал.), **Індыя** (1392), ЗША (329), **Інданезія** (268), **Пакістан** (217), Бразілія (209), Нігерыя (201), Бангладэш (164), Расія (147) і Мексіка (127 млн чал.).

Папрацуем з атласам. Знайдзіце на палітычнай карце свету дзясятку краін з найбольшай колькасцю насельніцтва.



Мал. 55. Найбуйнейшыя краіны свету па колькасці насельніцтва, 2017 г.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Прагноз колькасці насельніцтва свету. Па прагнозах ААН, колькасць насельніцтва свету будзе паступова павялічвацца і да 2020 г. дасягне 7,8 млрд чалавек, а да 2050 г. — 9,7 млрд чалавек. Сярод развітых рэгіёнаў Еўропа будзе характарызавацца скарачэннем колькасці насельніцтва да 2050 г. да 716 млн чал., у той час як у Паўночнай Амерыцы прагназуецца далейшы рост да 434 млн чалавек. Ва ўсіх рэгіёнах, якія развіваюцца, прагназуецца рост колькасці насельніцтва да 2050 г.

Клуб знаўцаў-эканомікагеографаў. Далейшы рост колькасці насельніцтва свету будзе адбывацца пры запавольванні штогадовых тэмпаў, якія ў параўнанні з 2010 г. паменшацца больш чым на 30 %. Найбуйнейшымі краінамі па колькасці насельніцтва прагназуюцца Індыя (1659 млн чал.), Кітай (1364), Нігерыя (410), ЗША (389), Інданезія (321 млн чал.).

Падвядзём вынікі. Тэорыя дэмаграфічнага пераходу распрацавана ... у 1945 г. Тэорыя звязвае асаблівасці дэмаграфічнай сітуацыі з эканамічным ростам. У ім вылучаюць ... стадыі дэмаграфічнага развіцця, якія краіны і рэгіёны праходзяць у розны час.

Першы дэмаграфічны пераход праявіўся ў ..., Другі ... — у арганізацыі жыцця сям'і і яе форм, Трэці пераход разглядае ў якасці асноўнага фактару змены колькасці насельніцтва ... .

Праверым свае веды. 1. У чым заключаецца тэорыя дэмаграфічнага пераходу? 2. Ахарактарызуйце чатыры стадыі дэмаграфічнага пераходу. 3. Як зменіцца колькасць насельніцтва па рэгіёнах свету да 2050 г.?

Ад простага да складанага. 1. Ці маюць развітыя краіны свету прамыя адносіны да глабальнай дэмаграфічнай праблемы? Чаму адны краіны могуць вырашыць дэмаграфічную праблему, а іншыя — не? 2. Прывядзіце станоўчыя і адмоўныя прыклады вырашэння дэмаграфічнай праблемы. Сёння дэмографы звязваюць Трэці дэмаграфічны пераход з іміграцыяй ў краінах з нізкай нараджальнасцю, перш за ўсё еўрапейскіх. Чаму іміграцыя стала асноўнай прычынай Трэцяга дэмаграфічнага пераходу? Да якіх наступстваў гэта можа прывесці?

Ад тэорыі да практыкі. Выканайце практычную работу «Складанне дэмаграфічнага профілю развітых дзяржаў і дзяржаў, якія развіваюцца» (на прыкладзе дзвюх дзяржаў на выбар), па тыпавым плане (гл. дадатак 1).

Падарожжа па Глабальнай сетцы.

Сайт Інстытута дэмаграфіі Нацыянальнага даследчага ўніверсітэта «Вышэйшая школа эканомікі» (Расія, г. Масква).

Сайт дэмаграфічнага штотыднёвіка «Насельніцтва і грамадства».

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



§ 9. Фактары і віды міграцыі насельніцтва

Успамінаем. Што такое міграцыя? Якія прычыны выклікаюць міграцыю насельніцтва?

Для чаго мы гэта вывучаем? Як уплывае міграцыя на дэмаграфічную сітуацыю ў краіне? З якімі праблемамі сутыкаюцца мігранты ў краіне, што іх прымае?

Фактары міграцыі насельніцтва. Міграцыі аказваюць значнае ўздзеянне на геаграфію, структуру і дынаміку колькасці насельніцтва асобных населеных пунктаў, краін і свету. Паколькі міграцыя насельніцтва ўплывае на дэмаграфічныя, эканамічныя, сацыяльныя і палітычныя працэсы як тэрыторыі выхаду, так і тэрыторыі ўсялення, то на яе аказвае ўплыў мноства фактараў. Фактарамі міграцыі з'яўляюцца агульныя сацыяльна-эканамічныя і іншыя прычыны, якія яе выклікаюць. У найбольш абагульненым выглядзе сярод іх вылучаюць некалькі груп (мал. 56).

Як правіла, сукупнае дзеянне фактараў вызначае міграцыйную рухомасць насельніцтва. Пры гэтым эканамічны фактар гістарычна з'яўляецца вызначальным. Фактары міграцыі можна таксама падзяліць на *тыя, што выштурхваюць,* і *тыя, што прыцягваюць*. Да *першай групы* адносяцца беднасць, голад, нізкі ўзровень жыцця і заработнай платы, перанасяленне краін, якія развіваюцца, высокі ўзровень беспрацоўя, экалагічныя катастрофы, войны, канфлікты, праследаванне і г. д.

У *другую групу* уключаны больш высокі ўзровень жыцця і аплаты працы, патрэбы эканомік развітых краін і краін, якія актыўна развіваюцца, у працоўных рэсурсах, магчымасці працаўладкавання, бяспека, дэфіцыт уласных працоўных рэсурсаў у развітых краінах, спрыяльныя прыродна-кліматычныя ўмовы і г. д.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

ПРЫРОДНЫЯ	• Аказваюць апасродкаваны ўплыў, іх роля слабее па меры росту ўзроўню сацыяльна-эканамічнага развіцця. • У спрыяльных для пражывання прыродна-кліматычных умовах ствараюцца перадумовы для прытоку насельніцтва
ЭКАНАМІЧНЫЯ	• Развіццё эканомікі на тэрыторыях спрыяе стварэнню новых працоўных месцаў і стымулюе прыток насельніцтва і наадварот. • Больш высокі ўзровень даходаў спрыяе адтоку насельніцтва з краін, дзе гэтыя даходы ніжэйшыя
ДЭМАГРАФІЧНЫЯ	• Стварэнне і распад сям'і спрыяюць міграцыі насельніцтва
ПРАВАВЫЯ	• Узмацненне жорсткасці прававых нормаў зніжае міграцыйную рухомасць насельніцтва. • Паслабленне прававых норм спрыяе ўзмацненню міграцыі насельніцтва
ПАЛІТЫЧНЫЯ	• Змена палітычнага рэжыму, рэпрэсіі па палітычных матывах спрыяюць міграцыйнай актыўнасці насельніцтва
ЭКАЛАГІЧНЫЯ	• Тэхнагенныя і экалагічныя катастрофы ўзмацняюць адток насельніцтва

Мал. 56. Фактары міграцыі насельніцтва

У свеце ўсё ўзаемазвязана. Прывядзіце прыклады станоўчага і адмоўнага ўплыву міграцый на сацыяльна-эканамічнае развіццё краін і рэгіёнаў як прыбыцця, так і выбыцця. Якія літаратурныя творы, дзе апісваліся міграцыі насельніцтва, вы чыталі?


Свет і Беларусь. Якія міграцыйныя хвалі былі характэрныя для Рэспублікі Беларусь? Якія змены адбыліся ў прычынах, напрамках і хвалях міграцыі ў Беларусі за апошнія 20 гадоў?

Віды міграцый. У сучасным свеце існуе вялікая колькасць міграцый, якія адрозніваюцца шэрагам прыкмет. Прасторавыя перамяшчэнні носяць разнастайны характар, таму ў сукупнасці міграцыі класіфікуюць на розныя віды (мал. 57).

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

1. Міграцыі па часе (мал. 58)	пастаянныя			часовыя		
2. Міграцыі па геаграфічным ахопе	знешнія (міжнародныя)			унутраныя (унутрыдзяржаўныя)		
3. Міграцыі па прычынах/мэтах	эканамічная	палітычная	экалагічная	этнічная	дэмаграфічная	рэлігійная
4. Міграцыі па форме арганізацыі	арганізаваная			індывідуальная		
5. Міграцыі па характары	добраахвотная			прымусовая		
6. Міграцыі па ступені законнасці	легальная			нелегальная		

Мал. 57. Віды міграцый



Мал. 58. Міграцыі па часе

Крыніцамі звестак аб міграцыі выступаюць даныя перапісаў насельніцтва, бягучага ўліку, а таксама спецыяльных выбарачных даследаванняў. Вывучэнне міграцыі дазваляе адказаць на многія пытанні. Напрыклад, колькі выехала насельніцтва, хто выехаў, куды выехаў і г. д. Каб правільна адказваць на іх, існуюць паказчыкі для вывучэння міграцыі. Іх можна падзяліць на некалькі груп: паказчыкі маштабаў міграцыі, адносныя паказчыкі міграцыі, паказчыкі структуры міграцыі і інш.

Да паказчыках маштабаў міграцыі адносяць наступныя (мал. 59).

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

1. Колькасць мігрантаў, якія прыбылі (П), чал.

2. Колькасць мігрантаў, якія выбылі (В), чал.

3. Сальда міграцыі (+/–), або міграцыйны прырост (змяншэнне), чал.
Разлічваецца як розніца паміж колькасцю прыбыўшых мігрантаў і мігрантаў, якія выбылі, за пэўны перыяд (звычайна год) для краіны, рэгіёна, горада, раёна па формуле: МП (МВ) = П – В.
Калі паказчык станоўчы, выкарыстоўваецца тэрмін «міграцыйны прырост», калі адмоўны — «міграцыйнае змяншэнне».

4. Валавая міграцыя (ВМ), або міграцыйны абарот (МА)
Разлічваецца як сума колькасці мігрантаў, якія прыбылі і выбылі, па формуле:
ВМ (МА) = П + В.

Мал. 59. Асноўныя абсалютныя паказчыкі вывучэння міграцыі

Асноўнымі *адноснымі паказчыкамі міграцыі* з'яўляюцца каэфіцыенты інтэнсіўнасці прыбыцця, выбыцця і міграцыйнага абароту. Яны разлічваюцца як адносіны колькасці тых, хто прыбыў і выбыў, і міграцыйнага абароту адпаведна да сярэднегадавой колькасці насельніцтва ў разліку на 1000 чалавек і вымяраюцца ў праміле.

Паказчыкі структуры міграцыі адказваюць на пытанні, якімі з'яўляюцца мігранты паводле полу, узросту, краіны выезду/уезду, прафесіі, адукацыі, узроўню даходаў, шлюбнага стану і іншых прыкмет. Таму для іх разліку выкарыстоўваюцца адносіны колькасці насельніцтва пэўнай прыкметы да агульнай колькасці мігрантаў, які вымяраюцца ў працэнтах.



Мал. 60. В. Зялінскі, аўтар канцэпцыі міграцыйнага (мабільнага) пераходу

Міграцыйны пераход. Аналагічна тэорыі дэмаграфічнага пераходу чалавецтва ў розныя перыяды спрабавала даваць тлумачэнні прычынам і асаблівасцям міграцыі насельніцтва ў залежнасці ад змен сацыяльна-эканамічных умоў. Гэта знайшло адлюстраванне ў канцэпцыі міграцыйнага (мабільнага) пераходу В. Зялінскага (мал. 60).


Канцэпцыі дэмаграфічнага і міграцыйнага пераходу цесна ўзаемазвязаны і дапаўняюць адна адну.

Паразважаем. Дэмаграфічнае развіццё і роля міжнароднай міграцыі ў ім істотна адрозніваюцца ў развітых рэгіёнах і рэгіёнах свету, якія развіваюцца. Пацвердзіце ці аспрэчце дадзены выраз.

Міграцыйны пераход — гэта эвалюцыя міграцыі насельніцтва, якая адлюстроўвае заканамерны пераход ад нізкай міграцыйнай рухомасці на аграрнай стадыі да яе росту ў перыяд індустрыяльнага і постындустрыяльнага грамадства ў выніку сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Згодна з канцэпцыяй, міграцыя насельніцтва перажывае пяць стадый развіцця, якія змяняюцца паралельна сацыяльным і эканамічным зменам у грамадстве (мал. 61).



Мал. 61. Стадыі міграцыйнага (мабільнага) пераходу

На *першай стадыі* ў даіндустрыяльным грамадстве міграцыя абмежаваная. Маюць месца толькі нязначныя перамяшчэнні людзей па прылеглай тэрыторыі пры нязначным натуральным прыросце, высокай нараджальнасці і высокай смяротнасці насельніцтва. Гэту стадыю ўсе краіны свету да цяперашняга часу завяршылі.

Другая стадыя супадае з пачаткам дэмаграфічнага выбуху. Яна характарызуецца міграцыяй з вёскі ў горад, ростам перамяшчэнняў на больш далёкія адлегласці, агульным узрастаннем маштабаў міжнароднага міграцыйнага руху. Сёння на гэтай стадыі знаходзіцца невялікая колькасць найменш развітых краін пераважна Афрыкі (напр., Намібія, Эфіопія) і Азіі (напр., Бутан, Непал), і колькасць іх скарачаецца.

На *трэцяй стадыі* захоўваецца рух з вёскі ў горад пры хуткім узмацненні міграцыі паміж гарадамі. Маштабы міграцыі, у тым ліку міжнароднай, узрастаюць. Прысутнічаюць усе спалучэнні міграцыі гарадскога і сельскага насельніцтва. Гэта стадыя прадстаўлена ў большасці краін, Лацінскай Амерыкі, Азіі, шэрага краін Афрыкі, якія развіваюцца (напр., ПАР, Егіпет, Нігерыя), некаторых краінах з пераходнай эканомікай (напр., Польшча, Венгрыя, Расія, Украіна).

На *чацвёртай стадыі* ў познім індустрыяльным і постындустрыяльным грамадстве пры нязначным натуральным прыросце міграцыя з вёскі ў горад у пэўнай ступені захоўваецца, але мае малыя маштабы. Атрымлівае развіццё адваротны міграцыйны рух з горада ў вёску. Узрастаюць аб'ёмы міграцыі з больш буйных па колькасці насельніцтва гарадоў у больш дробныя. Адбываецца значны рост міжнароднай міграцыі. Гэта стадыя характэрная ў асноўным для развітых дзяржаў Еўропы (напр., Германіі, Вялікабрытаніі, Нідэрландаў), часткова прадстаўлена ў ЗША. Шэраг найбольш развітых краін Лацінскай Амерыкі таксама набывае рысы гэтай стадыі (напр., Бразілія, Мексіка).

Папрацуем з атласам. Выкарыстоўваючы матэрыялы вучэбнага дапаможніка і карты атласа, назавіце краіны, якія знаходзяцца на другой, трэцяй і чацвёртай стадыях міграцыйнага пераходу.

Пятая (заключная) стадыя разглядаецца як гіпатэтычная стадыя постындустрыяльнага грамадства. Для яе будуць характэрныя пераважна міжгарадская міграцыя і

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

пэўныя перасяленні з горада ў вёску. Міжнародная міграцыя захоўваецца, але кантроль з боку дзяржавы ўзмацняецца.

У свеце цікавага. У сувязі з заключнай стадыяй развіцця міграцыі цікавасць уяўляе меркаванне італьянскага вучонага П. Прыні пра тое, што «выразнікам сутнасці нашай эпохі з'яўляецца хутчэй качэўнік — чалавек, які вандруе з краю ў край» і ў постындустрыяльным грамадстве «ўсе людзі, незалежна ад сваёй культуры, будуць мігрыраваць». З гэтым сцвярджэннем узгадняецца і канцэпцыя Трэцяга дэмаграфічнага пераходу Д. Коулмэна.

Падвядзём вынікі. На міграцыю насельніцтва ўплываюць многія фактары, асноўным з якіх з'яўляецца ... . Міграцыі адрозніваюцца па ..., ..., ..., ..., ..., ... Сярод паказчыкаў міграцыі вылучаюць тры асноўныя групы — паказчыкі маштабаў міграцыі, адносныя паказчыкі міграцыі, паказчыкі структуры міграцыі. Вылучаюць ... стадый міграцыйнага пераходу. Міграцыйны пераход уяўляе з сябе змену нізкай міграцыйнай рухомасці насельніцтва на аграрнай стадыі яе ростам у перыяд індустрыяльнага і постындустрыяльнага грамадства ў выніку сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў.

Праверым свае веды. 1. Назавіце асноўныя фактары міграцыі. 2. Што такое міграцыйны пераход? 3. Прывядзіце прыклады міграцый па прычынах. 4. Якія міграцыйныя працэсы характэрныя для вашай мясцовасці?

Ад простага да складанага. На малюнку 62 схематычна прадстаўлена мадэль прыняцця рашэння аб міграцыі Э. С. Лі (1966). Вывучыўшы малюнак, адкажыце на наступныя пытанні: 1. Што пазначана знакамі плюс і мінус у кругах, якія сімвалізуюць рэгіёны выбыцця і прыбыцця мігрантаў? 2. Якія тры фактары могуць разглядацца як прамежкавыя перашкоды?



Мал. 62. Схема «прыцягвання — выштурхвання» ў адпаведнасці з міграцыйнай тэорыяй Э. С. Лі

Падарожжа па Глабальнай сетцы.

Сайт Міжнароднай арганізацыі па міграцыі.

Сайт Прадстаўніцтва Міжнароднай арганізацыі па міграцыі ў Рэспубліцы Беларусь.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

§ 10. Міжнародная міграцыя ў сучасным свеце

Успамінаем. Праблемы якога характару спрыяюць міжнароднай міграцыі? Успомніце падзеі, што выклікалі найбольш маштабныя перамяшчэнні людзей у гісторыі чалавецтва. Якія праблемы яны пацягнулі за сабой?

Для чаго мы гэта вывучаем? Што неабходна прадпрымаць дзяржаве, каб не дапусціць значных маштабаў эміграцыі? Якія праблемы цягне за сабой міжнародная міграцыя?

Дынаміка маштабаў міжнароднай міграцыі ў свеце і рэгіёнах. З сярэдзіны XX ст. пачынаецца сучасная эпоха міграцыі насельніцтва свету. Гістарычным яе пачаткам было заканчэнне Другой сусветнай вайны, а галоўнай асаблівасцю — значны рост маштабаў міжнароднай міграцыі. На палітычнай карце свету не засталося дзяржаў, якія не былі б уцягнуты ў міжнародную міграцыю. У параўнанні з 1965 г. колькасць міжнародных мігрантаў у свеце ўзрасла ў 3,5 раза і склала 258 млн чалавек, або 3,4 % насельніцтва свету. Міжнародная міграцыя набыла глабальны характар.

$П_1$

У свеце ўсё ўзаемазвязана. Якія падзеі ў свеце спрыяюць актывізацыі міжнароднай міграцыі? Чаму яна стала глабальным працэсам?

У свеце цікавага. У гісторыі чалавецтва класічнай краінай эміграцыі ў XIX ст. была Ірландыя. За некалькі дзесяцігоддзяў пасля Вялікага голаду ў 1840-х гг. (мал. 63) насельніцтва гэтай краіны зменшылася ў два разы. Па долі эмігрантаў у насельніцтве яна заняла першае месца ў свеце. Цяпер у Ірландыі пражывае толькі палова ірландцаў. У ЗША — больш за 40 млн асоб ірландскага паходжання — у 12 разоў больш жыхароў самой Ірландыі. У сярэдзіне XIX ст. у Новы Свет з Ірландыі прыбылі 5000 караблёў з эмігрантамі. Усяго на амерыканскі бераг ступіла крыху больш за мільён чалавек.




Мал. 63. Помнік Вялікаму голаду ў Ірландыі


Звыш 60 % міжнародных мігрантаў пражывае ў Азіі (80 млн чал.) і ў Еўропе (78 млн чал.). Паўночная Амерыка з'яўляецца трэцім рэгіёнам па ліку міжнародных мігрантаў (58 млн чал.). Па колькасці міжнародных мігрантаў на 1000 жыхароў найбольшымі значэннямі вылучаюцца Аўстралія з Акіяніяй і Паўночная Амерыка (4,8 і 3,2 ‰ адпаведна). Тры рэгіёны (Афрыка, Паўднёвая Амерыка і Азія) характарызуюцца міграцыйным адтокам (мал. 64).

$П_2$

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Мал. 64. Сальда міжнароднай міграцыі па рэгіёнах, 2017 г., ‰



Мал. 65. Найбуйнейшыя краіны паходжання міжнародных мігрантаў, 2017 г., млн чал.


У 2017 г. найбольшая колькасць міжнародных мігрантаў пражывала ў ЗША (50 млн чал.), Саудаўскай Аравіі, Германіі і Расіі (каля 12 млн чал.). Найбуйнейшымі краінамі паходжання міжнародных мігрантаў з'яўляюцца Індыя, Мексіка і Расія (мал. 65). Да іншых краін з вялікай колькасцю мігрантаў адносяцца Кітай, Бангладэш, Сірыя, Пакістан і Украіна.

У структуры міжнародных мігрантаў пераважаюць мужчыны — 52 %. Доля жанчын складае 48 % і пастаянна павялічваецца. Сярэдні ўзрост сучаснага мігранта павялічваецца і складае 39 гадоў. 74 % мігрантаў знаходзяцца ў працаздольным узросце (20–64 гады) (мал. 66).

Міграцыя ў развітых краінах і краінах, якія развіваюцца. Галоўнай асаблівасцю міжнароднай міграцыі з'яўляецца міграцыйны адток, што павялічваецца, з краін, якія развіваюцца, у развітыя. Развітыя краіны характарызуюцца станоўчым сальда міграцыі. У краінах, якія развіваюцца, назіраецца адмоўнае сальда міграцыі (мал. 67).



Мал. 66. Полаўзроставая піраміда міжнародных працоўных мігрантаў, 2017 г.



Мал. 67. Дынаміка міжнароднай міграцыі ў развітых краінах і краінах, якія развіваюцца, ‰


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Паразважаем. Дэмаграфічнае развіццё і роля міжнароднай міграцыі ў ім істотна адрозніваюцца ў развітых рэгіёнах свету і рэгіёнах, якія развіваюцца. Пацвердзіце або аспрэчце дадзены выраз.

З канца 1980-х гг. свет характарызуецца надыходам *найноўшага перыяду міграцыі* насельніцтва. Ён сфарміраваўся пад уздзеяннем палітычных, сацыяльна-эканамічных, экалагічных і лакальных фактараў. Асноўнымі падзеямі гэтага перыяду былі распад сацыялістычнай сістэмы гаспадарання, з'яўленне суверэнных дзяржаў і змена іх дзяржаўных меж, пашырэнне меж Еўрапейскага саюза.

Свет і Беларусь. Назавіце асноўныя фактары, якія вызначылі трэнды міжнароднай міграцыі насельніцтва ў Рэспубліцы Беларусь на пачатку XXI ст. Якія сферы занятасці з'яўляюцца найбольш прывабнымі для беларускіх мігрантаў у краінах СНД і Заходняй Еўропы?

Павелічэнне разрыву ва ўзроўні жыцця паміж эканамічна развітымі дзяржавамі і дзяржавамі, якія развіваюцца, а таксама ў групе краін, што развіваюцца, выступае фактарам росту патокаў міжнароднай міграцыі (мал. 68).




Мал. 68. Асноўныя патокі міжнароднай міграцыі паміж развітымі краінамі і краінамі, якія развіваюцца, %

Асноўным з'яўляецца паток міграцыі з краін, якія развіваюцца, у развітыя краіны (40 %). Аднак з-за павелічэння адрозненняў ва ўзроўні даходаў насельніцтва больш чым кожны трэці міжнародны мігрант сёння выязджае з краін, якія развіваюцца, у краіны, якія развіваюцца (напр., з Гватэмалы ў Мексіку, з Бангладэш у Індыю). Гэта ж прычына тлумачыць міграцыю з развітых у развітыя краіны, на якую прыходзіцца 22 % (напр., з Іспаніі ў Германію).

Калідоры міжнароднай міграцыі. Значныя маштабы міжнароднай міграцыі разам з гістарычнымі перадумовамі прывялі да фарміравання ў свеце ўстойлівых і вялікіх па колькасці патокаў мігрантаў паміж асобнымі краінамі. Гэта з'ява атрымала назву «міграцыйны калідор». Усяго іх налічваецца 15. Самым буйным з'яўляецца калідор паміж Мексікай і ЗША, дзе колькасць міжнародных мігрантаў складае каля 13 млн чалавек (мал. 69).

Папрацуем з атласам. Пакажыце на палітычнай карце свету асноўныя калідоры міжнародных міграцый: **Мексіка — ЗША**; **Індыя — ААЭ**; **Расія — Украіна**. Чым вы можаце растлумачыць іх фарміраванне?

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Мал. 69. Асноўныя міграцыйныя калідоры свету, 2017 г., млн чал.



Мал. 70. Нелегальныя мігранты з Сірыі

Прычына міграцыі ў межах калідораў, як правіла, эканамічная — магчымасць знайсці работу насельніцтву з краін, якія развіваюцца. Аднак у апошнія гады прычынай часта становяцца палітычныя падзеі ў краіне, напрыклад у Сірыі (мал. 70).

Сучасныя віды міжнароднай міграцыі і іх геаграфія. Асноўнай формай міжнароднай міграцыі ў сучасным свеце з'яўляецца працоўная міграцыя. Яе фактарамі выступаюць: адрозненні ва ўзроўні жыцця насельніцтва; прыцягненне таннай працоўнай сілы з краін, якія развіваюцца; узросшая залежнасць шэрага галін гаспадаркі і відаў эканамічнай дзейнасці развітых краін ад працы замежных рабочых з дзяржаў, якія развіваюцца. Колькасць працоўных мігрантаў складае 150,3 млн чалавек, або каля 60 % міжнародных мігрантаў. Больш за 70 % з іх працуюць у сферы паслуг, каля 20 % — у прамысловасці. Кожны дзясяты заняты ў сельскай гаспадарцы (мал. 71). 56 % у структуры складаюць мужчыны і 44 % — жанчыны.



Клуб знаўцаў-эканомікагеографаў. Павелічэнне маштабаў працоўнай міграцыі прыводзіць да росту колькасці замежнай працоўнай сілы ў структуры працоўных рэсурсаў развітых краін. Па даных Міжнароднай арганізацыі міграцыі, у Аўстраліі доля замежных рабочых складае 24,5 %, Канадзе — 19,1, Швейцарыі — 18,4, ЗША — 12,4, Аўстрыі, Бельгіі, ФРГ — каля 10 %.



Мал. 71. Структура занятасці міжнародных працоўных мігрантаў, 2017 г., млн чал.

Сучасныя грамадзянскія войны і змена палітычных рэжымаў прыводзяць да міграцыі насельніцтва па палітычных прычынах. *Палітычная міграцыя* набывае ў свеце ўстойлівыя маштабы. У выніку палітычных канфліктаў і перамяшчэння насельніцтва, якое зведвае прыгнёт рознага характару (рэлігійнага, расавага, ідэалагічнага),

П$_4$

П$_5$

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

гэты від міграцыі фарміруе з'яву бежанства. Сёння колькасць бежанцаў нашмат меншая за колькасць эканамічных мігрантаў, але застаецца значнай.

Адной з новых форм выступае *міграцыя высокакваліфікаваных кадраў* («brain drain»), або *інтэлектуальная міграцыя*. Рэгіёнам з найбольшай эміграцыяй насельніцтва з вышэйшай адукацыяй з'яўляецца Лацінская Амерыка. Больш за 80 % насельніцтва з вышэйшай адукацыяй Гаіці, Сурынама, Ямайкі пакідаюць свае краіны.

У шэрагу дзяржаў Афрыкі (Эфіопія, Нігерыя, Кенія, ПАР) больш за 60 % высокакваліфікаваных асоб эмігрыруюць. Для гэтых дзяржаў выезд спецыялістаў з'яўляецца сур'ёзнай праблемай будучага развіцця.

У свеце цікавага. Дзяржавамі, якія вядуць найбольш актыўную палітыку па прыцягненні высокакваліфікаваных мігрантаў, з'яўляюцца ЗША, Вялікабрытанія, Канада і Аўстралія. Найбольшай доляй замежных навукоўцаў і даследчыкаў у свеце вылучаюцца Швейцарыя (57 %), Аўстралія (45 %) і ЗША (38 %).

П$_6$

Рост колькасці моладзі ў краінах, якія развіваюцца, прывёў да фарміравання *міжнароднай студэнцкай міграцыі*. Сёння колькасць студэнтаў, якія вучацца за мяжой, складае 4,8 млн чалавек. Большасць замежных студэнтаў прадстаўлена афрыканскай, арабскай і кітайскай моладдзю. Самымі мабільнымі з'яўляюцца студэнты краін Афрыкі на поўдзень ад Сахары. Кожны 16-ты афрыканскі студэнт навучаецца за мяжой. У шасці краінах налічваецца 67 % замежных студэнтаў свету. Гэта ЗША (23 %), Вялікабрытанія (12), Германія (11), Францыя (10), Аўстралія (7) і Японія (5 %).

П$_7$

Глабальныя змены клімату, прыродныя бедствы прывялі да з'яўлення *кліматычнай міграцыі*. З-за засух і недахопу вады, павышэння ўзроўню мора, стыхійных бедстваў і экстрэмальных тэмператур 143 млн чалавек у свеце з'яўляюцца кліматычнымі мігрантамі. Найбольшая частка іх прыходзіцца на тры рэгіёны — Афрыку на поўдзень ад Сахары, Паўднёвую Азію і Лацінскую Амерыку.

У свеце цікавага. З-за стыхійных бедстваў у 2017 г. 18,8 млн чалавек былі вымушаны мігрыраваць. Паўднёвая і Усходняя Азія, Карыбскі басейн і Ціхаакіянскі рэгіён з'яўляюцца найбольш слабымі рэгіёнамі. У Кітаі, на Філіпінах і Кубе ў 2017 г. адбылася найбольшая колькасць выпадкаў стыхійных бедстваў. Малыя астраўныя дзяржавы, якія развіваюцца, таксама адчуваюць негатыўнае ўздзеянне стыхійных бедстваў.

Нягледзячы на тое, што кліматычная міграцыя адбываецца ў асноўным у межах краіны, значная частка насельніцтва вымушана перасяляцца за мяжу.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Падвядзём вынікі. Міжнародная міграцыя — гэта працэс, які гістарычна склаўся. Асноўнымі прычынамі міжнароднай міграцыі з'яўляюцца ... . Колькасць міжнародных мігрантаў у свеце пастаянна ... . Для развітых краін характэрна ... сальда міграцыі, для краін, якія развіваюцца, — ... . Вылучаюць наступныя віды міжнароднай міграцыі: ..., ..., …, ..., ...

Праверым свае веды. 1. Назавіце асноўныя прычыны міжнароднай міграцыі. 2. Назавіце асноўныя калідоры міжнародных міграцый і растлумачце іх геаграфію. 3. Назавіце і пакажыце на карце краіны студэнцкай іміграцыі. 4. Назавіце і пакажыце на карце краіны з самай вялікай доляй замежных рабочых.

Ад простага да складанага. 1. Растлумачце, чаму прыкладам умелай узаемасувязі міграцыі працоўнай сілы з узроўнем эканамічнага развіцця з'яўляецца Японія. 2. Падумайце, якія краіны з пункту гледжання міжнароднай міграцыі называюцца краінамі-донарамі, а якія — краінамі-рэцыпіентамі.

Ад тэорыі да практыкі. Запоўніце табліцу ў сшытку.

Прычыны і геаграфія сучасных міжнародных міграцый

Віды міграцый	Прычыны міграцый	Адкуль?	Куды?
Палітычная			
Эканамічная			
Працоўная			
Кліматычная			
Студэнцкая			

Падарожжа па Глабальнай сетцы.

Міжнародная база даных працоўнай міграцыі.

Агульныя вынікі міграцыі насельніцтва Рэспублікі Беларусь.

П$_8$

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

§ 11. Бежанства ў сучасным свеце

Успамінаем. Па якіх прычынах людзі могуць пакідаць сваю краіну? Якая прычына з'яўляецца асноўнай у сучаснай міжнароднай міграцыі? Якія падзеі прымушаюць людзей пакідаць сваё месцажыхарства?

Для чаго мы гэта вывучаем? Як вы думаеце, якая розніца існуе паміж паняццямі «бежанец» і «мігрант»? Якія праблемы цягне за сабой бежанства?

Прычыны бежанства ў свеце. Адной з форм палітычнай міграцыі з'яўляецца бежанства. Гэта форма міграцыі, у адрозненне ад іншых, найбольш моцна закранае правы чалавека і ніколі не бывае добраахвотнай. З другой паловы XX ст. яна носіць глабальны праблемны характар і з'яўляецца адным з самых складаных пытанняў, якія стаяць сёння перад сусветнай супольнасцю.

У свеце ўсё ўзаемазвязана. У канцы XX – пачатку XXI ст. бежанства набыло найбольшыя маштабы за ўсю сваю гісторыю. З чым звязана значнае павелічэнне колькасці бежанцаў? Адказ абгрунтуйце.

Бежанства мае глыбокія гістарычныя карані. Так, у 1951 г. большасць бежанцаў былі еўрапейцамі. Сёння — гэта насельніцтва Азіі і Афрыкі. Калі раней бежанства ўяўляла з сябе вымушаныя міграцыйныя перамяшчэнні асобных людзей, то цяперашнія патокі бежанцаў усё часцей прымаюць масавую форму.


У свеце цікавага. Гісторыя чалавецтва поўная трагічных старонак, звязаных з бежанцамі. Яшчэ ў 695 г. да н. э. 50 тыс. чалавек беглі ў Егіпет, ратуючыся ад асірыйскай арміі цара Сінахерыба, якая ўступіла ў Іўдзею. На пачатку новай эры каля 300 тыс. готаў беглі ад нашэсця качэўнікаў-гунаў на землі Рыма. Працэс распаду Вялікай Рымскай імперыі пад ударамі варвараў суправаджаўся беспрэцэдэнтным «вялікім перасяленнем народаў». У VIII–IX стст. у выніку спусташальных уварванняў вікінгаў у Брытанію каля 40 тыс. астраўлян уцякалі ў Францыю. Тысячы людзей у Еўропе і Азіі ўцякалі ад частых эпідэмій чумы. Сапраўдныя масавыя ўцёкі пачаліся ў першай палове XIII ст., калі мангольскія орды, сеючы смерць і разбурэнні, прайшлі ад Ціхага акіяна да Міжземнага мора.

Прычыны сучаснага бежанства разнастайныя (мал. 72).

Галоўнай міжнароднай арганізацыяй па забеспячэнні правоў і дабрабыту бежанцаў з'яўляецца Упраўленне Вярхоўнага камісара ААН па справах бежанцаў (УВКБ). Яно была створана ў 1950 г. і каардынуе міжнародныя дзеянні па абароне бежанцаў і вырашэнні іх праблем незалежна ад расы, веравызнання, палітычных перакананняў і полу ў сусветным маштабе.


Паразважаем. Як вы разумееце словы Вярхоўнага камісара ААН па справах бежанцаў Антоніу Гуцерэша (2005–2015): «Свет уступае ў новую эру, калі маштабы глабальнага прымусовага перамяшчэння насельніцтва засланяюць усё бачанае раней»? Адказ патлумачце.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Мал. 72. Прычыны бежанства ў свеце

Геаграфія бежанства. У сучасным свеце да росту бежанства прыводзяць як палітычныя і ваенныя канфлікты, так і вельмі нізкі ўзровень эканамічнага развіцця. Пры гэтым трэба разумець, што колькасць бежанцаў можа вагацца ў залежнасці ад актыўнасці падзей, якія адбываюцца. У параўнанні з 1990 г. колькасць бежанцаў у свеце ўзрасла і складае 22,5 млн чалавек (мал. 73). Гэта каля 10 % міжнародных мігрантаў. Большасць з іх — 89 % — з'яўляецца насельніцтвам краін, якія развіваюцца, і 19 % — развітых. У цяперашні час 80 % бежанцаў складаюць жанчыны і дзеці.



Мал. 73. Дынаміка колькасці бежанцаў ў свеце, млн чал.

Свет і Беларусь. Ці адчувае Рэспубліка Беларусь на сваёй тэрыторыі праблему бежанства?

Бежанцы размяркоўваюцца ў свеце па *краіне паходжання* і *па краіне прытулку* (*або прыёму*). Па краіне паходжання найбольшай колькасцю ў 2016 г. характарызаваліся **Сірыя**, **Афганістан** і **Паўднёвы Судан** (мал. 74). Асноўнымі прычынамі эміграцыі з'яўляюцца ваенныя дзеянні, нестабільныя эканамічныя абставіны, нізкі ўзровень жыцця і інш. Найбольшую колькасць бежанцаў прынялі Турцыя, Іарданія і Ліван (мал. 75).

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Мал. 74. Найбуйнейшыя краіны па колькасці бежанцаў (па краіне паходжання), 2016, тыс. чал.



Мал. 75. Найбуйнейшыя краіны па прыёме бежанцаў, 2016, тыс. чал.

Клуб знаўцаў-эканомікагеографаў. Найбольш складаная сітуацыя, якая прызнаецца УВКБ, склалася ў цяперашні час у Сірыі (мал. 76), Емене, Іраку, Паўднёвым Судане, Бурундзі і Нігерыі. Аднак кожны рэгіён стаў самастойнай пляцоўкай бежанства. У Афрыцы з-за засух, голаду і пагрозы харчовай бяспекі 1,8 млн бежанцаў прынялі Уганда, Судан, Кенія, Эфіопія і ДР Конга. У Еўропе з-за міграцыйнага крызісу краінамі, якія найбольш актыўна прымаюць бежанцаў, з'яўляюцца Грэцыя і Сербія. Гуманітарны крызіс Блізкага Усходу і Паўночнай Афрыкі робіць найбольш прыступным да бежанства насельніцтва Сірыі, Емена, Егіпта, Іарданіі, Ірака, Лівана і Турцыі. У Амерыцы прычынай бежанства з'яўляецца гвалт у Цэнтральнай Амерыцы (Гватэмала, Гандурас, Коста-Рыка і Мексіка).

Папрацуем з атласам. Пакажыце на карце краіны з найбольшай колькасцю бежанцаў: Сірыю, Афганістан, Паўднёвы Судан.



Мал. 76. Лагер сірыйскіх бежанцаў у Германіі

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Жэнеўская канвенцыя аб статусе бежанцаў. Колькасць бежанцаў у свеце, якая павялічваецца, стварае праблему атрымання афіцыйнага статусу бежанца і вызначэння дакладных яго прыкмет для краін, што іх прымаюць.

У свеце цікавага. Паняцце «бежанец» з'яўляецца ўпершыню ў 1922 г. у першым пагадненні аб статусе рускіх і армянскіх бежанцаў. У ім былі вызначаны іх правы і прыняты першы праязны дакумент для бежанцаў — нансенаўскі пашпарт (мал. 77). Ён быў названы ў гонар палярнага даследчыка і першага Вярхоўнага камісара па справах бежанцаў Ф. Нансена. У 1942 г. гэты пашпарт прызналі ўрады 52 дзяржаў, і ён дзейнічаў да 1951 г.



Мал. 77. Старонка пашпарта Нансена


Паняцце «бежанец» і яго статус былі прынятыя ў 1951 г. у Жэневе ў Канвенцыі ААН аб статусе бежанцаў. Па вызначэнні ААН, бежанцамі лічацца асобы, якія: 1) могуць стаць ахвярай пераследу па прыкмеце расы, веравызнання, грамадзянства, прыналежнасці да пэўнай сацыяльнай групы, сексуальнай арыентацыі ці па палітычных поглядах; 2) знаходзяцца па-за краінай сваёй грамадзянскай прыналежнасці і не могуць ці не жадаюць карыстацца абаронай гэтай краіны з прычыны асцярогі.

У свеце цікавага. У той час як многія краіны павялічваюць квоты на прадастаўленне статусу бежанца, шэраг дзяржаў з кожным годам скарачае іх колькасць у мэтах бяспекі краіны. Складаная палітычная абстаноўка ў шэрагу краін Азіі і Афрыкі, што развіваюцца, прыводзіць да павелічэння колькасці людзей, якія падаюць прашэнне аб атрыманні прытулку. У 2016 г. было пададзена каля 2 млн новых хадайніцтваў аб прадастаўленні прытулку. Найбольшая колькасць новых просьб аб прытулку атрымліваюць Германія (722 тыс.), ЗША (262), Італія (123) і Турцыя (79 тыс.).

Еўрапейскі міграцыйны крызіс. Часткай глабальнага бежанства з'яўляецца Еўрапейскі міграцыйны крызіс. У 2015 г. шматразовае павелічэнне патоку бежанцаў і нелегальных мігрантаў у Еўрапейскі саюз з краін Паўночнай Афрыкі, Блізкага Усходу і Паўднёвай Азіі і адсутнасць адзінай палітыкі ЕС па іх прыёме і размеркаванні прывялі да міграцыйнага крызісу. Ён стаў найбуйнейшым з часоў Другой сусветнай вайны.

Міграцыйны крызіс абумоўлены пяццю асноўнымі прычынамі (мал. 78).

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Мал. 78. Прычыны Еўрапейскага міграцыйнага крызісу

У 2016 г. у ЕС прыбыло 5,2 млн мігрантаў пераважна з Сірыі, Ірака і Афганістана. Каля 5,1 тыс. бежанцаў і мігрантаў загінулі або прапалі без вестак у Міжземнамор'і. У 2017 г. Міжземнае мора перасеклі каля 103 тыс. чалавек, пры гэтым каля 2,3 тыс. чалавек загінулі або прапалі без вестак.

Галоўнымі краінамі выхаду мігрантаў з'яўляюцца Сірыя, Афганістан, Ірак, Албанія, асноўнымі краінамі прыбыцця — Італія, Грэцыя, Кіпр і Іспанія. У той жа час краінамі, якія легалізавалі найбольшую колькасць мігрантаў, выступілі Германія, Швецыя, Італія, Швейцарыя і Францыя.

Міграцыйная палітыка. У краінах свету складваецца рознае становішча ў галіне міграцыі, актыўнасці патокаў эміграцыі і іміграцыі, а таксама адносна колькасці мігрантаў, якія пакідаюць і прыязджаюць у краіну. Таму для ўстанаўлення спрыяльнай для краіны міграцыйнай сітуацыі адбываецца яе рэгуляванне.

Міграцыйная палітыка — гэта сістэма прынцыпаў, мэт і дзеянняў, з дапамогай якіх дзяржава рэгулюе патокі міграцыі.

Дзяржаўная міграцыйная палітыка павінна быць накіравана на дасягненне мэт, адпаведных інтарэсам развіцця грамадства.

У залежнасці ад міграцыйнай сітуацыі ў краіне, суадносін іміграцыі і эміграцыі ў свеце вылучаюць палітыку ў галіне іміграцыі і палітыку ў галіне эміграцыі. Іміграцыйная палітыка рэгламентуе правілы і нормы прыняцця замежных грамадзян, а эміграцыйная палітыка — выезд грамадзян за мяжу.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Клуб знаўцаў-эканомікагеографаў. У абагульненым выглядзе міграцыйную палітыку ў краінах свету можна падзяліць на наступныя віды: 1) міграцыйная палітыка не замінае эміграцыі, але жорстка рэгламентуе іміграцыю (напр., ЗША, Канада, Аўстралія і іншыя развітыя краіны); 2) міграцыйная палітыка не перашкаджае эміграцыі і спрыяе іміграцыі (напр., Ізраіль, Германія, нафтаздабываючыя краіны Паўднёва-Заходняй Азіі); 3) міграцыйная палітыка не перашкаджае ні эміграцыі, ні іміграцыі (напр., Туніс, Егіпет, Польшча); 4) міграцыйная палітыка накіравана на закрытасць краіны (Куба, КНДР).

У залежнасці ад стаўлення да мігрантаў вылучаюць: 1) палітыку асіміляцыі (зліццё аднаго народа з іншым са стратай адным з народаў сваёй мовы, культуры, нацыянальнай самасвядомасці); 2) палітыку мультыкультуралізму (падтрымка новых ідэнтычнасцей: этнічных, рэлігійных; мяркуе талерантнасць, уключэнне ў культурны працэс элементаў культур эмігрантаў, узаемнае пранікненне розных культур); 3) палітыку сацыяльнай інтэграцыі і культурна-моўнай адаптацыі (паспяховае ўліванне вялікай колькасці людзей, якія належаць да іншай супольнасці, у сацыякультурную прастору іншай культурнай супольнасці).



Падвядзём вынікі. Бежанства — гэта ... . Асноўнымі прычынамі бежанства з'яўляюцца ваенныя канфлікты, экалагічныя катастрофы, рэлігійная непрыязнасць. Асноўным рэгіёнам, куды накіраваліся асноўныя патокі бежанцаў, з'яўляецца ... . Еўрапейскі саюз адчувае міграцыйны крызіс. Дзяржавамі з найбольшай колькасцю бежанцаў з'яўляюцца ... .



Праверым свае веды. 1. Назавіце асноўныя прычыны бежанства. 2. Які дакумент вызначае статус бежанца? 3. Якія краіны прынялі найбольшую колькасць бежанцаў?



Ад простага да складанага. Сёння ў адзінай Еўропы няма агульнага рашэння, як рэгуляваць міграцыйную палітыку. У гэтым рэгіёне больш не засталося краін, гатовых працягваць палітыку адкрытых меж. Пазіцыі асобных дзяржаў і кіраўніцтва Еўрасаюза адрозніваюцца толькі тым, як лепш узяць паток мігрантаў пад кантроль. Прапануйце шляхі выхаду з міграцыйнага крызісу Еўропы.



Падарожжа па Глабальнай сетцы.

Сайт Упраўлення Вярхоўнага камісара Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па справах бежанцаў.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



§ 12. Размяшчэнне насельніцтва свету

Успамінаем. Калі і дзе з'явіліся першыя людзі на нашай планеце? Ці раўнамерна размешчана насельніцтва на Зямлі? Якія фактары вызначаюць размяшчэнне людзей?

Для чаго мы гэта вывучаем? Як уплывае змена шчыльнасці насельніцтва на эканамічнае развіццё краіны? Якія праблемы цягнуць за сабой прыродныя катаклізмы і як гэта адбіваецца на размяшчэнні насельніцтва? Якія прагнозы адносна размяшчэння магчыма зрабіць, выкарыстоўваючы статыстычныя дэмаграфічныя паказчыкі? Веды якіх тэрмінаў і паняццяў, вывучаных раней, вам неабходны будуць пры вывучэнні тэмы?

Размяшчэнне насельніцтва свету, асноўныя фактары. Паміж натуральным рухам, міграцыяй і размяшчэннем насельніцтва існуе непасрэдная сувязь. Карціна размяшчэння насельніцтва свету, якая склалася, — гэта вынік двух вышэйзгаданых працэсаў.


Размяшчэнне насельніцтва — працэс асваення і засялення насельніцтвам тэрыторыі айкумены і фарміравання сеткі паселішчаў на пэўны момант часу.

У гісторыі развіцця чалавецтва выбар таго ці іншага месца жыхарства вызначаецца характарам працоўнай дзейнасці і магчымасцю ёю займацца. На працягу развіцця грамадства паступова змяняла і ўскладняла характар заняткаў, якія абумоўлівалі месца размяшчэння чалавека (мал. 79).

У размяшчэнні насельніцтва свету вылучаюць тры асноўныя гістарычныя фактары (мал. 80). Аднак варта ўлічваць і дадатковыя фактары: асаблівасці дэмаграфічнага развіцця, міграцыйны, гістарычны (працягласць перыяду фарміравання насельніцтва

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

на дадзенай тэрыторыі), экалагічны, лакальныя фактары, якія дзейнічаюць толькі на пэўнай тэрыторы.



Мал. 79. Гістарычная сувязь размяшчэння насельніцтва з характарам працы чалавека

У цэлым нераўнамернасць размяшчэння — гэта сукупны эфект дзеяння ўсіх фактараў.

1. Роля прыроднага асяроддзя

размяшчэнне насельніцтва рэгулююць умовы для вырошчвання сельскагаспадарчых культур — рысу, пшаніцы, кукурузы, жыта, бульбы;
раёны канцэнтрацыі насельніцтва — даліны і вусці рэк Янцзы, Хуанхэ, Меконга, Ганга, Ніла, По; нізіны і раўніны Еўропы, за Уралам, паўночнаамерыканскія прэрыі і інш.

2. Размяшчэнне прамысловасці

1. *Размяшчэнню насельніцтва спрыялі пачатковыя фазы мануфактурнай вытворчасці — тэкстыльная, шкляная і інш.*;
раёны канцэнтрацыі насельніцтва — перадгор'і з багаццем вады і сыравіны;
2. *Размяшчэнне насельніцтва ў раёнах здабычы карысных выкапняў і развіцця цяжкай прамысловасці*;
раёны канцэнтрацыі насельніцтва — Цэнтральная Англія, Вестфалія, Латарынгія, Верхняя Сілезія, паўночны ўсход ЗША і інш.

3. Рост міжнароднага гандлю і марскіх перавозак

размяшчэнне насельніцтва абумоўлена фарміраваннем буйных партоў, развіццём прыморскіх прамысловых і рэкрэацыйных раёнаў;
раёны канцэнтрацыі насельніцтва — Японія, узбярэжжы Міжземнага і Чорнага мораў еўрапейскіх краін, ЗША, узбярэжжы Атлантычнага акіяна краін Паўднёвай Амерыкі і інш.

Мал. 80. Гістарычныя фактары размяшчэння насельніцтва свету (па А. Ягельскаму)

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Размяшчэнне насельніцтва вывучаецца з дапамогай паказчыка шчыльнасці насельніцтва. Ён разлічваецца як адносіны колькасці пастаяннага насельніцтва да плошчы тэрыторыі (без уліку буйных унутраных водных басейнаў).

Насельніцтва свету вельмі нераўнамерна размешчана на паверхні Зямлі. На 7 % сушы пражывае 70 % насельніцтва. Яно засяроджана пераважна ў Паўночным і Усходнім паўшар'ях, у зоне ўмеранага клімату. З другой паловы XX ст. быў характэрны зрух насельніцтва да ўзбярэжжаў. Гэта сфарміравала прыбярэжны характар размяшчэння насельніцтва. Самы высокі ўзровень «марынізацыі» размяшчэння насельніцтва адзначаецца ў Аўстраліі (80 %), самы нізкі — у Афрыцы (каля 18 %). У цяперашні час каля 30 % насельніцтва свету жыве на адлегласці да 50 км ад марскога ўзбярэжжа.

Насельніцтва свету засяроджана ў раёнах з невялікай вышынёй над узроўнем мора. Каля 70 % насельніцтва свету жыве не вышэй за 500 м над узроўнем мора і крыху больш за 8 % — на тэрыторыі вышэй за 1000 м над узроўнем мора. На нізінах больш за ўсё насельніцтва пражывае ў Еўропе (69 %) і Аўстраліі (73); менш за ўсё — у Афрыцы (32) і Паўднёвай Амерыцы (42 %).

У свеце вылучаюць *чатыры асноўныя арэалы высокай шчыльнасці насельніцтва* і *чатыры найбольш рэдказаселеныя арэалы* (мал. 81).

Арэалы высокай шчыльнасці насельніцтва

1. Усход і паўднёвы ўсход Азіі (больш за 200 чал./км^2)
2. Індастан (200–500 чал./км^2)
3. Еўропа (больш за 150 чал./км^2)
4. Паўночны ўсход ЗША і паўднёвы ўсход Канады (больш за 150 чал./км^2)

Найбольш рэдказаселеныя арэалы (менш за 5 чал./км^2)

1. Тэрыторыі Паўночнай Амерыкі і Еўразіі з прыпалярнымі архіпелагамі, якія прылягаюць да марскіх узбярэжжаў Паўночнага Ледавітага акіяна
2. Пустыні Паўночнай Афрыкі, Цэнтральнай і Заходняй Аўстраліі, Цэнтральнай Азіі
3. Экватарыяльныя лясы басейна Амазонкі
4. Аравійскі паўвостраў

Мал. 81. Густазаселеныя і рэдказаселеныя арэалы свету

У свеце ўсё ўзаемазвязана. Дзе і чаму ў свеце размешчаны раёны з высокай і нізкай шчыльнасцю насельніцтва? Прывядзіце прыклады, якія даказваюць дадзеныя факты. Як наступства аварыі на ЧАЭС паўплывалі на змяненне размяшчэння насельніцтва краін-суседзяў? З чым звязана высокая шчыльнасць насельніцтва на акіянічных узбярэжжах Амерыкі і Афрыкі?

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Мал. 82. Высокая шчыльнасць гарадской забудовы ў Бахрэйне




Мал. 83. Рэдказаселеныя тэрыторыі ў Манголіі

Геаграфія шчыльнасці насельніцтва свету. Насельніцтва свету размешчана ў межах рэгіёнаў і краін вельмі нераўнамерна. Шчыльнасць насельніцтва няўхільна павялічваецца і складае 59 чал./км^2. Максімальны паказчык шчыльнасці, за выключэннем найдрабнейшых дзяржаў, адзначаны ў **Бахрэйне** (мал. 82) (1964 чал./км^2). Мінімальныя значэнні зафіксаваны ў **Манголіі** (мал. 83) (1,9 чал./км^2).

У свеце цікавага. З найдрабнейшых дзяржаў максімальныя паказчыкі шчыльнасці насельніцтва характэрныя для Манака (25 709,4 чал./км^2) і Сінгапура (7907,5 чал./км^2).

У выніку адрозненняў у характары натуральнага руху і міграцыі шчыльнасць насельніцтва ў развітых краінах і краінах, якія развіваюцца, значна адрозніваецца (мал. 84). У краінах, якія развіваюцца, яна значна вышэйшая і перавышае 75 чал./км^2, у развітых — амаль у тры разы меншая — крыху больш за 25 чал./км^2.



Мал. 84. Дынаміка шчыльнасці насельніцтва свету, чал./км^2


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Найбольш густазаселеным рэгіёнам свету з'яўляецца Азія (142,4 чал./км^2). У Афрыцы шчыльнасць насельніцтва складае 40,3 чал./км^2. Еўропа з Расіяй і Паўднёвая Амерыка характарызуюцца прыкладна роўнымі паказчыкамі — 33,5 і 31,4 чал./км^2. У краінах Паўночнай Амерыкі — 19,1 чал./км^2. Рэдказаселеным рэгіёнам свету з'яўляюцца Аўстралія і Акіянія — 4,7 чал./км^2 (мал. 85).

Папрацуем з атласам. Вылучыце рэгіёны свету з максімальнай і мінімальнай шчыльнасцю насельніцтва. Вызначыце, як паўплывалі прыродныя ўмовы на шчыльнасць насельніцтва ў гэтых рэгіёнах.

Свет і Беларусь. Якая шчыльнасць насельніцтва Рэспублікі Беларусь? Якая вобласць мае найбольшую шчыльнасць насельніцтва, якая — найменшую? У чым сутнасць змен, што адбываюцца ў размяшчэнні насельніцтва Беларусі ў цяперашні час?

Палосы канцэнтрацыі насельніцтва ў рэгіёнах свету. Унутрыкраінная дыферэнцыяцыя шчыльнасці насельніцтва. Рэгіёны свету адрозніваюцца шэрагам асаблівасцей размяшчэння насельніцтва.



Мал. 85. Шчыльнасць насельніцтва свету, 2018 г., чал./км^2

Еўропа — рэгіён з адносна раўнамерна высокай шчыльнасцю насельніцтва, якая ўтвараецца пераважна за кошт гарадскіх жыхароў. У рэгіёне вылучаюцца *тры палосы высокай шчыльнасці насельніцтва*.

Першая паласа пачынаецца на паўднёвым усходзе Англіі, праходзіць праз Бельгію, Нідэрланды, Люксембург і даліну Рэйна на ўсход, у Сілезію. *Другая паласа* ідзе з поўначы на поўдзень па даліне Рэйна і, перарываючыся Альпамі, пашыраецца ў Паўночнай

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Італіі, ахопліваючы даліну ракі По. *Трэцяя паласа* прадстаўлена адносна густазаселенай далінай Дуная і ўзбярэжжам Міжземнага мора.

У Еўропе вылучаюцца краіны з выяўленай унутранай дыферэнцыяцыяй размяшчэння насельніцтва. У першую чаргу гэта Вялікабрытанія і Францыя.

Клуб знаўцаў-эканомікагеографаў. У Вялікабрытаніі, у паўднёва-ўсходняй частцы, сярэдняя шчыльнасць перавышае 350 чал./км^2, у той час як у Шатландыі яна меншая за 10 чал./км^2. У Францыі ў гарыстых раёнах Цэнтральнага масіва шчыльнасць насельніцтва ў некалькі разоў меншая, чым у прыбярэжных раёнах Брэтані, і г. д.

Азія з'яўляецца рэгіёнам са значнымі кантрастамі ў размяшчэнні насельніцтва, якое, у адрозненне ад Еўропы, фарміруецца за кошт сельскіх жыхароў. Як і ў Еўропе, тут вылучаюцца краіны з дыферэнцыяцыяй размяшчэння насельніцтва. Гэта Кітай з густазаселенымі ўсходнімі раёнамі і надзвычай рэдказаселенымі раёнамі Тыбета. У Індыі густазаселеная даліна Ганга знаходзіцца ў кантрасце з рэдказаселеным пласкагор'ем Дэкан і слабаабжытымі гімалайскімі раёнамі. У Інданезіі шчыльнасць насельніцтва на в. Ява перавышае 600 чал./км^2, а на Калімантане — менш за 50 чал./км^2.

Паразважаем. Чаму на в. Ява самая вялікая шчыльнасць насельніцтва, а на размешчаным побач в. Калімантан — нязначная? Як звязаны паміж сабой сельская гаспадарка і шчыльнасць насельніцтва?

Афрыка з'яўляецца рэгіёнам адносна слабазаселеным, дзе значэнне шчыльнасці насельніцтва ніжэйшае за сяроднесусветны ўзровень. Найбольшай дыферэнцыяцыяй у размяшчэнні насельніцтва ў межах краін вылучаецца Паўночная Афрыка.

Амерыка характарызуецца адносна слабай заселенасцю пры пастаянным росце колькасці насельніцтва. Краінамі з выяўленай унутранай дыферэнцыяцыяй у характары размяшчэння насельніцтва з'яўляюцца Канада, ЗША, Бразілія.

Падвядзём вынікі. Насельніцтва на Зямлі размешчана нераўнамерна. На размяшчэнне насельніцтва аказалі ўплыў тры гістарычныя фактары. Аднак вялікае значэнне і такіх фактараў, як ..., ..., ... Асноўны паказчык для вывучэння размяшчэння насельніцтва — ... насельніцтва. Існуюць значныя адрозненні паміж рэгіёнамі свету па шчыльнасці насельніцтва. У рэгіёнах свету вылучаюць ... канцэнтрацыі насельніцтва. Адрозненні ў шчыльнасці насельніцтва існуюць і ўнутры дзяржаў.

Праверым свае веды. 1. Што такое шчыльнасць насельніцтва? 2. Якая шчыльнасць насельніцтва свету? 3. Назавіце групы фактараў, якія аказваюць істотны ўплыў на размяшчэнне насельніцтва Зямлі. 4. Якая краіна характарызуецца найбольшай шчыльнасцю насельніцтва ў свеце і чым гэта можна растлумачыць?

Ад простага да складанага. 1. Чаму паказчык сярэдняй шчыльнасці насельніцтва свету мае тэндэнцыю росту? 2. Што меў на ўвазе вядомы географ А. І. Ваейкаў, калі сказаў, што «вырашальным фактарам у размеркаванні насельніцтва з'яўляецца не столькі навакольнае асяроддзе, колькі сам чалавек»?

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Ад тэорыі да практыкі. 1. Па прагнозах навукоўцаў, да 2056 г. колькасць насельніцтва Зямлі дасягне 10 млрд чалавек. Разлічыце прагнозную шчыльнасць насельніцтва свету ў 2056 г. і параўнайце з сучаснай. 2. Накладзіце фізічную карту свету на карту шчыльнасці насельніцтва і вызначыце, якія экстрэмальныя прыродныя ўмовы не спрыяюць размяшчэнню людзей на планеце.

Падарожжа па Глабальнай сетцы.
Перспектывы сусветнага насельніцтва, 2017 г. Аддзяленне народанасельніцтва ААН.

§ 13. Геаграфія рассялення свету

Успамінаем. Якія асноўныя формы рассялення склаліся ў залежнасці ад фізіка-геаграфічных умоў у працэсе засялення Зямлі людзьмі? Што такое населены пункт? Якія тыпы населеных пунктаў вы ведаеце? Што вы разумееце пад працэсам урбанізацыі?

Для чаго мы гэта вывучаем? Як горад уплывае на навакольнае асяроддзе? Спецыялісты якіх прафесій неабходныя для вырашэння праблем развіцця горада?

Геаграфія рассялення свету, фактары, формы рассялення. Рассяленне насельніцтва — гэта складаны сацыяльна-эканамічны працэс, таму разам з геаграфіяй насельніцтва ён вывучаецца такімі навукамі, як дэмаграфія, сацыялогія, этнаграфія і інш. Для геаграфіі важна разглядаць рассяленне ва ўзаемадзеянні з прыродным асяроддзем і ў гістарычным разрэзе. Гісторыка-геаграфічны падыход дазваляе прасачыць гісторыю асваення чалавекам заселенай тэрыторыі, якая ўключае ўсе заселеныя і асвоеныя людзьмі тэрыторыі.

Рассяленне — гэта працэс размеркавання і перараз меркавання насельніцтва з наступным фарміраваннем сеткі паселішчаў.

ПРЫРОДНЫЯ	• клімат, рэльеф мясцовасці; • глебы, карысныя выкапні і іншыя прыродныя рэсурсы
САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНЫЯ	• агульны ўзровень развіцця эканомікі; • рэгіянальныя адрозненні ў размяшчэнні галін гаспадаркі, даходах насельніцтва і г. д.
ДЭМАГРАФІЧНЫЯ	• рэгіянальныя адрозненні міграцыйных працэсаў; • інтэнсіўнасць працэсаў узнаўлення насельніцтва

Мал. 86. Групы фактараў рассялення

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Мал. 87. Качавое рассяленне ў Манголіі



Мал. 88. Качавыя народы Афрыкі — туарэгі

Паняцце «рассяленне насельніцтва» ўключае ў сябе размяшчэнне насельніцтва. На працэс рассялення насельніцтва ўплываюць тры групы фактараў (мал. 86). З ростам узроўню сацыяльна-эканамічнага развіцця ўплыў прыродных фактараў слабее. *Галоўная заканамернасць рассялення насельніцтва* — адпаведнасць форм рассялення спосабу вытворчасці і ўзроўню развіцця прадукцыйных сіл.

Рассяленне ў свеце разнастайнае, але пры гэтым вылучаюць дзве асноўныя яго формы — *качавое* і *аселае* з перавагай апошняга.

У свеце яшчэ захоўваецца вялікая колькасць народаў, якія ў выніку сваёй асноўнай гаспадарчай дзейнасці — жывёлагадоўлі — вядуць качавы лад жыцця. Напрыклад, у Афрыцы і Азіі (мал. 87, 88).

Усе населеныя пункты дзеляцца на два тыпы — *гарадскія* і *сельскія*. У аснове іх вылучэння ляжыць некалькі прыкмет (напр., колькасць насельніцтва, адміністрацыйны статус, шчыльнасць насельніцтва і гушчыня забудовы, асаблівасці планіроўкі і архітэктуры і інш.), але асноўным выступае характар занятасці насельніцтва.

Свет і Беларусь. 1. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка неаднаразова звяртае ўвагу ў сваіх выступленнях, што трэба «вырашыць пытанне прывабнасці жыцця ў вёсцы». Чаму гэта пытанне вельмі актуальнае для нашай дзяржавы? Якія меры падтрымкі ажыццяўляе дзяржава для жыхароў сельскай мясцовасці? 2. Успомніце прыкметы вылучэння гарадскіх паселішчаў у Беларусі. Назавіце агламерацыю на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

Для рассялення насельніцтва свету найбольш важнай тэндэнцыяй выступае рост гарадоў і гарадскога насельніцтва. Гэта тлумачыцца сацыяльна-эканамічным пераўтварэннем горада і вёскі на аснове падзелу працы, які прыводзіць да інтэнсіўнага развіцця індустрыі, транспарту, паслуг.



П$_1$ П$_2$ П$_3$ П$_4$

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Урбанізацыя свету і яе геаграфія. Урбанізацыя як сусветны гістарычны і складаны працэс непарыўна звязана з канцэнтрацыяй дзейнасці ў параўнальна нешматлікіх цэнтрах развіцця і ахоплівае змены ў размяшчэнні вытворчасцей, рассяленні, дэмаграфічнай структуры, ладзе жыцця, культуры і г. д.

У свеце ўсё ўзаемазвязана. Дзе і калі ўзніклі першыя гарады? Урбанізацыя ў менш развітых краінах праходзіць хуткімі тэмпамі і часта называецца «ілжывай». У чым прычына такой урбанізацыі?

Працэс урбанізацыі праходзіць некалькі стадый, кожная з якіх характарызуецца адметнымі прыкметамі і з'яўленнем форм гарадскога рассялення (мал. 89).

Стадыя	Асноўныя характарыстыкі	Прасторавая форма
Пачатковая (кропкавая) урбанізацыя	• больш хуткі рост гарадскога насельніцтва ў параўнанні з сельскім; • паскоранае развіццё **кропкавых гарадоў**; • звязана з перыядам развіцця буйной прамысловай вытворчасці, масавым адтокам насельніцтва з сельскай мясцовасці ў гарады	
Класічная ўрбанізацыя	• развіццё **агламерацый** пры паскораным росце іх ядраў, скарачэнні сельскага насельніцтва за міграцыі ў гарады; • у прыгарадах вялікіх гарадоў з'яўляюцца гарады-«спальні» і спадарожнікі вытворчага профілю	
Позняя ўрбанізацыя (гіперурбанізацыя)	• рэзкае павелічэнне плошчы і колькасці насельніцтва горада з ярка выяўленымі негатыўнымі экалагічнымі праявамі; • скарачэнне колькасці цэнтральных частак гарадоў; • з'яўленне спецыфічнай формы гіперурбанізаваных паселішчаў — **мегалапалісаў**	

Мал. 89. Стадыі працэсу ўрбанізацыі

Па меры ўскладнення эканамічных сувязей паміж гарадскімі населенымі пунктамі замест кропкавых гарадоў пачынаюць узнікаць агламерацыі.


Агламерацыя — кампактная форма прасторавага размяшчэння гарадскіх паселішчаў, аб'яднаная разнастайнымі інтэнсіўнымі сувязямі ў складаную сістэму.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Гарадскія агламерацыі могуць быць монацэнтрычнымі (з адным горадам-ядром) і поліцэнтрычнымі (з некалькімі гарадамі-ядрамі).

Сінонім гарадской агламерацыі ў Вялікабрытаніі — канурбацыя, у ЗША — метраполісы.

Паразважаем. Ці супадаюць межы горада і межы агламерацыі? Калі не, то чым яны вызначаюцца? Які выгляд міграцый вызначае ў цэлым межы агламерацыі? Чаму адны гарады растуць, а іншыя — не?



Мал. 90. Найбуйнейшыя агламерацыі свету, 2018 г., млн чал.

Найбуйнейшымі гарадскімі агламерацыямі свету, колькасць насельніцтва якіх перавышае 30 млн чалавек, з'яўляюцца **Дэлі**, **Токіа** і **Шанхай** (мал. 90). У XXI ст. большасць з іх размешчана ў краінах, якія развіваюцца.

На апошняй стадыі ў сувязі з пашырэннем плошчы агламерацый, узмацненнем эканамічных узаемасувязей паміж імі і паскораным ростам іх перыферыйных зон узнікаюць мегалаполісы.

Мегалаполіс — найбольш буйная форма гарадскога рассялення, урбанізаваная зона, якая ўтвараецца пры зрастанні вялікай колькасці суседніх гарадскіх агламерацый.

У адрозненне ад агламерацыі мегалаполіс мае значна большую плошчу, колькасць насельніцтва і прадстаўлены арэальна-лінейнай формай у выглядзе гірлянды гарадоў, нанізаных на натуральныя ці штучныя транспартныя шляхі.

Мегалаполісы фарміруюцца ў цяперашні час як у развітых краінах, так і ў краінах, якія развіваюцца. Найбольш вядомымі і буйнымі па плошчы і колькасці насельніцтва мегалаполісамі ў свеце ў развітых краінах з'яўляюцца — **Транс'еўрапейскі** (ці **«Блакітны банан»**), **Паўночна-Усходні (Босваш)** і **Прыазёрны (Чыпітс)** (ЗША) (мал. 91), у краінах, якія развіваюцца, — **Візагмахангар** (Індыя, Бангладэш) і **Сан-Рыа** (Бразілія).




Мал. 91. Прыазёрны мегалаполіс (Чыпітс)

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Папрацуем з атласам. Пакажыце на карце найбуйнейшыя мегалаполісы свету. Дзе і якія мегалаполісы, на ваш погляд, могуць з'явіцца ў бліжэйшай будучыні?

У залежнасці ад узроўню сацыяльна-эканамічнага развіцця рэгіёнаў і краін у свеце назіраецца несінхроннае праходжанне стадый. У большасці краін, якія развіваюцца, пераважае класічная ўрбанізацыя і адбываецца канцэнтрацыя насельніцтва ў гарадах. У развітых краінах назіраецца пераважна гіперурбанізацыя і адток карэннага насельніцтва з гарадоў.

На другую палову XX ст. прыходзіцца пік урбанізацыі свету. У 1960 г. кожны трэці жыхар свету пражываў у гарадах, у тым ліку ў развітых краінах — каля 60 % усяго насельніцтва, у краінах, якія развіваюцца, — больш за 20 %. У XXI ст. доля гарадскога насельніцтва свету складае 55,3 % (мал. 92). У развітых краінах пражывае ў гарадах амаль 80 % насельніцтва, у краінах, якія развіваюцца, — каля 50 %. Краінай з максімальнай доляй гарадскога насельніцтва ў свеце — 99 % — з'яўляецца **Катар**. Менш за ўсё гарадскіх жыхароў у **Бурундзі** — 13 %.




Мал. 92. Дынаміка долі гарадскога насельніцтва свету, %

Клуб знаўцаў-эканомікагеографаў. Паміж рэгіёнамі існуюць адрозненні ва ўзроўні ўрбанізацыі. Самымі ўрбанізаванымі з'яўляюцца Паўночная і Паўднёвая Амерыка — 82 і 81 % адпаведна. У Еўропе адбываецца скарачэнне долі гарадскога насельніцтва (74,5 %). У Аўстраліі і Акіяніі 68 % насельніцтва жыве ў гарадах, у Азіі — 50 %. Найменш урбанізаваным рэгіёнам з'яўляецца Афрыка — 42,5 %.

На пачатку XXI ст. назіраецца запаволенне тэмпаў росту гарадскога насельніцтва. Аднак у параўнанні з дынамікай агульнай колькасці насельніцтва свету колькасць гарадскога насельніцтва расце ў паўтара раза хутчэй. Штогадовыя тэмпы складаюць 2 %. З другой паловы XX ст. гарадское насельніцтва павялічваецца больш інтэнсіўна ў краінах, якія развіваюцца, чым у развітых (мал. 93). Пры штогадовым росце колькасці гараджан на 2,3 % у краінах, якія развіваюцца, ён складае 2,5 %. Развітыя краіны характарызуюцца нізкімі тэмпамі росту гарадскога насельніцтва — 0,5 %.

Для сучаснай урбанізацыі характэрны найбольш хуткі рост колькасці насельніцтва буйных гарадоў або мегагарадоў (мегасіці).

Правообладатель Адукацыя і выхаванне




Мал. 93. Гарадское насельніцтва свету, %

Мегасіці — звышбуйныя гарады з колькасцю насельніцтва больш за 10 млн чалавек.

У 1960-х гг. такіх гарадоў у свеце было тры — Токіа, Нью-Ёрк і Осака, у 2000 — 16, у 2018 г. — 33. Прадстаўлены яны пераважна ў краінах, якія развіваюцца (Кітай, Індыя, Мексіка, Бразілія і інш.).

Гарадскія трушчобы ў сучасным свеце. Хуткія тэмпы ўрбанізацыі ў краінах, якія развіваюцца, і нізкі ўзровень сацыяльнага-эканамічнага развіцця прывялі да фарміравання трушчобнага гарадскога рассялення. *Трушчобай* называюць жылы масіў з высокай шчыльнасцю стыхійнай гарадской забудовы, якая адрозніваецца адсутнасцю або вострым недахопам асноўнай інфраструктуры (электрычнасць, каналізацыя і г. д.) для паўнавартаснага грамадскага жыцця чалавека і бедным сацыяльным асяроддзем.



Мал. 94. Размеркаванне трушчобнага гарадскога рассялення па рэгіёнах, %

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

На пачатку XXI ст. у трушчобах пражывае каля 923,9 млн гараджан, або 32 % гарадскога насельніцтва свету. Найбольшая доля трушчобнага рассялення характэрная для краін Афрыкі на поўдзень ад Сахары (71,9 %) і Азіі (40 %), якія развіваюцца (мал. 94).

Краінамі з ярка выяўленым трушчобным гарадскім рассяленнем з'яўляюцца **Бразілія** (мал. 95), **Індыя**, **Нігерыя**.



Мал. 95. Трушчобная ўрбанізацыя ў Бразіліі

Падвядзём вынікі. Існуюць дзве асноўныя формы (... і ...) і два асноўныя тыпы (... і ...) рассялення.

На рассяленне насельніцтва аказвае ўплыў шэраг фактараў ... . Большая частка насельніцтва свету жыве ў ... . Агламерацыя — кампактная форма прасторавага аб'яднання ... .

Мегалаполіс — найбольш буйная форма гарадскога рассялення, якая ўтвараецца пры ... . Для сучаснага этапу ўрбанізацыі характэрныя дзве галоўныя асаблівасці: хуткія тэмпы павелічэння долі гарадскога насельніцтва ў краінах, якія развіваюцца, і ... . Найбольш высокі паказчык долі гарадскога насельніцтва ў ... краінах. Урбанізацыя ў любой краіне праходзіць некалькі стадый.

Праверым свае веды. 1. Назавіце адметныя рысы развіцця працэсу ўрбанізацыі ў развітых краінах і краінах, якія развіваюцца. 2. У чым розніца паняццяў «горад», «агламерацыя», «мегалаполіс» і на якіх стадыях урбанізацыі яны ўзнікаюць?

Ад простага да складанага. 1. У якіх тыпах краін і рэгіёнах адзначаны максімальны рост гарадскіх агламерацый у другой палове XX – пачатку XXI ст.? 2. З прыведзеных прыкладаў выберыце гарады, для якіх можа быць характэрная з'ява «ілжывай» урбанізацыі: Рыа-дэ-Жанейра, Масква, Каракас, Лондан, Шанхай, Ліма. 3. У цяперашні час для развітых краін характэрная такая з'ява, як субурбанізацыя. Паспрабуйце раскрыць гэта паняцце. Назавіце тры асноўныя прычыны гэтай з'явы. 4. Падумайце, ці характэрная гэта з'ява для нашай краіны ў цяперашні час.

Ад тэорыі да практыкі. 1. Уявіце, што вам паступіла прапанова прыняць удзел у дыспуце «Жыццё ў малым горадзе». Падрыхтуйце аргументы «за» і «супраць». 2. Выкажыце сваё меркаванне пра жыццё ў цэнтры горада і на яго ўскраіне. 3. Выканайце практычную работу «Два партрэты ўрбанізацыі: падабенствы і адрозненні паміж развітымі краінамі і краінамі, якія развіваюцца» (на прыкладзе дзвюх краін на выбар) паводле тыпавога плана (гл. дадатак 2).

Падарожжа па Глабальнай сетцы.

Сайт Праграмы Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па населеных пунктах.

Перспектывы сусветнай урбанізацыі, 2018 год. Ключавыя факты. Аддзяленне народанасельніцтва ААН.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

АБАГУЛЬНЯЛЬНАЕ ПАЎТАРЭННЕ ПА РАЗДЗЕЛАХ I, II

1. Сучасная палітычная карта свету і палітычная геаграфія
2. Геаграфія насельніцтва свету



Праверым свае веды.

1. Квазідзяржава — гэта... .
2. Геаканфлікталогія — гэта... .
3. Палітычная геаграфія — гэта... .
4. Геапалітыка — гэта... .
5. Электаральная геаграфія — гэта... .
6. Дэмаграфічнае старэнне — гэта... .
7. Узнаўленне насельніцтва — гэта... .
8. Мегасіці — гэта... .
9. Мегалаполіс — гэта... .
10. Міграцыйны пераход — гэта... .
11. Якія змены адбыліся на палітычнай карце свету ў XX–XXI стст.?
12. Якая роля ААН у фарміраванні палітычнай карты свету?
13. Назавіце рэгіянальныя і лакальныя канфлікты, якія адбываюцца ў цяперашні час. Пакажыце прычыны гэтых канфліктаў.
14. Якое месца займае геапалітыка ў сістэме геаграфічных навук?
15. Якія фактары ўплываюць на дэмаграфічную сітуацыю ў краіне?
16. Чаму на палітычнай карце свету з'яўляюцца самаабвешчаныя дзяржавы? Прывядзіце прыклады.
17. Чаму многія краіны прэтэндуюць на тэрыторыі ў Антарктыцы?
18. Чаму насельніцтва нераўнамерна размяшчаецца па тэрыторыі Зямлі?
19. Чаму існуюць адрозненні ва ўзроўні ўрбанізацыі паміж развітымі краінамі і краінамі, якія развіваюцца?
20. Чаму для міграцыйных працэсаў характэрная хвалепадобнасць?



Папрацуем з атласам.

1. Пакажыце на карце пяць залежных тэрыторый. Якім дзяржавам яны належаць?
2. Пакажыце на карце «гарачыя кропкі» цяперашняга часу.
3. Пакажыце на карце пяць найбуйнейшых дзяржаў свету па колькасці насельніцтва і назавіце іх сталіцы.
4. Пакажыце на карце краіну з максімальнай нараджальнасцю, назавіце яе сталіцу; дзяржаву з мінімальнай нараджальнасцю і яе сталіцу.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

5. Пакажыце на карце краіну з максімальнай смяротнасцю насельніцтва ў свеце і яе сталіцу; краіну з мінімальнай смяротнасцю насельніцтва ў свеце і яе сталіцу.

6. Назавіце і пакажыце краіну з найбольшай доляй насельніцтва «дзіцячых узростаў» у полаўзроставай структуры.

7. Назавіце і пакажыце краіну з найбольшай доляй насельніцтва ва ўзросце 60+.

8. Пакажыце на карце краіну са станоўчай дынамікай колькасці насельніцтва.

9. Пакажыце на карце краіны з адмоўнай дынамікай колькасці насельніцтва.

10. Пакажыце на карце краіну з максімальнай шчыльнасцю насельніцтва, назавіце яе сталіцу; дзяржаву з мінімальнай шчыльнасцю насельніцтва і яе сталіцу.

11. Пакажыце на карце краіну з максімальнай доляй гарадскога насельніцтва, назавіце яе сталіцу; краіну з мінімальнай доляй гарадскога насельніцтва і яе сталіцу.

12. Назавіце тры найбуйнейшыя агламерацыі свету.

13. Назавіце найбуйнейшыя мегалаполісы свету.

14. Пакажыце на карце асноўныя калідоры міжнародных міграцый.

15. Назавіце і пакажыце дзяржавы — лідары па колькасці бежанцаў.



Прагназуем.

1. Якія змены адбудуцца на палітычнай карце свету ў бліжэйшыя 100 гадоў?

2. Якія новыя напрамкі ў сацыяльна-эканамічнай геаграфіі могуць з'явіцца ў бліжэйшыя дзесяцігоддзі?

3. Якія праблемы, на ваш погляд, могуць абвастрыцца ў сувязі з ростам або скарачэннем колькасці насельніцтва Зямлі?

4. Як зменяцца суадносіны гарадскіх і сельскіх жыхароў у бліжэйшыя 100 гадоў?

5. Якія могуць быць варыянты вырашэння праблемы бежанства ў свеце?

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

РАЗДЗЕЛ

III

ГЕАГРАФІЯ СУСВЕТНАЙ ГАСПАДАРКІ



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



§ 14. Сусветная гаспадарка, фарміраванне і развіццё

Успамінаем. Якія фактары і падзеі спрыялі фарміраванню сучаснай сусветнай гаспадаркі? Якія паказчыкі адлюстроўваюць узровень сацыяльна-эканамічнага развіцця краін? Чым адрозніваюцца эканомікі развітых краін і краін свету, якія развіваюцца? Якія галіны ў структуры сусветнай гаспадаркі адрозніваюцца найбольшай дынамічнасцю ў сваім развіцці?

Для чаго мы гэта вывучаем? Як вызначыць узровень удзелу краіны ў сусветнай гаспадарцы? У чым выяўляецца глабалізацыя сусветнай гаспадаркі? Падумайце, галіной дзейнасці якіх спецыялістаў з'яўляецца вывучэнне развіцця сусветнай гаспадаркі. Праблемы развіцця сусветнай гаспадаркі — гэта праблемы спецыялістаў толькі эканамічных прафесій або якіх-небудзь іншых?


Этапы фарміравання сусветнай гаспадаркі. Сусветная гаспадарка ўяўляе з сябе сукупнасць нацыянальных гаспадарак, якія дынамічна развіваюцца, і галін, што ўваходзяць у іх і звязаны паміж сабой сусветнымі эканамічнымі адносінамі на аснове міжнароднага падзелу працы.

Клуб знаўцаў-эканомікагеографаў. Сусветная гаспадарка прайшла *некалькі этапаў*. *Першы этап*, які ахоплівае перыяд да XV ст., называецца *перадгісторыяй сусветнай гаспадаркі* і характарызуецца зараджэннем сусветнага гандлю. Жыхары Старажытнага Егіпта (мал. 96) гандлявалі з суседнімі плямёнамі, купляючы ў іх драўніну, метал, жывёлу ў абмен на прадукты рамяства і земляробства. З XV ст. да першай паловы XVII ст. — *другі этап — этап зараджэння сусветнай гаспадаркі*. У эпоху Вялікіх геаграфічных адкрыццяў сфарміраваўся гандлёвы «залаты трохвугольнік» (мал. 97) паміж Старым і Новым Светам. З Еўропы ў Афрыку везлі тканіны, зброю, напоі; з Афрыкі ў Амерыку — «жывы тавар» (рабоў для працы на плантацыях і ў рудніках); з Амерыкі ў Еўропу — каву, цукар, каштоўныя металы, бавоўну і інш. *Трэці этап* ахоплівaў першую палову XVII — пачатак XIX ст. і быў звязаны з *пераходам ад мануфактуры да машыннай вытворчасці*. На заключным *чацвёртым этапе* — з XIX ст. да пачатку XX ст. — у сусветнай гаспадарцы былі сфарміраваны тры асноўныя яе часткі: сусветны рынак, буйная машынная індустрыя і транспарт. У выніку гэты этап атрымаў назву *завяршэння фарміравання сусветнай гаспадаркі*.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Мал. 96. Рынак у Старажытным Егіпце



Мал. 97. «Залаты трохвугольнік» гандлю ў XV–XVII стст.

Структура сусветнай гаспадаркі ўяўляе з сябе сістэму нацыянальных рынкаў тавараў, паслуг, капіталаў, інтэрнацыяналізацыі вытворчасцей і інтэграцыйных аб'яднанняў, міжнародных фінансавых цэнтраў. Сусветная гаспадарка традыцыйна ўключае тры сектары. У трацічным сектары ва ўмовах постындустрыялізацыі сталі вылучаць чацвярцічны сектар (мал. 98). Вылучаюць галіновую і прасторавую структуры сусветнай гаспадаркі.




Мал. 98. Сектары сусветнай гаспадаркі

Галіновая структура сусветнай гаспадаркі — гэта сукупнасць яе частак (галін, падгалін, відаў эканамічнай дзейнасці), якія гістарычна склаліся ў выніку грамадскага падзелу працы.

Дадзеная структура вызначаецца доляй асобных галін, падгалін, відаў эканамічнай дзейнасці ў агульным аб'ёме вытворчасці. Структура занятасці насельніцтва таксама характарызуе галіновую структуру гаспадаркі (мал. 99).

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Мал. 99. Галіновая структура сусветнай гаспадаркі, %:
а — развітыя краіны; *б* — краіны, якія развіваюцца

У свеце ўсё ўзаемазвязана. Як па структуры занятасці насельніцтва можна вызначыць узровень эканамічнага развіцця краін? З якіх прадметных абласцей вы сёння выкарыстоўваеце веды пры засваенні вучэбнага матэрыялу?

Па галіновай структуры можна вызначыць тып краіны (напрыклад, аграрны, індустрыяльны, постындустрыяльны). Для аграрнага тыпу характэрна перавага сельскай гаспадаркі. Ён прадстаўлены ў невялікай колькасці найменш развітых краін. Напрыклад, у Эфіопіі, дзе больш за 80 % насельніцтва занята ў сельскай гаспадарцы. Індустрыяльны тып характарызуецца вялікай доляй прамысловасці. Гэты тып прадстаўлены, напрыклад, у Алжыры, Кувейце, Мексіцы. Постындустрыяльнай структуры ўласціва перавага паслуг над матэрыяльнай вытворчасцю, што характэрна для найбольш развітых краін. Напрыклад, для Францыі, Аўстрыі.

Свет і Беларусь. Успомніце галіновую структуру гаспадаркі Беларусі і параўнайце яе з сярэднесусветнымі паказчыкамі.

$П_2$

Прасторавая структура сусветнай гаспадаркі адлюстроўвае прапорцыі паміж краінамі па іх эканамічнай моцы на аснове валавога ўнутранага прадукту (ВУП). Існуюць тры прасторавыя мадэлі сусветнай гаспадаркі.




Мал. 100. Краіны Поўначы і краіны Поўдня

Двухчленная мадэль заснавана на падраздзяленні сусветнай гаспадаркі на эканамічна развітыя краіны і краіны, якія развіваюцца (краіны Поўначы і краіны Поўдня адпаведна) (мал. 100).

Трохчленная мадэль адпавядае дзяленню сусветнай гаспадаркі на краіны развітыя, якія развіваюцца, з пераходнай эканомікай. Развітыя краіны вырабляюць 69 % валавога сусветнага прадукту, краіны, якія развіваюцца, — 27 % і краіны з пераходнай

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

эканомікай — 4,0 %. Згодна з гэтай мадэллю вылучаюць таксама краіны Цэнтра, Перыферыі і Паўперыферыі (мал. 101).



Мал. 101. Краіны Цэнтра, Перыферыі і Паўперыферыі

Клуб знаўцаў-эканомікагеографаў. Пад краінамі *Цэнтра* разумеюць высокаразвітыя дзяржавы Поўначы з постындустрыяльнай эканомікай (напр., ЗША, Японія), якія валодаюць вялікім капіталам, найноўшымі тэхналогіямі, высокакваліфікаванымі працоўнымі рэсурсамі. Да *Перыферыі* адносяць краіны, якія развіваюцца, з перавагай або аграрнай структуры, або пачатковай індустрыяльнай, з распаўсюджваннем беднасці і голаду, з нізкакваліфікаванай працоўнай сілай (напр., Кенія, Афганістан). У склад *Паўперыферыі* ўваходзяць краіны, якія развіваюцца, са сфарміраванай індустрыяльнай структурай (напр., Індыя, Кітай), а таксама постсацыялістычныя дзяржавы.

Мнагачленая (дзесяцічленная) мадэль адлюстроўвае прапорцыі паміж дзесяццю асноўнымі краінамі па эканамічнай моцы. Галоўным яе паказчыкам з'яўляецца ***валавы ўнутраны прадукт (па парытэце пакупной здольнасці — ППЗ)***.

Пад парытэтам пакупной здольнасці разумеюць адносіны паміж дзвюма валютамі розных краін, якія былі разлічаны на аснове іх пакупной здольнасці адносна пэўнага набору тавараў і паслуг.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне


Напрыклад, калі адзін і той жа набор спажывецкіх тавараў і паслуг ва Украіне каштуе 500 грывень, а ў ЗША — 100 долараў, то парытэт пакупной здольнасці складае 5 грывень на 1 долар. Гэта азначае, што на 5 грывень ва Украіне можна купіць столькі ж, колькі на 1 долар у ЗША, ці наадварот.

Лідзіруючыя пазіцыі ў гэтай мадэлі па даных за 2018 г. належаць Кітаю (25,3 трлн дол.), ЗША (20,5), Індыі (10,5 трлн дол.), Японіі і Германіі. У цэлым на фоне вялікай Перыферыі ў сусветнай гаспадарцы сфарміравалася тры магутныя эканамічныя цэнтры — Еўрапейскі, Паўночнаамерыканскі і Усходне-Азіяцкі.

П$_3$ **Стадыі развіцця сусветнай гаспадаркі.** У развіцці сусветнай гаспадаркі вылучаюць тры стадыі: даіндустрыяльную (аграрную), індустрыяльную і постындустрыяльную. *Даіндустрыяльная стадыя* характарызуецца перавагай ручной працы, вельмі нізкімі тэмпамі развіцця вытворчасці, якая можа задавальняць патрэбы людзей толькі на мінімальным узроўні. Большая частка насельніцтва занята ў сельскай гаспадарцы. *Індустрыяльная стадыя* характарызуецца масавай вытворчасцю, механізацыяй і аўтаматызацыяй працы, развіццём рынку тавараў і паслуг. У індустрыяльнай структуры пераважае прамысловасць. *Постындустрыяльная стадыя* характарызуецца шэрагам адметных прыкмет (мал. 102).

П$_4$ Доля сферы паслуг у структуры валавога сусветнага прадукту дасягае 70 %. Па меры развіцця сусветнай гаспадаркі адбываецца памяншэнне колькасці краін, якія знаходзяцца на аграрнай стадыі, павелічэнне — якія ажыццявілі пераход да постындустрыяльнай стадыі, і дамінаванне — якія былі на індустрыяльнай стадыі.

П$_5$



Мал. 102. Прыкметы постындустрыяльнай стадыі

П$_6$ **Глабалізацыя і глабальныя гарады.** На пачатку XXI ст. сусветная гаспадарка набывае новыя рысы, адной з якіх з'яўляецца глабалізацыя.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Пад глабалізацыяй сусветнай гаспадаркі разумеюць працэс фарміравання і наступнага развіцця агульнасусветнай фінансава-эканамічнай, палітычнай, сацыяльна-культурнай, інфармацыйна-камунікацыйнай прасторы.

Вылучаюць тры асноўныя *формы глабалізацыі* — эканамічную, палітычную і культурную. *Эканамічная глабалізацыя* выяўляецца ў фарміраванні адзінай сусветнай эканамічнай прасторы.

Клуб знаўцаў-эканомікагеографаў. Нягледзячы на відавочныя перавагі глабалізацыі сусветнай гаспадаркі, яна праяўляецца і ў негатыўных формах. Напрыклад, утварэнне сусветнага фінансавага рынку робіць слабымі ўсе краіны да глабальных фінансавых крызісаў. Фарміраванне агульнай сацыяльнай прасторы спрыяе распаўсюджванню злачыннасці, міжнароднага тэрарызму. Развіццё масавай інтэрнацыянальнай культуры прыводзіць да страты традыцый многіх народаў.

Паразважаем. Як глабалізацыя ўплывае на маё жыццё? Глабалізацыя: «за» і «супраць».

У выніку глабалізацыі асобныя гарады свету пачынаюць выступаць агульнасусветнымі фінансавымі, палітычнымі, эканамічнымі, культурнымі цэнтрамі. Такія гарады атрымалі назву глабальных.

Глабальны горад — гэта постындустрыяльны цэнтр, інтэграваны ў сусветную гаспадарку і які з'яўляецца важным элементам сусветнай эканамічнай сістэмы.


Асноўнымі *прыкметамі глабальнага горада* з'яўляюцца: 1) адносна вялікая колькасць насельніцтва; 2) наяўнасць штаб-кватэр найбуйнейшых ТНК і міжнародных эканамічных арганізацый; 3) адносная незалежнасць ад нацыянальнага палітычнага кіраўніцтва; 4) горад павінен быць сусветным фінансавым, транспартным і камунікацыйным вузлом; 5) высокаразвітая сфера паслуг.

У сусветнай гаспадарцы існуе тры групы глабальных гарадоў: 1) альфа (α) — вядучыя; 2) бэта (β) — галоўныя; 3) гама (γ) — другарадныя (мал. 103).

Папрацуем з атласам. Выкарыстоўваючы карты атласа і матэрыялы вучэбнага дапаможніка, прывядзіце па тры прыклады альфа-, бэта- і гама-гарадоў. У чым заключаюцца адрозненні паміж групамі гэтых гарадоў?

Паводле ацэнак міжнародных экспертаў, у свеце ў цяперашні час налічваецца больш за 150 глабальных гарадоў розных рангаў. Геаграфічна яны знаходзяцца ва ўсіх рэгіёнах свету, але найбольшая іх колькасць сканцэнтравана ў Еўропе, Паўночнай Амерыцы і Азіі. Да вядучых адносіцца 48 глабальных гарадоў, сярод якіх

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Мал. 103. Геаграфія глабальных гарадоў, 2016 г.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

гістарычнымі і сучаснымі лідарамі выступаюць Нью-Ёрк, Лондан, Парыж, Токіа, Ганконг. Разам з імі Дубай (мал. 104), Сінгапур, Шанхай і Сіднэй таксама фарміруюць Клуб глабальнай урбаністычнай эліты свету.



Мал. 104. Дубай — глабальны горад

Падвядзём вынікі. У фарміраванні сусветнай гаспадаркі вылучаюць ... этапы. Сусветная гаспадарка ўключае тры сектары: ..., ..., ... Вылучаюць тры прасторавыя мадэлі сусветнай гаспадаркі: ..., ..., ... У развіцці сусветнай гаспадаркі вылучаюць тры асноўныя стадыі: ..., ... і ... . Пад глабалізацыяй сусветнай гаспадаркіразумеюць працэс фарміравання і наступнага развіцця агульнасусветнай фінансава-эканамічнай, палітычнай, сацыяльна-культурнай, інфармацыйна-камунікацыйнай прасторы. Вылучаюць тры асноўныя формы глабалізацыі — ..., ... і ... . Глабальны горад — гэта постындустрыяльны цэнтр, які з'яўляецца .... .

Праверым свае веды. 1. Якія этапы фарміравання характэрныя для сусветнай гаспадаркі? 2. Якія вылучаюць віды структур сусветнай гаспадаркі? 3. Якія прасторавыя мадэлі характэрныя для сусветнай гаспадаркі? 4. Што такое глабальны горад?

Ад простага да складанага. 1. Падрыхтуйце калаж «Міфы аб глабалізацыі», выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі. 2. Падбярыце некалькі афарызмаў да тэрміна «сусветная гаспадарка».

Ад тэорыі да практыкі. Напішыце сачыненне-разважанне на тэму «Я жыву ў глабальным горадзе».

Падарожжа па Глабальнай сетцы. Афіцыйны сайт Сусветнага банка.

§14-1
§14-2

§ 15. Міжнародны геаграфічны падзел працы

Успамінаем. Пры вывучэнні якога вучэбнага прадмета вы даведаліся аб падзеле працы паміж людзьмі? Калі ён з'явіўся? Якія краіны валодаюць значнымі запасамі прыродных рэсурсаў? Якія рэгіёны і краіны характарызуюцца высокім узроўнем развіцця індустрыяльнага сектара сусветнай гаспадаркі? У якіх краінах адбываецца хуткае развіццё сферы паслуг?

Для чаго мы гэта вывучаем? Для чаго краіне неабходны ўдзел у сусветным гандлі? Якія фактары з'яўляюцца асноўнымі пры міжнародным геаграфічным падзеле працы (МГПП)? Чаму спецыялізацыя і кааперацыя дапаўняюць адно аднаго?

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Фактары міжнароднага геаграфічнага падзелу працы. Падзел працы мае глыбокія карані. Гістарычна ён быў звязаны з прыроднымі ўмовамі, відамі гаспадарчай дзейнасці і інтарэсамі чалавека абмяняць лішкі вынікаў сваёй працы на тавары ці паслугі, якія ён не рабіў.



Міжнародны геаграфічны падзел працы — гэта прасторавая форма грамадскага падзелу працы, якая выяўляецца ў спецыялізацыі асобных цэнтраў, раёнаў і краін на вытворчасці пэўных відаў прадукцыі і паслуг, прызначаных для рэалізацыі за іх межамі.



У свеце цікавага. Падзел працы на ранніх стадыях адбываўся па біялагічных прыкметах — паводле полу (паміж мужчынамі і жанчынамі), узросту людзей. Пазней з-за адрозненняў у прыродных умовах паявіўся падзел працы паміж асобнымі плямёнамі. Напрыклад, паміж качэўнікамі-жывёлагадоўцамі, земляробамі, паляўнічымі і г. д. Наступным этапам стаў падзел працы паміж гарадскім і сельскім насельніцтвам. Пасля падзел разумовай і фізічнай працы прывёў да замацавання за пэўнымі краінамі самастойных відаў дзейнасці.

Геаграфічны падзел працы развіваецца пад уплывам пэўных фактараў. Першую групу ўтвараюць *прыродна-геаграфічныя фактары*. Да іх адносяцца адрозненні прыродных умоў і нераўнамернасць у забеспячэнні краін прыроднымі рэсурсамі. Другая група — гэта *эканоміка-геаграфічныя фактары*. Да іх адносяцца адрозненні ў геаграфічным становішчы краіны, памерах тэрыторыі і яе канфігурацыі.



Клуб знаўцаў-эканомікагеографаў. Так, вялікія па плошчы краіны (напр., Кітай, Індыя, Бразілія і інш.) валодаюць больш разнастайнымі прыроднымі рэсурсамі і могуць быць больш актыўна ўцягнутыя ў падзел працы. Аднак вялікія па плошчы краіны патрабуюць вялікіх выдаткаў на стварэнне транспартнай інфраструктуры. У сваю чаргу, малыя па плошчы краіны ў значнай ступені залежаць ад міжнароднага гандлю і вымушаны шукаць іншыя фактары ўдзелу ў падзеле працы (напр., Японія, Сінгапур).

Па меры развіцця чалавечага грамадства роля названых дзвюх груп фактараў слабее. Да трэцяй групы адносяцца *вынікі навукова-тэхнічнай рэвалюцыі*. Краіны могуць адрознівацца колькасцю навуковых адкрыццяў, узроўнем развіцця тэхналогій і інш. Чацвёртая група ўключае *сацыяльна-эканамічныя* і *сацыяльна-палітычныя фактары*. Яны заключаюцца ў адрозненнях гістарычнага развіцця, вытворчых традыцый і традыцый знешнеэканамічных сувязей, эканамічнага развіцця, структуры гаспадаркі, колькасці насельніцтва і складу працоўных рэсурсаў і інш.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Гістарычныя тыпы МГПП. Міжнародны геаграфічны падзел працы складваўся гістарычна. У *старажытнасці* і *Сярэдневякоўі* абмен адбываўся паміж краінамі ў межах Старога Свету, у асноўным за кошт Еўропы і Паўночнай Афрыкі. Пасля Вялікіх геаграфічных адкрыццяў у МГПП былі ўцягнуты тэрыторыі, прылеглыя да ўзбярэжжаў Атлантычнага і Індыйскага акіянаў. У XVI–XVII стст. ахоп тэрыторый падзелам працы значна павялічыўся. Гэта было звязана з нарастаючымі патрэбамі асобных краін у абмене таварамі, якія не маглі вырабляцца паўсюдна.



Мал. 105. А. Сміт (1723–1790)

У свеце ўсё ўзаемазвязана. У 1776 г. Адам Сміт, вядомы эканаміст XVIII ст., прыйшоў да вываду аб тым, што падзел працы носіць універсальны характар. Ён звярнуў увагу на тое, што абмен магчымы толькі тады, калі людзі занятыя неаднолькавымі справамі. Так, у яго з'яўляецца паняцце «каштоўнасць». Вось як пісаў у рамане «Яўген Анегін» А. С. Пушкін пра тэорыю падзелу працы А. Сміта (мал. 105):

Зато читал Адама Смита
И был глубокий эконом,
То есть умел судить о том,
Как государство богатеет
И чем живёт, и почему
Не нужно золота ему,
Когда простой продукт имеет…


У XIX ст. *індустрыяльная стадыя* прывяла да шырокага распаўсюджвання міжнароднага падзелу працы і яшчэ большай уцягнутасці краін. Экспарт гатовай прадукцыі стаў прыярытэтам развітых краін, сыравіны — краін, якія развіваюцца.

На *постындустрыяльнай стадыі* ў канцы XX – пачатку XXI ст., калі ў міжнародным абмене сталі прысутнічаць разам з таварамі і паслугі, у сусветнай гаспадарцы практычна не засталося дзяржаў, якія не ўдзельнічаюць у МГПП. Для развітых краін стаў характэрным пераважна экспарт паслуг і гатовай навукаёмістай прадукцыі апрацоўчай прамысловасці (машынабудавання, хімічнай прамысловасці і інш.). Краіны, якія развіваюцца, застаюцца экспарцёрамі рэсурсаў, сельскагаспадарчай прадукцыі. Аднак з развіццём індустрыялізацыі яны таксама ўдзельнічаюць у падзеле працы ў якасці пастаўшчыкоў прадукцыі апрацоўчай прамысловасці.

Паразважаем. Як геаграфічнае і геапалітычнае становішча краіны ўплывае на яе ступень удзелу ў міжнародным геаграфічным падзеле працы? Чым адрозніваецца міжнародны геаграфічны падзел працы індустрыяльнай і постындустрыяльнай стадый развіцця сусветнай гаспадаркі? М. М. Баранскі назваў міжнародны геаграфічны падзел працы «душой сусветнай гаспадаркі». Як вы разумееце гэта выказванне?

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

У залежнасці ад тэрытарыяльнага ахопу існуе пяць прасторавых узроўняў МГПП (мал. 106).



Мал. 106. Прасторавыя ўзроўні МГПП (паводле Ю. Г. Саушкіна)

У сацыяльна-эканамічнай геаграфіі вылучаюць тры гістарычна паслядоўныя тыпы МГПП — *агульны, прыватны* і *адзінкавы* (мал. 107). Напрыклад, у *агульным падзеле працы* Кенія і Шры-Ланка з'яўляюцца аграрнымі краінамі (экспарцёры чаю); Чылі (экспарцёр меднай руды), Катар, Іран (экспарцёры прыроднага газу) — сыравіннымі краінамі; Кітай (экспарцёр чыгуну, сталі), Рэспубліка Карэя (экспарцёр аўтамабіляў, бытавой тэхнікі і электронікі) — індустрыяльнымі. У *прыватным падзеле працы* Японія, напрыклад, спецыялізуецца на суднабудаванні, аўтамабілебудаванні, робататэхніцы; Германія — на вытворчасці аўтамабіляў і ўсіх відаў прадукцыі хімічнай прамысловасці; Францыя — на аэракасмічнай галіне і парфумернай індустрыі; Індыя — на вытворчасці чыгуну, сталі і фармацэўтыкі; Швейцарыя — на банкаўскіх паслугах. У *адзінкавым падзеле працы* ЗША, напрыклад, спецыялізуюцца на распрацоўцы праграмнага забеспячэння; Германія, Швейцарыя — на навуковых распрацоўках у галіне фармацэўтыкі; Малайзія, Інданезія — на зборцы мікраэлектронікі і бытавой тэхнікі.

АГУЛЬНЫ	• падзел краін па сферах сусветнай гаспадаркі і вылучэнне сярод іх індустрыяльных, аграрных і сыравінных краін-экспарцёраў
ПРЫВАТНЫ	• падзел працы па пэўных галінах вытворчасці або паслуг, відах гатовай прадукцыі або паслуг
АДЗІНКАВЫ	• падзел працы па вытворчасці асобных дэталей, кампанентаў, стадыях тэхналагічнага працэсу, відах паслуг

Мал. 107. Гістарычныя тыпы МГПП

Міжнародная спецыялізацыя і кааперараванне. МГПП суправаджаецца двума ўзаемадапаўняльнымі працэсамі — *міжнароднай спецыялізацыяй вытворчасці* і *міжнародным кааперараваннем вытворчасці*. Спецыялізацыя ўяўляе з сябе засяроджванне вытворчасці адной прадукцыі (тавараў і паслуг) з асобым тэхналагічным працэсам, спецыяльным абсталяваннем і кадрамі звыш унутраных патрэб краіны і наступным міжнародным абменам прадукцыяй паміж краінамі (мал. 108).

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Мал. 108. Разнавіднасці міжнароднай спецыялізацыі

Клуб знаўцаў-эканомікагеографаў. Для міжнароднай спецыялізацыі краіны неабходна выкананне трох умоў. *Першая ўмова* — краіна павінна валодаць перавагамі перад іншымі краінамі для развіцця гэтай вытворчасці. Напрыклад, мець большыя ў параўнанні з іншымі краінамі запасы мінеральных рэсурсаў, танную працоўную сілу ці больш высокакваліфікаваныя працоўныя рэсурсы, больш выгаднае транспартна-геаграфічнае становішча, размяшчаць капітал і інш. *Другая ўмова* — за межамі той краіны, якая можа вырабляць лішкі пэўных тавараў, павінны існаваць краіны, дзе гэтых тавараў не хапае і існуе попыт на іх па больш высокай цане. *Трэцяя ўмова* — выдаткі на дастаўку тавараў на рынак не павінны паглынаць усю розніцу паміж цаной продажу на месцы вытворчасці і на тым рынку, куды тавар пастаўляецца.

Спецыялізацыя на вытворчасці і экспарце сельскагаспадарчай прадукцыі і прадукцыі здабыўной прамысловасці характэрная для краін, якія развіваюцца. Сярод іх найбуйнейшымі экспарцёрам рэсурсаў у свеце з'яўляюцца Саудаўская Аравія, Кувейт, Алжыр, Нігерыя (нафта), Іран (нафта і прыродны газ), Марока (фасфарыты). Краіны Лацінскай Амерыкі, якія развіваюцца, з'яўляюцца найважнейшымі пастаўшчыкамі кавы, бананаў (Калумбія, Бразілія, Эквадор), цукровага трыснягу (Бразілія). Краіны Афрыкі спецыялізуюцца на вырошчванні цытрусавых (Егіпет, Марока), какава-бабоў (Кот-д'Івуар), краіны Азіі — рысу (Бангладэш).

Высокаразвітыя краіны спецыялізуюцца на вытворчасці навукаёмістай прадукцыі апрацоўчых галін, на навукова-даследчых распрацоўках ва ўсіх сектарах сусветнай гаспадаркі, на вытворчасці і экспарце паслуг. Напрыклад, ЗША спецыялізуюцца на транспартных, інфармацыйных, тэлекамунікацыйных паслугах, з'яўляюцца экспарцёрам транспартных паслуг; Вялікабрытанія, Швейцарыя — на банкаўскіх і страхавых паслугах; Італія, Францыя — на турысцкіх паслугах.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Свет і Беларусь. У чым заключаюцца асаблівасці спецыялізацыі Рэспублікі Беларусь у міжнародным геаграфічным падзеле працы?

Каапераванне — гэта форма падзелу працы, пры якой праца работнікаў розных краін непасрэдна злучаецца ў штодзённым узаемадзеянні ў адным і тым жа або ў розных, але звязаных паміж сабой працэсах вытворчасці. Галіной сусветнай гаспадаркі, у якой кааперaванне праяўляецца найбольш ярка, з'яўляецца аўтамабілебудаванне. Напрыклад, распрацоўка дызайну аўтамабіля ажыццяўляецца італьянскімі дызайнерамі; распрацоўка рухавікоў і вытворчасць камплектуючых дэталей — нямецкімі інжынерамі; зборка — рабочымі краін, якія развіваюцца (Бразілія, Турцыя, Мексіка, В'етнам) і з пераходнай эканомікай (Польшча, Венгрыя).

Найноўшыя змены ў МГПП. На постындустрыяльнай стадыі ў МГПП адбываюцца істотныя змены.

Эпіцэнтр масавай прамысловай вытворчасці перамяшчаецца з развітых краін у краіны, якія развіваюцца. Развітыя краіны спецыялізуюцца ў асноўным на навукаёмістых і высокатэхналагічных вытворчасцях (мал. 109) і паслугах. З буйных гарадоў сыходзіць індустрыяльная спецыялізацыя, яе змяняе спецыялізацыя на розных відах паслуг (адукацыйных, фінансавых, дзелавых, культурных і інш.). Сельская мясцовасць пачынае спецыялізавацца не толькі на сельскагаспадарчай вытворчасці, але і на рэкрэацыйных паслугах.



Мал. 109. Зборачнае прадпрыемства Boeing у Рэнтане (ЗША)

Падвядзём вынікі. Міжнародны геаграфічны падзел працы — гэта ... . МГПП узнік у выніку ... .

Геаграфічны падзел працы адбываецца пад уплывам пэўных груп фактараў: прыродна-геаграфічных, ..., ..., ... і сацыяльна-палітычных.

Кожная стадыя развіцця сусветнай гаспадаркі дзяржавы адрозніваецца яе міжнароднай спецыялізацыяй.

Праверым свае веды. 1. Для чаго краіне неабходны ўдзел у міжнародным геаграфічным падзеле працы? 2. Якія краіны характарызуюцца сыравіннай і аграрнай спецыялізацыяй? 3. Якія краіны спецыялізуюцца на вытворчасці і экспарце паслуг? Прывядзіце прыклады. 4. Чым адрозніваецца міжнародны геаграфічны падзел працы індустрыяльнай і постындустрыяльнай стадый развіцця сусветнай гаспадаркі?

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Ад простага да складанага. 1. Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, складзіце ментальную карту па вытворчасці аўтамабіля. 2. Падрыхтуйце кароткае паведамленне пра А. Сміта і яго кнігу «Даследаванне аб прыродзе і прычынах багацця народаў».

Ад тэорыі да практыкі. Запоўніце табліцу ў сшытку.

Спецыялізацыя краін у МГПП

Фактар МГПП	Спецыялізацыя	Прыклад краін
Прыродныя рэсурсы		
Працоўныя рэсурсы		
Навукаёмістасць		
Энергетычны		

Падарожжа па Глабальнай сетцы.
Найбольш папулярная ў свеце кніга пра МГПП вядомага брытанскага сацыёлага і геаграфа Дорын Мэсі «Геаграфічны падзел працы: сацыяльная структура і геаграфія вытворчасцей».



П$_1$

§ 16. Транснацыяналізацыя сусветнай гаспадаркі

Успамінаем. Чаму міжнародны геаграфічны падзел працы ўяўляе з сябе гістарычны працэс? На якіх відах эканамічнай дзейнасці спецыялізуюцца развітыя краіны і краіны, якія развіваюцца, у МГПП?

Для чаго мы гэта вывучаем? Якімі ведамі павінен валодаць паспяховы ў бізнесе чалавек? Якія замежныя прадпрыемствы прадстаўлены сёння ў Беларусі?

Транснацыяналізацыя сусветнай гаспадаркі, сутнасць і фактары развіцця. З развіццём МГПП паміж краінамі адбываецца ўзмацненне ўзаемадзеяння і ўзаемазалежнасці ва ўсіх сферах гаспадаркі і на розных узроўнях. Напрыклад, на ўзроўні паставак рэсурсаў і гатовай прадукцыі, вытворчасці камплектуючых і зборкі гатовай прадукцыі, распрацоўкі новых тэхналогій і іх укаранення ў вытворчасць і інш. Гэта прыводзіць да таго, што вытворчасць якога-небудзь тавару або паслугі перастае належаць адной краіне і становіцца інтэрнацыянальнай. Таму для развіцця сусветнай гаспадаркі характэрная *інтэрнацыяналізацыя*.

Разам з інтэрнацыяналізацыяй у развітых краінах пры дасягненні высокага ўзроўню развіцця засяроджваецца залішні капітал, але ў дэфіцыце знаходзяцца іншыя фактары вытворчасці. Напрыклад, танная рабочая сіла, сыравіна і інш. У гэтых умовах развітыя краіны пачынаюць пераносіць свой капітал у іншыя дзяржавы. А менавіта


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

ў тыя, дзе існуе дэфіцыт капіталу, але ёсць іншыя фактары вытворчасці. У такім выпадку ў сусветнай гаспадарцы з'яўляюцца не толькі інтэрнацыянальныя, але і транснацыянальныя тэндэнцыі.

Транснацыяналізацыя — гэта працэс перанясення часткі вытворчасцей з адной краіны ў іншую з дапамогай укладу капіталу больш развітых краін з мэтай арганізацыі філіялаў і ўстанаўлення кантролю над замежнымі кампаніямі, якія робяцца залежнымі.

Паразважаем. «Ролю транснацыянальных кампаній (ТНК) у адносінах да дзяржавы можна параўнаць з жыццём асы-наязніцы, лічынкі якой вылупляюцца ўнутры ахвяры і сілкуюцца ёю, паступова знішчаючы. Па гэтым прынцыпе ТНК "сілкуецца" рэсурсамі нацыянальнай дзяржавы да таго часу, пакуль яго класічныя функцыі (кантроль, бяспека, сацыяльныя гарантыі) не пачынаюць замінаць карпарацыі. Калі карпарацыя-дзяржава выспявае, дзяржава або яе некаторыя функцыі адкідаюцца за непатрэбнасцю» *(Принцип Домино // Мировая политика на рубеже веков. Аўтары: А. Г. Панамарова, Г. А. Рудаў)*. Як вы разумееце гэта выказванне?

Развіццю транснацыяналізацыі, асновай якой з'яўляюцца транснацыянальныя кампаніі/карпарацыі, спрыяе шэраг фактараў (мал. 110).



Мал. 110. Фактары транснацыяналізацыі

Клуб знаўцаў-эканомікагеографаў. Правобразы першых ТНК з'явіліся ў XVII ст., калі Вялікабрытанія і Нідэрланды пачалі ўкладваць свой капітал у распрацоўку сыравіны і гандаль вострымі прыправамі, шоўкам, каляровымі металамі былых калоній. Так, у 1600 г. была ўтворана Брытанская Ост-Індская кампанія (мал. 111), а затым у 1602 г. — Галандская Ост-Індская кампанія (мал. 112). У перыяд паміж Першай і Другой сусветнымі войнамі (1918–1939) утвараюцца ТНК (іх налічвалася каля 300), якія спецыялізаваліся на вытворчасці ваенна-тэхнічнай прадукцыі.



Мал. 111. Герб Брытанскай Ост-Індскай кампаніі




Мал. 112. Герб Галандскай Ост-Індскай кампаніі

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Разнавіднасці транснацыянальных карпарацый.

Транснацыянальная кампанія/карпарацыя — гэта прадпрыемства, якому належаць або якое кантралюе вытворчасці, што знаходзяцца па-за межамі краіны базіравання, якія маюць шырокую сетку філіялаў і займаюць вядучыя месцы ў свеце па вытворчасці таго ці іншага тавару або паслугі.



Мал. 113. Прыкметы адрозненняў ТНК

Сучасныя ТНК у сусветнай гаспадарцы адрозніваюцца шэрагам прыкмет (мал. 113).

Па *месцы размяшчэння* вылучаюць еўрапейскія, азіяцкія, паўночнаамерыканскія, аўстралійскія, афрыканскія.

Па *відзе дзейнасці падзяляюцца* на вытворчыя, якія прадстаўляюць сферу матэрыяльнай вытворчасці, і невытворчыя, якія прадстаўляюць адпаведна нематэрыяльную сферу. Напрыклад, аўтамабільная ТНК «Таёта Мотар» з'яўляецца вытворчай, а ТНК «Макдональдс», якая працуе ў сферы хуткага харчавання (Fast food), — невытворчай.

Па *колькасці краін-гаспадароў* бываюць падзеленыя ТНК, у якіх прадстаўлена некалькі дзяржаў у якасці ўладальнікаў, і ўласныя. Напрыклад, нафтагазавая ТНК «Роял Датч Шэл» належыць Нідэрландам і Вялікабрытаніі і таму з'яўляецца падзеленай. ТНК у галіне электронікі і электратэхнікі «Соні» належыць толькі Японіі і, значыць, яна ўласная.

Па *колькасці галін спецыялізацыі* вылучаюць аднаспецыялізаваныя і комплексныя ТНК. Аднаспеціялізаваныя ТНК займаюцца вытворчасцю аднаго віду прадукцыі або паслугі. Напрыклад, амерыканская ТНК «Ай-Бі-Эм» вырабляе камп'ютары. Комплексныя ТНК вырабляюць сумежныя або блізкія віды прадукцыі. Напрыклад, ТНК «Нэстле» вырабляе і харчовыя прадукты, і напоі.

Папрацуем з атласам. Выкарыстоўваючы карты атласа, знайдзіце ТНК, прадукцыяй якіх вы карыстаецеся ў паўсядзённым жыцці.

Свет і Беларусь. Якія ТНК прадстаўлены ў Рэспубліцы Беларусь? ТНК якога сектара эканомікі найбольш прадстаўлены ў нашай краіне? Як вы лічыце, прыход новых ТНК на беларускі рынак будзе станоўчым ці адмоўным па ўздзеянні на развіццё эканомікі краіны?

Геаграфія, рэгіянальная і галіновая структура ТНК. Згодна з міжнароднай статыстыкай у 1970 г. у свеце налічвалася 700 ТНК. На пачатку XXI ст. іх колькасць

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

павялічылася да 80 тыс. з дзевяццюстамі тысяч філіялаў. У цяперашні час з-за імклівага росту ў міжнароднай статыстыцы вядзецца ўлік найбуйнейшых ТНК, гадавыя даходы якіх перавышаюць 1 млрд дол. ЗША. У 2017 г. у свеце іх налічвалася 8000.

На працягу многіх гадоў у свеце па колькасці ТНК пераважаў Паўночнаамерыканскі рэгіён. У другой палове XX ст. у сусветнай структуры стала павялічвацца доля Еўропы і Азіі. Сярод асобных краін лідарамі выступалі ЗША, Японія, Вялікабрытанія. У XXI ст. найбольшая колькасць найбуйнейшых ТНК размешчана ў Азіі, Паўночнай Амерыцы і Еўропе (мал. 114).


Калі раней у структуры пераважалі выключна развітыя краіны, то ў цяперашні час у групу лідараў уваходзяць і дзяржавы, якія развіваюцца. Сярод краін свету па колькасці ТНК у XXI ст. разам з ранейшымі лідарамі ў першую пяцёрку ўваходзіць Кітай (мал. 115).

У свеце ўсё ўзаемазвязана. Чаму ТНК адыгралі станоўчую ролю ў развіцці эканомікі краін, якія развіваюцца? Якое адмоўнае ўздзеянне на сусветную эканоміку аказваюць ТНК?

Найбольшая колькасць ТНК прадстаўлена ў прамысловасці — каля 60 %, у сектары паслуг — каля 37 і ў сельскай гаспадарцы — каля 3 %. У апошнія дзесяцігоддзі намецілася тэндэнцыя росту ТНК у сферы паслуг.



Мал. 114. Рэгіянальнае размеркаванне буйнейшых ТНК, 2016 г., %



Мал. 115. Размеркаванне буйнейшых ТНК свету па краінах свету, 2016 г.

У свеце цікавага. Гісторыя ТНК Adidas, найбуйнейшага вытворцы спартыўнага абутку, адзення і інвентару, пачынаецца ў 1948 г., калі два браты Адольф і Рудольф Даслеры, не знайшоўшы агульнай мовы, вырашылі разбурыць сямейнае прадпрыемства — шырокавядомую фірму-вытворца спартыўнага абутку Dassler. Гэты крок паслужыў штуршком для стварэння двух вядомых брэндаў і вечных канкурэнтаў — Adidas і Puma. Сямейнае прадпрыемства Даслераў было падзелена: Адольф стаў уладальнікам кампаніі Adidas, Рудольф — Puma. Пасля смерці А. Даслера прадпрыемства перайшло яго ўдаве, а пазней — сыну. Сёння Adidas перастаў быць сямейным бізнесам, ператварыўшыся ў ТНК, штаб-кватэра якой усё яшчэ знаходзіцца ў маленькім нямецкім гарадку Херцагенауры, дзе і пачалася гісторыя фірмы.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

У прамысловасці найбольшая колькасць ТНК засяроджана ў аўтамабілебудаванні, нафтаперапрацоўцы, электратэхніцы і электроніцы. У сектары паслуг найбольш распаўсюджаным відам дзейнасці ТНК з'яўляюцца банкаўская сфера, тэлекамунікацыі і гандаль.

Галіны сусветнай гаспадаркі або асобныя віды эканамічнай дзейнасці адрозніваюцца паміж сабой па тэмпах росту транснацыяналізацыі. Найбольшымі тэмпамі характарызуюцца вытворчасць харчавання і энергетыка. Другое месца належыць фінансавай сферы і перапрацоўцы нафты. Гандаль займае трэцюю пазіцыю.

Найбуйнейшыя ТНК свету і змена геаграфіі галін сусветнай гаспадаркі. Пры вывучэнні ТНК важна ведаць, якія з іх займаюць пазіцыі лідараў у сусветнай гаспадарцы. Для вызначэння гэтага існуе шэраг паказчыкаў. Напрыклад, аб'ём гадавых продажаў, аб'ём прыбытку, аб'ём замежных інвестыцый і інш. Існуе таксама комплексная ацэнка дзейнасці ТНК на аснове некалькіх паказчыкаў. Згодна з гэтай ацэнкай Forbes па міжнароднай статыстыцы ў 2019 г. у першую пяцёрку ўвайшлі тры кітайскія (мал. 116) і дзве амерыканскія ТНК (табл. 2).



Мал. 116. Штаб-кватэра Ідустрыяльнага і камерцыйнага банка Кітая (ICBC) у Пекіне

Табліца 2. Найбуйнейшыя ТНК свету, 2019 г.

№ п/п	Назва ТНК	Від дзейнасці	Краіна
1	Індустрыяльны і камерцыйны банк Кітая **(ICBC)**	банкаўская	Кітай
2	Джэй-Пі-Морган Чэйз **(JPMorgan Chase)**	банкаўская	ЗША
3	Кітайскі будаўнічы банк **(China Construction Bank)**	банкаўская	Кітай


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Заканчэнне табліцы 2

№ п/п	Назва ТНК	Від дзейнасці	Краіна
4	Сельскагаспадарчы банк Кітая **(Agricultural Bank of China)**	банкаўская	Кітай
5	Банк Амерыкі **(Bank of America)**	банкаўская	ЗША

Клуб знаўцаў-эканомікагеографаў. Цікавым з'яўляецца вылучэнне сярод ТНК найбуйнейшых па ліку работнікаў. Па даных за 2017 г., першае месца сярод ТНК заняла амерыканская кампанія Волмарт (Walmart), якая кіруе найбуйнейшай у свеце рознічнай сеткай магазінаў, у якой працуе 2,3 млн чалавек. На другім месцы знаходзіцца ТНК McDonald's з колькасцю занятых 1,9 млн чалавек. Кітайская нацыянальная нафтагазавая карпарацыя (China national Petroleum) займае трэцяе месца — 1,5 млн працоўных.

Штаб-кватэры ТНК размешчаны ў найбуйнейшых гарадах свету. Гістарычна склалася, што найбольшая іх колькасць размяшчалася ў гарадах высокаразвітых краін. У XXI ст. гэта тэндэнцыя захоўваецца. У першую пяцёрку па колькасці ТНК уваходзяць Токіа, Нью-Ёрк, Лондан, Осака, Парыж, Пекін, Масква, Сеул, Рэйн-Рур (мал. 117). У апошнія гады з-за хуткага эканамічнага росту Кітая ў першую дзясятку па колькасці штаб-кватэр стаў уваходзіць Пекін.



Мал. 117. Размеркаванне гарадоў свету па колькасці штаб-кватэр ТНК, 2017 г., адз.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Галоўнымі тэндэнцыямі транснацыяналізацыі XXI ст. з'яўляюцца: 1) змена геаграфіі галін сусветнай гаспадаркі з-за размяшчэння філіялаў ТНК у краінах, якія развіваюцца; 2) павелічэнне колькасці ТНК у сферы паслуг; 3) рост долі дзяржаў, якія развіваюцца, у сусветнай структуры пераважна за кошт Азіяцкага рэгіёна; 4) узмацненне пазіцый і ролі Кітая.

Падвядзём вынікі. Транснацыяналізацыя — гэта ... . Асноўнымі фактарамі яе развіцця з'яўляюцца ... .

ТНК адрозніваюцца па месцы размяшчэння, відзе дзейнасці, колькасці краін-гаспадароў, колькасці галін спецыялізацыі.

Па колькасці ТНК доўгі час лідзіраваў ... рэгіён, у другой палове XX ст. стала павялічвацца доля ... рэгіёна. Сярод краін свету па колькасці ТНК у XXI ст. у першую пяцёрку ўваходзіць ... . З кожным годам павялічваецца колькасць ТНК у ... .

Праверым свае веды. 1. Чым можна растлумачыць узнікненне інтэрнацыяналізацыі ў свеце? 2. У чым адрозненне транснацыяналізацыі ад інтэрнацыяналізацыі? 3. Па якіх прыкметах можна падзяліць ТНК? 4. Якімі прыкметамі адрозніваліся ТНК на розных стадыях развіцця сусветнай гаспадаркі? 5. Якое размеркаванне ТНК па рэгіёнах свету, сектарах і галінах сусветнай гаспадаркі? 6. Чым тлумачацца і ў чым заключаюцца асаблівасці структуры ТНК у XXI ст.? 7. У чым заключаюцца асаблівасці геаграфіі гарадоў па колькасці штаб-кватэр ТНК?

Ад простага да складанага. Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы, падрыхтуйце прэзентацыю аб найбуйнейшых ТНК XXI ст.

Ад тэорыі да практыкі. Складзіце вусны часопіс «Геаграфія найбуйнейшых сусветных ТНК».

Падарожжа па Глабальнай сетцы.
Пералік найбуйнейшых ТНК свету паводле ацэнкі Forbes.

§16-1

§ 17. Міжнародная эканамічная інтэграцыя

Успамінаем. Чаму краіны ўтвараюць гандлёвыя і эканамічныя саюзы? Якія вядучыя інтэграцыйныя аб'яднанні існуюць у свеце? Якое іх значэнне ў свеце? Якія асноўныя мэты стварэння Еўрапейскага саюза, СНД?

Для чаго мы гэта вывучаем? Чаму ў цяперашні час паміж краінамі ствараюцца інтэграцыйныя аб'яднанні? Па якой прычыне найбольшая колькасць інтэграцыйных аб'яднанняў узнікае ў краінах, якія развіваюцца?

Перадумовы і стадыі міжнароднай эканамічнай інтэграцыі. На пэўных этапах развіцця сусветнай гаспадаркі краіны ўзаемадзейнічаюць паміж сабой не толькі ў рамках міжнароднага геаграфічнага падзелу працы, але і шляхам стварэння аб'яднанняў эканамічнага характару. Адной з праяў інтэрнацыяналізацыі сусветнай гаспадаркі з'яўляецца міжнародная эканамічная інтэграцыя.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

1. Адносна высокі ўзровень эканамічнага развіцця, каб вытрымліваць канкурэнцыю з іншымі краінамі па вытворчасці тавараў і паслуг

2. Прыкладна аднолькавы ўзровень эканамічнага развіцця, інакш перавагі будзе атрымліваць больш развітая краіна ў шкоду менш развітым

3. Падобныя палітычныя сістэмы і агульныя гістарычныя і культурныя традыцыі

4. Геаграфічная блізкасць краін

Мал. 118. Перадумовы міжнароднай эканамічнай інтэграцыі

Міжнародная эканамічная інтэграцыя — найвышэйшая ступень інтэрнацыяналізацыі, пры якой адбываецца зрошчванне нацыянальных гаспадарак на аснове глыбокіх устойлівых узаемасувязей і падзелу працы і фарміруецца агульная прастора з адзінай валютна-фінансавай, прававой сістэмай і каардынацыяй эканамічнай палітыкі дзяржаў.

Для развіцця інтэграцыйных працэсаў паміж краінамі існуе шэраг перадумоў (мал. 118). У апошнія гады з-за фарміравання інтэграцыйных аб'яднанняў паміж рэгіёнамі зніжаецца значэнне геаграфічнай блізкасці краін — удзельніц інтэграцыі.

П$_1$

Паразважаем. Калі XVII ст. – першая палова XX ст. сталі эпохай фарміравання незалежных нацыянальных дзяржаў, то ў другой палове XX ст. пачаўся працэс іх раздзялення. Гэта тэндэнцыя спачатку атрымала развіццё толькі ў Еўропе, але затым распаўсюдзілася і на іншыя рэгіёны. Чаму ў свеце назіраецца падзел раней адзіных дзяржаў?

У залежнасці ад узаемадзеяння паміж краінамі вылучаюць шэсць стадый эканамічнай інтэграцыі (мал. 119).

Любая эканамічная інтэграцыя пачынаецца з міждзяржаўных гандлёвых пагадненняў. У выніку на першай стадыі ўтвараюцца зоны пэўных гандлёвых дамоўленасцей паміж краінамі, або зоны прэферэнцый.

Прэферэнцыйная зона аб'ядноўвае краіны, ва ўзаемным гандлі якіх паніжаны або адменены мытныя пошліны



Мал. 119. Стадыі эканамічнай інтэграцыі

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

на пэўныя тавары, якія ўвозяцца. Другой стадыяй эканамічнай інтэграцыі з'яўляецца *зона свабоднага гандлю* — аб'яднанне краін з мэтай ліквідацыі мытных пошлін і колькасных абмежаванняў ва ўзаемным гандлі, але з захаваннем іх самастойнасці ў правядзенні знешнегандлёвай палітыкі ў дачыненні да краін-няўдзельніц.



У свеце цікавага. Напрыклад, у 1960 г. была ўтворана Еўрапейская асацыяцыя свабоднага гандлю ЕАСГ, у 1984 г. — Арганізацыя Азіяцка-Ціхаакіянскага эканамічнага супрацоўніцтва, у 1994 г. — Паўночнаамерыканская зона свабоднага гандлю НАФТА, якая аб'яднала ЗША, Канаду і Мексіку.

На трэцяй стадыі адбываецца ўтварэнне *мытных саюзаў*. Яно прадугледжвае нараўне з функцыянаваннем зоны свабоднага гандлю ўсталяванне адзіных гандлёвых тарыфаў у дачыненні да трэціх краін. Напрыклад, у 1969 г. быў утвораны Паўднёваафрыканскі мытны саюз, у 1995 г. сярод краін СНД быў створаны Мытны саюз, які аб'яднаў Расію, Беларусь, Казахстан і Кіргізію.



Клуб знаўцаў-эканомікагеографаў. Напрыклад, у 1960 г. быў утвораны Цэнтральнаамерыканскі агульны рынак, у 1969 г. — Андскі агульны рынак, у 1975 г. — Карыбскі агульны рынак — КАРЫКАМ, які аб'яднаў гаспадаркі астраўных дзяржаў рэгіёна.

Чацвёртай стадыяй выступае *агульны рынак*. Для яго нараўне з прыкметамі мытнага саюза характэрна фарміраванне прынцыпу «чатырох свабод», г. зн. свабоднага перамяшчэння капіталаў, тавараў, паслуг і працоўных рэсурсаў.



У свеце цікавага. Першыя мытныя саюзы з'явіліся яшчэ ў XIX ст. (напр., Германскі мытны саюз, Zollverein, які аб'ядноўваў у 1834–1871 гг. шэраг нямецкіх дзяржаў). Напярэдадні Другой сусветнай вайны функцыянавала больш за 15 мытных саюзаў. Але паколькі тады роля сусветнай эканомікі ў параўнанні з унутрынацыянальнай гаспадаркай была невялікай, яны не мелі асаблівага значэння і не прэтэндавалі на ператварэнне ў нешта іншае.

На пятай стадыі краіны аб'ядноўваюцца ў *эканамічны саюз*. Для яго характэрна нараўне з фарміраваннем прынцыпу «чатырох свабод» адзіная сацыяльная, эканамічная і гандлёвая палітыка і мяркуецца ўвядзенне адзінай валюты. Напрыклад, еўрапейская эканамічная супольнасць — прататып сучаснага Еўрапейскага саюза — у 1957 г. была створана як эканамічны саюз. У 1975 г. быў утвораны эканамічны саюз ЭКОВАС — Эканамічная супольнасць дзяржаў Заходняй Афрыкі.



У свеце ўсё ўзаемазвязана. Ці можа быць адна дзяржава членам некалькіх інтэграцыйных аб'яднанняў? Якія ўмовы неабходны для ўдзелу краін у інтэграцыйных працэсах? Якія перавагі мае дзяржава, што з'яўляецца членам інтэграцыйнага аб'яднання?

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Заключнай стадыяй выступае *поўная* (эканамічная і палітычная) *інтэграцыя*. Яе фарміраванне магчыма пры існаванні адзінага валютнага, эканамічнага і палітычнага саюза, правядзенні агульнай знешняй палітыкі, увядзенні адзінага грамадзянства, стварэнні наддзяржаўных органаў кіравання і ліквідацыі дзяржаўных меж.

Эканамічная інтэграцыя прадстаўлена ў дзвюх асноўных формах — рэгіянальнай і галіновай. Рэгіянальная інтэграцыя з'яўляецца найбольш распаўсюджанай у сучасным свеце. Прыкладамі рэгіянальных эканамічных аб'яднанняў выступаюць нараўне з Еўрапейскім саюзам і Паўночнаамерыканскай зонай свабоднага гандлю Асацыяцыя дзяржаў Паўднёва-Усходняй Азіі (АСЕАН), Азіяцка-Ціхаакіянская эканамічная супольнасць (АЦЭС), Лацінаамерыканская асацыяцыя інтэграцыі (ЛАІ) і інш. Сярод галіновых інтэграцыйных аб'яднанняў прыкметную ролю ў сусветнай гаспадарцы адыгрывае Арганізацыя краін — экспарцёраў нафты АПЕК, створаная ў 1960 г. для ўніфікацыі нафтавай палітыкі краін-удзельніц.

Вядучыя эканамічныя інтэграцыйныя аб'яднанні свету і іх роля ў развіцці сучаснай сусветнай гаспадаркі. Сучасныя вядучыя інтэграцыйныя аб'яднанні свету прадстаўлены ў галоўных цэнтрах сусветнай гаспадаркі — Еўропе і Паўночнай Амерыцы. **Еўрапейскі саюз** (мал. 120), які аб'яднаў 28 дзяржаў рэгіёна (мал. 121), з'яўляецца ў цяперашні час вышэйшай стадыяй інтэграцыі ў свеце.

3 1993 г. ЕС сфарміраваўся як эканамічны саюз са свабодным перамяшчэннем капіталу, тавараў, паслуг і працоўнай сілы. З 1985 г. на падставе Шэнгенскай дамовы быў уведзены адзіны памежны кантроль на знешняй мяжы ЕС (у цяперашні час для 26 краін). З 1999 г. існуе валютны саюз у межах еўразоны з адзінай валютай — еўра, які ўключае 19 дзяржаў. У цяперашні час у ЕС пражывае 6,8 % насельніцтва свету, ён вырабляе 17,2 % валавога сусветнага прадукту і 22 % сусветнай прамысловай прадукцыі (мал. 122).




Мал. 120. Штаб-кватэра Еўрапейскага саюза. Бельгія, Брусель



Мал. 121. Краіны Еўрапейскага саюза


Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Мал. 122. Месца вядучых інтэграцыйных аб'яднанняў у сусветнай гаспадарцы, %:
а — доля ў колькасці насельніцтва свету; *б* — доля ў валавым сусветным прадукце;
в — доля ў міжнародным гандлі

Папрацуем з атласам. Назавіце сталіцы дзяржаў — членаў Еўрапейскага саюза.

Гадавы даход на душу насельніцтва ў краінах ЕС складае 40,9 тыс. дол. (мал. 123). Больш чым кожны трэці тавар і паслуга, выраблены ў свеце, экспартуюцца ў цяперашні час з Еўрапейскага саюза. На пачатку XXI ст., нягледзячы на поспехі, дасягнутыя ЕС у галіне інтэграцыі, намеціўся шэраг праблем, звязаных з павелічэннем разрыву ва ўзроўні сацыяльна-эканамічнага развіцця краін-членаў. Гэта прывяло да міграцыі працоўных рэсурсаў з менш развітых у больш развітыя дзяржавы ЕС, да абвастрэння сацыяльных і эканамічных праблем.



Мал. 123. ВУП на душу насельніцтва ў вядучых інтэграцыйных аб'яднаннях, 2017 г., тыс. дол.

Свет і Беларусь. У якія інтэграцыйныя аб'яднанні ўваходзіць Рэспубліка Беларусь? З якімі эканамічнымі праблемамі сутыкаецца Рэспубліка Беларусь, з'яўляючыся ўдзельніцай інтэграцыйных аб'яднанняў?

У Паўночнай Амерыцы вядучым інтэграцыйным аб'яднаннем выступае **НАФТА**. Асноўнай мэтай стварэння гэтай арганізацыі было стымуляванне ўзаемнага гандлю на аснове фарміравання зоны свабоднага гандлю. Па некаторых эканамічных паказчыках гэта аб'яднанне ў цяперашні час апярэджвае ЕС. Аб'ядноўваючы 6,5 % сусветнага насельніцтва, НАФТА вырабляе 19,5 % сусветнага валавога прадукту і 22 % сусветнай прамысловай прадукцыі

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

з гадавым прыбыткам насельніцтва 42,6 тыс. дол. Па паказчыках долі ў знешнім гандлі гэта аб'яднанне саступае ЕС. Нягледзячы на істотныя пазіцыі НАФТА у сусветнай гаспадарцы, у цяперашні час назіраецца нераўнамерная роля краін у развіцці арганізацыі. Вызначальная роля належыць ЗША.



Мал. 124. Сцягі дзяржаў МЕРКАСУР

Папрацуем з атласам. Назавіце сталіцы дзяржаў — членаў НАФТА.

Важная роля ў эканамічнай інтэграцыі Лацінскай Амерыкі належыць Паўднёваамерыканскаму агульнаму рынку — **МЕРКАСУР** (мал. 124). Утварыўшыся ў 1991 г., арганізацыя аб'ядноўвае пяць дзяржаў — Аргенціну, Бразілію, Уругвай, Парагвай і Венесуэлу. За гады свайго існавання аб'яднанне стала найбольш уплывовым гандлёва-эканамічным саюзам краін, якія развіваюцца. У цяперашні час МЕРКАСУР вырабляе каля 3,9 % сусветнага валавога прадукту, каля 7 % — сусветнай прамысловай прадукцыі і 2,1 % — сусветнага знешнегандлёвага абароту. На пачатку XXI ст. арганізацыя адчувае шэраг цяжкасцей у развіцці. Гэта звязана з павелічэннем разрыву ва ўзроўні даходаў насельніцтва, з рознагалоссямі ў дачыненні да формы эканамічнай інтэграцыі.

Папрацуем з атласам. Назавіце сталіцы дзяржаў — членаў МЕРКАСУР.

У апошнія гады значную ролю ў свеце адыгрывае група краін БРІКС, куды ўваходзяць Бразілія, Расія, Індыя, Кітай і ПАР. Члены БРІКС — гэта краіны з магутнай эканомікай і значнымі рэсурсамі, якія хутка развіваюцца. На гэтыя краіны прыпадае 42 % насельніцтва свету, 26 % плошчы і больш за 30 % ВУП свету. Доля БРІКС у сусветным гандлі перавышае долю ЕС і НАФТА і складае 17 %.

Падвядзём вынікі. Міжнародная эканамічная інтэграцыя — гэта ... . Асноўнымі перавагамі інтэграцыі з'яўляюцца ... . Вылучаюць шэсць стадый эканамічнай інтэграцыі. Вышэйшай формай міжнароднай эканамічнай інтэграцыі з'яўляецца Еўрапейскі саюз.

Праверым свае веды. 1. Якія ўмовы неабходны для ўдзелу краін у інтэграцыйных працэсах? 2. Якія выгады атрымлівае краіна ад інтэграцыі? 3. З якімі эканамічнымі праблемамі краіна сутыкаецца пры інтэграцыі? 4. Чым адрозніваецца мытны саюз ад агульнага рынку? 5. Чым адрозніваецца зона свабоднага гандлю ад агульнага рынку?

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

6. Якія прыкметы поўнай інтэграцыі адсутнічаюць у Еўрапейскім саюзе? 7. Якія існуюць асноўныя формы эканамічнай інтэграцыі? 8. Ці прадстаўлена поўная інтэграцыя ў сучасным свеце?



Ад простага да складанага. 1. Падрыхтуйце паведамленне, выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы, аб найбуйнейшых інтэграцыйных аб'яднаннях свету. 2. Абмяркуйце пытанне «Плюсы і мінусы міжнароднай інтэграцыі».



Ад тэорыі да практыкі. 1. Закончыце фразы:
- зоны свабоднага гандлю ствараюцца з мэтай ... ;
- прыкладамі зон свабоднага гандлю з'яўляюцца ... ;
- мытныя саюзы ствараюцца з мэтай ... ;
- прыкладамі мытных саюзаў з'яўляюцца ... ;
- агульныя рынкі ствараюцца з мэтай ... ;
- прыкладамі агульных рынкаў з'яўляюцца ... .

2. Запоўніце табліцу ў сшытку, выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі.

Інтэграцыйныя аб'яднанні свету

Назва	Штаб-кватэра	Год стварэння	Мэта стварэння	Склад краін-удзельніц



Падарожжа па Глабальнай сетцы.
Сайт Еўрапейскага саюза.

Сайт НАФТА.

Сайт МЕРКАСУР.

Інтэрнэт-партал СНД.

Міждзяржаўны статыстычны камітэт СНД.

П3
§17-1 §17-2 §17-3

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



§ 18. Структура і геаграфічныя тыпы сельскай гаспадаркі свету. Геаграфія раслінаводства свету

Успамінаем. Як прыродныя ўмовы ўплываюць на спецыялізацыю сельскай гаспадаркі? Якая заканамернасць геаграфічнай абалонкі вызначае развіццё сельскай гаспадаркі? Як прыродныя ўмовы паўплывалі на спецыялізацыю сельскай гаспадаркі ў краінах Афрыкі? Якія фактары для развіцця сельскай гаспадаркі, акрамя прыродных, маюць развітыя краіны Паўночнай Амерыкі? Якія адметныя асаблівасці мае спецыялізацыя сельскай гаспадаркі краін Еўропы?

Для чаго мы гэта вывучаем? Якія вы ведаеце прафесіі, звязаныя з працай у аграпрамысловым комплексе? Якія ўстановы адукацыі рыхтуюць спецыялістаў у галіне сельскай гаспадаркі?

Сельская гаспадарка ў структуры сусветнай гаспадаркі. Сельская гаспадарка ўтварае першасны сектар сусветнай гаспадаркі і адносіцца да найстарэйшага віду чалавечай дзейнасці. На даіндустрыяльнай стадыі развіцця чалавецтва яна адыгрывала вызначальную ролю ў структуры сусветнай гаспадаркі.


У свеце ўсё ўзаемазвязана. Экспедыцыі Усесаюзнага інстытута раслінаводства ў 1919–1939 гг. у Афрыку, Азію, Лацінскую Амерыку, узначаленыя акадэмікам М. І. Вавілавым, даказалі, што радзімай большасці культурных раслін з'яўляюцца менавіта гэтыя рэгіёны (мал. 125). Растлумачце прычыны геаграфіі паходжання раслін.


Мал. 125. Зараджэнне сельскай гаспадаркі

Па меры развіцця індустрыялізацыі і постындустрыялізацыі доля сельскай гаспадаркі стала змяншацца. У структуры сусветнага

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

валавога прадукту яна складае 6,4 %, у развітых краінах — 1 %, у краінах, якія развіваюцца, — 26 %. У сельскай гаспадарцы занята 3453 млн чалавек. У структуры занятасці насельніцтва доля сельскай гаспадаркі большая — 26,5 %. Гэта тлумачыцца значнай колькасцю ў свеце дзяржаў, якія развіваюцца. Паміж развітымі краінамі і краінамі, што развіваюцца, існуюць вялікія адрозненні ў занятасці насельніцтва ў сельскай гаспадарцы. У развітых краінах доля занятых знізілася да 3 %, у краінах, якія развіваюцца, складае каля 65 % (мал. 126).



Мал. 126. Дынаміка долі занятых у сельскай гаспадарцы ў структуры занятасці насельніцтва свету, %

Клуб знаўцаў-эканомікагеографаў. Сельская гаспадарка свету характарызуецца трыма функцыямі, якія захоўваюць яе значэнне ў сусветнай гаспадарцы: 1) паўсюднае геаграфічнае распаўсюджванне; 2) вытворчасць і забеспячэнне харчаваннем і сельскагаспадарчай сыравінай; 3) забеспячэнне занятасці насельніцтва ў вялікай колькасці дзяржаў.

Фактары размяшчэння і развіцця сельскай гаспадаркі свету. На размяшчэнне і развіццё сельскай гаспадаркі ўплываюць пэўныя фактары. Прыродны фактар выступае асновай для геаграфічных адрозненняў у сельскай гаспадарцы. У залежнасці ад агракліматычных умоў тэрыторыі (працягласці вегетатыўнага перыяду, колькасці ападкаў, умоў атмасфернага ўвільгатнення, працягласці безмарознага перыяду, урадлівасці глеб і інш.) вылучаюцца зоны сельскагаспадарчай спецыялізацыі свету.

Важную ролю адыгрывае *сацыяльна-эканамічны фактар*. Ён характарызуецца традыцыямі вядзення сельскай гаспадаркі; узроўнем механізацыі, хімізацыі і электрыфікацыі; аб'ёмам капіталаўкладанняў у галіну, у тым ліку ўкараненняў новых тэхналогій; узроўнем прадукцыйнасці працы і прыбытковасці галіны.

У апошні час на развіццё сельскай гаспадаркі краін свету аказваюць уплыў *міжнародны гандаль* і *адзіная аграрная палітыка*, якія дзейнічаюць у некаторых інтэграцыйных аб'яднаннях. У цэлым пры нізкім узроўні сацыяльна-эканамічнага развіцця прыродныя фактары працягваюць адыгрываць вызначальную ролю ў развіцці сельскай гаспадаркі. Па меры яго росту ў краіне залежнасць ад прыродных фактараў слабее.

Структура і геаграфічныя тыпы сельскай гаспадаркі. Структура сектара прадстаўлена дзвюма асноўнымі галінамі — раслінаводствам і жывёлагадоўляй.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Раслінаводства, у сваю чаргу, уключае земляробства, агародніцтва, гародніцтва, вінаградарства і кветкаводства. У жывёлагадоўлі вылучаюцца развядзенне буйной рагатай жывёлы, свінагадоўля, авечкагадоўля і інш.

У структуры сусветнага зямельнага фонду на землі сельскагаспадарчага прызначэння прыходзіцца 37 %, у тым ліку на раллю — 12 %. Сярод вядучых сусветных вытворцаў сельскагаспадарчай прадукцыі вылучаюцца Кітай (20 % сусветнай вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі), Індыя (11) і ЗША (8 %).

У свеце цікавага. Ізраільская сельская гаспадарка — гэта сусветны феномен. У краіне, дзе менш за 20 % зямель прыдатныя для вядзення сельскай гаспадаркі, фермеры забяспечваюць патрэбы насельніцтва ў прадуктах харчавання на 95 %. Пры гэтым Ізраіль не толькі забяспечвае ўласныя харчовыя патрэбы, але і паспяхова экспартуе сваю прадукцыю ў дзясяткі краін. Сакрэт поспеху ізраільскага аграсектара — тэхналогіі. Інавацыйныя падыходы Ізраіля да вядзення сельскай гаспадаркі зніжаюць кліматычныя рызыкі і садзейнічаюць рацыянальнаму выкарыстанню найкаштоўнейшых для пустыннага клімату водных рэсурсаў (мал. 127)



Мал. 127. Інавацыі ў сельскай гаспадарцы Ізраіля — вертыкальная пасадка на сценах дамоў

Разнастайнасць прыродна-кліматычных умоў свету, адрозненні ў сістэме землеўладання, землекарыстання і аграрных рэформах абумовілі вылучэнне, з аднаго боку, зон сельскагаспадарчай спецыялізацыі, з другога боку, падобных галіновых напрамкаў у краінах і рэгіёнах. Гэтыя ўмовы вызначаюць геаграфічны тып сельскай гаспадаркі.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Геаграфічны тып сельскай гаспадаркі — устойлівае спалучэнне прыродна-абумоўленых і гістарычна складзеных вытворчых прыкмет сельскай гаспадаркі на канкрэтнай тэрыторыі, якія ўключаюць: 1) аграрныя адносіны, 2) спецыялізацыю, 3) інтэнсіўнасць вытворчасці, 4) узровень матэрыяльна-тэхнічнай аснашчанасці, 5) сістэмы земляробства і жывёлагадоўлі.

На аснове паказаных вышэй асаблівасцей сельскай гаспадаркі ў сусветнай гаспадарцы вылучаюць тры асноўныя катэгорыі і 11 геаграфічных тыпаў сельскай гаспадаркі (гл. дадатак 3).

Свет і Беларусь. Якая першая ў Расійскай імперыі вышэйшая сельскагаспадарчая навучальная ўстанова была адкрыта на тэрыторыі сучаснай Беларусі ў XIX ст.? Якія збожжавыя культуры вырошчваюць у Рэспубліцы Беларусь? Якія геаграфічныя тыпы сельскай гаспадаркі характэрныя для Рэспублікі Беларусь?

Геаграфія раслінаводства. Асноўнай падгаліной раслінаводства як у развітых краінах, так і ў краінах, якія развіваюцца, з'яўляецца *збожжавая гаспадарка*. Яна характарызуецца попытам на збожжа, які пастаянна расце, стабілізацыяй валавой вытворчасці, зніжэннем пасяўных плошчаў, павелічэннем ураджайнасці збожжавых культур.

Клуб знаўцаў-эканомікагеографаў. Цікава, што асноўныя пасяўныя плошчы збожжавых сканцэнтраваны ў Паўднёва-Усходняй Азіі і Паўночнай Амерыцы. Асноўныя пасяўныя плошчы збожжавых культур размешчаны ў Індыі (15 %), Кітаі (13), ЗША (9), Расіі (6) і Канадзе (2,5 %).

З другой паловы XX ст. пад уплывам біятэхналагічнай рэвалюцыі валавыя зборы збожжавых у свеце сталі расці значна хутчэй. У цяперашні час у сярэднім па свеце збор складае 2,55 млрд т. Краінамі — лідарамі па вытворчасці збожжа выступаюць Кітай (20 % сусветнага рынку), ЗША (16), Індыя (11), Канада (4) і Расія (3,5 %). Трыма галоўнымі збожжавымі культурамі з'яўляюцца *кукуруза, пшаніца* і *рыс*, на долю якіх у пасяўных плошчах прыходзіцца 83 %, а ў валавым зборы — 89 %.

Кукуруза з'яўляецца галоўнай культурай сярод збожжавых па валавых зборах. Гэта пераважна кармавая культура, аднак у краінах, якія развіваюцца, і ў некаторых развітых краінах яна выкарыстоўваецца ў ежу. Улічваючы, што кукуруза больш цеплалюбівыя культура, яе арэалы ахопліваюць амерыканскі Сярэдні Захад, Мексіку, поўдзень Еўропы, Індыю, Кітай, Паўднёва-Усходнюю Азію, Бразілію, Аргенціну, ПАР. Агульны валавы збор кукурузы ў свеце складае 1134 млн т, доля ў структуры збожжавых — 41,5 % (табл. 3).


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Па валавых зборах кукурузы ў першую тройку краін уваходзяць **ЗША** (371 млн т), **Кітай** (259), **Бразілія** (98 млн т) (мал. 128).

Табліца 3. Сусветная і рэгіянальная структура валавога збору збожжавых культур, %

Збожжавая культура	Еўропа	Азія	Афрыка	Аўстралія і Акіянія	Паўночная Амерыка	Лацінская Амерыка	Свет
Кукуруза	20,7	18,8	35,6	2,1	72,4	59,6	37
Рыс	0,9	52,5	15,3	1,4	1,6	16,9	27
Пшаніца	52,1	24,5	15,6	64,4	19,6	14,5	26
Ячмень	22,5	1,9	3,7	24,7	3,8	1,8	6
Сорга	0,2	1,0	17,4	7,5	2,5	7,2	2,3
Жыта	3,5	0,1	0,1	0,0	0,1	0,1	0,5
Іншыя	0,2	1,2	12,3	0,0	0,1	0,0	1,2
Усяго	100	100	100	100	100	100	100

Пшаніца з'яўляецца самай геаграфічна распаўсюджанай сельскагаспадарчай культурай у свеце і другой па валавых зборах збожжавых. Геаграфія вырошчвання культуры прадстаўлена двума паясамі — паўночным і паўднёвым. *Паўночны*



Мал. 128. Геаграфія і асноўныя вытворцы збожжавых культур у свеце, 2016 г., млн т

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

пояс ахоплівае Паўночную Амерыку, Еўропу (мал. 129), поўдзень еўрапейскай часткі Расіі, Паўночную Афрыку, Блізкі і Сярэдні Усход. Далей ён падзяляецца на дзве галіны, адна з якіх сыходзіць у Казахстан і Паўночна-Усходні Кітай, другая — да Інда-Гангскай нізіны. *Паўднёвы пояс* распасціраецца праз стэпавыя і лесастэпавыя раёны Паўднёвай Амерыкі, паўднёвы ўскраек Афрыкі і раёны Аўстраліі.

Валавы збор пшаніцы ў свеце складае 771 млн т, доля ў структуры збожжавых — 29,4 %. Па валавых зборах пшаніцы ў першую тройку краін уваходзяць Кітай (134 млн т), Індыя (98,5), Расія (86 млн т).

Рыс — трэцяя збожжавая культура па валавых зборах. Яна з'яўляецца вільгацелюбівай і цеплалюбівай культурай, у сувязі з чым геаграфія вырошчвання прымеркавана да субтрапічнага і трапічнага кліматычных паясоў (мал. 130), мусоннага тыпу клімату. Валавы збор рысу ў свеце складае 769 млн т, доля ў структуры збожжавых — 29 %. Па валавых зборах рысу ў першую тройку краін уваходзяць **Кітай** (213 млн т), **Індыя** (169), **Інданезія** (81 млн т).

Іншымі збожжавымі культурамі, якія адыгрываюць значную ролю ў сусветным раслінаводстве, з'яўляюцца ячмень, сорга і жыта, доля якіх у валавых зборах збожжавых складае 6,0, 2,3 і 0,5 % адпаведна.



Мал. 129. Пшанічныя палі ў Францыі



Мал. 130. Тэрасныя рысавыя палі ў В'етнаме



Мал. 131. Прадукцыя арганічнай сельскай гаспадаркі

Паразважаем. 1. У апошнія дзесяцігоддзі важная роля ў развіцці сельскай гаспадаркі належыць стварэнню генетычна мадыфікаваных сельскагаспадарчых культур, г. зн. з такімі зададзенымі ўласцівасцямі, як устойлівасць да шкоднікаў, ядахімікатаў, павышанае ўтрыманне вітамінаў. З аднаго боку, гэта дазваляе палепшыць рацыён харчавання жыхароў многіх краін, а з другога — выклікае бурныя дыскусіі аб іх шкодзе. Прывядзіце

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

прыклады «за» і «супраць» выкарыстання ГМА у сельскай гаспадарцы. 2. Як вы разумееце сэнс паняцця «арганічная сельская гаспадарка» (мал. 131) і якія краіны могуць дазволіць сабе яе вядзенне?

Папрацуем з атласам. Пакажыце на карце краіны — лідары па аб'ёмах валавога збору пшаніцы, рысу, кукурузы. У якіх прыродных зонах збіраюць найбольшыя ўраджаі пшаніцы, кукурузы, рысу?

Геаграфія міжнароднага гандлю прадукцыяй раслінаводства. Спрыяльныя прыродныя ўмовы краін, гістарычныя традыцыі вядзення сельскай гаспадаркі і забеспячэнне харчовай бяспекі свету стымулююць міжнародны гандаль прадукцыяй раслінаводства. У збожжавай гаспадарцы свету склалася група краін, якія лідзіруюць на працягу многіх гадоў у экспарце сельскагаспадарчых культур. Вядучымі краінамі па экспарце кукурузы ў свеце з'яўляюцца ЗША, Аргенціна і Бразілія; пшаніцы — Расія, ЗША і Канада; рысу — Тайланд, Індыя і Пакістан.

Падвядзём вынікі. Асноўным фактарам, які вызначае развіццё сельскай гаспадаркі, з'яўляецца ... . Вылучаюць адзінаццаць геаграфічных тыпаў сельскай гаспадаркі. Лідарамі па аб'ёмах валавога збору пшаніцы з'яўляюцца ..., ..., ...; кукурузы — ..., ..., ...; рысу — ..., ..., ... Актыўна развіваецца арганічная сельская гаспадарка, укараняюцца генетычна мадыфікаваныя арганізмы.

Праверым свае веды. 1. Як адрозніваецца доля сельскай гаспадаркі ў структуры ВУП у развітых крамах і краінах, якія развіваюцца? 2. Што ляжыць у аснове вылучэнняў геаграфічных тыпаў сельскай гаспадаркі? 3. Якая агульнасусветная структура валавога збору збожжавых культур? 4. Як НТР паўплывала на развіццё сельскай гаспадаркі? 5. У чым заключаюцца асаблівасці рэгіянальнай структуры валавога збору збожжавых культур?

Ад простага да складанага. 1. Існуе меркаванне, што ўстойлівае развіццё сельскай гаспадаркі — гэта развіццё, якое забяспечвае прадуктамі харчавання насельніцтва, што павялічваецца, без адначасовага разбурэння навакольнага асяроддзя. Растлумачце, як вы гэта разумееце. 2. Падрыхтуйце калаж аб найноўшых спосабах вырошчвання раслін. 3. Падрыхтуйце прэзентацыю аб цэнтрах паходжання культурных раслін.

Ад тэорыі да практыкі. Запоўніце табліцу ў сшытку, выкарыстоўваючы матэрыялы вучэбнага дапаможніка і дадатковыя крыніцы інфармацыі.

Адметныя рысы раслінаводства ў розных тыпах краін

Эканамічна развітыя краіны	Краіны, якія развіваюцца

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Падарожжа па Глабальнай сетцы.
Статыстычная база Харчовай і сельскагаспадарчай арганізацыі ААН ФАО па раслінаводстве.

§18-1

§ 19. Геаграфія жывёлагадоўлі

Успамінаем. Якія галіны вылучаюць у сельскай гаспадарцы? Якія падгаліны ўваходзяць у жывёлагадоўлю? Чаму развядзенне буйной рагатай жывёлы займае вядучае месца ў жывёлагадоўлі?

Для чаго мы гэта вывучаем? Чаму жывёлагадоўля па кошце мае перавагу над раслінаводствам? Якія праблемы, на ваш погляд, сёння актуальныя для жывёлагадоўлі?

Структура жывёлагадоўлі. Жывёлагадоўля з'яўляецца другой па значнасці галіной сельскай гаспадаркі, якая характарызуецца глыбокай гісторыяй развіцця. Гэта галіна забяспечвае сыравінай харчовую (мяса, малако, яйкі, мёд і г. д.) і лёгкую (скура, шэрсць, коканы шаўкапрада і інш.) прамысловасць, арганічнымі ўгнаеннямі раслінаводства і г. д.


Жывёлагадоўля характарызуецца складанай структурай. У ёй прадстаўлена больш за дзесяць падгалін (мал. 132). Існуюць у структуры таксама спецыфічныя фермы па гадоўлі кракадзілаў, страусаў і г. д.

У сваю чаргу, у залежнасці ад сферы выкарыстання ў кожным з відаў эканамічнай дзейнасці вылучаюцца напрамкі. Напрыклад, малочны, мясны напрамкі — у жывёлагадоўлі; сальны, беконны, мясны, шчацінны — у свінагадоўлі; мясны, малочны, шэрсны — у авечкагадоўлі і г. д.

У залежнасці ад характару вядзення вылучаюць чатыры асноўныя сістэмы жывёлагадоўлі: качавая, паўкачавая, пашавая і стойлавая. Стойлавая сістэма з'яўляецца найбольш інтэнсіўнай і можа прымяняцца як у халодныя сезоны, так і цэлы год.

У свеце ўсё ўзаемазвязана. Якія экалагічныя праблемы ўзнікаюць у сувязі з развіццём жывёлагадоўлі?

Фактары размяшчэння і развіцця жывёлагадоўлі. Развіццё жывёлагадоўлі абумоўлена як традыцыйнымі для сельскай гаспадаркі



Мал. 132. Структура жывёлагадоўлі

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

фактарамі, так і спецыфічнымі. *Прыродныя* і *кліматычныя ўмовы* вызначаюць спецыялізацыю жывёлагадоўлі. Сацыяльна-эканамічны фактар адыгрывае важную ролю ў развіцці галіны, якое будзе залежаць ад ступені механізацыі, капіталаўкладанняў у распрацоўку новых тэхналогій і інш. На развіццё галіны аказвае ўплыў *міжнародны гандаль* і *інтэграцыйныя працэсы*. Напрыклад, вялікая колькасць вытворцаў, якія спецыялізуюцца на выпуску адной і той жа прадукцыі, прыводзіць да палітыкі стрымлівання і скарачэння іх колькасці. У адрозненне ад раслінаводства вызначальную ролю ў развіцці і размяшчэнні жывёлагадоўлі адыгрывае *кармавая база* — яе характар і памеры. Здольнасць вырошчваць, нарыхтоўваць, перапрацоўваць і захоўваць розныя віды кармоў выступаюць асновай развіцця падгалiны. Найбольш высокія патрабаванні да кармавой базы прад'яўляюцца пры развядзенні буйной рагатай жывёлы, асабліва малочнага напрамку. Асаблівае месца ў жывёлагадоўлі займае *спажывецкі фактар*. Напрыклад, свінагадоўля прымеркавана да раёнаў з вялікай колькасцю насельніцтва і буйных гарадоў. Прадпрыемствы птушкагадоўлі таксама больш выгадна размяшчаць паблізу гарадоў.



Клуб знаўцаў-эканомікагеографаў. У развітых краінах жывёлагадоўля развіваецца ў асноўным інтэнсіўным шляхам. Яна заснавана на палявой кормавытворчасці і культурных пашах, з шырокім распаўсюджваннем малочнай жывёлагадоўлі, птушкагадоўлі і свінагадоўлі ў прыгарадных зонах. Такая жывёлагадоўля атрымала развіццё, напрыклад, у Еўропе, на паўночным усходзе ЗША. Распаўсюджаны ў развітых краінах і шырокія раёны экстэнсіўнай пашавай жывёлагадоўлі. Напрыклад, у Аўстраліі, Канадзе, на захадзе ЗША. Для большасці краін, якія развіваюцца, усё яшчэ характэрна пераважна экстэнсіўная жывёлагадоўля. Буйное пагалоўе сельскагаспадарчых жывёл спалучаецца з іх нізкай прадукцыйнасцю, шырокім выкарыстаннем у якасці цяглавой сілы і распаўсюджваннем шырокіх раёнаў качавой і паўкачавой жывёлагадоўлі. Аднак у шэрагу краін Лацінскай Амерыкі і Азіі, якія развіваюцца, актыўна развіваецца інтэнсіўная жывёлагадоўля (Бразілія, Аргенціна, краіны Паўднёва-Заходняй і Усходняй Азіі).



Паразважаем. Уявіце сябе фермерам, які ў прыгараднай зоне набыў ўчастак зямлі і вырашыў заняцца малочнай гаспадаркай. Якія ўмовы пры гэтым вы будзеце ўлічваць? Як будзеце прадаваць прадукцыю? Што вы зробіце, каб прадукцыя вашай вытворчасці стала канкурэнтнай з прадукцыяй іншых прадпрыемстваў?

Геаграфія асноўных відаў эканамічнай дзейнасці жывёлагадоўлі. У структуры жывёлагадоўлі асноўнае месца належыць тром падгалінам — жывёлагадоўлі, свінагадоўлі і авечкагадоўлі. Сярод іх вядучым з'яўляецца *развядзенне буйной рагатай жывёлы* (БРЖ). Яно развіваецца па трох напрамках: малочным, мяса-малочным і мясным. У лясной і лесастэпавай зоне ўмеранага пояса са стойлава-пашавым утрыманнем жывёлы развіваецца малочны напрамак. Мясную жывёлу разводзяць пераважна ў больш засушлівых раёнах умеранага і субтрапічнага кліматычных паясоў.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Сусветнае пагалоўе буйной рагатай жывёлы складае 1491 млн галоў і мае нераўнамерны характар геаграфічнага размеркавання. Сярод рэгіёнаў найбольшым пагалоўем вылучаюцца Азія, Лацінская і Паўночная Амерыка. Вядучымі краінамі па пагалоўі з'яўляюцца Бразілія (214 млн галоў) (мал. 133), Індыя (185) і ЗША (94 млн галоў). Вялікае пагалоўе характэрна і для Кітая (84 млн галоў).



Мал. 133. Паша бразільскіх кароў зебу

У свеце цікавага. Каровы вельмі разумныя і назіральныя. Калі адна карова трапіць у бяду, напрыклад яе ўдарыць токам каля агароджы, то ні адна карова са статку больш не падыдзе да гэтай агароджы. У старажытных егіпцян карова ўвасабляла нябесную багіню Нут, а ў Індыі карова дагэтуль лічыцца святой жывёлай (мал. 134).



Мал. 134. Святая жывёла Індыі



Мал. 135. Вертыкальныя свінафермы ў Кітаі

Свінагадоўля з'яўляецца відам дзейнасці ў жывёлагадоўлі, які найбольш дынамічна развіваецца. У адрозненне ад жывёлагадоўлі яна імкнецца пераважна да густанаселеных і прыгарадных раёнаў, якія забяспечаны кармамі і рынкамі збыту. Размяшчэнне свінагадоўлі абмежавана рэлігійнымі прычынамі ў краінах, дзе насельніцтва вызнае іслам або іўдаізм. Сусветнае пагалоўе свіней ацэньваецца ў 967 млн галоў. Яго размеркаванне мае яшчэ больш нераўнамерны характар, чым развядзенне буйной рагатай жывёлы. Больш за 50 % пагалоўя засяроджана ў Азіі, 14 % — у Амерыцы. Менавіта ў гэтых рэгіёнах прадстаўлены краіны — лідары па пагалоўі — **Кітай** (440 млн галоў) (мал. 135), **ЗША** (73), **Бразілія** (41 млн галоў).

Авечкагадоўля з'яўляецца старажытнай галіной сельскай гаспадаркі. Яна распаўсюджана ў краінах са значнымі плошчамі натуральных паш, пераважна ў арыдных

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

і горных раёнах. У авечкагадоўлі развіваюцца тры напрамкі: мяса-воўнавы, засяроджаны ў раёнах з дастатковым увільгатненнем і мяккім кліматам; танкарунны і паўтанкарунны, якія размяшчаюцца ў больш засушлівых абласцях.

Сусветнае пагалоўе авечак налічвае 1202 млн галоў. Сярод краін — **Кітай** (161 млн галоў), **Аўстралія** (72) (мал. 136) і **Індыя** (63 млн галоў). Па пагалоўі сярод рэгіёнаў дамінуюць Азія (42 %) і Афрыка (26 %).



Мал. 136. Авечкі-мерыносы ў Аўстраліі

Свет і Беларусь. Чаму Мінская, Брэсцкая і Гродзенская вобласці вылучаюцца больш высокім узроўнем развіцця асноўных падгалін жывёлагадоўлі?

Папрацуем з атласам. Вызначыце спецыялізацыю жывёлагадоўлі ў залежнасці ад прыродных зон. Пакажыце на карце краіны — лідары па пагалоўі буйной рагатай жывёлы, свіней, авечак.

Міжнародны гандаль прадукцыяй жывёлагадоўлі. Развітыя краіны значна апярэджваюць краіны, якія развіваюцца, па паказчыках вытворчасці прадукцыі жывёлагадоўлі. Гэта прычына тлумачыць становішча ў міжнародным гандлі. Па большасці артыкулаў экспарту лідзіруюць развітыя краіны. Вядучымі экспарцёрамі *ялавічыны* і *цяляціны* з'яўляюцца Аўстралія, Германія, Нідэрланды, ЗША; *свініны* — Нідэрланды, Бельгія, Данія; *бараніны* — Новая Зеландыя, Аўстралія і Вялікабрытанія; *мяса птушкі* — Францыя, ЗША, Нідэрланды; *воўны* — Аўстралія, Новая Зеландыя, Аргенціна. Артыкулам экспарту, у якім лідзіруюць краіны, што развіваюцца, з'яўляецца *буйная рагатая жывёла*. У групе вядучых краін знаходзяцца Бразілія, Аргенціна і Мексіка. Па экспарце авечак і коз вылучаецца Турцыя.

Аграрная палітыка ў краінах Еўрапейскага саюза. Як правіла, правядзенне адзінай аграрнай палітыкі ў інтэграцыйным аб'яднанні краін не выступае першаднай задачай. Еўрапейскі саюз з'яўляецца гістарычным прыкладам, калі задачы фарміравання адзінай індустрыяльнай і сельскагаспадарчай сферы ажыццяўляліся адначасова. Аграрная палітыка вызначае галоўную ролю ЕС у глабальнай вытворчасці і гандлі харчовымі прадуктамі. На яго долю прыходзіцца 17 % сусветнага экспарту прадуктаў харчавання. ЕС займае другое месца як сусветны экспарцёр малочных прадуктаў і свініны і трэцяе месца па экспарце птушкі і збожжа.

Клуб знаўцаў-эканомікагеографаў. Адзіная аграрная палітыка Еўрапейскага саюза (ААП ЕС) з 1960-х гг. уяўляе з сябе сістэму выплат фермерам краін ЕС. Галоўныя мэты ААП — гэта арганізацыя сельскагаспадарчага рынку, устанаўленне адзіных цэн

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

на большасць відаў прадукцыі сельскай гаспадаркі, высокая ступень абароны ўнутранага аграрнага рынку, забеспячэнне работнікам, занятым у аграрным сектары, годнага ўзроўню жыцця, супастаўнага з іншымі сектарамі эканомікі.

На аграрную палітыку выдаткоўваецца 46,7 % бюджэту ЕС. Яна прайшла некалькі этапаў у сваім развіцці (мал. 137), якія сведчаць аб пастаянным яе ўдасканаленні.

	Этап	Асноўны напрамак
1	1960–1970-е гг.	Самазабеспячэнне насельніцтва харчаваннем; усталяванне агульных цэн на сельскагаспадарчую прадукцыю
2	1970–1980-е гг.	Абмежаванне вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі; зніжэнне аб'ёмаў фінансавай падтрымкі фермераў
3	1980–1990-е гг.	Увядзенне падаткаў і нацыянальных квот з-за перавышэння парогу вытворчасці
4	1990–2000-е гг.	Кантроль за залішняй вытворчасцю; падтрымка гаспадарак, размешчаных у неспрыяльных раёнах; паляпшэнне стану навакольнага асяроддзя
5	2000-е гг.	Паляпшэнне якасці сельскагаспадарчай прадукцыі; стымуляванне вытворчасці прадукцыі арганічнай сельскай гаспадаркі; захаванне стандартаў па абароне навакольнага асяроддзя

Мал. 137. Этапы і асноўныя напрамкі адзінай аграрнай палітыкі ЕС

Як любы інтэграцыйны працэс адзіная аграрная палітыка не толькі мае перавагі, але і сутыкаецца з шэрагам праблем. Гэта, напрыклад, адзіныя стандарты якасці малочнай прадукцыі; аднолькавы памер выплат незалежна ад памеру фермерскай гаспадаркі і аб'ёмаў вытворчасці; памяншэнне выплат старым членам ЕС з-за яго пашырэння і неабходнасці выплат новым членам інтэграцыйнага аб'яднання; скарачэнне аб'ёмаў вытворчасці і колькасці фермераў з-за праблем са збытам прадукцыі; адзіныя цэны на прадукцыю незалежна ад выдаткаў; абмежаванні на імпарт сельскагаспадарчай сыравіны і інш. Аднак поспехі адзінай аграрнай палітыкі пераважаюць над выдаткамі. У яе ёсць магчымасць стаць еўрапейскай мадэллю сельскай гаспадаркі XXI ст.

Падвядзём вынікі. Асноўнымі падгалінамі жывёлагадоўлі з'яўляюцца ..., ..., ..., ... Лідарамі па пагалоўі буйной рагатай жывёлы з'яўляюцца ..., ..., ...; па пагалоўі свіней — ..., ..., ...; авечак — ..., ..., ... Асноўнымі экспарцёрамі прадукцыі жывёлагадоўлі з'яўляюцца ..., імпарцёрамі — ... .

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Праверым свае веды. 1. Якія фактары вызначаюць развіццё жывёлагадоўлі ў свеце? Адказ патлумачце. У чым заключаюцца адрозненні ў развіцці жывёлагадоўлі ў развітых краінах і краінах, якія развіваюцца? 2. У чым адрозненне экстэнсіўнай жывёлагадоўлі ад інтэнсіўнай? Як НТР паўплывала на развіццё жывёлагадоўлі?



Ад простага да складанага. Падрыхтуйце паведамленні пра развіццё жывёлагадоўлі ў краінах ЕС.



Ад тэорыі да практыкі. Запоўніце табліцу ў сшытку, выкарыстоўваючы матэрыялы вучэбнага дапаможніка і дадатковыя крыніцы інфармацыі.

Рэгіён	Геаграфічны тып сельскай гаспадаркі	Асноўныя характарыстыкі жывёлагадоўлі
Еўропа		
Азія		
Амерыка		
Афрыка		
Аўстралія		



Падарожжа па Глабальнай сетцы.
Статыстычная база Харчовай і сельскагаспадарчай арганізацыі ААН ФАО па жывёлагадоўлі.

§19-1 §19-2 §19-3 §19-4

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



§ 20. Прамысловасць свету, агульная характарыстыка

Успамінаем. Якія галіны адносяць да здабыўной і апрацоўчай прамысловасці? Якія галіны спецыялізацыі характэрныя для апрацоўчай прамысловасці развітых краін і краін, якія развіваюцца? Як галіновая структура прамысловасці адлюстроўвае ўзровень развіцця краіны? Чым вызначаецца размяшчэнне прамысловых прадпрыемстваў?

Для чаго мы гэта вывучаем? Ці будуць у бліжэйшы час адбывацца значныя змены ў структуры прамысловасці? Ці лічыце вы, што ад узроўню развіцця прамысловасці залежыць узровень развіцця эканомікі краіны ў цэлым? Адказ растлумачце. Якія галіны прамысловасці ўзніклі ў канцы XX – пачатку XXI ст.?

Месца прамысловасці ў сусветнай гаспадарцы, фактары размяшчэння. Найважнейшай часткай сучаснай сусветнай гаспадаркі з'яўляецца прамысловасць, якая аказвае вырашальнае ўздзеянне на ўзровень эканамічнага развіцця грамадства. **Геаграфія прамысловасці** — галіна сацыяльна-эканамічнай геаграфіі, якая вывучае тэрытарыяльную арганізацыю прамысловай вытворчасці: фактары, асаблівасці размяшчэння і ўзаемадзеяння галін і прадпрыемстваў у свеце і асобных краінах і рэгіёнах, іх сувязі з іншымі галінамі гаспадаркі, навукай, грамадствам і прыродным асяроддзем.

У свеце ўсё ўзаемазвязана. Выкарыстоўваючы веды, атрыманыя ў працэсе вывучэння вучэбнага прадмета «Сусветная гісторыя», узгадайце, калі пачала зараджацца прамысловасць. Што азначае тэрмін «прамысловая рэвалюцыя»? Дакажыце, што пры размяшчэнні прамысловых прадпрыемстваў неабходна ўлічваць меркаванне спецыялістаў з вобласці эканамічнай геаграфіі.

Прамысловасць з'яўляецца асноўнай галіной сусветнай гаспадаркі ў структуры сусветнага валавога прадукту і структуры занятасці насельніцтва. На яе долю прыпадае 30 % сусветнага валавога прадукту і 23 % занятых (3,4 млрд чал.).

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Месца прамысловасці ў развітых краінах і краінах, якія развіваюцца, у структуры іх гаспадарак адрозніваецца. У структуры ВУП у развітых краінах і краінах, якія развіваюцца, індустрыяльны сектар займае 25 і 30 % адпаведна.

На размяшчэнне галін прамысловасці аказвае ўздзеянне вялікая колькасць фактараў, якія падзяляюцца на тры асноўныя групы: *старыя*, ці *класічныя, новыя* і *найноўшыя* (мал. 138).

Класічныя	Новыя	Найноўшыя
Тэрытарыяльны Прыродна-рэсурсны Транспартны Фактар працоўных рэсурсаў	Экалагічны Навукаёмістыя вытворчасці	Эканамічная інтэграцыя Дзейнасць ТНК Лагістычны Палітычны Інвестыцыйны клімат Інфармацыйна-камунікацыйны

Мал. 138. Фактары размяшчэння прамысловасці

Тэрытарыяльны фактар уключае памер тэрыторыі і яе канфігурацыю, эканоміка-геаграфічнае становішча (цэнтральнае, перыферыйнае, суседскае, прыморскае, прыгранічнае). *Прыродна-рэсурсны* характарызуе забяспечанасць тэрыторыі/краіны прыроднымі рэсурсамі. Роля дадзенага фактару па меры развіцця сусветнай гаспадаркі слабее, але застаецца значнай у шэрагу краін. Значэнне *транспартнага фактару* заключаецца ў зніжэнні выдаткаў на перавозку грузаў. *Працоўныя рэсурсы* аказваюць істотны ўплыў на працягу ўсёй гісторыі сусветнай гаспадаркі. Важнае значэнне сёння набывае не толькі колькасць працоўных рэсурсаў, але і якасныя іх характарыстыкі (кваліфікацыя, адукацыя, здароўе, мабільнасць, наяўнасць канкрэтных навыкаў і інш.).



Паразважаем. Адна з найбуйнейшых экалагічных катастроф другой паловы XX ст. адбылася ў індыйскім горадзе Бхапал. З прычыны выкіду атрутных рэчываў на адным з прадпрыемстваў амерыканскай ТНК «Юніён Карбайд», якая вырабляе пестыцыды для сельскай гаспадаркі, загінула 18 тыс. жыхароў Індыі. Чаму ЗША пабудавалі гэта прадпрыемства не ў сваёй краіне?

Асаблівае значэнне набываюць *экалагічны фактар* і *навукаёмістая вытворчасць*. Пад уплывам індустрыялізацыі адбываецца забруджванне навакольнага асяроддзя. У сувязі з гэтым развітыя краіны ўводзяць жорсткія экалагічныя нормы і ажыццяўляюць перанос найбольш «брудных вытворчасцей» у краіны, якія развіваюцца, дзе экалагічнае заканадаўства пакуль знаходзіцца на пачатковай стадыі развіцця. У выніку навукова-тэхнічнай рэвалюцыі адбываецца ўкараненне яе вынікаў ва ўсе галіны прамысловасці. У канчатковым выніку адбываецца павелічэнне выдаткаў на навуковыя даследаванні.

П$_1$

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Навукова-тэхнічная рэвалюцыя (НТР) — карэнныя пераўтварэнні ў сістэме навуковых ведаў і ў тэхніцы, якія адбываюцца ў непарыўнай сувязі з гістарычным працэсам развіцця чалавечага грамадства.

Свет і Беларусь. Як паўплывала НТР на галіновую структуру прамысловасці Рэспублікі Беларусь? Якія фактары з'яўляюцца вызначальнымі ў размяшчэнні прамысловых прадпрыемстваў Рэспублікі Беларусь?

П$_2$

Структура прамысловасці. У прамысловасці свету існуе вялікая колькасць падгалін, якія вылучаюцца па розных прыкметах — прызначэнні прадукцыі, сыравіны, тэхналогіях і г. д. Асноўнымі з іх з'яўляюцца здабыўная і апрацоўчая прамысловасць.


Здабыўная (горназдабыўная) прамысловасць уяўляе з сябе комплекс галін, якія займаюцца здабычай і ўзбагачэннем карысных выкапняў на нафтапрамысловых і газаздабыўных прадпрыемствах, платформах на марскім шэльфе, шахтах, рудніках, горнаўзбагачальных камбінатах і інш. (мал. 139).



Мал. 139. Здабыча нафты ў Паўночным моры

Апрацоўчая прамысловасць уяўляе з сябе комплекс галін і відаў эканамічнай дзейнасці, якія ажыццяўляюць механічную, фізічную, хімічную, біятэхналагічную, нанатэхналагічную трансфармацыю матэрыялаў у новы прадукт, а таксама зборку кампанентаў (мал. 140).

Папрацуем з атласам. Выкарыстоўваючы карты атласа, назавіце краіны, дзе атрымала развіццё здабыўная прамысловасць, і краіны з высокім узроўнем развіцця апрацоўчай прамысловасці.



Мал. 140. Доля асобных галін і відаў эканамічнай дзейнасці ў структуры апрацоўчай прамысловасці свету, %

Ва ўмовах хуткага ўкаранення дасягненняў НТР у структуры апрацоўчай прамысловасці ўтварыліся высока-

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

тэхналагічныя галіны. Яны ўключаюць вытворчасць: 1) самалётаў і касмічных апаратаў; 2) офіснай, бухгалтарскай і камп'ютарнай тэхнікі; 3) фармацэўтыкі; 4) абсталявання для радыё, тэлебачання і сувязі; 5) высокадакладных, медыцынскіх і аптычных прыбораў.

Агульная характарыстыка сучаснай прамысловасці свету. Прамысловасць свету характарызуецца шэрагам адметных тэндэнцый. Па-першае, у выніку індустрыялізацыі адбываецца *памяншэнне ў структуры долі здабыўной прамысловасці і павелічэнне — апрацоўчай*. Доля здабыўной прамысловасці складае 10 %, апрацоўчай — 90 %. Па-другое, прамысловасць свету характарызуецца *высокай ступенню геаграфічнай канцэнтрацыі*.

На долю чатырох краін — індустрыяльных гігантаў — ЗША, Японіі, Кітая і Германіі — прыходзіцца 56 % аб'ёму прамысловай прадукцыі свету.

Па-трэцяе, на постындустрыяльнай стадыі роля прамысловасці і ў развітых краінах, і ў краінах, якія развіваюцца, застаецца значнай. *Краіны Поўначы і Поўдня сфарміравалі свае нішы ў міжнародным геаграфічным падзеле працы.*

Развітыя краіны застаюцца ядром прамысловасці свету і займаюць вядучую пазіцыю ў вытворчасці — 48 %, пры долі ў апрацоўчай прамысловасці звыш 75 %. У МГПП яны спецыялізуюцца на высокатэхналагічных галінах. Гэта так званыя верхнія паверхі апрацоўчай прамысловасці (навукаёмістае машынабудаванне, хімічная прамысловасць, фармацэўтыка, біятэхналогіі і інш.). Найбольшай доляй у сусветнай прамысловай вытворчасці характарызуюцца ЗША (21 %), Японія (8) і Германія (6 %) (мал. 141).



Мал. 141. Вытворчасць медпрэпаратаў у высокатэхналагічнай ТНК Bayer

Роля *краін, якія развіваюцца*, у прамысловасці свету няўхільна расце і складае 40 %. У іх атрымліваюць хуткае развіццё рэсурсаёмістыя, энергаёмістыя, працаёмістыя галіны прамысловасці. Занятасць насельніцтва ў індустрыяльным сектары павялічваецца. У дзяржавах Поўдня шырока прадстаўлена здабыўная галіна і хутка развіваюцца «ніжнія паверхі» апрацоўчай прамысловасці (металургія, нафтахімія, вугальная, асноўная хімія і інш.).



Мал. 142. Металургічная вытворчасць у Кітаі

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Найбольш дынамічна прамысловасць развіваецца ў Кітаі, Індыі, новых індустрыяльных краінах і нафтаздабыўных дзяржавах. Кітай у цяперашні час уяўляе з сябе своеасаблівую індустрыяльную фабрыку свету, займаючы пазаканкурэнтныя пазіцыі па тэмпах і аб'ёмах вытворчасцей у металургіі (мал. 142), машынабудаванні і шэрагу іншых вытворчасцей.

Па-чацвёртае, для прамысловасці свету характэрны *перанос* або *міграцыя асобных галін* з адных краін у іншыя. З краін Поўначы ў краіны Поўдня мігрыравалі найбольш працаёмістыя і экалагічна шкодныя вытворчасці. Напрыклад, з краін Еўропы ў Азію, і асабліва ў Кітай, адбыўся перанос металургіі, асноўнай хіміі, вытворчасці сінтэтычных смол і пластмас, зборачных машынабудаўнічых вытворчасцей.

Паразважаем. Які ўплыў прамысловасці на навакольнае асяроддзе? Як за апошнія 50 гадоў змяніліся фактары размяшчэння прамысловых прадпрыемстваў?

Уплыў НТР на галіновую структуру прамысловасці свету. Вынікі НТР аказваюць уплыў на з'яўленне новых відаў вытворчасцей. Найбольш хуткімі тэмпамі ўкараняюцца распрацоўкі ў *хімічнай галіне*. Напрыклад, вытворчасць новых відаў хімічных валокнаў і нітак (поліэстар, спандэкс, *мікрафібра*, новыя пакаленні ўцяпляльнікаў); прэпаратаў бытавой хіміі (звышактыўныя ачышчальнікі забруджванняў, выдаляльнікі тлушчу); касметыкі і парфумерыі (антыўзроставыя прэпараты, ачышчальныя сродкі, гелевыя сродкі гігіены); лекаў (супрацьвірусныя сродкі, імунамадулятары). У *металургіі* ажыццёўлены пераход да новых відаў выплаўлення чыгуну і сталі — ад мартэнаўскай да кіслародна-канвертарнага і электрычнага. У *здабыўной прамысловасці* стала магчымым бурэнне марскіх нафтавых і газавых свідравін з плаваючых платформ. У *аўтамабілебудаванні* на зборачных работах выкарыстоўваюцца прамысловыя робаты, а сучасны легкавы аўтамабіль камплектуецца сістэмай электроннага кіравання, новымі матэрыяламі каркаса і салона, гібрыднымі відамі паліва. У *харчовай прамысловасці* актыўна прымяняюцца розныя віды кансервантаў, харчасмакавыя дабаўкі, араматызатары і ўзмацняльнікі смакаў, якія павялічваюць тэрміны прыгоднасці прадуктаў і замяняюць дарагія натуральныя кампаненты.

Падвядзём вынікі. Прамысловасць з'яўляецца асноўнай часткай сучаснай сусветнай гаспадаркі. На развіццё і размяшчэнне галін прамысловасці аказваюць уздзеянне тры асноўныя групы фактараў: ..., ... і ... . Асноўнымі галінамі прамысловасці з'яўляюцца ... прамысловасць і ... . Сёння павялічваецца доля высокатэхналагічных галін у структуры сусветнай прамысловасці. Развітыя краіны спецыялізуюцца на вытворчасці прамысловай прадукцыі ... (напр., навукаёмістае машынабудаванне, фармацэўтыка, біятэхналогіі), краіны, якія развіваюцца, — на вытворчасці прадукцыі ... (здабыўная прамысловасць, металургія, асноўная хімія).

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Праверым свае веды. 1. Якія асноўныя фактары размяшчэння прамысловасці? 2. Чым адрозніваецца занятасць насельніцтва ў прамысловасці развітых краін і краін, якія развіваюцца? 3. Якія новыя галіны ў развіцці прамысловасці з'явіліся ў апошнія дзесяцігоддзі?

Ад простага да складанага. 1. Чаму ва ўмовах НТР асаблівая ўвага надаецца падрыхтоўцы кадраў у сістэме вышэйшай адукацыі? 2. Як уплывае будаўніцтва экалагічна небяспечнага прадпрыемства на ўзаемаадносіны паміж краінамі?

Падарожжа па Глабальнай сетцы.
Арганізацыя ААН па прамысловым развіцці.

Міжнародная стандартная галіновая класіфікацыя відаў эканамічнай дзейнасці.

П$_3$

§20-1

§ 21. Геаграфія энергетыкі свету

Успамінаем. Якія рэсурсы свету адносяцца да энергетычных? Якія краіны свету маюць буйныя запасы нафты і прыроднага газу? Якія краіны валодаюць буйнымі запасамі каменнага вугалю? Якія віды электрастанцый існуюць?

Для чаго мы гэта вывучаем? Ці магчыма сёння ўявіць жыццё без электрычнай энергіі? Чаму развіццё энергетыкі аказвае вызначальны ўплыў на развіццё ўсіх астатніх відаў гаспадарчай дзейнасці людзей? Ці існуюць праблемы ў грамадстве, звязаныя з развіццём энергетычнага комплексу?

Агульная характарыстыка энергетыкі. Энергетыка з'яўляецца базавай галіной прамысловасці. Яе развіццё выступае неад'емнай умовай функцыянавання ўсіх іншых галін індустрыяльнага сектара.

У свеце ўсё ўзаемазвязана. Як па аб'ёмах спажывання электрычнай энергіі можна вызначыць узровень сацыяльна-эканамічнага развіцця краін? Якія экалагічныя праблемы ўзнікаюць у сувязі з развіццём энергетыкі?


У склад галіны ўваходзіць паліўна-энергетычная прамысловасць (нафтавая, газавая, вугальная) і электраэнергетыка. Асноўнымі энерганосьбітамі выступаюць нафта, прыродны газ, вугаль, гідра- і атамная энергія. На працягу гісторыі сусветнай гаспадаркі адбываецца няўхільны рост вытворчасці і спажывання энергіі. Аднак пад уплывам НТР змяняецца іх структура. У другой палове XX ст. вядучая роля ў структуры спажывання належала вугалю, другім па значнасці энергарэсурсам была нафта. У цяперашні час у выніку змены ў спажыванні, вычарпання энергетычных рэсурсаў, абвастрэння экалагічнага становішча і пераходу да энергазберагальных тэхналогій вядучае месца ў балансе перайшло да нафты (33 %). Далей ідуць вугаль (28) і прыродны газ (24 %). Доля гідраэнергіі складае 7 %, атамнай — 5 %. На аднаўляльныя энергетычныя крыніцы прыходзіцца 3 %.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Паразважаем. 1. Авалоданне крыніцамі энергіі заўсёды было спосабам выжывання чалавецтва. І сёння яе спажыванне застаецца адным з найважнейшых не толькі эканамічных, але і сацыяльных паказчыкаў, якія шмат у чым прадвызначаюць узровень жыцця людзей. Вось чаму часам кажуць, што энергетыка кіруе светам. Ці згодныя вы з дадзеным сцвярджэннем? 2. Энергетыка — рухавік тэхнічнага працэсу. Ці так гэта?

Геаграфія нафтавай прамысловасці. Нафтавая прамысловасць выступае найважнейшай галіной у структуры энергетыкі свету. Значная частка здабываемай нафты выкарыстоўваецца як паліва. Аднак у апошні час вялікая яе частка прымяняецца ў нафтахімічнай і хімічнай прамысловасці.

Нафтавая прамысловасць з'яўляецца галіной, якая дынамічна развіваецца, што звязана з яе высокай прыбытковасцю. Гэты фактар прыводзіць да распрацоўкі новых спосабаў здабычы нафты, росту спажывання і павелічэння тэмпаў здабычы. За апошнія 50 гадоў аб'ёмы здабычы нафты выраслі ў чатыры разы і складаюць 4482 млн т (мал. 143). У геаграфіі здабычы вылучаюцца тры асноўныя рэгіёны — Паўднёва-Заходняя Азія (34 %), Паўночная Амерыка (20) і Еўропа з СНД (20 %). Тры вядучыя краіны свету па здабычы нафты — **ЗША**, **Саудаўская Аравія** і **Расія** — характарызаваліся раней прыкладна аднолькавымі аб'ёмамі здабычы (больш як 0,5 млрд т). Аднак у 2018 г. ЗША выйшлі на першае месца ў свеце. Здабыча склала 666 млн т. Прыкметна ўзмацніліся з канца XX ст. пазіцыі Кітая, на долю якога прыходзіцца 5 % сусветнай здабычы.



Мал. 143. Дынаміка сусветнай здабычы нафты, млн т


Сучасныя змены ў геаграфіі нафтавай прамысловасці свету звязаны з асваеннем шэльфавых радовішчаў у Паўночным моры, Мексіканскім, Каліфарнійскім, Гвінейскім залівах, каля астравоў Паўднёва-Усходняй Азіі і інш. У некаторых краінах у шэльфавай зоне сканцэнтравана асноўная частка запасаў (Нарвегія, Вялікабрытанія — 100 %; Бахрэйн — 90; ЗША — 50 %).

Папрацуем з атласам. Выкарыстоўваючы карты атласа, вызначыце геаграфію экспартных патокаў нафты.

Геаграфія газавай прамысловасці. Газавая прамысловасць з'яўляецца другой па значнасці ў структуры энергетыкі свету. Прыродны газ адрозніваецца большай цеплатворнай здольнасцю. Ён з'яўляецца больш экалагічна чыстым энерганосьбітам, які валодае значна лягчэйшай сістэмай здабычы, добрымі магчымасцямі транспарціроўкі і звадкавання. У параўнанні з нафтай за апошнія 50 гадоў аб'ёмы здабычы прыроднага газу павялічыліся амаль у 8 разоў і складаюць у цяперашні час 3937 млрд м^3

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

(мал. 144). Рэгіянальная структура здабычы прыроднага газу характарызуецца вылучэннем трох асноўных цэнтраў: 1) Еўропа з СНД (28 %); 2) Паўночная Амерыка (27) і Паўднёва-Заходняя Азія (18 %). Сярод вядучых краін па здабычы прыроднага газу вылучаюцца ЗША (862 млрд м^3), Расія (715) і Іран (231 млрд м^3).



Мал. 144. Дынаміка сусветнай здабычы прыроднага газу, млрд м^3


Адной з асаблівасцей геаграфіі газавай прамысловасці з'яўляецца стварэнне марскіх падводных рэзервуараў. У цяперашні час яны маюцца ў Паўночным моры, Мексіканскім заліве, у Паўднёва-Усходняй Азіі. Пры агульнай долі марской здабычы, якая складае каля 20 % сусветнай, у шэрагу краін яна з'яўляецца дамінуючай — каля 80 % (Бруней, Малайзія, Нарвегія, Вялікабрытанія).

У свеце цікавага. Нафта і прыродны газ вядомыя з даўніх часоў. У старажытнасці нафту і яе вытворныя выкарыстоўвалі як лекі, змазку, будаўнічы матэрыял, для асвятлення і ў іншых мэтах. Яшчэ да нашай эры нафту здабывалі саматужным спосабам і ў невялікіх колькасцях на Блізкім Усходзе, у Кітаі, на Каўказе і ў Крыме. Аднак толькі з адкрыццём машыннага спосабу здабычы нафты шляхам бурэння свідравін з другой паловы XIX ст. пачалося развіццё нафтаздабываючай прамысловасці.

Геаграфія вугальнай прамысловасці. Вугальная прамысловасць — найстарэйшая галіна энергетыкі, якая гістарычна мае важнае значэнне не толькі ў паліўнай прамысловасці, але і для развіцця металургічнай і хімічнай галін сусветнай гаспадаркі. За апошнія 50 гадоў аб'ёмы сусветнай здабычы ўзраслі ў тры разы і складаюць 7813 млн т (мал. 145).

У рэгіянальнай структуры здабычы вугалю вылучаюцца старыя і новыя цэнтры. Да старых цэнтраў адносяцца Еўропа, Паўночная Амерыка і Аўстралія, да новых, што дынамічна развіваюцца, — Азія.

У геаграфіі здабычы адбыліся кардынальныя зрухі, якія характарызуюцца



Мал. 145. Дынаміка сусветнай здабычы вугалю, млн т

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

высокай прасторавай канцэнтрацыяй і пераносам галіны ў Азіяцкі рэгіён. На долю Усходняй, Паўднёва-Усходняй, Паўднёвай Азіі, Аўстраліі і Акіяніі прыходзіцца 69 % сусветнай здабычы, а на долю **Кітая** — 46 % (3550 млн т). Сярод вядучых краін па здабычы вугалю вылучаюцца таксама **Індыя** (9 % сусветнай здабычы, 771 млн т) і **ЗША** (9 % сусветнай здабычы, 685 млн т).


Геаграфія электраэнергетыкі. Электраэнергетыка лічыцца вядучай галіной сусветнай гаспадаркі. Яе ўнікальнымі рысамі з'яўляюцца магчымасць выкарыстання шырокім колам спажыўцоў (транспарт, сувязь, жыллёва-камунальная і сельская гаспадарка і інш.), адносная экалагічная бяспека, магчымасць укаранення навукова-тэхнічных дасягненняў для павышэння эфектыўнасці нацыянальных гаспадарак.



Мал. 146. Структура сыравіннага балансу вытворчасці электраэнергіі, %

На пачатку XXI ст. у структуры сыравіннага балансу вытворчасці электраэнергіі пераважае вугаль (мал. 146).

За апошнія 50 гадоў сусветная вытворчасць электраэнергіі павялічвалася значна хутчэй, чым у іншых галінах энергетыкі, — узрасла больш чым у 10 разоў і складае ў цяперашні час 25,6 трлн кВт·г (мал. 147). У параўнанні з другой паловай XX ст. значна ўзрасла доля Азіяцка-Ціхаакіянскага рэгіёна, дзе цяпер вырабляецца 44 % электраэнергіі свету, больш чым па 20 % прыходзіцца на краіны Паўночнай Амерыкі і Еўропы з СНД. У апошні час прыкметна ўзмацніліся пазіцыі краін, якія развіваюцца, у вытворчасці электраэнергіі. Вядучымі краінамі па агульных аб'ёмах вытворчасці з'яўляюцца **Кітай** (6,6 трлн кВт·г), **ЗША** (4,2) і **Індыя** (1,5 трлн кВт·г).



Мал. 147. Дынаміка сусветнай вытворчасці электраэнергіі, трлн кВт·г

Электрычная энергія выпрацоўваецца на трох асноўных тыпах электрастанцый — ЦЭС, ГЭС і АЭС, якія ў суме вырабляюць 99 % энергіі. ЦЭС — найбольш распаўсюджаныя ў свеце. Яны вырабляюць у сярэднім 64 % электраэнергіі свету, прадстаўлены ў многіх краінах і працуюць на мінеральнай сыравіне (вугалі, мазуце, прыродным газе). Найбольшай доляй вугалю ў вытворчасці электраэнергіі характарызуюцца ПАР, Кітай, Аўстралія, Расія і інш.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Свет і Беларусь. Якія тыпы электрастанцый існуюць у Рэспубліцы Беларусь? Якія віды альтэрнатыўнай энергетыкі атрымалі развіццё ў Рэспубліцы Беларусь?

Доля ГЭС у структуры сусветнай вытворчасці электраэнергіі складае 16 %. Размяшчэнне гідраэнергетыкі залежыць ад засвоенасці гідраэнергарэсурсаў. Сусветная вытворчасць складае 4,2 трлн кВт·г. У некаторых краінах гідраэнергетыка з'яўляецца вызначальнай у структуры электраэнергетыкі і складае больш за 60 %. Напрыклад, у Нарвегіі, Венесуэле, Бразіліі. Вядучымі сусветнымі вытворцамі гідраэнергіі выступаюць Кітай, Бразілія і Канада. Найбуйнейшымі ГЭС свету з'яўляюцца **Саньея** (Кітай, р. Янцзы, 22,5 млн кВт) (мал. 148); **Ітайпу** (Бразілія-Парагвай, р. Парана, 16,0 млн кВт) і **Сілоду** (Кітай, правінцыі Юньнань і Сычуань, р. Янцзы, 13,9 млн кВт).

Доля АЭС у структуры электраэнергетыкі складае 10 %. У цяперашні час у свеце налічваецца 435 атамных рэктараў, у тым ліку ў ЗША — 104, Францыі — 58 і Японіі — 50. Найбольшай доляй атамнай энергіі ў структуры электраэнергетыкі характарызуюцца Францыя (больш за 70 %), Славакія і Бельгія (больш за 50 %). Асноўнымі вытворцамі атамнай энергіі ў свеце з'яўляюцца ЗША (839 млрд кВт·г), Францыя (398) і Кітай (248 млрд кВт·г). Найбуйнейшымі па магутнасці АЭС у свеце лічацца **Касівадзакі-Карыва** (Японія) (мал. 149), **Брус** (Канада) і **Коры** (Рэспубліка Карэя).

Клуб знаўцаў-эканомікагеографаў. Аварыі на Чарнобыльскай АЭС і АЭС «Фукусіма» змянілі ў многіх краінах стаўленне да атамнай энергетыкі. Так, пасля катастрофы на ЧАЭС усе краіны падзяліліся на тры групы: краіны-«адмоўнікі» (напр., Аўстрыя, Італія, Польшча); краіны без дэмантажу і без будаўніцтва новых АЭС (ЗША, Украіна, Расія) і краіны з шырокамаштабнымі атамна-энергетычнымі праграмамі (Францыя, Японія, Рэспубліка Карэя, Кітай). Пасля аварыі на «Фукусіме» ў Італіі быў прыняты Закон аб адмове ад развіцця ядзернай энергетыкі (2011), у Германіі распрацавана праграма адмовы ад ядзернай энергетыкі да 2022 г., у Швейцарыі прынята рашэнне прыпыніць рэалізацыю новых праектаў будаўніцтва ядзерных



Мал. 148. ГЭС «Саньея» («Тры цясніны»)



Мал. 149. «Касівадзакі-Карыва», найбуйнейшая АЭС свету

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

энергаблокаў, у Бельгіі поўны «выхад» з ядзернай энергетыкі намечаны на 2025 г. Аднак у цэлым Еўропа не збіраецца адмаўляецца ад ядзернай энергетыкі. У Азіі актыўнае развіццё ядзерных праграм адбываецца ў КНДР, Іране, Кувейце, Саудаўскай Аравіі і інш.

Папрацуем з атласам. Вызначыце краіны з максімальным і мінімальным аб'ёмам вытворчасці электрычнай энергіі на душу насельніцтва.

З-за вычарпальнасці энергетычных рэсурсаў у свеце, пагаршэння навакольнага асяроддзя і з прычыны развіцця энергазберажэння атрымлівае актыўнае развіццё альтэрнатыўная электраэнергетыка.

Альтэрнатыўная электраэнергетыка ўключае спосабы вытворчасці энергіі з аднаўляльных рэсурсаў і прыродных з'яў (вецер, сонечныя прамяні, патокі вады, якія рухаюцца, геатэрмальныя воды і інш.).

Перавагі аднаўляльных крыніц энергіі — шырокае іх распаўсюджванне, адсутнасць негатыўнага ўплыву на навакольнае асяроддзе і здароўе чалавека, эканамічнасць. У сучаснай структуры электраэнергетыкі доля альтэрнатыўнай складае 7 %. Вылучаюць ветравую, сонечную, геатэрмальную і прыліўную энергетыку.

Найбольшае развіццё атрымлівае ветравая энергетыка (мал. 150). Вытворчасць электраэнергіі з выкарыстаннем сілы ветру складае ў свеце 1127 млрд кВт·г. Вядучымі вытворцамі выступаюць **Кітай** (295), **ЗША** (257), Германія (106). Найбольшай доляй ветравой электраэнергіі ў структуры электраэнергетыкі ў свеце характарызуецца Іспанія (18 %).

Другое месца па аб'ёмах вытворчасці займае сонечная энергетыка. У 2017 г. у свеце было выраблена 444 млрд кВт·г сонечнай электраэнергіі. Вядучымі вытворцамі з'яўляюцца **Кітай** (141), **ЗША** (67), **Японія** (55). Сумарная магутнасць геатэрмальных электрастанцый (мал. 151) складае 14,6 млн кВт, у тым ліку ў **ЗША** — 3,6, у **Інданезіі** — 1,9 і на **Філіпінах** — 1,8 квт. Энергія прыліваў і марскіх хваль



Мал. 150. Ветрапарк у Паўночным моры



Мал. 151. «Несьявелір», ГеаЦЭС

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

выкарыстоўваецца ў свеце ў меншай ступені і атрымлівае найбольшае распаўсюджанне ў Францыі, Расіі, Нарвегіі, Канадзе і Кітаі.

Міжнародны гандаль электраэнергіяй. У міжнародным гандлі электраэнергіяй па аб'ёмах экспарту вылучаюцца Германія (78,8 млн кВт·г), Канада (73) і Францыя (61 млн кВт·г). Больш за ўсё імпартуюць электраэнергіі такія краіны, як ЗША (81 млн кВт·г), Італія (47) і Бразілія (34 млн кВт·г).

Падвядзём вынікі. Энергетыка забяспечвае развіццё галін індустрыяльнага сектара эканомікі. У структуры энергетыкі вылучаюць ..., ..., ... прамысловасці, а таксама ... . Электрычная энергія вырабляецца на ..., ..., ... У выніку скарачэння запасаў паліўных рэсурсаў усё больш актыўнае развіццё атрымлівае ... .

Праверым свае веды. 1. У чым падабенства і адрозненні геаграфіі запасаў і здабычы нафты і прыроднага газу? 2. У чым заключаюцца адрозненні ў рэгіянальнай структуры здабычы нафты, прыроднага газу і вугалю? 3. Якія змены ў геаграфіі здабычы нафты і прыроднага газу адбыліся ў цяперашні час? 4. Ці адмовіцца сусветная супольнасць ад атамнай энергетыкі? 5. Ці магчымая поўная замена традыцыйнай электраэнергетыкі на альтэрнатыўную?

Ад простага да складанага. Існуе меркаванне, што камерцыйна выгаднай альтэрнатывай выкапнёваму паліву ў бліжэйшы час не стане ні атамная, ні сонечная энергетыка, тым больш энергія прыліваў. Якія змены павінны адбыцца, каб гэта сцвярджэнне страціла сваю актуальнасць?

Ад тэорыі да практыкі. 1. Выкарыстоўваючы картаграфічны матэрыял, матэрыял вучэбнага дапаможніка і дадатковую літаратуру, падрыхтуйце паведамленне «Геаграфія гідраэнергетыкі свету», улічваючы наступныя характарыстыкі галіны: 1) фактары развіцця гідраэнергетыкі; 2) доля ГЭС у структуры сусветнай вытворчасці электраэнергіі; 3) краіны, дзе гідраэнергетыка з'яўляецца вызначальнай у структуры электраэнергетыкі; 4) вядучыя сусветныя вытворцы гідраэнергіі; 5) рэкі, на якіх пабудаваны найбуйнейшыя ГЭС свету.

Падарожжа па Глабальнай сетцы.
Сайт Міжнароднага агенцтва па атамнай энергіі (МАГАТЭ).

§21-1

§ 22. Геаграфія металургіі свету

Успамінаем. Руды якіх металаў адносяцца да чорных металаў, якіх — да каляровых? З чаго вырабляецца першасны метал, з чаго — другасны? Якія фактары ўплываюць на размяшчэнне металургічных вытворчасцей? Як звязаны паміж сабой электраэнергетыка і вытворчасць каляровых металаў?

Для чаго мы гэта вывучаем? Ці магчыма сёння адмовіцца ад выкарыстання металаў і замяніць іх іншымі канструкцыйнымі матэрыяламі? Ці аказала ўплыў НТР на развіццё металургічнага комплексу? Для чаго насельніцтва збірае металалом?


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Агульная характарыстыка металургіі. Металургія адносіцца да найстарэйшых і базавых галін апрацоўчай прамысловасці. Першыя металургічныя прадпрыемствы з'явіліся ў Германіі ў XVI ст. Доля металургіі ў структуры апрацоўчай прамысловасці свету складае 5 %, у развітых краінах — 4, у краінах, якія развіваюцца, — 7 %. Адметнымі асаблівасцямі галіны з'яўляюцца высокая матэрыялаёмістасць, многастадыйнасць тэхналагічнага працэсу, экалагічная нагрузка. Металургія забяспечвае гаспадарку краіны чыгуном, сталлю, пракатам, каляровымі металамі, іх шматлікімі сплавамі, у сувязі з чым развіццё галіны ў краіне вызначае эканамічны патэнцыял і выступае прыкметай індустрыяльнай стадыі. У склад галіны ўваходзяць чорная і каляровая металургія.

Геаграфія чорнай металургіі. Доля чорнай металургіі ў сусветнай прамысловай вытворчасці складае 10 %. Асноўнай сыравінай для вытворчасці чорных металаў служаць жалезныя руды. У свеце здабываецца 2400 млн т жалезнай руды. Вядучае месца належыць Азіі (50 %), Аўстраліі (17), Цэнтральнай і Паўднёвай Амерыцы (16,7 %). Лідарамі ў здабычы жалезных руд выступаюць Аўстралія, дзе засяроджана 37 % сусветнай здабычы, Бразілія і Кітай.

У склад чорнай металургіі ўваходзяць жалезарудная, чыгуналіцейная, сталеплавільная і пракатная вытворчасці.

Фактары размяшчэння чорнай металургіі. На размяшчэнне металургічных вытворчасцей аказваюць уплыў розныя фактары: сыравінны, транспартны, спажывецкі, экалагічны і інш. Часам на размяшчэнне вытворчасцей чорнай металургіі дзейнічае спалучэнне некалькіх фактараў (мал. 152).




Мал 152. Тыпы металургічных вытворчасцей па пераважным фактары размяшчэння

У свеце ўсё ўзаемазвязана. Чаму ў канцы XX ст. адбылося зрушэнне металургічных прадпрыемстваў у партовыя гарады? Якая са стадый вытворчасці чорных металаў з'яўляецца найбольш «бруднай»? Як звязаны паміж сабой хімія і металургія?

Правообладатель Адукацыя і выхаванне


Сусветная дынаміка вытворчасці чыгуну характарызуецца высокімі тэмпамі. У развітых краінах гэта тлумачыцца карэннай рэканструкцыяй галіны (вытворчасцю новых відаў сплаваў, пераносам у сувязі з экалагічным заканадаўствам). У краінах, якія развіваюцца, гэта звязана з актыўнай індустрыялізацыяй. Рубеж XX і XXI стст. стаў своеасаблівым пунктам адліку новага этапу развіцця чорнай металургіі, калі сусветнае выплаўленне і чыгуну, і сталі перавысіла 1 млрд т. Сусветныя аб'ёмы вытворчасці чыгуну ў свеце складаюць 1247 млн т, сталі — 1808 млн т (мал. 153).



Мал. 153. Дынаміка сусветнай вытворчасці чыгуну і сталі, млн т

Геаграфія чорнай металургіі свету з канца XX ст. зведала кардынальныя змены. Геаграфічны цэнтр галіны перамясціўся з Еўропы і Паўночнай Амерыкі. XXI ст. па аб'ёмах выплаўлення чыгуну і сталі стаў стагоддзем Азіі, на долю якой прыходзіцца 59 % сусветнай вытворчасці чыгуну і 67 % — сталі (мал. 154).

Нараўне з лідзіруючымі пазіцыямі шэрага развітых краін — традыцыйных лідараў чорнай металургіі свету (Японія, ЗША) — і краін, якія развіваюцца (Індыя, Рэспубліка Карэя), у цяперашні час 60 % сусветнага выплаўлення чыгуну і 49 % сталі прыходзіцца на Кітай (мал. 155). Вядучымі краінамі па вытворчасці і чыгуну, і сталі з'яўляюцца **Кітай**, **Індыя**, **Японія**.



Мал. 154. Рэгіянальная структура вытворчасці чыгуну і сталі, %

Свет і Беларусь. Ці існуе ў Рэспубліцы Беларусь неабходнасць у будаўніцтве другога буйнога металургічнага прадпрыемства? Якія сусветныя тэндэнцыі абумоўліваюць развіццё металургічнай вытворчасці ў Беларусі?

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Мал. 155. Вытворчасць пракату ў Кітаі

У свеце склаліся тры рэгіёны чорнай металургіі — Еўрапейскі, Паўночнаамерыканскі і Азіяцкі. *Азіяцкі рэгіён* — вядучы цэнтр сусветнай чорнай металургіі, дзе маюцца розныя віды сыравіны і паліва, але пры гэтым краіны валодаюць рознай ступенню забяспечанасці. У рэгіёне прадстаўлены найстарэйшы лідар — Японія і новыя лідары, якія дынамічна развіваюцца, — Кітай, Рэспубліка Карэя, Індыя. *Еўрапейскі рэгіён* з'яўляецца найстарэйшым металургічным цэнтрам свету, значнасць якога не змяншаецца. Павелічэнне экалагічнай нагрузкі і пераход да постындустрыялізацыі прывялі да фарміравання ўласнай нішы ў МГПП і спецыялізацыі — вытворчасці якасных сталей. Асноўнымі вытворцамі выступаюць Германія, Францыя, Вялікабрытанія, Італія. У *Паўночнаамерыканскім рэгіёне* вядучая роля належыць ЗША, якія на працягу доўгага перыяду лідзіравалі ў свеце па здабычы і выплаўленні чорных металаў. У апошнія гады рэгіён змяніў сваю міжнародную спецыялізацыю на буйных металургічных камбінатах — ствараюцца невялікія заводы па вытворчасці высакаякасных сталей.

У свеце ТНК. У цяперашні час найбуйнейшымі вытворцамі чорных металаў з'яўляюцца не асобныя краіны, а транснацыянальныя карпарацыі. Найбуйнейшыя металургічныя ТНК у свеце — **ArcelorMittal** (Люксембург), **China Baowu Group** (Кітай) і **Nippon Steel & Corporation** (Японія).

Геаграфія каляровай металургіі свету. Гэта падгаліна з'яўляецца другой па значнасці ў структуры металургічнай прамысловасці. Адметныя асаблівасці каляровай металургіі — наяўнасць спецыяльных тэхналагічных цыклаў (мал. 156); экалагічныя праблемы на розных тэхналагічных стадыях; дарагоўля каляровых металаў у параўнанні з чорнымі.

Каляровая металургія

- Атрыманне «чарнавога» металу
- Узбагачэнне
- Здабыча
- Рафінаванне
- Выраб пракату
- Збор і падрыхтоўка лому для другаснага выкарыстання

Мал. 156. Асноўныя тэхналагічныя цыклы ў каляровай металургіі

Роля галіны ў сусветнай гаспадарцы вызначаецца шырокімі абласцямі прымянення каляровых металаў — ад электраэнергетыкі,

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

агульнага машынабудавання і хімічнай прамысловасці да авіябудавання (рэактыўных рухавікоў), ядзерных рэактараў, унікальных сплаваў ваеннага прызначэння.


На размяшчэнне галін каляровай металургіі ўплывае комплекс фактараў: сыравінны, энергетычны, водны, спажывецкі, экалагічны і інш. Кожны від вытворчасці характарызуецца сваім наборам фактараў. Аднак у МГПП склалася спецыялізацыя паміж групамі краін: краіны, якія развіваюцца, займаюцца сыравіннымі стадыямі і вытворчасцю першасных металаў, развітыя — рафінаваннем і другаснымі пракатнымі стадыямі.

Па аб'ёмах вытворчасці ў структуры каляровай металургіі вядучае месца належыць алюмініевай прамысловасці (58 %), далей ідуць медная (21), цынкавая (15) і свінцовая (6 %).

Паразважаем. Чаму пачынаючы з 70-х гг. XX ст. пачалося перамяшчэнне металургічных прадпрыемстваў з Заходняй Еўропы і ЗША ў Азіяцкі рэгіён? Чаму некаторыя каляровыя металы называюць металамі XXI ст.?

У свеце цікавага. Самыя дарагія сталовыя прыборы Напалеона III былі выраблены з алюмінію — новага і незвычайнага ў той час металу. Яны падаваліся на ўрачыстых абедах толькі імператару і самым ганаровым гасцям. Іншыя госці карысталіся прыборамі са звычайных золата і серабра.


Геаграфія алюмініевай прамысловасці — вядучай падгаліны каляровай металургіі — складаецца з некалькіх стадый, якія характарызуюцца розным размяшчэннем і вызначаюць спецыялізацыю ў міжнародным геаграфічным падзеле працы (мал. 157).



Мал. 157. Стадыі вытворчасці алюмінію

Здабыча баксітаў сканцэнтравана ў невялікай колькасці краін пераважна Аўстраліі і Акіяніі, Амерыкі і Азіі. Яна прымеркавана да найбуйнейшых баксітаносных радовішчаў свету. Аб'ём здабычы баксітаў у свеце складае 300 млн т, з іх 27 % прыпадае на Аўстралію, 23 — Кітай і 15 % — Гвінею. *Вытворчасць гліназёму* (прадукту перапрацоўкі баксітаў для наступнай выплаўкі алюмінію) складае 130 млн т. Геаграфія практычна супадае са здабычай баксітаў, але канцэнтрацыя размяшчэння больш высокая. У Кітаі прадстаўлена 55 % сусветнай вытворчасці гліназёму, у Аўстраліі — 9 %. Вялікімі аб'ёмамі вытворчасці ў сусветным маштабе вылучаюцца таксама Бразілія і Індыя. Геаграфія выплаўлення *першаснага алюмінію*

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Мал. 158. Вядучыя вытворцы алюмініевай прамысловасці свету, 2016, млн т

прадстаўлена ў развітых краінах і краінах, якія развіваюцца. Пры гэтым, як і ў чорнай металургіі, назіраецца перанос вытворчасці ў краіны, якія развіваюцца.

У свеце выплаўляецца 60 млн т першаснага алюмінію, у тым ліку ў **Кітаі** — 53 %. Астатнія краіны-лідары — **Расія**, **Індыя** — маюць вялікі адрыў ад Кітая па аб'ёмах вытворчасці (мал. 158).

Другое месца па значнасці ў структуры каляровай металургіі займае *медная прамысловасць*. У свеце здабываецца 21 млн т меднай руды. Геаграфія здабычы сканцэнтравана ў Цэнтральнай і Паўднёвай Амерыцы (54 %) і Азіі (21 %). Вядучай краінай свету па здабычы медных руд застаецца Чылі, доля якой у свеце складае 32 % (5,8 млн т). Далей ідуць Перу (2,4) і Кітай (1,6 млн т). У геаграфіі вытворчасці рафінаванай медзі адбыліся істотныя змены, дзе гістарычна вядучыя месцы займалі развітыя краіны. На пачатку XXI ст. вытворчасць стала хуткімі тэмпамі развівацца ў **Кітаі**, які ў цяперашні час выплаўляе 8,9 млн т рафінаванай медзі, або 38 % сусветнай вытворчасці. Другое і трэцяе месцы займаюць **Чылі** і **Японія**.

Трэцяе месца ў структуры каляровай металургіі належыць *цынкава-свінцовай прамысловасці*. У свеце здабываецца 12 млн т *цынкавых руд*, з якіх 38 % прыходзіцца на Кітай. У міжнародным падзеле працы на здабычы медных руд спецыялізуюцца таксама Перу, Аўстралія, ЗША. Геаграфія вытворчасці рафінаванага цынку прадстаўлена пераважна краінамі, якія развіваюцца (Кітай, Рэспубліка Карэя, Індыя). З 13,2 млн т сусветнай вытворчасці 45 % прыпадае на Кітай. Па здабычы *свінцовых руд* у свеце лідзіруюць тры краіны — Кітай, Аўстралія і ЗША. Пры гэтым з 4,6 млн т сусветнай здабычы 50 % сканцэнтравана ў Кітаі. У геаграфіі вытворчасці рафінаванага свінцу ў XXI ст. склаліся роўныя пазіцыі лідарства паміж краінамі, якія развіваюцца (**Кітай**, **Рэспубліка Карэя**, **Індыя**), і развітымі (**ЗША**, Германія, Вялікабрытанія).

Папрацуем з атласам. Прааналізуйце геаграфію запасаў руд і вытворчасці каляровых металаў. Зрабіце вывады.

П$_1$

П$_2$

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Геаграфія міжнароднага гандлю ў металургіі. Агульны аб'ём міжнароднага экспарту сталі ў свеце ў 2017 г. склаў 463 млн т. Асноўнымі экспарцёрамі сталі з'яўляюцца Кітай (75 млн т, або 16 % сусветнага экспарту), Японія (37) і Рэспубліка Карэя (31 млн т). Асноўныя экспарцёры чыгуну — Расія, Украіна і Бразілія.

Падвядзём вынікі. У склад металургічнага комплексу ўваходзяць ... і ... . Доля чорнай металургіі ў сусветнай прамысловай вытворчасці складае каля 10 %. У свеце склаліся тры рэгіёны чорнай металургіі: ..., ... і ... . Па аб'ёмах вытворчасці ў каляровай металургіі вядучае месца належыць ... прамысловасці, ..., ... і ... .

Праверым свае веды. 1. Якія фактары ляжаць у аснове размяшчэння прадпрыемстваў чорнай металургіі? 2. Якія фактары ляжаць у аснове размяшчэння прадпрыемстваў каляровай металургіі? 3. Якія ТНК з'яўляюцца вядучымі ў чорнай металургіі, у якіх краінах яны размешчаны? 4. Якія плюсы і мінусы маюць руды каляровых металаў у параўнанні з рудамі чорных металаў?

Ад простага да складанага. Выкарыстоўваючы гіперспасылкі з рубрыкі «Падарожнічаем па Глабальнай сетцы», падрыхтуйце прэзентацыю «Найбуйнейшыя ТНК металургіі».

Ад тэорыі да практыкі. Выкарыстоўваючы картаграфічны матэрыял, матэрыял вучэбнага дапаможніка і дадатковую літаратуру, запоўніце табліцу ў сшытку.

Параўнальная характарыстыка рэгіёнаў чорнай металургіі свету

Асноўныя характарыстыкі	Еўрапейскі рэгіён	Азіяцкі рэгіён	Паўночнаамерыканскі рэгіён
Рэсурсная база			
Фактары размяшчэння			
Вядучыя краіны			
Перспектывы развіцця			

Падарожжа па Глабальнай сетцы.
Сайт Сусветнай асацыяцыі вытворцаў сталі.

Сайт кітайскай ТНК China Baowu group.

Сайт ТНК ArcelorMittal.

Сайт ТНК Nippon Steel & Sumitomo Metal.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

§ 23. Геаграфія машынабудавання свету

Успамінаем. Што такое машынабудаванне? Якія віды прадукцыі вырабляе машынабудаванне? Прывядзіце прыклады трох дзяржаў, якія з'яўляюцца сусветнымі лідарамі па вытворчасці прадукцыі машынабудавання.

Для чаго мы гэта вывучаем? 1. Уявіце, што перад вамі стаіць задача па адкрыцці прадпрыемства машынабудавання. З чаго вы пачняце рэалізацыю пастаўленай задачы? Якія фактары размяшчэння вытворчасці і чаму вы будзеце ўлічваць? 2. У цяперашні час усё больш навукова-даследчых і доследна-канструктарскіх распрацовак укараняюцца ў машынабудаванне. Ці зменіцца гэта тэндэнцыя ў бліжэйшы час? 3. Якія змены зведалі найбуйнейшыя прадпрыемствы машынабудавання нашай краіны?

Структура і фактары размяшчэння машынабудавання. Машынабудаванне з'яўляецца вядучай галіной апрацоўчай прамысловасці свету. Яна забяспечвае астатнія галіны сусветнай гаспадаркі сродкамі працы і рознымі відамі абсталявання. Доля машынабудавання ў структуры апрацоўчай прамысловасці складае 47,5 %.

Разважаем. Чаму машынабудаванне развіваецца апераджальнымі тэмпамі ў параўнанні з іншымі галінамі прамысловасці?


У структуры машынабудавання вылучаюць *старыя, новыя* і *найноўшыя галіны*. Напрыклад, да старых галін адносяць станкабудаванне, суднабудаванне; да новых — аўтамабілебудаванне, авіяракетна-касмічную прамысловасць (АРКП); да найноўшых — электроніку, вытворчасць камп'ютараў, праграмнага забеспячэння і дадаткаў.

Машынабудаўнічая галіна ўключае ў сябе агульнае машынабудаванне, транспартнае машынабудаванне і электратэхніку з электронікай. Калі ў канцы XX ст. на кожную падгаліну прыходзілася прыкладна 1/3 сукупнай вытворчасці машын, то ў XXI ст. у структуры дамінуе электронная.

У свеце ўсё ўзаемазвязана. Чаму ад узроўню развіцця машынабудавання залежыць узровень развіцця ўсіх галін прамысловасці? Чаму найбольшая патрэба ў робатах узнікае ў аўтамабілебудаванні?

На размяшчэнне прадпрыемстваў машынабудавання ўплываюць многія фактары (мал. 159). У апошні час вырашальнае значэнне ў размяшчэнні і развіцці маюць навуковыя распрацоўкі і новыя тэхналогіі ў вытворчасці прадукцыі машынабудавання.

Машынабудаванне адрозніваецца нераўнамернасцю размяшчэння, высокай канцэнтрацыяй асобных вытворчасцей і спецыялізацыяй



Мал. 159. Агульныя фактары размяшчэння машынабудавання

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

краін у МГПП, якая склалася. У сувязі з гэтым краіны свету падзяляюцца на дзве групы: з перавагай у структуры старых галін, з перавагай у структуры найноўшых галін машынабудавання.

П$_1$

Геаграфія асноўных галін машынабудавання. Вядучай падгаліной у агульным машынабудаванні з'яўляецца станкабудаванне. Яно ўключае ў сябе вытворчасць металаапрацоўчых і іншых станкоў, кавальска-прэсавага абсталявання, прамысловых робатаў. Гістарычна вядучыя пазіцыі ў развіцці станкабудавання займалі развітыя краіны. У цяперашні час спецыфікай геаграфіі падгаліны з'яўляецца высокая канцэнтрацыя складаных вытворчасцей у развітых краінах (выпуск складаных дарагіх станкоў) і менш складаных — у краінах, якія развіваюцца. За апошнія два дзесяцігоддзі геаграфія падгаліны зведала істотныя зрухі. У рэгіянальнай структуры 62 % станкоў вырабляецца ў Азіі, 30 — у Еўропе і 5 % — у Амерыцы. У вытворчасці станкоў варта вылучыць дзве вядучыя развітыя краіны — **Японію** і **Германію** (мал. 160) і краіну, якая развіваецца, — **Кітай**. На іх долю ў сукупнасці прыходзіцца больш за 50 % сусветнай вытворчасці станкоў.

Робататэхніка з'яўляецца падгаліной у структуры машынабудавання, якая дынамічна развіваецца, што звязана з попытам на робатаў у аўтамабілебудаванні, ахове здароўя, фармацэўтыцы і інш. Вытворчасць робатаў у свеце дасягнула 294 тыс. адз. Гістарычным лідарам выступае Японія (мал. 161). У цяперашні час на пяць краін — Кітай, Рэспубліку Карэя, Японію, ЗША і Германію — прыходзіцца 70 % сусветнай вытворчасці робатаў. Найбольш хуткімі тэмпамі развіваецца робататэхніка ў Кітаі, доля якога складае 30 % сусветнай вытворчасці, або 87 тыс. адз. Другое месца належыць Рэспубліцы Карэя — 41 тыс. адз., трэцяе — Японіі — 38 тыс. адз. Найбольшай патрэбай у робатах характарызуецца аўтамабілебудаванне (на 10 000 працоўных прыходзіцца ад 400 да 700 робатаў) і электронікай з электратэхнікай (на 10 000 працоўных — 100–200 робатаў).



Мал. 160. Выкарыстанне лушчыльнага станка (Германія) для вытворчасці мэблевага шпону



Мал. 161. Японскія робаты Kawasaki — найстарэйшыя ў свеце

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

У свеце цікавага. У свеце вылучаюцца краіны з найбольш высокім узроўнем рабатызацыі. Лідзіруе Рэспубліка Карэя — на 10 тыс. рабочых тут маецца 631 робат. Больш за ўсё машын установлена на прадпрыемствах аўтамабільнай і электратэхнічнай прамысловасці. Далей ідзе Сінгапур — на 10 тыс. чалавек на заводах установлена 488 робатаў. Каля 90 % машын задзейнічана ў электратэхнічнай прамысловасці. Германія — самая аўтаматызаваная краіна ў Еўропе. На 10 тыс. чалавек у вытворчасці прыходзіцца 309 робатаў. У той жа час у Вялікабрытаніі прамысловыя робаты не карыстаюцца асаблівай папулярнасцю. На 10 тыс. чалавек у 2016 г. прыходзіўся 71 робат.

Найбуйнейшымі ТНК робататэхнікі з'яўляюцца японская FANUC, якая вырабляе «інтэлектуальныя» робаты; нямецкая KUKA, якая спецыялізуецца на робатах для зваркі, пагрузкі, упакоўкі, зборкі; швейцарская ABB, якая выпускае робаты для транспартнага машынабудавання (для трактароў, цягнікоў, матацыклаў, лёгкіх самалётаў і верталётаў).

Найстарэйшай галіной транспартнага машынабудавання выступае *суднабудаванне*. Геаграфія галіны зведала істотныя змены з часу ўзнікнення. Лідарства доўгі час належала Еўропе, дзе вядучымі суднабудаўнічымі дзяржавамі былі Вялікабрытанія, Швецыя, Германія (мал. 162) і інш. У Азіі суднабудаванне актыўна развівалася ў Японіі. У канцы



Мал. 162. Найбуйнейшая ў свеце суднабудаўнічая верф Маер у Папенбургу (Германія) па вытворчасці круізных лайнераў


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

XX ст. лідарамі па вытворчасці круізных лайнераў былі Японія, Германія і Рэспубліка Карэя. Пад уплывам НТР з'явіліся новыя віды суднаў — буйнатанажныя танкеры, атамныя ледаколы, кантэйнеравозы, навукова-даследчыя плывучыя лабараторыі і інш. У цяперашні час у геаграфіі суднабудавання адбыўся кардынальны зрух — з развітых краін у краіны, якія развіваюцца, з Еўропы ў Азію. Вядучымі вытворцамі суднаў у свеце з'яўляюцца **Рэспубліка Карэя** (41 % сусветнай вытворчасці), **Японія** (29) і **Кітай** (24 %).

Свет і Беларусь. У Рэспубліцы Беларусь атрымала маштабнае развіццё машынабудаванне. Найбуйнейшыя машынабудаўнічыя прадпрыемствы вырабляюць прадукцыю не толькі для задавальнення попыту на ўнутраным рынку. Значная частка прадукцыі галіны ідзе на экспарт. Вызначыце геаграфію экспартных паставак прадпрыемстваў машынабудавання. Якія змены ў развіцці машынабудавання Беларусі адбыліся ў апошні час?

Аўтамабілебудаванне — галоўная састаўная частка транспартнага машынабудавання і адна з найважнейшых галін у структуры машынабудавання. Развіццё галіны залежыць ад многіх галін сусветнай гаспадаркі (металургія, хімічная, нафтахімічная, тэкстыльная і інш.). Да ліку асноўных фактараў размяшчэння адносяцца фактар працоўных рэсурсаў, навукаёмістасць, экалагічны і інш.

Сусветная вытворчасць аўтамабіляў у свеце няўхільна ўзрастае. Калі ў 1950 г. выраблялася 10,5 млн аўтамабіляў, то ў цяперашні час — 95,6 млн, з іх легкавых — 70,5 млн (мал. 163).




Мал. 163. Дынаміка сусветнай вытворчасці аўтамабіляў усіх відаў, млн шт.

У галіновай структуры вылучаюць чатыры групы вытворчасцей: легкавыя аўтамабілі, легкагрузныя аўтамабілі, велікагрузныя аўтамабілі, велікагрузныя аўтобусы (мал. 164). Гістарычна ў свеце існавала геаграфічная трыяда вытворцаў аўтамабіляў: краіны Еўропы — ЗША — Японія. У цяперашні час галіна характарызуецца шырокай геаграфіяй. Аўтамабілебудаванне прадстаўлена ў большасці краін свету, у ім моцна развіты міжнароднае кааперараванне працы і міжнародная спецыялізацыя. У цяперашні час у рэгіянальнай структуры вытворчасці ўсіх відаў аўтамабіляў 53 % прыходзіцца на Азію, 26 — на Еўропу, 21 % — на Паўночную Амерыку.

Па вытворчасці легкавых аўтамабіляў Азіяцкі рэгіён таксама выступае лідарам, яго доля складае 52 %. Кожны трэці легкавы аўтамабіль вырабляецца ў Еўропе (32 %) (мал. 165) і 15 % сусветнай вытворчасці прыходзіцца на Паўночную Амерыку.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Мал. 164. Вядучыя вытворцы аўтамабіляў, 2018 г.

Найбольшай колькасцю легкавых аўтамабіляў характарызуецца **Кітай**, далей ідуць **Японія** і **Германія**. Сярод краін, у якіх дынамічна развіваецца аўтамабілебудаванне, неабходна вылучыць Бразілію, Мексіку, Індыю, Турцыю, Тайланд і інш.

У свеце ТНК. Нягледзячы на геаграфічны зрух аўтамабілебудавання ў краіны Азіі, якія развіваюцца, большасць вядучых ТНК галіны знаходзіцца ў развітых краінах. Да іх ліку адносяцца **Toyota Motor** (Японія), **Volkswagen Group** (Германія), **Daimler** (Германія).



Мал. 165. Канвеерная зборка легкавых аўтамабіляў у Познані (Польшча)

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Папрацуем з атласам. Выкарыстоўваючы карты атласа, назавіце асноўныя ТНК у аўтамабілебудаванні і краіны, у якіх размешчаны іх штаб-кватэры.

Электронная прамысловасць з'яўляецца самай навукаёмістай і інавацыйнай у сусветнай гаспадарцы. Яна характарызуецца найбольш высокімі і ўстойлівымі тэмпамі росту. Развіццё электронікі ўплывае на ўсе без выключэння галіны сусветнай гаспадаркі, што тлумачыцца масавым укараненнем яе прадукцыі.

У структуры падгаліны вылучаюць вытворчасць: 1) электронных сродкаў апрацоўкі інфармацыі; 2) электронных кампанентаў і праграмнага забеспячэння; 3) сродкаў сувязі.

Аб'ём вытворчасці электронных сродкаў апрацоўкі інфармацыі — персанальных камп'ютараў — у свеце складае 315 млн шт., з іх настольных — 137 і партатыўных — 178 млн шт. У рэгіянальнай структуры вытворчасці камп'ютараў дамінуючыя пазіцыі ў цяперашні час займаюць краіны Азіі (Кітай, Рэспубліка Карэя). Аднак у розныя перыяды значная роля належала ЗША і краінам Еўропы.

У свеце ТНК. Сярод найбуйнейшых ТНК, якія вырабляюць камп'ютары, варта вылучыць **Apple** (ЗША) і **Hewlett-Packard** (ЗША). Вытворчасць электронных кампанентаў уключае выпуск транзістараў, працэсараў, чыпсет і інш. Вядучай ТНК у гэтай галіне з'яўляецца амерыканская кампанія **Intel**. Самай буйной кампаніяй у свеце па вытворчасці праграмнага забеспячэння з'яўляецца амерыканская ТНК **Microsoft**.

Вытворчасць сродкаў сувязі (прылады для доступу ў інтэрнэт, мабільныя тэлефоны, сеткавае абсталяванне) характарызуецца самымі высокімі тэмпамі развіцця, што абумоўлена спажывецкім фактарам. Вядучыя пазіцыі ў сусветнай індустрыі мабільных тэлефонаў і смартфонаў (мал. 166) займаюць наступныя ТНК: Nokia (Фінляндыя, 33 % сусветнага рынка), Apple (ЗША, 16) і Samsung Group (Рэспубліка Карэя, 8 %). Аб'ём вытворчасці смартфонаў дасягнуў 302 млн шт., а агульная колькасць іх карыстальнікаў у свеце перавысіла 1,6 млрд чалавек.

Авіяракетна-касмічная прамысловасць (АРКП) адносіцца да найноўшых галін машынабудавання. Асноўным фактарам размяшчэння з'яўляецца прыцягненне да гарадоў, якія маюць буйныя навукова-даследчыя цэнтры. АРКП з'яўляецца найбольш навукаёмістай галіной, якая патрабуе значных капіталаўкладанняў. Таму найбольшае развіццё яна атрымлівае ў абмежаванай колькасці краін з высокім узроўнем развіцця.

У структуры галіны вылучаюць самалётабудаванне, верталётабудаванне, ракетабудаванне, вытворчасць касмічных лятальных апаратаў, вытворчасць рухавікоў і авіяцыйнае прыборабудаванне. Лідзіруючыя пазіцыі ў свеце па ўсіх відах вытворчасцей АРКП займаюць ЗША, Францыя (мал. 167) і Расія. Найбуйнейшым сусветным вытворцам авіяцыйнай, касмічнай і ваеннай тэхнікі ў свеце з'яўляецца амерыканская ТНК The Boeing Company.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Мал. 166. Вытворчасць смартфонаў у Рэспубліцы Карэя



Мал. 167. Зборка Airbus A380 ў Тулузе (Францыя)

Геаграфія міжнароднага гандлю прадукцыяй машынабудавання. Міжнародны гандаль прадукцыяй машынабудавання моцна залежыць ад спажывецкага фактару. Так, у перыяд глабальнага эканамічнага крызісу 2008–2009 гг. найбольшыя страты продажаў былі характэрныя для аўтамабілебудавання, станкабудавання і электратэхнікі.

Найбуйнейшымі экспарцёрамі прадукцыі *аўтамабілебудавання* выступаюць Японія, ЗША і Мексіка, *станкоў* — Германія, Японія і Італія. Першае месца па экспарце суднаў займае Рэспубліка Карэя. Доля краіны ў сусветным экспарце суднаў у 2008 г. дасягнула амаль 27,5 %. Другое месца належыць Японіі з доляй 13,5 %, трэцяе — Кітаю. Яго доля ў сусветным экспарце павялічылася да 13 %.

Падвядзём вынікі. Машынабудаванне — вядучая галіна ... прамысловасці. У структуры машынабудавання вылучаюць ..., ... і ... падгалiны. Дынамічна развіваюцца ..., вытворчасць ..., ..., авіяракетна-касмічная прамысловасць.

Праверым свае веды. 1. Якія фактары ляжаць у аснове размяшчэння прадпрыемстваў машынабудавання? 2. Якая доля машынабудавання ў апрацоўчай прамысловасці? 3. Якія краіны свету з'яўляюцца лідарамі па вытворчасці легкавых, грузавых аўтамабіляў, аўтобусаў? 4. Чаму ў машынабудаванні ярка прасочваюцца спецыялізацыя і кааперaванне?

Ад простага да складанага. Напішыце сачыненне-разважанне на тэму «Узровень гаспадаркі краіны залежыць ад узроўню развіцця машынабудавання».

Ад тэорыі да практыкі. Выкарыстоўваючы картаграфічны матэрыял, матэрыял вучэбнага дапаможніка і дадатковую літаратуру, запоўніце табліцу ў сшытку.

П$_4$

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Геаграфія машынабудавання ў свеце

Падгаліна	Фактары размяшчэння	Асноўныя краіны-вытворцы
Станкабудаванне		
Робататэхніка		
Суднабудаванне		
Аўтамабілебудаванне		
Электронная прамысловасць		
Авіяракетна-касмічная прамысловасць		



Падарожжа па Глабальнай сетцы.
Сайт Міжнароднай арганізацыі вытворцаў аўтамабіляў.

Сайт ТНК Toyota Motor.

Сайт ТНК Volkswagen Group.

Сайт ТНК Daimler.

§ 24. Геаграфія хімічнай прамысловасці свету



Успамінаем. Што з'яўляецца сыравінай для развіцця хімічнай прамысловасці? Якія віды прадукцыі вырабляе хімічная прамысловасць? Чым адрозніваецца спецыялізацыя хімічнай прамысловасці развітых краін і краін свету, якія развіваюцца?



Для чаго мы гэта вывучаем? Падумайце, ці магчыма ў цяперашні час чалавеку цалкам адмовіцца ад выкарыстання прадукцыі хімічнай прамысловасці. Якую прадукцыю хімічнай вытворчасці ваша сям'я выкарыстоўвае штодня? Як вы лічыце, ці патрэбны сучаснаму грамадству высокакваліфікаваныя спецыялісты ў галіне хімічнай вытворчасці і чаму штогод абнаўляецца пералік спецыяльнасцей па падрыхтоўцы спецыялістаў-хімікаў ва ўстановах адукацыі?

Роля ў сусветнай гаспадарцы і структура хімічнай прамысловасці. Хімічная прамысловасць з'яўляецца адной з навукаёмістых галін сусветнай гаспадаркі, якая найбольш дынамічна развіваецца. Яе развіццё сведчыць аб узроўні навукова-тэхнічнага

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

прагрэсу ў краіне. Доля галіны ў структуры апрацоўчай прамысловасці свету складае 9 %, у развітых краінах — 8,7 %, у краінах, якія развіваюцца, — 10,3 %.

У свеце ўсё ўзаемазвязана. Роля і значэнне хімічнай галіны ў эканоміцы вызначаюцца ўнікальнасцю выпускаемай прадукцыі, якая валодае асаблівымі ўласцівасцямі, з'яўляецца незаменнай у іншых галінах прамысловасці. Прывядзіце прыклады, якія сведчаць незаменнасць прадукцыі дадзенай галіны. Чаму ўзровень развіцця хімічнай прамысловасці залежыць ад узроўню развіцця эканомікі краіны?


У структуры хімічнай прамысловасці вылучаюць: 1) *неарганічную*, або *асноўную, хімію*, якая ўключае вытворчасць кіслот, шчолачаў, мінеральных угнаенняў; 2) *арганічную хімію*, ці *хімію арганічнага сінтэзу*, якая выпускае палімеры, хімічныя валокны, пластмасы; 3) *тонкую хімію*, якая вырабляе бытавую хімію, лакафарбавыя вырабы, парфумерна-касметычную прадукцыю, фармацэўтыку.

Фактары размяшчэння хімічных вытворчасцей. На размяшчэнне хімічных вытворчасцей аказваюць уплыў многія фактары, што звязана са складанай галіновай структурай і разнастайнасцю вытворчасцей. Да ліку асноўных адносяцца: сыравінны, энергетычны, водны фактары, фактар працоўных рэсурсаў і наяўнасці высококваліфікаваных кадраў, спажывецкі, транспартны, экалагічны.

У залежнасці ад спалучэння фактараў у сусветнай гаспадарцы сфарміраваліся мадэлі размяшчэння хімічных вытворчасцей — еўрапейская, паўночнаамерыканская і японская (мал. 168).

Хімічная прамысловасць адрозніваецца разнастайнай сыравіннай базай і ўключае здабычу серы, фасфарытаў, калійных солей, кухоннай солі і інш.

Агульны аб'ём здабычы серы, якая далей выкарыстоўваецца для вытворчасці сернай кіслаты, у свеце складае 80,2 млн т. Найбольшымі аб'ёмамі здабычы серы характарызуюцца Кітай (22 %), ЗША (12) і Расія (9 %). Сусветная здабыча фасфарытаў складае 269 млн т. Асноўная геаграфія здабычы прадстаўлена Кітаем (53 %), Марока (11) і ЗША (10 %). Здабыча калійных солей у свеце дасягнула 41,4 млн т, з іх 26 % здабычы засяроджана ў Канадзе, па 16 % — у Расіі і Беларусі. Аб'ём здабычы кухоннай солі ў свеце роўны 288 млн т. Геаграфія вядучых краін па здабычы ўключае Кітай (23 % сусветнай здабычы), ЗША (16) і Індыю (7 %). Як відаць, значная частка сыравіннай базы хімічнай прамысловасці свету сканцэнтравана ў Кітаі.




Мал. 168. Мадэлі размяшчэння хімічных вытворчасцей (паводле В. А. Пуляркіна)

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Паразважаем. Пісьменнік-фантаст і навуковец-біяхімік Айзек Азімаў пісаў у адной са сваіх аповесцей: «Хімія — гэта смерць, спакаваная ў банкі і скрынкі». Сказанае справядліва ў адносінах не толькі да хіміі, але і да электрычнасці, радыёэлектронікі, транспарту. Ці згодныя вы з гэтым сцвярджэннем або прытрымліваецеся іншага пункту гледжання?

Геаграфія прамысловасці мінеральных угнаенняў. Вытворчасць мінеральных угнаенняў характарызуецца ўстойлівымі станоўчымі тэндэнцыямі развіцця. Гэта абумоўлена растучым попытам на ўгнаенні ў краінах, якія развіваюцца, у сувязі з вырашэннем харчовай праблемы. Калі ў 1960 г. доля трох асноўных відаў угнаенняў была прыкладна роўная, то ў далейшым адбывалася павелічэнне долі азотных угнаенняў. Так, у цяперашні час з 214 млн т усіх угнаенняў, што вырабляюцца, 57 % прыходзіцца на азотныя, 24 — на фосфарныя і 19 % — на калійныя. Мае месца тэндэнцыя ўзрастання ролі дзяржаў, якія развіваюцца, у іх вытворчасці, напрыклад Кітая, Індыі, Інданезіі, Бразіліі і інш.

Аб'ём вытворчасці *азотных угнаенняў у свеце* складае 119,6 млн т. За апошнія 50 гадоў адбыўся зрух вытворчасці з развітых краін у краіны, якія развіваюцца, а менавіта з краін Еўропы і Паўночнай Амерыкі ў Азію. Вядучымі вытворцамі азотных угнаенняў у свеце выступаюць **Кітай** (29 %), **Індыя** (11) і **ЗША** (9 %) (мал. 169). Сусветная вытворчасць *фосфарных угнаенняў* таксама перамясцілася ў Азію і складае 55,7 млн т, з якіх 30 % засяроджана ў **Кітаі** (мал. 170), 22 — у **ЗША** і 8 % — у **Індыі**. Геаграфія вытворчасці *калійных угнаенняў* прадстаўлена пераважна Паўночнаамерыканскім і Еўрапейскім рэгіёнамі. Пры сусветным аб'ёме вытворчасці 44,5 млн т доля **Канады** складае 27 %, **Расіі** — 20, **Беларусі** — 16 %.



Мал. 169. Геаграфія вядучых вытворцаў мінеральных угнаенняў у свеце, 2017 г., млн т



Мал. 170. Завод па вытворчасці фосфарных угнаенняў у Кітаі

Геаграфія вытворчасці сінтэтычных смол і пластмас у свеце развіваецца хуткімі тэмпамі. Так, калі ў 1950 г. іх выпуск складаў 1,6 млн т, то ў цяперашні час дасягнуў амаль 300 млн т. У другой палове XX ст. асноўнымі вытворцамі былі Паўночная Амерыка і Еўропа — 43 % і 37 % адпаведна.

У цяперашні час вядучую пазіцыю займае Азія — 46 %. Адпаведна, змяняюцца і

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

краіны, якія лідзіруюць у вытворчасці. З 2005 г. Кітай становіцца вядучым вытворцам пластмас у свеце, на долю якога прыходзіцца 25 %. ЗША і Германія гістарычна нязменна ўваходзяць у вядучую тройку краін, якія выпускаюць дадзеную прадукцыю, займаючы 12 % і 5 % сусветнага рынку адпаведна.

Геаграфія вытворчасці хімічных валокнаў. У цяперашні час на хімічныя валокны прыходзіцца каля 65 % сусветнай вытворчасці ўсіх відаў валокнаў, на баваўняныя валокны — 29, ваўняныя — 1 %.

З 1950 г. сусветная вытворчасць вырасла з 1,7 да 63,2 млн т у 2013 г. Імклівы рост тлумачыцца пашырэннем сфер выкарыстання хімічных валокнаў. Асноўнымі спажыўцамі выступаюць тэкстыльная, шынная і гуматэхнічная прамысловасць, рыбапрамысловая гаспадарка, дарожнае будаўніцтва і шэраг іншых вытворчасцей.



Мал. 171. Завод па вытворчасці хімічных валокнаў у Індыі

Галоўная асаблівасць геаграфіі прамысловасці хімічных валокнаў — зрух іх вытворчасці ў Азію. Да 1980-х гг. лідарамі былі Еўропа і Паўночная Амерыка. У 2016 г. доля Азіяцкага рэгіёна вырасла да 91 %. Зведала змены і геаграфія вядучых вытворцаў. Сёння з развітых краін сярод лідараў засталіся толькі ЗША і Японія. Доля **Кітая** складае 67 % сусветнай вытворчасці хімічных валокнаў, **Індыі** — 9 % (мал. 171). Трэцяе месца ў свеце займаюць **ЗША** (4 %).

Свет і Беларусь. Якія віды ўгнаенняў вырабляюць у Беларусі? Прывядзіце прыклады прадпрыемстваў, якія вырабляюць у Беларусі прадукцыю хіміі арганічнага сінтэзу.

Геаграфія фармацэўтычнай прамысловасці. Падгаліна з'яўляецца самай навукаёмістай у сусветнай гаспадарцы. На яе долю прыходзіцца каля 18 % кошту прадукцыі. Тэмпы росту з'яўляюцца аднымі з самых высокіх у хімічнай індустрыі. Гэта абумоўлена дэмаграфічным старэннем чалавецтва, укараненнем новых прэпаратаў у лячэбную практыку, стварэннем новых пакаленняў лекаў і інш.

Геаграфія фармацэўтыкі адрозніваецца высокай тэрытарыяльнай канцэнтрацыяй — 75 % медыкаментаў вырабляецца ў развітых краінах. Вылучаюць чатыры асноўныя цэнтры сусветнай фармацэўтыкі. *ЗША* вырабляюць да 30 % медыкаментаў у свеце, але з-за вялікага ўнутранага рынку спажывання экспарт складае 30–35 % выпрабленай прадукцыі. Доля *Еўропы* складае 25–33 % сусветнай вытворчасці. Вядучымі вытворцамі лекавых прэпаратаў выступаюць ФРГ, Швейцарыя і Бельгія. *Азіяцкі цэнтр* фармацэўтыкі прадстаўлены Японіяй, якая характарызуецца самым

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

вялікім душавым спажываннем медыкаментаў у свеце, і Кітаем, дзе ў апошнія гады ўзрастаюць тэмпы росту фармацэўтыкі. *Усходнееўрапейскі цэнтр* фармацэўтыкі свету прадстаўлены Венгрыяй, Польшчай, Сербіяй і Славакіяй.

Клуб знаўцаў-эканомікагеографаў. Асноўнымі вытворцамі хімічнай прадукцыі з'яўляюцца краіны, якія развіваюцца. Пры гэтым гандаль прадукцыяй галіны ў большай ступені ідзе паміж развітымі краінамі. 10 з 20 найбуйнейшых ТНК у галіне хіміі размешчаны ў Еўропе. Растлумачце дадзеныя тэндэнцыі.

Папрацуем з атласам. Чаму вытворчасць мінеральных угнаенняў з'яўляецца адной з найбольш маштабных у складзе хімічнай прамысловасці і мае шырокую геаграфію?

Найбуйнейшыя ТНК галіны. Хімічная прамысловасць свету характарызуецца высокай ступенню транснацыяналізацыі.

У свеце ТНК. Найбуйнейшымі ТНК з'яўляюцца **BASF** (Германія), якая спецыялізуецца на шырокім спектры хімікатаў (хімікаты для захаванасці прадуктаў, азотная кіслата і метанол, лакі, фарбы, касметыка, мыйныя сродкі, вітаміны); **Bayer** (Германія) (мал. 172), якая выпускае фармацэўтычныя прэпараты, высокатэхналагічныя хімічныя матэрыялы для аховы ўраджаю, і **Saudi Basic Industries** (Саудаўская Аравія), якая вырабляе ўгнаенні, інавацыйныя пластмасы, палімеры і інш.

П$_1$

Геаграфія міжнароднага гандлю асноўнай хімічнай прадукцыяй. Гандаль мінеральнымі ўгнаеннямі паказвае значны рост. Найбуйнейшымі экспарцёрамі азотных угнаенняў выступаюць Расія (9,1 млн т), Кітай (7,2) і Нідэрланды (2,6 млн т). Галоўным экспарцёрам калійных угнаенняў традыцыйна выступае Канада (9,6 млн т), другое і трэцяе месцы займаюць Расія (6,9) і Беларусь (4,2 млн т). Лідарам экспарту фосфарных угнаенняў з'яўляецца Марока (5,1 млн т), другую пазіцыю займае Кітай (5,0), трэцюю — Расія (3,4 млн т).



Мал. 172. Завод фармацэўтычнай кампаніі Bayer

Падвядзём вынікі. Хімічная прамысловасць — галіна апрацоўчай прамысловасці, якая дынамічна развіваецца. У структуры хімічнай прамысловасці свету вылучаюць ..., ... і ... . Міжнародная спецыялізацыя абумовіла вылучэнне ..., ... і ... рэгіёнаў хімічнай прамысловасці. Хімічная прамысловасць характарызуецца высокай ступенню ўцягнутасці ў міжнародны геаграфічны падзел працы і транснацыяналізацыі.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Праверым свае веды. 1. У чым адрозненне асноўных мадэлей размяшчэння хімічнай прамысловасці? 2. Чаму адбыліся змены ў структуры вытворчасці мінеральных угнаенняў? 3. Чаму Кітай заняў лідзіруючыя пазіцыі ў вытворчасці хімічнай прадукцыі? 4. Як змянілася структура хімічнай прамысловасці пад уплывам НТР?

Ад простага да складанага. Складзіце ментальную карту «Хімія ў жыцці чалавека».

Ад тэорыі да практыкі. Выкарыстоўваючы картаграфічны матэрыял, матэрыял вучэбнага дапаможніка і дадатковую літаратуру, запоўніце табліцу ў сшытку.

Адметныя рысы хімічнай прамысловасці ў розных тыпах краін

Развітыя краіны	Краіны, якія развіваюцца

П$_2$

Падарожжа па Глабальнай сетцы.
Сайт часопіса «Хімія і жыццё».

Сайт Міжнароднай асацыяцыі вытворцаў угнаенняў.

Сайт ТНК BASF.

Сайт ТНК Bayer.

Сайт ТНК Saudi Basic Industries.

§ 25. Геаграфія лёгкай і харчовай прамысловасці свету

§24-1

Успамінаем. З якімі галінамі сусветнай гаспадаркі цесна звязаны лёгкая і харчовая прамысловасць? Чаму прадпрыемствы лёгкай і харчовай прамысловасці ёсць амаль у кожным горадзе? Якія фактары з'яўляюцца асноўнымі пры размяшчэнні прадпрыемстваў лёгкай і харчовай прамысловасці?

Для чаго мы гэта вывучаем? Ці магчыма сёння ўявіць эканоміку краіны без лёгкай і харчовай прамысловасці? Якія прадпрыемствы лёгкай і харчовай прамысловасці працуюць у вашай мясцовасці? Як вы лічыце, дзе мэтазгодна размяшчаць прадпрыемствы лёгкай і харчовай прамысловасці?

Лёгкая і харчовая прамысловасць з'яўляюцца старымі галінамі сусветнай гаспадаркі, якія задавальняюць базавыя патрэбы насельніцтва ў вопратцы, абутку, тканінах,

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

прадуктах харчавання і інш. Па меры развіцця постындустрыялізацыі доля гэтых галін у структуры апрацоўчай прамысловасці свету скарачаецца, аднак геаграфічна яны маюць паўсюднае распаўсюджванне. У цяперашні час доля галіны складае каля 5 %. Акрамя таго, у сувязі з патрэбамі насельніцтва, якія растуць, і перш за ўсё краін, што развіваюцца, аб'ёмы вытворчасці прадукцыі лёгкай і харчовай прамысловасці няўхільна растуць.



У свеце ўсё ўзаемазвязана. У постындустрыяльных краінах доля лёгкай прамысловасці скарачаецца. Аднак у гэтых краінах усё больш маштабна развіваецца індустрыя моды. Кампаніі, якія займаюцца вытворчасцю, продажам і абслугоўваннем моднай прадукцыі, уяўляюць з сябе гіганцкую індустрыю, што дае шматмільярдныя прыбыткі. Чаму дадзены напрамак атрымаў развіццё ў постындустрыяльных краінах на фоне скарачэння долі лёгкай прамысловасці? Прывядзіце прыклады такіх кампаній.

Асноўнымі фактарамі, якія аказваюць уплыў на размяшчэнне лёгкай і харчовай прамысловасці, з'яўляюцца спажывецкі, сыравінны, узровень тэхналогій вытворчасці, фактар працоўных рэсурсаў.

Лёгкая прамысловасць уключае вялікую колькасць падгалін, што забяспечваюць насельніцтва прадукцыяй шырокага прызначэння, — тэкстыльную, абутковую, швейную, ювелірную, футравую, мэблевую, дывановую, фарфоравую і шэраг іншых. Вядучымі сярод іх выступаюць тэкстыльная і швейная прамысловасць.

Геаграфія тэкстыльнай прамысловасці. Тэкстыльная прамысловасць з'яўляецца адной з самых буйных па аб'ёме выпускаемай прадукцыі і колькасці занятых. У залежнасці ад тэхналогіі атрымання тэкстылю вылучаюць *тры асноўныя віды вытворчасцей* — тканін, нятканых матэрыялаў і трыкатажу. У *развітых краінах* найбольшае развіццё атрымліваюць вытворчасці дарагіх тканін верхняга трыкатажу, нятканых матэрыялаў, высакаякасных відаў натуральных тканін; у краінах, якія развіваюцца, — баваўняных тканін, тканін з хімічных валокнаў, недарагога бялізнавага трыкатажу.

У тэкстыльнай прамысловасці на вытворчасць тканін прыходзіцца каля 50 %, трыкатажную вытворчасць — 30, вытворчасць нятканых матэрыялаў — 20 %. У структуры *вытворчасці тканін* адбыліся значныя змены.

Калі ў 1950 г. 84 % тканін выраблялася з натуральных валокнаў і толькі 16 — з хімічных, то ў цяперашні час доля апошніх узрасла да 58 %.

Сярод натуральных тканін вядучае месца па аб'ёмах вытворчасці належыць *баваўняным*. Падгаліна развіваецца на мясцовай сыравіне. Вытворчасць баваўняных тканін характарызуецца зніжэннем тэмпаў і канцэнтрацыяй у краінах, якія развіваюцца. Агульны аб'ём вытворчасці складае 111 млрд м^2. Геаграфія вядучых вытворцаў прадстаўлена Кітаем (26 % сусветнай вытворчасці), Індыяй (14), Расіяй (15 %), а таксама Пакістанам і Бразіліяй.

Такія вядомыя ў мінулым віды тканін, як шарсцяныя, ільняныя, шаўковыя, займаюць цяпер нязначнае месца ў структуры тэкстыльнай галіны — менш за 10 %.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Вытворчасць шарсцяных тканін (мал. 173) у свеце саступае па аб'ёмах вытворчасці баваўняных. Сусветная вытворчасць складае каля 3,2 млрд м^2. Асноўныя сучасныя магутнасці сканцэнтраваны ў Кітаі, Індыі, Турцыі. Аднак шэраг развітых краін (Францыя, Японія, Італія) таксама спецыялізуецца на іх выпуску.



Мал. 173. Вытворчасць шарсцяных тканін

Вытворчасць *шаўковых тканін* складае менш за 0,2 % у структуры тэкстыльнай прамысловасці. Аднак значнасць падгаліны ў сусветнай гаспадарцы з'яўляецца высокай, і геаграфія вытворчасці прадстаўлена больш чым 60 краінамі. Сусветная вытворчасць шаўковых тканін складае 178 млн т. Вядучымі вытворцамі выступаюць Кітай (146 млн т), Індыя (28), Узбекістан (1,1 млн т), на долю якіх прыходзіцца 98 % сусветнай вытворчасці.

У свеце цікавага. З'яўленнем шоўку мы абавязаны Старажытнаму Кітаю (мал. 174). Шоўк выкарыстоўваўся там за 3 тысячы гадоў да н. э. Спачатку тканіна была ва ўжытку толькі кітайскіх імператараў. Паступова слава шоўку распаўсюдзілася па ўсёй Азіі, і купцы пачалі ажыццяўляць паўнавартасны гандаль тканінай і адзеннем з шоўку. Доўгі час кітайцы спрабавалі захаваць тэхналогію вытворчасці шоўку ў сакрэце. Але некалькі разоў лічынкі тутавага шаўкапрада ўдалося таемна вывезці ў іншыя краіны, і шаўкаводства стала распаўсюджвацца ў іншых рэгіёнах.



Мал. 174. Вытворчасць шаўковых тканін у Старажытным Кітаі

Трыкатажная вытворчасць займае другое месца ў структуры тэкстыльнай прамысловасці. Гістарычна лідзіруючыя пазіцыі па аб'ёмах вытворчасці належалі развітым краінам і першым чынам Італіі. У апошні час значна выраслі тэмпы і аб'ёмы вытворчасці ў краінах Азіі, якія развіваюцца, і на першыя пазіцыі выйшаў Кітай. Доля краіны ў сусветнай вытворчасці трыкатажу складае 71 %, другое месца займае Італія (8), трэцяе — Японія (4 %).

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Мал. 175. Нятканыя матэрыялы ў медыцыне

Вытворчасць *нятканых матэрыялаў* расце ў свеце значна хутчэй, чым тканін і трыкатажу, што звязана з павелічэннем колькасці спажыўцоў гэтага віду тэкстыльнай прадукцыі. Агульны аб'ём вытворчасці нятканых матэрыялаў дасягнуў у свеце 1,954 млн т. Найбольш шырока нятканыя матэрыялы выкарыстоўваюцца для вытворчасці сродкаў гігіены, хірургічнай экіпіроўкі (мал. 175), аднаразовага адзення, сталовай бялізны, у будаўніцтве, аўтамабільнай галіне. На тры рэгіёны свету — Азію, Еўропу і Паўночную Амерыку — прыходзіцца 85 % сусветнай вытворчасці і спажывання нятканых матэрыялаў. Сярод краін у цяперашні час вядучым удзельнікам сусветнага рынку нятканых матэрыялаў стаў Кітай (мал. 176). На яго долю прыходзіцца 30 % вытворчасці і 28 % сусветнага экспарту.



Мал. 176. Вытворчасць нятканых матэрыялаў у Кітаі

Геаграфія швейнай прамысловасці. Швейная вытворчасць прадстаўлена ў большасці краін свету і мае шырокую геаграфію. Аднак з-за магчымасці выкарыстання таннай працоўнай сілы асноўнымі сусветнымі вытворцамі з'яўляюцца краіны, якія развіваюцца, з вялікай колькасцю працоўных рэсурсаў. Гэтыя ж дзяржавы выступаюць і асноўнымі сусветнымі экспарцёрамі швейнай прадукцыі.

У геаграфіі *экспарту тэкстылю* (пражы, тканін усіх відаў, адзення) на працягу другой паловы XX – пачатку XXI ст. адбыліся істотныя змены. Еўрапейскі і Паўночнаамерыканскі рэгіёны саступілі сваё лідарства краінам Азіі. Першае месца ў цяперашні час належыць **Кітаю** (36 %) (мал. 177). Сярод азіяцкіх дзяржаў высокімі аб'ёмамі экспарту характарызуюцца таксама Індыя і Турцыя. Прыкметныя пазіцыі ў сусветным экспарце тэкстылю застаюцца за **ЗША** і **Рэспублікай Карэя**.



Мал. 177. Вытворчасць швейных вырабаў у Кітаі

Папрацуем з атласам. Назавіце і пакажыце дзяржавы па вытворчасці швейнай прадукцыі, якая дорага каштуе.

У геаграфіі *экспарцёраў адзення* вылучаюцца два асноўныя рэгіёны — Еўрапейскі і Азіяцкі. Першы спецыялізуецца на дарагім, эксклюзіўным адзенні, другі — на адзенні

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

масавага спажывання. Доля краін Еўрапейскага саюза ў сусветным экспарце адзення складае 29 %, Кітая — 24 %. Вядучыя месцы па экспарце адзення ў свеце займаюць таксама Бангладэш (5 %), Германія і Турцыя (па 4,5), Італія (4,2 %).

Клуб знаўцаў-эканомікагеографаў. Сярэдняя працягласць жыцця адзення складае каля 3 гадоў. Спадніца — найстарэйшы прадмет адзення, старэйшая толькі набедраная павязка. Больш за 2 млрд футболак прадаецца кожны год. Сацыяльны ранг чалавека і прафесія ў еўрапейскім Сярэдневякоўі вызначаліся па колеры адзення. Знаць насіла вопратку чырвонага колеру, сяляне — карычневага і шэрага, а купцы, банкіры і дваране — зялёнага.

Паразважаем. Чаму ў цяперашні час многія вядомыя кампаніі па вытворчасці спартыўнага адзення выводзяць свае прадпрыемствы з Кітая і пераносяць іх у Бангладэш, В'етнам, Камбоджу, Інданезію?

Геаграфія харчовай прамысловасці. Харчовая прамысловасць з'яўляецца галіной, якая цесна звязана з сельскай гаспадаркай, што пастаўляе сыравіну для вытворчасці прадуктаў харчавання. Прадпрыемствы харчовай прамысловасці размяшчаюцца паўсюдна, што звязана з наяўнасцю спажыўцоў і разнастайнай сыравіннай базай. Доля галіны ў структуры апрацоўчай прамысловасці свету складае каля 9 %, у развітых краінах — 7,6, у краінах, якія развіваюцца, — 11,8 %.


Харчовая прамысловасць прадстаўлена мноствам падгалін і відаў вытворчасцей. Вылучаюць базавыя падгаліны — мукамольную, мясную, малочную, цукровую, масларобную, сыраварную, рыбную прамысловасць. Да харчовай прамысловасці таксама адносяць вытворчасць круп, крухмалу, кансерваў, піва, віна, кандытарскіх і тытунёвых вырабаў.

Клуб знаўцаў-эканомікагеографаў. У залежнасці ад арыентацыі той ці іншай вытворчасці на сыравіну або спажыўца падгаліны дзеляць на тры групы. Да падгалін, якія імкнуцца да сыравіны, адносяцца цукровая, рыбная, вінакурная, масласыраробная прамысловасць. Падгалінамі, якія арыентуюцца на спажыўца, з'яўляюцца макаронная, хлебапякарная, кандытарская прамысловасць. На спажыўца і на сыравінны фактар адначасова арыентуюцца мясаперапрацоўчая, мукамольная, маргарынавая прамысловасць.

Геаграфія вытворчасці мяса ў свеце зведала істотныя зрухі за другую палову XX – пачатак XXI ст. Гэта звязана, з аднаго боку, з ростам узроўню сацыяльна-эканамічнага развіцця і адпаведным ростам спажывання ў краінах, якія развіваюцца, і, з другога боку, пераходам развітых краін да спажывання дыетычнага мяса і агульнага скарачэння спажывання мяса ў рацыёне.

Галоўным рэгіёнам вытворчасці мяса выступае Азія, далей ідуць дзяржавы Амерыкі. Доля еўрапейскіх дзяржаў у сусветнай структуры скарачаецца. У цяперашні час у свеце вырабляецца 334,2 млн т мяса. Вядучымі вытворцамі з'яўляюцца **Кітай**, **ЗША** і **Бразілія** (мал. 178).

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Мал. 178. Геаграфія вядучых вытворцаў прадукцыі харчовай прамысловасці, 2017 г., млн т

Геаграфія вытворчасці малака характарызуецца шырокім распаўсюджваннем і перавагай у рэгіянальнай структуры Азіяцкага рэгіёна. Агульны аб'ём вытворчасці малака складае 828,8 млн т, з якіх 25 % прыходзіцца на тры краіны — **Індыю** (мал. 179), **Пакістан** і **Кітай**.



Мал. 179. Індыя — сусветны лідар у вытворчасці малака

Важнае месца ў структуры харчовай прамысловасці адводзіцца *масласыраробным вытворчасцям*. У цяперашні час аб'ёмы вытворчасці *сыроў* перавышаюць аб'ёмы вытворчасці масла. Так, сусветная вытворчасць сыроў складае 42 млн т, масла — 6,1 млн т. У МГПП гістарычна вядучыя пазіцыі па вытворчасці сыроў належалі краінам Еўропы — Францыі (мал. 180), Швейцарыі і інш. Аднак з-за росту спажывання сыроў прыкметна ўзраслі пазіцыі краін Паўночнай Амерыкі. Геаграфія вядучых вытворцаў сыроў прадстаўлена ў цяперашні час ЗША, Германіяй і Францыяй. Сярод асноўных сусветных



Мал. 180. Французскія сыры — мара гурманаў

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

вытворцаў масла вылучаюць ЗША, Індыю і Новую Зеландыю. Геаграфія вытворчасці алею досыць шырокая і паўсюдная. Аднак найбольшая канцэнтрацыя характэрная для Азіі. Сусветная вытворчасць складае 178,3 млн т, з іх на Інданезію, Малайзію і ЗША прыходзіцца 46 %.

Геаграфія цукровай прамысловасці гістарычна характарызавалася арыентацыяй на сыравіну, г. зн. на цукровы трыснёг і цукровыя буракі. Па аб'ёмах вытворчасці ў цяперашні час у структуры пераважае вытворчасць цукру з цукровага трыснягу. Аднак у Еўропе захоўваюцца краіны, якія займаюць лідзіруючыя пазіцыі ў МГПП па вытворчасці бураковага цукру. У свеце вырабляецца 178,9 млн т цукру, з іх на Бразілію (мал. 181), Індыю і Кітай прыходзіцца 46 %.



Мал. 181. Цукровы камбінат у Бразіліі

Свет і Беларусь. Якую прадукцыю лёгкай прамысловасці вырабляюць у Беларусі? Якую прадукцыю харчовай прамысловасці вырабляюць у Беларусі? Прадукцыя якіх прадпрыемстваў нашай краіны арыентавана на экспарт?

Падвядзём вынікі. Лёгкая і харчовая прамысловасць з'яўляюцца старымі галінамі сусветнай гаспадаркі і задавальняюць базавыя патрэбы насельніцтва ў ..., ... Асноўнымі фактарамі, якія вызначаюць размяшчэнне прадпрыемстваў лёгкай і харчовай прамысловасці, з'яўляюцца ..., ... і ... .

Праверым свае веды. 1. Чаму ў свеце зніжаюцца аб'ёмы вытворчасці натуральных тканін? 2. Як звязаны паміж сабой лёгкая і хімічная прамысловасць? 3. Чаму Кітай лідзіруе па выпуску прадукцыі лёгкай прамысловасці? 4. Чым адрозніваецца спецыялізацыя харчовай прамысловасці свету ў развітых краін і краінах, якія развіваюцца? 5. Чым тлумачыцца спецыялізацыя развітых краін на вытворчасці сыроў?

Ад простага да складанага. 1. Складзіце калаж на тэму «Геаграфія майго гардэроба». 2. Падрыхтуйце прэзентацыі «Найбуйнейшыя ТНК у харчовай прамысловасці».

Ад тэорыі да практыкі. 1. Выкарыстоўваючы картаграфічны матэрыял і матэрыял вучэбнага дапаможніка, запоўніце табліцу ў сшытку.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Геаграфія харчовай прамысловасці

Прадукцыя, якая вырабляецца	Фактары размяшчэння вытворчасці	Краіны — лідары па вытворчасці прадукцыі
Мяса		
Малако		
Сыр		
Цукар		

2. Выканайце практычную работу «Параўнальная характарыстыка найбуйнейшых індустрыяльных ТНК свету з выяўленнем падабенстваў і адрозненняў (на прыкладзе дзвюх кампаній на выбар)».



Падарожжа па Глабальнай сетцы.

Сайт найбуйнейшага вытворцы адзення — ТНК Christian Dior.

Сайт найбуйнейшага вытворцы спартыўнага адзення — ТНК Nike.

Сайт найбуйнейшага вытворцы прадуктаў харчавання — ТНК Nestle.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



§ 26. Сектар паслуг у сусветнай гаспадарцы

Успомніце. У чым заключаецца адрозненне ў эканоміцы постындустрыяльных краін ад індустрыяльных? Да якога сектару эканомікі адносіцца сфера паслуг? У якіх краінах свету па ўзроўні сацыяльна-эканамічнага развіцця яна найбольш развітая? На якіх відах паслуг спецыялізуюцца ў міжнародным геаграфічным падзеле працы краіны Еўропы?

Для чаго мы гэта вывучаем? Якімі паслугамі ваша сям'я карыстаецца найбольш часта? Якія прафесіі звязаны з работай у сферы паслуг? На якой з прафесій сферы паслуг вы б спынілі свой выбар і чаму? Якія ўстановы адукацыі рыхтуюць спецыялістаў для працы ў розных галінах сферы паслуг?

Структура сферы паслуг. Сфера паслуг адносіцца да трацічнага сектара сусветнай гаспадаркі. Ва ўмовах постындустрыяльнага грамадства яна становіцца прыярытэтнай у забеспячэнні эканамічнага росту як асобнай дзяржавы, так і ўсёй сусветнай супольнасці. У той час як долі першаснага і другаснага сектараў у сусветнай гаспадарцы скарачаюцца, доля сферы паслуг павялічваецца. У структуры сусветнага валавога прадукту доля сферы паслуг у 2017 г. складала 63 %, у развітых краінах — 75, у краінах, якія развіваюцца, — 50 %. Па меры развіцця постындустрыялізацыі ўсё большая колькасць відаў дзейнасці пераходзіць з першаснага і другаснага сектараў у сферу паслуг.

У залежнасці ад ролі паслуг і характару здавальняючых патрэбнасцей адрозніваюць: *сферу паслуг матэрыяльнай вытворчасці* (транспарт, сувязь, бытавое абслугоўванне), *сферу паслуг духоўнага жыцця* (адукацыя, фізічная культура, навука, мастацтва) і *сферу паслуг у сацыяльнай сферы* (гандаль, жыллёва-камунальнае абслугоўванне, ахова здароўя).

Сфера паслуг характарызуецца складанай структурай. На аснове прынцыпу спажывання паслуг вылучаюць: *традыцыйныя паслугі* (гандаль, транспарт, харчаванне,

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

сувязь, фінансы, адукацыя, ахова здароўя і інш.); *нетрадыцыйныя*, звязаныя з узнікненнем новых патрэб чалавека (турызм, фінансавыя, банкаўскія, кансалтынгавыя, аўдытарскія, лагістычныя, інжынірынгавыя, клінінгавыя, інфармацыйна-камунікацыйныя (ІКТ) і інш.).

Клуб знаўцаў-эканомікагеографаў. У сучасным свеце атрымліваюць хуткае развіццё кансалтынгавыя паслугі. Па сваёй сутнасці яны выяўляюцца ў кансультаванні, калі адно прадпрыемства або чалавек прадастаўляе паслугі па рашэнні пэўных задач іншаму прадпрыемству/фірме ці чалавеку. Адной з разнавіднасцей кансалтынгавых паслуг з'яўляецца інжынірынг. Гэта кансультацыі па інжынернай падрыхтоўцы і забеспячэнні вытворчага працэсу і эксплуатацыі розных аб'ектаў.

У свеце ўсё ўзаемазвязана. 1. Якія новыя прафесіі, звязаныя з работай у сферы паслуг, з'явіліся на рынку працы ў апошні час? 2. У чым заключаюцца сутнасці лагістыкі? 3. Дадатковыя веды якіх галін спатрэбяцца сучаснаму спецыялісту па лагістыцы?

У Міжнароднай стандартнай галіновай класіфікацыі відаў эканамічнай дзейнасці (МСГК) вылучаюць наступныя віды паслуг (мал. 182).

У сусветнай гаспадарцы вылучаюць чатыры групы краін паводле долі сферы паслуг у структуры ВУП, у %: 1) менш за 50; 2) 50–65; 3) 65–70; 4) больш за 70.



Мал. 182. Віды паслуг
(паводле Міжнароднай стандартнай галіновай класіфікацыі відаў эканамічнай дзейнасці)

У *першую групу*, напрыклад, уваходзяць аграрныя дзяржавы Афрыкі — Ангола, ЦАР, Рэспубліка Конга і інш. *У другой групе* знаходзяцца краіны Азіі, Афрыкі, Лацінскай Амерыкі, якія развіваюцца, а таксама шэраг дзяржаў з пераходнай эканомікай (напр., Расія, Украіна, Перу, Філіпіны, Рэспубліка Карэя). *Трэцяя* і *чацвёртая групы* прадстаўлены пераважна эканамічна высокаразвітымі дзяржавамі або найбольш развітымі сярод краін, якія развіваюцца (напр., Бельгія, Францыя, ЗША, Германія, Японія, Бразілія, Мексіка, Уругвай і інш.).

Паразважаем. 1. Як вы разумееце выказванне: «Сёння хуткімі тэмпамі ідзе працэс ператварэння інфармацыйнай індустрыі ў найбольш дынамічную, выгадную і прэстыжную сферу вытворчасці, якая забяспечвае лідзіруючую ролю асобных краін у сусветнай гаспадарцы»? 2. Інфармацыя і веды становяцца рухальнай сілай эканамічнага развіцця грамадства. Таму многія даследчыкі называюць яго інфармацыйным. У інфармацыйным грамадстве эканамічныя поспехі ўсё больш залежаць ад наяўнасці інавацый і сістэмы бесперапыннай адукацыі. Ці згодны вы з гэтым сцвярджэннем? Свой адказ абгрунтуйце.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Адрозненні ў структуры сферы паслуг развітых краін і краін, якія развіваюцца. Паміж развітымі краінамі і краінамі, якія развіваюцца, існуюць адрозненні ў структуры аказваемых паслуг. Краіны, якія развіваюцца, з-за больш нізкага ўзроўню сацыяльна-эканамічнага развіцця і даходаў насельніцтва характарызуюцца перавагай традыцыйных паслуг — гандлю, транспарту, будаўніцтва і інш. Аднак і сярод іх ёсць прыклады краін, дзе актыўна развіваюцца інавацыйныя віды паслуг. Напрыклад, у Індыі разам з развіццём фінансавых, банкаўскіх, бухгалтарска-аўдытарскіх, страхавых, медыцынскіх паслуг (мал. 183) і іншых у апошнія гады хутка развіваюцца паслугі рынку нерухомасці, а таксама інфармацыйна-камунікацыйныя паслугі (ІКТ).



Мал. 183. Медыцынскія работнікі з Індыі вядомыя ва ўсім свеце

У свеце цікавага. Індыя хутка становіцца адной з вядучых краін на сусветным рынку інфармацыйных тэхналогій. Доказам таму стаў факт, што высокаразвітыя краіны зрабілі вялікія фінансавыя ўкладанні ў эканоміку Індыі. У прыватнасці, яны адкрылі ў краіне некалькі буйных цэнтраў па аказанні тэхналагічных паслуг і апрацоўцы інфармацыйных заказаў сваіх кліентаў па ўсім свеце і г. д. Па агульным прызнанні індыйскія работнікі ва ўсім свеце адрозніваюцца высокім прафесійным узроўнем выканання сваіх функцый.

Імкліва набірае абароты сфера паслуг у Кітаі. Актыўна развіваюцца банкаўскія паслугі, грамадскае харчаванне, турызм, фінансы, страхаванне, транспарт, рэклама, рыэлтарская сфера, інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі і г. д.

У развітых краінах атрымаў развіццё ўвесь спектр паслуг. Аднак найбольш інтэнсіўна развіваюцца інавацыйныя віды паслуг, або сэрвісныя інавацыі: ІКТ; паслугі мабільнай сувязі, мабільныя дадаткі; інтэрнэт-сэрвісы, у тым ліку інтэрнэт-гандаль; паслугі інавацыйнай медыцыны (пластычная, касметычная хірургія); сеткавы гандаль; паслугі падзейнага турызму і многія іншыя.

У свеце ТНК. Найбуйнейшымі ТНК развітых краін у сферы паслуг з'яўляюцца, напрыклад, у рэкламным бізнесе — **Grey Advertising** (ЗША), міжнародных экспрэс-перавозках — **DHL** (Германія), падзейных паслугах — **Pico Global Services LTD** (Ганконг)).

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Клуб знаўцаў-эканомікагеографаў. Падзейны турызм за апошнія гады прыцягвае вялікую колькасць прыхільнікаў. Сёння стандартнага знаёмства з краінай турыстам ужо недастаткова. Яны хочуць атрымаць большае задавальненне ад падарожжа. Сярод папулярных падзейных тураў вылучаюць паездкі на карнавалы (мал. 184), музычныя фестывалі, нацыянальныя святы, спартыўныя падзеі, фэшнпаказы, гастранамічныя туры, канцэрты зорак эстрады, сафары, наведванне надзвычайных прыродных з'яў і інш. Падзейны турызм таксама распаўсюдзіўся на сферу спорту. Найбольш папулярнымі і наведвальнымі спаборніцтвамі з'яўляюцца: аўтагонкі «Формула-1», Зімовыя і Летнія Алімпійскія гульні, чэмпіянаты свету па футболе, тэнісныя турніры; бокс і інш.



Мал. 184. На штогадовы бразільскі карнавал з'язджаюцца тысячы турыстаў з усяго свету

Папрацуем з атласам. Назавіце краіны, якія на працягу некалькіх апошніх гадоў сталі цэнтрамі падзейнага турызму.

Геаграфія відаў паслуг і міжнароднага гандлю паслугамі. Сфера паслуг мае шырокую геаграфію. На карце свету няма дзяржаў, у якіх яна не была б прадстаўлена. Шэраг краін трывала замацавалі сваю міжнародную спецыялізацыю на сусветным рынку паслуг. Напрыклад, Швейцарыя спецыялізуецца на банкаўскіх паслугах (мал. 185), гандлі, кансалтынгу, лагістыцы; Вялікабрытанія — на страхавых і банкаўскіх паслугах, паслугах правядзення аўкцыёнаў, розных відах кансалтынгу; Сінгапур — у авіятранспарце; Злучаныя Штаты — у рэкламнай дзейнасці і гасцінічным бізнесе.



Мал. 185. Нацыянальны банк Швейцарыі

Свет і Беларусь. Якія змены ў сферы паслуг адбыліся ў Рэспубліцы Беларусь за апошнія дваццаць гадоў? Чаму нетрадыцыйныя паслугі, зыходзячы з прынцыпаў спажывання, усё часцей карыстаюцца попытам у насельніцтва нашай краіны? Якія віды транспарту атрымалі развіццё ў Рэспубліцы Беларусь?

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Клуб знаўцаў-эканомікагеографаў. Швейцарскія банкі на працягу многіх стагоддзяў асацыіруюцца з надзейнасцю і бездакорным захаваннем банкаўскай тайны. Першымі кліентамі швейцарскіх банкаў былі французскія каралі, якія высока цанілі асцярожнасць сваіх крэдытораў. Жэнеўскія банкіры на самай справе былі пратэстантамі, часта французскага паходжання, якія цярпелі пераслед. Нягледзячы на гаданні, яны працягвалі фінансаваць французскага караля з Жэневы. У той час лепшага пазычальніка, чым кароль, нельга было і прыдумаць: з аднаго боку, ён вяртаў прадастаўленыя пазыкі, а з другога — яму пастаянна былі патрэбны грошы (мал. 186). Захоўваць асцярожнасць было вельмі важна — ніхто не павінен быў ведаць пра тое, што кароль займае грошы ў ерэтыкоў-пратэстантаў.



Мал. 186. Першыя банкі з'явіліся на аснове простых абменных кантор

Сусветны гандаль паслугамі з'яўляецца адным з найбольш хутка растучых сектараў сусветнай гаспадаркі. Ён развіваецца больш хуткімі тэмпамі, чым гандаль таварамі. Сярод найбуйнейшых экспарцёраў і імпарцёраў паслуг лідарамі з'яўляюцца ЗША, Вялікабрытанія і Германія. Аднак у апошнія гады ў іх лік увайшлі таксама Кітай, Індыя, Ганконг, Сінгапур і Рэспубліка Карэя. Па аб'ёме экспарту вядучыя пазіцыі займаюць **ЗША**, **Вялікабрытанія**, **Кітай**, па аб'ёме імпарту — **ЗША**, **Кітай**, **Германія**.

Рост міжнароднага гандлю ў цяперашні час адбываецца ў асноўным за кошт краін Азіі (Кітай, Індыя, Рэспубліка Карэя, Ганконг (Кітай) і Тайланд), на долю якіх прыходзіцца 22,4 % сусветнага экспарту паслуг.

Падвядзём вынікі. Сфера паслуг адносіцца да сектара сусветнай гаспадаркі. Яна з'яўляецца прыярытэтнай у забеспячэнні эканамічнага росту дзяржавы. Адрозніваюць сферу паслуг ... і сферу паслуг ... . Краіны, якія развіваюцца, спецыялізуюцца ў сусветнай гаспадарцы на традыцыйных паслугах — ..., ..., ... і інш. У развітых краінах найбольш інтэнсіўна развіваюцца інавацыйныя віды паслуг — ..., ..., паслугі інавацыйнай медыцыны, ..., падзейныя паслугі і многія іншыя.

Праверым свае веды. 1. Якое месца сферы паслуг у структуры сусветнага валавога прадукту? 2. Якія віды паслуг адносяцца да традыцыйных, а якія — да новых? 3. Якія краіны характарызуюцца высокай доляй сферы паслуг у структуры ВУП, а якія — нізкай? 4. На якіх відах паслуг спецыялізуюцца краіны, што развіваюцца, а на якіх — развітыя?

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Ад простага да складанага. 1. Існуе прамая ўзаемасувязь паміж узроўнем развіцця сферы паслуг і ўзроўнем сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны. Пацвердзіце ці аспрэчце дадзенае сцвярджэнне. 2. Распрацуйце крытэрыі, па якіх можна вызначыць узровень развіцця ІКТ у развітых краінах і краінах свету, якія развіваюцца.



Ад тэорыі да практыкі. 1. Падрыхтуйце вусны часопіс на тэму «Замежныя прадпрыемствы ў сферы паслуг Рэспублікі Беларусь». 2. Падрыхтуйце паведамленне на тэму «Як змянілася сістэма адукацыі ў свеце пры актыўным выкарыстанні інфармацыйна-камп'ютарных тэхналогій?».

П$_1$



Падарожжа па Глабальнай сетцы.
Матэрыялы Сусветнага банка па развіцці сферы паслуг.



Справаздача Сусветнага банка аб змене структуры занятасці свету ва ўмовах развіцця інфармацыйных тэхналогій.



§ 27. Геаграфія транспарту свету



Успамінаем. Якія віды транспарту вы ведаеце? Якія адметныя рысы паветранага транспарту? Чым адрозніваецца аўтамабільны транспарт ад іншых яго відаў? Якія праблемы выклікае развіццё чыгуначнага транспарту? Якія грузы перавозяць трубаправодным транспартам?



Для чаго мы гэта вывучаем? Якія геаграфічныя веды патрэбныя, каб спраектаваць і пабудаваць чыгунку? Калі вам прыйдзецца планаваць падарожжа, як вам дапамогуць веды геаграфіі транспарту? Уявіце сябе дырэктарам металургічнага камбіната, які будуецца. Як правільна выбраць пастаўшчыка жалезнай руды, калі камбінат размешчаны ў раёне, дзе яна адсутнічае, але ёсць іншыя фактары размяшчэння?

Роля транспарту ў сусветнай гаспадарцы. Транспарт уяўляе з сябе вядучую галіну ў сферы паслуг, якая забяспечвае вытворчыя сувязі, перавозку грузаў, пасажыраў, інфармацыі, энергіі ад месца да месца, з аднаго рэгіёна (краіны) у іншы рэгіён (краіну). Узровень развіцця транспарту вызначаецца ўзроўнем сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны і залежыць ад памераў тэрыторыі, ступені яе засвоенасці, удзелу краіны ў МГПП.

Транспарт уяўляе з сябе складаную сістэму, якая ўключае наступныя абавязковыя элементы: 1) *інфраструктуру* (аўтамабільныя дарогі і чыгункі, каналы, трубаправоды); 2) *тэрміналы* (чыгуначныя і аўтобусныя станцыі, аэрапорты, марскія і рачныя парты); 3) *сродкі перамяшчэння*; 4) *транспартныя кампаніі*.

Па *перавазе перамяшчальных элементаў* транспарт дзеліцца на грузавы і пасажырскі. Па тэхналогіі перамяшчэння адрозніваюць: 1) наземны (чыгуначны, аўтамабільны, трубаправодны, конны); 2) водны (марскі, унутраны водны); 3) паветраны (авіяцыйны) транспарт.

У структуры *грузаабароту* свету вядучае месца належыць воднаму транспарту, на долю якога прыходзіцца 62 % перавозак. Узрастае доля трубаправоднага транспарту,

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

якая складае 13 %. Доля чыгуначнага транспарту скарацілася да 11 %. Такая ж доля прыходзіцца на аўтамабільны транспарт. Доля паветранага транспарту ў грузаперавозках складае 3 %.

У структуры *пасажыраабароту* 80 % усіх перавозак ажыццяўляецца аўтамабільным транспартам. Узрастае роля паветранага транспарту, доля якога павялічылася да 10 %, доля чыгуначнага транспарту застаецца ўстойлівай — у межах 10 %.

Найноўшымі тэндэнцыямі ў развіцці транспарту свету з'яўляюцца: 1) узмацненне бяспекі перавозак, надзейнасці дастаўкі грузаў і патрабаванняў па тэрмінах дастаўкі («дакладна ў тэрмін» — just-in-time); 2) рост долі транспарціроўкі гатовых вырабаў і высокатэхналагічных тавараў; 3) фарміраванне кантэйнернай сістэмы; 4) фарміраванне транспартных калідораў; 5) развіццё інтэрмадальных перавозак (выкарыстанне некалькіх відаў транспарту без перагрузкі ў іншую грузавую ёмістасць); 6) стварэнне персанальнага беспілотнага транспарту (мал. 187).



Мал. 187. Беспілотны транспарт у г. Доха (Катар)

Транспартная сістэма свету ўяўляе з сябе сукупнасць усіх відаў транспарту, звязаных эканамічнымі, тэхналагічнымі, тэхнічнымі і нарматыўна-прававымі адносінамі.

Геаграфія асноўных відаў транспарту ў свеце.

Свет і Беларусь. Якія віды транспарту атрымалі развіццё ў Рэспубліцы Беларусь? Якія змены ў развіцці транспартнай сістэмы Беларусі могуць адбыцца ў бліжэйшы час? Чаму з кожным годам у Беларусі павялічваецца колькасць пасажыраў, якія аддаюць перавагу авіятранспарту?

Марскі транспарт з'яўляецца вядучым у структуры грузаперавозак. Ён у найбольшай ступені спрыяе інтэрнацыяналізацыі эканамічнай дзейнасці. У структуры грузаў, якія перавозяць, пераважае нафта, далей ідуць кантэйнерныя перавозкі, жалезная руда, вугаль і збожжа. Аб узроўні развіцця марскога транспарту можна меркаваць па колькасці і танажы суднаў і наяўнасці партоў.

З развіццём марскога транспарту звязана такое паняцце, як рэгістрацыя суднаў пад «таннымі», або «зручнымі», сцягамі. Яно заключаецца ў стварэнні рэжыму льготнага

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

падаткаабкладання для суднаўладальнікаў. У 2015 г. краінамі з самым вялікім флотам «танных» сцягоў былі Панама (каля 5,2 тыс. суднаў), Ліберыя (2,6) і Маршалавы астравы (1,5 тыс. суднаў).

Найбольш важныя марскія шляхі перасякаюць Атлантычны, Ціхі і Індыйскі акіяны. У апошні час актыўна развіваюцца трансціхаакеанскія маршруты.

У свеце налічваецца звыш 3 тыс. марскіх партоў. Найбуйнейшымі марскімі партамі па грузаабароце з'яўляюцца **Шанхай** (645 тыс. т), **Сінгапур** (538), **Цяньцзінь** (477 тыс. т). Да найбуйнейшых *кантэйнерных партоў* свету адносяць Шанхай, Сінгапур, Пусан.

Папрацуем з атласам. З якога аднаго з трох найбуйнейшых марскіх партоў танней за ўсё даставіць грузы ў нашу краіну? Да якога аднаго з вядучых аэрапортаў свету жыхару Беларусі дабрацца хутчэй за ўсё?

Чыгуначны транспарт, сусветная сетка якога склалася на пачатку XX ст., развіваецца ў цяперашні час за кошт павелічэння інтэнсіўнасці руху, паляпшэння рухомага складу, стварэння высакаскорасных ліній. Найбольшай працягласцю чыгуначных шляхоў характарызуюцца краіны з вялікімі тэрыторыямі — Расія, ЗША, Кітай, Індыя, Канада. Найбольшая гушчыня дарог характэрна для краін Еўропы (Бельгія, Германія, Швейцарыя). Самым дынамічным рэгіёнам па развіцці чыгуначнага транспарту як паводле росту грузаабароту, так і пасажыраабароту з'яўляецца Азія.



Мал. 188. Маглеў у Германіі

Адной з асноўных тэндэнцый развіцця чыгуначнага транспарту з'яўляецца стварэнне звышскорасных цягнікоў на магнітным падвешванні (адштурхванні). Такі від транспарту быў названы левіціруючым, а цягнікі атрымалі назву маглеў (мал. 188).

Клуб знаўцаў-эканомікагеографаў. Першыя эксперыментальныя лініі былі запушчаны ў Германіі ў 1970-я гг. (максімальная скорасць цягнікоў 400 км/г). Пазней была адкрыта першая камерцыйная высакаскорасная лінія ў Шанхаі (скорасць да 450 км/г). Плануецца збудаванне першай міжгародняй лініі ў Японіі.

Паразважаем. Агульная працягласць чыгунак перавышае 1 млн км. У цяперашні час яна не павялічваецца, а ў многіх развітых краінах нават скарачаецца. Як вы лічыце, чаму такое адбываецца ў перыяд хуткага развіцця прамысловай вытворчасці і індустрыялізацыі ў цэлым?

Адным з відаў транспарту, які найбольш дынамічна развіваецца, з'яўляецца **аўтамабільны**. Галоўныя тэндэнцыі яго развіцця — павелічэнне колькасці дарог

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

з цвёрдым пакрыццём, пашырэнне сеткі аўтамагістралей, рост значэння транскантынентальных магістралей. Найбольшай працягласцю аўтадарог характарызуюцца краіны Паўночнай Амерыкі і Заходняй Еўропы. Аўтамагістраль (аўтастрада) уяўляе з сябе шматпалосную скорасную аўтадарогу з удасканаленым пакрыццём, якая не перасякаецца на адным узроўні з іншымі аўтадарогамі. Працягласць усіх аўтамагістралей у свеце складае 326 тыс. км. Найбольш працяглымі сістэмамі аўтастрад валодаюць Кітай (96 тыс. км), ЗША (76) і Заходняя Еўропа (66 тыс. км).

У свеце цікавага. Швейцарыя выгадна выкарыстоўвае сваё геаграфічнае становішча, а менавіта цэнтральнасць і транзітнасць у Еўрапейскім саюзе. Урад краіны задумаўся над змяншэннем адмоўнага ўздзеяння аўтамабільнага транспарту на навакольнае асяроддзе. На праведзеным у 1994 г. рэферэндуме насельніцтва краіны прагаласавала за тое, каб замежныя грузы перавозіліся праз тэрыторыю Швейцарыі толькі па чыгунцы. Тунэль Сімплтан, які злучае Швейцарыю і Італію, пабудаваны ў 1905 г., — адзін з самых доўгіх у свеце (19,5 км). У ім, як і ў іншых тунэлях, нават аўтамабілі перамяшчаюцца на спецыяльных чыгуначных платформах (так званыя аўтамабільныя паромы) (мал. 189), што памяншае выкіды выхлапных газаў.



Мал. 189. Чыгуначныя платформы для перавозкі аўтамабіляў у тунэлі Сімплтан

Авіяцыйны транспарт з'яўляецца галоўным правадніком глабалізацыі. Ён забяспечвае хуткія і надзейныя транспартныя зносіны паміж найбуйнейшымі сацыяльна-эканамічнымі цэнтрамі свету і перыферыйнымі тэрыторыямі.

Да ліку найбуйнейшых паветраных партоў свету адносяць **Атланту** (95 млн чал.) (мал. 190), **Пекін** (82) і **Лондан** (70 млн чал.). 65 % самалётнага парку свету выраблена на заводах транснацыянальных карпарацый **Боінг** (ЗША) і **Эйрбас** (Францыя), 16 % — **Бамбардзье** (Канада) і **Эмбраер** (Бразілія).

Сусветным лідарам па аб'ёмах перавозак пасажыраў з'яўляецца амерыканская кампанія **Delta Air Lines** (161,4 млн чал.).

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Паразважаем. У апошні час у развіцці паветранага транспарту актыўна развіваюцца грузавыя авіяперавозкі. Падумайце, якія грузы пачалі перавозіць авіятранспартам. Назавіце станоўчыя і адмоўныя бакі дадзенай тэндэнцыі.

Клуб знаўцаў-эканамікагеографаў. Адной з найноўшых тэндэнцый развіцця авіяцыйнага транспарту з'яўляецца стварэнне нізкабюджэтных авіякампаній, якія ажыццяўляюць перавозку пасажыраў за невысокую плату — лаўкастараў. Вядучай лаўкост-кампаніяй свету з'яўляецца ірландская Ryanair (Ірландыя).



Мал. 190. Аэрапорт Атланта (ЗША)

Разам з гэтым у сусветнай авіяцыі адбываецца фарміраванне авіяцыйных вузлоў, якія прадстаўляюць сукупнасць некалькіх аэрапортаў паблізу аднаго буйнога горада. Кожны аэрапорт авіяцыйнага вузла спецыялізуецца на абслугоўванні пэўных тыпаў палётаў. Найбуйнейшымі сусветнымі авіяцыйнымі вузламі з'яўляюцца Лонданскі (140,0 млн чал., які ўключае аэрапорты Хітроў, Гэтвік, Станстэд, Лутон, Сіці); Нью-Ёркскі (109,1; аэрапорты Дж. Кенэдзі, Ньюарк, Ла-Гардыя) і Такійскі (102,3 млн чал.; аэрапорты Ханеда, Нарыта).

Кантэйнерызацыя. Сучаснай тэндэнцыяй развіцця транспартнай сістэмы з'яўляецца *кантэйнерызацыя*. Яна ўяўляе з сябе выкарыстанне вялікіх прамавугольных кантэйнераў стандартнага памеру для перавозкі тавараў і дазваляе ўніфікаваць транспартны працэс, скараціць час дастаўкі. Кантэйнеры перавозяцца марскімі суднамі-кантэйнеравозамі, у чыгуначных саставах, на грузавых аўтамабілях, рачнымі суднамі, на самалётах. Першы кантэйнер быў вынайдзены ў ЗША ў 1930 г., а першы стандартны кантэйнер (20-футавы) Twenty-foot Equivalent Unit (TEU) створаны ў 1956 г.

Шырокае прымяненне кантэйнераў у 1950-60-х гг. выклікала тэхналагічную рэвалюцыю на транспарце. Яе назвалі лагістычнай рэвалюцыяй, якая значна спрасціла перавозку большасці грузаў.

Паразважаем. Што галоўнае ў сутнасці лагістыкі? Дадатковыя веды якіх галін спатрэбяцца сучаснаму спецыялісту па лагістыцы?

У 2006 г. у свеце перавезена 452 млн стандартных кантэйнераў TEU; у 2011 г. — 632 млн TEU (25 % з іх прыпадае на Кітай). 40 % сусветнага кантэйнераабароту прыпадае на 10 найбуйнейшых кампаній, якія базіруюцца ў партах Еўропы, Сінгапура, Кітая (мал. 191), Японіі, Рэспублікі Карэя, Чылі.



Мал. 191. Кантэйнерны порт Шэньчжэнь (Кітай)

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Падвядзём вынікі. Транспарт забяспечвае вытворчыя сувязі. Ён уяўляе з сябе сістэму, у якую ўваходзяць ..., ..., ... і ... . У структуры грузаабароту свету вядучае месца належыць ... транспарту, у структуры пасажыраабароту — ... . Найноўшай тэндэнцыяй развіцця авіяцыйнага транспарту з'яўляецца стварэнне нізкабюджэтных авіякампаній — ... . Сучаснай тэндэнцыяй развіцця транспартнай сістэмы ў цэлым з'яўляецца ... .

Праверым свае веды. 1. Назавіце асноўныя складаючыя элементы транспартнай сістэмы. 2. Якія віды транспарту лідзіруюць па грузаабароце, якія — па пасажыраабароце? 3. Назавіце тры найбуйнейшыя марскія парты па грузаабароце. 4. Якія аэрапорты лічацца самымі буйнымі па пасажыраабароце ў свеце? Што ўяўляе з сябе кантэйнерызацыя?

Ад простага да складанага. Існуе прамая ўзаемасувязь паміж узроўнем развіцця транспарту і ўзроўнем сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны. Падрыхтуйце міні-паведамленні, якія пацвярджаюць або аспрэчваюць дадзенае сцвярджэнне.

Ад тэорыі да практыкі. Распрацуйце праект змены транспартнай сістэмы Рэспублікі Беларусь праз выкарыстанне новых відаў транспарту.

П$_1$

Падарожжа па Глабальнай сетцы.

Сайт Сусветнай арганізацыі аўтамабільнага транспарту.

Сайт Міжнароднай асацыяцыі паветранага транспарту.

Сайт Міжнароднага саюза чыгунак.

Сайт Міжнароднай федэрацыі суднаходства.

§ 28. Геаграфія міжнароднага турызму

Успамінаем. Якімі відамі паслуг вы карыстаецеся часцей за ўсё? Што такое турызм? Ці карыстаецеся вы або вашы знаёмыя турысцкімі паслугамі? У якіх краінах вы пабывалі?

Для чаго мы гэта вывучаем? Чаму з кожным годам расце колькасць турысцкіх прыбыццяў? Ці хацелі б вы працаваць у сферы турызму і чаму? Які від турызму вам падабаецца больш за ўсё і чаму?

Роля міжнароднага турызму ў сусветнай гаспадарцы. Турызм з'яўляецца адной з галін сферы паслуг, якія найбольш дынамічна развіваюцца і высокапрыбытковыя. Даходы ад турызму ў 2016 г. у свеце склалі 7,6 трлн дол. ЗША, або 10,2 % сусветнага

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

ВУП. Сектар турызму паказвае ўстойлівы рост у сусветнай гаспадарцы. За 2016 г. даходы ў сферы турызму выраслі на 3,3 %.

У свеце цікавага. 5 ліпеня 1841 г. брытанскі прадпрымальнік Томас Кук, у той час актыўны змагар з п'янствам у Англіі, арганізаваў першую ў свеце групавую турысцкую паездку. Па яго патрабаванні чыгуначная кампанія Midland Counties Railway дала спецыяльны цягнік для «безалкагольнай» паездкі 570 рабочым па маляўнічым маршруце паміж гарадамі ў Сярэдняй Англіі. 570 «сяброў цвярозасці» пагрузіліся ў дзевяць адкрытых вагонаў (мал. 192). У далейшым у рэкламных мэтах чыгункі сталі прадастаўляць Т. Куку зніжкі, якія дазвалялі арганізоўваць забаўляльныя паездкі і для людзей з самымі абмежаванымі фінансавымі магчымасцямі. Экскурсіі і вандроўкі грунтаваліся на вельмі дзейсным прынцыпе: «Атрыманне максімальнай выгады для максімальнай колькасці людзей па мінімальнай цане». Так быў пакладзены пачатак сусветнаму групавому турызму.



Мал. 192. Першая масавая турысцкая паездка, арганізаваная Т. Кукам

Турызм з'яўляецца хуткарослай галіной у сусветным экспарце. На яго прыходзіцца 30 % сусветнага экспарту паслуг. Па даных Сусветнай турысцкай арганізацыі (ЮНВТО), у рэйтынгу сусветных экспартных галін турызм займае трэцяе месца пасля паліўнай і хімічнай прамысловасці.

У свеце ўсё ўзаемазвязана. Чаму маштабы развіцця турысцкай галіны пастаянна павялічваюцца? Як звязаны паміж сабой ГІС-тэхналогіі і турызм? Ці можа турызм прывесці да негатыўных наступстваў для краіны?

Развіццё міжнароднага турызму ў структуры сусветнай гаспадаркі набыло глабальны характар. У 2016 г. кожнае дзясятае працоўнае месца было зафіксавана ў сферы туріндустрыі. У ёй занята каля 300 млн чал.

Па прагнозах, да 2027 г. на туріндустрыю будзе прыходзіцца больш за 11 % сусветнага ВУП, а колькасць працуючых у ёй дасягне 380 млн чал. 25 % працоўных месцаў, якія з'явяцца ў бліжэйшыя 10 гадоў на сусветным рынку працы, будуць створаны ў турызме.

Турысцка-рэкрэацыйныя рэсурсы свету і іх выкарыстанне.

Пад турысцка-рэкрэацыйнымі рэсурсамі разумеюць прыродна-кліматычныя, гісторыка-культурныя і сацыяльна-эканамічныя аб'екты і з'явы, якія з'яўляюцца перадумовамі для развіцця розных відаў турызму і адпачынку і здольныя задавальняць патрэбнасці, якія пры гэтым узнікаюць.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Да *прыродна-кліматычнай групы* адносяць кампаненты прыроднага асяроддзя, або прыродныя рэсурсы: кліматычныя, водныя, лясныя, горныя. У залежнасці ад выконваемых функцый яны могуць быць аздараўленчымі, пазнавальнымі, спартыўнымі.

Да *гісторыка-культурнай* і *сацыяльна-эканамічнай групы* адносяць гістарычныя помнікі і памятныя мясціны, архітэктурныя ансамблі, музеі, а таксама этнаграфічныя, палітычныя, вытворчыя аб'екты. Акрамя гэтага, для развіцця турызму патрэбны фінансавыя, матэрыяльныя і працоўныя рэсурсы.

Больш за ўсё асвоены для турыстычных патрэб турысцка-рэкрэацыйныя рэсурсы Еўропы. Да краін з разнастайнымі рэсурсамі для развіцця турызму і адпачынку ў Еўропе адносяцца перш за ўсё Грэцыя, Італія, Францыя, Вялікабрытанія, Аўстрыя, Іспанія і інш. У іншых рэгіёнах — ЗША, Японія, Мексіка, Аўстралія, Егіпет і інш. Некаторыя краіны са старажытнай гісторыяй і культурай таксама маюць шмат цікавых помнікаў і аб'ектаў турызму. Да такіх краін адносяцца, напрыклад, Перу, Кітай, Індыя, Турцыя, Украіна і шмат інш.

Самымі папулярнымі месцамі адпачынку ў свеце з'яўляюцца Блакітны бераг Францыі, Сонечны бераг Балгарыі, Балеарскія астравы Іспаніі (мал. 193), Лігурыйскае ўзбярэжжа Італіі, Адрыятычнае ўзбярэжжа Харватыі, Французскія, Швейцарскія, Італьянскія і Аўстрыйскія Альпы.

Свет і Беларусь. Якія рэсурсы для развіцця турызму маюцца ў Рэспубліцы Беларусь? Якія змены адбыліся ў развіцці турызму ў Беларусі за апошнія пяць гадоў? Якія аб'екты на тэрыторыі Беларусі найбольш цікавыя для замежных грамадзян? Прывядзіце прыклады падзейнага турызму ў нашай краіне.




Мал. 193. Пляжы Іспаніі

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Асноўнымі прыбярэжнымі раёнамі, якія выкарыстоўваюцца ў мэтах рэкрэацыі і турызму, з'яўляюцца: у Атлантычным акіяне — міжземнаморскае ўзбярэжжа Паўднёвай Еўропы і Паўночнай Афрыкі, узбярэжжа Балтыйскага і Чорнага мораў, паўвостраў Фларыда, астравы Куба, Багамы; у Ціхім акіяне — Гавайскія астравы, астравы Палінезіі і Мікранезіі, усходняе ўзбярэжжа Аўстраліі, в. Хайнань (Кітай), узбярэжжа Японскага мора; у Індыйскім акіяне — в. Шры-Ланка, усходняе ўзбярэжжа в. Мадагаскар, Сейшэльскія і Мальдыўскія астравы.

Клуб знаўцаў-эканомікагеографаў. У апошнія дзесяцігоддзі адбыліся змены матывацыі насельніцтва да турызму: *ад «трох S»* — мора — сонца — пясок (SSS — Sea — Sun — Sand) *да «трох L»* — нацыянальныя традыцыі — пейзаж — вольны час (LLL — Lore — Landscape — Leisure). Гэта спрыяе значнаму павелічэнню колькасці турыстаў і даходаў, якія паступаюць ад развіцця турысцкай галіны.

Віды міжнароднага турызму. У залежнасці ад ступені выкарыстання турысцка-рэкрэацыйных рэсурсаў і галоўнай мэты падарожжа вылучаюць некалькі відаў турызму (мал. 194). Пры гэтым нараўне з традыцыйнымі ў сучасным свеце з'яўляюцца новыя віды турызму. Напрыклад, экзатычны турызм прадугледжвае наведванне маладаступных геаграфічных аб'ектаў, знаёмства з нацыянальнымі звычаямі і кліматам, кухняй і інш.



Мал. 194. Віды міжнароднага турызму па мэце падарожжа


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

У свеце цікавага. Цікавымі формамі развіцця міжнароднага турызму, якія актыўна развіваюцца ў свеце, з'яўляюцца парадорэс і таймшэр. Парадорэс уяўляе з сябе выкарыстанне старадаўніх замкаў і палацаў пад турысцкія гасцініцы і для экскурсійных мэт, каб захаваць нацыянальную архітэктурную спадчыну краіны. Таймшэр — гэта сумеснае валоданне нерухомасцю ў турысцкім бізнесе з магчымасцю карыстацца ёю на працягу пэўнага часу прапарцыйна грашоваму ўнёску. Час карыстання вымяраецца ў тыднях, якія згрупаваны ў тры колеры (красны — самы дарагі, белы і блакітны) і адлюстроўваюць дынаміку попыту па сезонах.

Пашыраюцца формы прыгодніцкага турызму. Да яго адносяць падарожжа на паветраным шары, скалалажанне, спуск па бурных рэках (рафтынг), віндсёрфінг, падводнае плаванне, катанне на снегаходах, водных матацыклах і інш. Інсентыў-турызм уяўляе з сябе паездкі, якімі фірма ўзнагароджвае сваіх супрацоўнікаў за высокія паказчыкі ў працы. Актыўна развіваюцца таксама круізны турызм, падводнае паляванне, спартыўнае рыбалоўства і інш.

Клуб знаўцаў-эканомікагеографаў. Круізны турызм развіваецца найбольш хуткімі тэмпамі. Сярэднегадавы рост колькасці адпачнуўшых у круізах складае кшталту 20–25 %. Для задавальнення попыту на марскія вандроўкі, які пастаянна падвышаецца, у розных краінах будуецца каля 50 гіганцкіх васьміпалубных караблёў, кожны з якіх можа змясціць больш за 6 тыс. пасажыраў. Аднак у сувязі з адноснай дарагоўляй круізны турызм пакуль застаецца ўдзелам галоўным чынам жыхароў багатых краін Еўропы і Паўночнай Амерыкі.

Геаграфія турысцкіх патокаў свету. Інтэнсіўная дынаміка развіцця турызму ў свеце пацвярджаецца паказчыкам турысцкіх прыбыццяў, які ў 2014 г. перавысіў 1 млрд чал. і ў 2017 г. склаў 1326 млн чал. (мал. 195).



Мал. 195. Дынаміка міжнародных турысцкіх прыбыццяў, млн чал.

Асноўнай мэтай большасці падарожжаў з'яўляецца адпачынак, яго выбіраюць 50 % турыстаў. Падарожжу з выкарыстаннем паветранага транспарту аддаюць перавагу 54 % турыстаў.

Рэгіёны свету адрозніваюцца па *колькасці турысцкіх прыбыццяў у структуры міжнароднага турызму*. Калі ў 1970-я гг. Еўропа і Паўночная Амерыка прымалі больш за 90 % турыстаў, то ў 1990-я гг. Паўночная Амерыка саступіла другую пазіцыю Азіяцка-Ціхаакіянскаму рэгіёну (АЦР). У 2016 г. на гэтыя тры рэгіёны прыходзіцца 95 % міжнародных турыстаў. Памяншэнне долі Амерыкі звязана не са стратай

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

прывабнасці рэгіёна, а з больш хуткімі тэмпамі развіцця турызму ў іншых рэгіёнах. Найбольшая колькасць міжрэгіянальных паездак здзяйсняецца з Паўночнай Амерыкі ў Еўропу, з Еўропы — на Блізкі і Сярэдні Усход, АЦР і Афрыку, з АЦР — у Паўночную Амерыку і Еўропу. Развіццё турызму адбываецца рознымі тэмпамі ў рэгіёнах свету. Так, больш актыўна «растуць» Азіяцка-Ціхаакіянскі рэгіён і Афрыка. Блізкі Усход стаў «рэкардсменам» па зніжэнні турысцкага патоку, якое адбылося з-за краін, дзе вядуцца ваенныя дзеянні.




Мал. 196. Структура міжнародных турысцкіх прыбыццяў па рэгіёнах, 2017 г., %

Па колькасці турысцкіх прыбыццяў лідзіруючае месца ў цяперашні час займае Еўропа (671 млн чал., або 51 %) (мал. 196). 25 % турыстаў аддаюць перавагу наведванню Азіі. На амерыканскі рэгіён прыходзіцца 16 % сусветных турысцкіх прыбыццяў (мал. 197).

У першую тройку краін па аб'ёмах прыбыццяў уваходзяць **Францыя** (88,9 млн чал.), **Іспанія** (82,2) і **ЗША** (72,9 млн чал.). У топ-10 краін увайшлі таксама Кітай, Італія, Мексіка, Вялікабрытанія, Турцыя, Германія і Тайланд.

Найбольшымі даходамі ад турызму ў 2016 г. характарызаваліся ЗША, Іспанія і Тайланд. Пры гэтым самыя вялікія выдаткі на падарожжы характэрныя для падарожнікаў з Кітая, ЗША і Германіі.

Па ўзроўні развіцця турызму, спецыялізацыі, аб'ёмах прыбыццяў і даходаў Сусветная турысцкая арганізацыя (ЮНВТО) вылучае шэсць турысцкіх макрарэгіёнаў:



Мал. 197. Размеркаванне міжнародных турысцкіх прыбыццяў па рэгіёнах, 2017 г., млн чал.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Еўрапейскі, Амерыканскі, Блізкаўсходні, Паўднёва-Азіяцкі, Азіяцка-Ціхаакіянскі, Афрыканскі (гл. мал. 196).

Папрацуем з атласам. Пакажыце на палітычнай карце свеце па дзве краіны з кожнага турысцкага макрарэгіёна свету, дзе ў найбольшай ступені развіты турызм. Якімі рэсурсамі для развіцця турызму яны валодаюць?

Асваенне новых тэрыторый свету для развіцця турызму на постындустрыяльнай стадыі. Ва ўмовах постындустрыяльнай стадыі развіцця змяняецца геаграфічная карціна традыцыйных краін і тэрыторый міжнародных турысцкіх наведванняў. Павышэнне цікавасці ў турыстаў да аддаленых, слабаасвоеных тэрыторый, у тым ліку з экстрэмальнымі кліматычнымі ўмовамі, нараўне з магчымасцю краіны атрымаць дадатковыя даходы ад турызму прывялі да засваення перыферыйных рэгіёнаў. Да такіх рэгіёнаў і краін адносяцца Ісландыя, Нарвегія, Шатландыя, в. Хакайда, Непал і інш.

Падвядзём вынікі. Турызм з'яўляецца адной з самых высокадаходных галін сферы паслуг. Турысцкая дзейнасць набыла ... характар. Для міжнароднага турызму характэрная ... . Па колькасці турысцкіх прыбыццяў лідзіруе ... . Па ўзроўні развіцця турызму, спецыялізацыі, аб'ёмах прыбыццяў вылучаюць ... турысцкіх макрарэгіёнаў: ..., ..., ..., ..., ..., ...

Праверым свае веды. 1. Якое месца турызму ў сферы паслуг? 2. У чым выяўляецца тэрытарыяльная нераўнамернасць у развіцці сучаснага турызму? 3. Якія фактары ўплываюць на развіццё турызму?

Ад простага да складанага. 1. Падрыхтуйце прэзентацыю пра найбольш наведвальныя куткі планеты. 2. Складзіце вусны часопіс на тэму «Краіны з рызыкамі для турыстаў».

Ад тэорыі да практыкі. Уявіце, што перад вамі стаіць задача навучыць вашых аднакласнікаў, як арганізаваць падарожжа з дапамогай інтэрнэту. Падрыхтуйце і правядзіце майстар-клас па гэтым пытанні.

Падарожжа па Глабальнай сетцы.
Сайт Сусветнай турысцкай арганізацыі (ЮНВТО).

П1

§ 29. Геаграфія фінансавых паслуг у свеце

Успамінаем. Да якой групы паслуг адносяцца фінансавыя паслугі? Чаму фінансавыя паслугі з'яўляюцца аднымі з найстарэйшых і самых распаўсюджаных у свеце? Чым можна растлумачыць, што сярод найбуйнейшых ТНК свету знаходзяцца найбуйнейшыя банкі?


Для чаго мы гэта вывучаем? Уявіце сітуацыю, калі вашы знаёмыя плануюць здзейсніць вялікую пакупку, але не маюць усёй сумы грошай. Як вы параіце ім паступіць? Уявіце, што вы назапасілі пэўную суму зберажэнняў і звярнуліся ў банк за

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

недастаючай сумай. Як вы выкарыстаеце свае зберажэнні і на што параіце ўсім звярнуць увагу пры здзяйсненні банкаўскіх аперацый?

Агульная характарыстыка фінансавых паслуг. Адной з галін сферы паслуг, якія найбольш дынамічна развіваюцца і прыбытковыя, з'яўляюцца фінансавыя паслугі.

Фарміраванне сусветнага рынку капіталаў, пашырэнне рынкаў золата, крэдытаў, валюты, каштоўных папер прывяло да стварэння ў сусветнай гаспадарцы спецыяльных фінансавых устаноў (мал. 198). Асноўнае месца сярод іх займаюць банкі і біржы.



Мал. 198. Асноўныя фінансавыя ўстановы інфраструктуры сусветнай фінансавай сістэмы

У XXI ст. з 20 найбуйнейшых банкаў свету сем з'яўляюцца кітайскімі, тры — банкамі ЗША, па два — японскімі і канадскімі. У першую пяцёрку ўваходзяць два кітайскія і тры банкі ЗША (мал. 199). Сярод бірж вылучаюць фондавыя, якія гандлююць каштоўнымі паперамі, і валютныя, прызначаныя для гандлю замежнай валютай.



У свеце цікавага. Правобразы банкаў існавалі ў старажытным Вавілоне, Егіпце і Грэцыі. Функцыю сховішчаў выконвалі палацы і храмы. Улік дабрабыту вялі жрацы. За дабро людзі не баяліся, таму што лічылася, што грошы ў храме абараняюць багі. З развіццём гандлю з'явіліся першыя мянялы. Яны мянялі чужыя грошы па ўстаноўленым курсе на тыя, якія былі прынятыя ў дадзенай мясцовасці. Мянялы былі і першымі крэдыторамі. З такіх абменных кантор і ўтварыліся першыя банкі. Банкі ў сучасным разуменні ўзніклі ў эпоху позняга Сярэдневякоўя. У гэты час у Еўропе зараджаўся капіталізм і рос лік мануфактур. Цэнтрамі гандлю выступалі Генуя, Фларэнцыя і Венецыя, там і з'явіліся першыя банкі.



Мал. 199. Найбуйнейшыя банкі свету, 2017 г.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

На гарадскіх плошчах актыўна закупляліся ўсходнія тавары і прадаваліся тавары еўрапейскія. Тут жа стаялі мянялы і ліхвяры. Працавалі яны за ўласнымі сталамі. На італьянскай мове слова «стол» гучыць як «банка», адсюль і назва — «банк».

Найбуйнейшыя фінансавыя цэнтры свету. Па меры ўзбуйнення банкаў і канцэнтрацыі фінансавай дзейнасці сталі ўзнікаць фінансавыя цэнтры. Яны могуць быць нацыянальнымі і міжнароднымі.

Міжнародны фінансавы цэнтр — гэта цэнтр засяроджвання буйных міжнародных капіталаў і маштабнага правядзення разнастайных міжнародных фінансавых аперацый.

Міжнародныя фінансавыя цэнтры з'яўляюцца сёння ключавымі пляцоўкамі глабальнай фінансавай сістэмы. На іх адбываецца прыцягненне і кіраванне патокамі капіталу з усяго свету. Яны збіраюць і перараспределяюць па ўсім свеце капіталы і засяроджваюць у сваіх руках найважнейшыя валютныя, крэдытныя, страхавыя і іншыя фінансавыя аперацыі. Агульная колькасць сусветных фінансавых цэнтраў — 96. Такія цэнтры адрозніваюцца па спецыялізацыі прадастаўляемых паслуг, але могуць мець і шырокую структуру.

У сусветнай структуры пераважаюць азіяцкія фінансавыя цэнтры. Найбуйнейшымі сярод іх з'яўляюцца Ганконг, Сінгапур, Токіа, Шанхай і Пекін.

У Еўропе — гэта Лондан, Цюрых і Франкфурт, у Паўночнай Амерыцы — Нью-Ёрк, Таронта, Сан-Францыска. У Афрыцы і на Блізкім Усходзе — Дубай, Абу-Дабі і Касабланка. У Лацінскай Амерыцы — Кайманавы астравы, Бярмуды і Багамы.

Па даных Global Financial Centers Index за 2017 г., пяццю найбуйнейшымі фінансавымі цэнтрамі свету з'яўляюцца: **Лондан**, **Нью-Ёрк**, **Сінгапур** (мал. 200), Ганконг і Токіа. У лік новых фінансавых цэнтраў, якія ўключаны ў сусветны рэйтынг, аднесены Астана (Казахстан), Баку (Азербайджан), Нью-Дэлі (Індыя) і Цяньцзінь (Кітай).



Мал. 200. Найбуйнейшы банк Сінгапура HSBC

Папрацуем з атласам. У якім рэгіёне свету размешчана найбольшая колькасць фінансавых цэнтраў? Растлумачце геаграфію іх з'яўлення.

Свет і Беларусь. Якія банкі ў Рэспубліцы Беларусь вы ведаеце? Чым можна растлумачыць, што ўсе іх галаўныя офісы размешчаны ў сталіцы — г. Мінску? Ці выкарыстоўваюцца ў Беларусі віртуальныя грошы?

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Міжнародныя фінансавыя арганізацыі і іх роля ў развіцці сусветнай гаспадаркі. Фарміраванне міжнародных фінансавых рынкаў, іх інтэрнацыяналізацыя, інтэграцыйныя працэсы ў гандлі капіталамі запатрабавалі стварэння міжнародных фінансавых арганізацый.

Міжнародная фінансавая сістэма была сфарміравана адразу пасля заканчэння Другой сусветнай вайны. Менавіта тады былі створаны дзве ключавыя арганізацыі ў галіне міжнародных фінансавых адносін — **Міжнародны банк рэканструкцыі і развіцця** (МБРР, International Bank for Reconstruction and Development) і **Міжнародны валютны фонд** (МВФ, International Monetary Found). Іх стварэнне было абумоўлена неабходнасцю аднаўлення эканомік Еўропы пасля Другой сусветнай вайны і пашырэння фінансавага супрацоўніцтва краін з мэтай выпрацоўкі найбольш аптымальнага шляху пераадолення фінансавых праблем.

Міжнародны банк рэканструкцыі і развіцця (мал. 201) пачаў функцыянаваць у 1946 г. Першапачаткова яго мэтай было стымуляванне інвестыцый у краіны Заходняй Еўропы. Да канца 1950-х гг. МБРР стаў ажыццяўляць інвестыцыі ў іншыя рэгіёны — Паўднёва-Усходнюю Азію, Лацінскую Амерыку. Акрамя інвестыцый ён таксама спрыяе развіццю міжнароднага гандлю, публікуе знешнеэканамічную статыстыку. МБРР бачыць сваю мэту ў прыцягненні прыватных інвестыцый у інфраструктуру і галіны прамысловай вытворчасці, у тыя галіны, куды прыватны капітал ідзе звычайна не вельмі актыўна. З 1990-х гг. МБРР займаецца праблемай урэгулявання знешніх даўгоў краін, якія развіваюцца.



Мал. 201. Штаб-кватэра МБРР у Вашынгтоне

Міжнародны валютны фонд (мал. 202) пачаў сваю дзейнасць у 1947 г. Ён быў створаны для садзейнічання развіццю сусветнага гандлю і валютнага супрацоўніцтва. МВФ дае крэдыты пры дэфіцыце плацежнага балансу дзяржавы шляхам продажу замежнай валюты за нацыянальную валюту асобных дзяржаў, рэгулюе валютныя курсы, ліквідуе валютныя абмежаванні і г. д.

Устаўны капітал МВФ фарміруецца за кошт узносаў дзяржаў-членаў. Самай вялікай колькасцю галасоў у МВФ валодаюць



Мал. 202. Штаб-кватэра МВФ у Вашынгтоне

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

ЗША. У апошні час у МВФ адбываюцца працэсы пераразмеркавання квот на карысць краін, якія развіваюцца, і новых індустрыяльна развітых краін. Зараз МВФ адыгрывае актыўную ролю ва ўрэгуляванні глабальнага фінансавага крызісу 2008–2009 гг., дапамагае краінам, якія сутыкнуліся з фінансавымі катаклізмамі. Можна сказаць, што МВФ з'яўляецца своеасаблівым сусветным міністэрствам фінансаў або цэнтральным банкам.

Нараўне з МВФ і МБРР узнік шэраг рэгіянальных фінансавых арганізацый: найбуйнейшая з іх — Еўрапейскі Банк рэканструкцыі і развіцця (ЕБРР). Яго задача — ажыццяўляць фінансавую дапамогу дзяржавам Еўропы і перш за ўсё Усходняй Еўропы.

Крыптавалюта і яе роля ў сусветнай гаспадарцы. За апошнія некалькі гадоў сусветная гаспадарка на ўсіх яе ўзроўнях (мікра-, меза-, глабальная эканоміка) становіцца ўсё больш тэхналагічнай, лічбавай і нават воблачнай. Лічбавізацыя эканомікі характарызуецца стварэннем на розных узроўнях сусветнай гаспадаркі інфармацыйна-лічбавых платформ і аператараў, якія дазваляюць вырашаць розныя гаспадарчыя задачы: развіццё медыцыны, навукі, адукацыі, транспарту, новай індустрыялізацыі і інш.

Сусветныя фінансавыя паслугі, як і ўся сусветная гаспадарка, становяцца залучанымі ў працэс лічбавізацыі. Са з'яўленнем інтэрнэту сталі папулярнымі плацяжы ў Сетцы. Такім чынам з'явіліся розныя электронныя валюты (напрыклад, Яндэкс. Грошы, WebMoney і інш.). Аднак гэта быў толькі першы крок. За ім пайшло стварэнне інфармацыйнай валюты ў якасці сродку плацяжу і абмену, электронных грошай — крыптавалют.



Крыптавалюта — гэта разнавіднасць лічбавай валюты (электронныя, або віртуальныя, грошы, створаныя па тэхналогіі крыптаграфіі), якая не мае фізічнага выражэння і служыць для правядзення ананімных фінансавых аперацый і плацяжоў з высокім узроўнем абароненасці.

Адзінкай крыптавалюты з'яўляецца «coin», што ў перакладзе з англійскай мовы азначае «манета».

У цяперашні час у свеце існуе звыш 1170 відаў крыптавалют. Найбольшай папулярнасцю карыстаюцца *біткоін* (*Bitcoin*) і *эфірыум* (*Etherium*). Гэтыя валюты прымаюць усе існуючыя абменныя пункты і біржы.

Біткоін — найбольш папулярная крыптавалюта і своеасаблівы яе родапачынальнік. Сваім з'яўленнем Bitcoin паклаў пачатак развіццю ўсіх астатніх падобных валют. Распрацоўшчыкам з'яўляецца група праграмістаў Сатошы Накамота.

Статус біткоіна ў розных краінах адрозніваецца. Ёсць краіны, дзе крыптавалюты не толькі маюць прававы статус, але і ўкаранёны ў паўсядзённае жыццё. Да іх адносяцца перш за ўсё Японія, ЗША, Канада. Афіцыйны прававы статус біткоін мае таксама ў Аўстраліі, Рэспубліцы Карэя, Швецыі, Фінляндыі.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Забароненыя біткоіны або ўведзены абмежаванні на іх выкарыстанне ў такіх краінах, як, напрыклад, Кітай, Бангладэш, Ісландыя, Ліван і інш.

Эфірыум быў прапанаваны В. Буцерыным у канцы 2013 г., сетка была запушчана ў 2015 г.


У адрозненне ад іншых крыптавалют аўтары не абмяжоўваюць ролю эфірыума плацяжамі, а прапануюць яго, напрыклад, у якасці сродку для абмену рэсурсамі.

Нягледзячы на ўсе свае рэвалюцыйныя ўласцівасці, крыптавалютная індустрыя сутыкаецца з шэрагам праблем. Адной з асноўных з'яўляецца бяспека плацежных аперацый.

Паразважаем. З якімі яшчэ праблемамі можа быць звязана выкарыстанне крыптавалюты? Якімі прычынамі можна растлумачыць, чаму ў шэрагу краін яна забаронена?

Геаграфія экспарту і імпарту фінансавых паслуг. Экспарт фінансавых паслуг у свеце складае 420 млрд дол. У сусветнай структуры вядучае месца належыць краінам Еўропы, на якія прыходзіцца 56 % сусветнага экспарту. На краіны Паўночнай Амерыкі прыходзіцца чацвёртая частка экспарту фінансавых паслуг свету. Доля краін Азіі складае 16 %.

Еўрапейскі саюз як вядучы фінансавы цэнтр свету з'яўляецца таксама і вядучым экспарцёрам фінансавых паслуг у свеце (мал. 203). На яго прыходзіцца 56 % сусветнага экспарту. Другое месца займаюць ЗША, доля якіх у экспарце фінансавых паслуг складае 25 %. Сінгапур і Швейцарыя займаюць разам трэцяе месца, іх доля ў сусветнай структуры складае 5 %. Вядучымі імпарцёрамі фінансавых паслуг выступаюць Еўрапейскі саюз, ЗША і Канада.



Мал. 203. Вядучыя экспарцёры і імпарцёры фінансавых паслуг, доля ў сусветнай структуры, %

Падвядзём вынікі. Фінансавыя паслугі — адна з галін сферы паслуг, якія найбольш дынамічна развіваюцца і з'яўляюцца прыбытковымі. Асноўнымі фінансавымі ўстановамі з'яўляюцца ... і ... . Сярод найбуйнейшых банкаў свету пераважаюць ... . Міжнародныя фінансавыя цэнтры з'яўляюцца ключавымі пляцоўкамі глабальнай фінансавай сістэмы. Міжнародныя фінансавыя арганізацыі ўтварыліся ў выніку фарміравання міжнародных фінансавых рынкаў, інтэграцыйных працэсаў у гандлі капіталамі. Лічбавізацыя сусветнай гаспадаркі прывяла да фарміравання ... .

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Праверым свае веды. 1. Якія існуюць асноўныя фінансавыя ўстановы? 2. Калі з'явіліся першыя банкі? 3. Назавіце найбуйнейшыя банкі і фінансавыя цэнтры свету. 4. Чым можна растлумачыць перавагу сярод іх Азіяцкага рэгіёна?

Ад простага да складанага. Курс крыптавалюты можа змяняцца некалькі разоў на дзень. Якія фактары ўплываюць на такія частыя ваганні курсу?

Ад тэорыі да практыкі. 1. Выкарыстоўваючы афіцыйныя сайты, падрыхтуйце кароткае паведамленне аб Міжнародным банку рэканструкцыі і развіцця і Міжнародным валютным фондзе. 2. Для чаго выкарыстоўваюцца электронныя грошы: Яндэкс.Грошы, WebMoney? Якія паслугі ў інтэрнэце імі можна аплачваць? Якія перавагі і недахопы вы бачыце пры іх выкарыстанні?

Падарожжа па Глабальнай сетцы.
Сайт Міжнароднага банка рэканструкцыі і развіцця.

Сайт Міжнароднага валютнага фонду.

§ 30. Геаграфія сектара інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій свету

Успамінаем. Чаму інтэрнэт называюць Сусветным павуціннем? Што такое інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі? Якія сферы дзейнасці чалавека больш за ўсё звязаны з інфармацыйна-камунікацыйнымі тэхналогіямі?

Для чаго мы гэта вывучаем? Чаму чалавеку неабходны інтэрнэт? Чаму развіццю ІТ-сферы надаюць значную ўвагу ва ўсім свеце? Якія спецыяльнасці, звязаныя з інфармацыйна-камунікацыйнымі тэхналогіямі, сёння найбольш запатрабаваныя?

Склад і месца інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій (ІКТ) у сусветнай гаспадарцы. ІКТ з'яўляюцца неад'емнай часткай развіцця сучаснага свету. Дзякуючы камп'ютарызацыі інфармацыйная прастора набыла глабальны маштаб. ІКТ сталі прымяняцца ва ўсіх сферах дзейнасці чалавека, пачынаючы ад вырашэння паўсядзённых патрэб чалавека і заканчваючы забеспячэннем банкаўскай і фінансавай дзейнасці краін, падатковай сістэмы, адукацыі (мал. 204), медыцыны (мал. 205), а таксама кіраваннем транспартам, прамысловымі прадпрыемствамі і г. д.

У цяперашні час міжнародныя эканамічныя арганізацыі разглядаюць тэлекамунікацыйныя віды дзейнасці, інтэрнэт-індустрыю, электронную выдавецкую справу, вытворчасць камп'ютарнай тэхнікі, праграмнага забеспячэння і іншыя сумежныя падгаліны як адзінае цэлае — інфармацыйна-камунікацыйны сектар (ІКС), або ІК-сектар.

ІКТ уключае вялікую колькасць відаў вытворчасцей і паслуг і складаецца з двух звёнаў. *Першае звяно* — аснова ІКС — гэта прамысловыя галіны, якія вырабляюць

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Мал. 204. Выкарыстанне ІКТ у адукацыі



Мал. 205. Выкарыстанне ІКТ у медыцыне

прадукцыю, прызначаную для рэалізацыі інфармацыйных працэсаў і камунікацыі, уключаючы перадачу інфармацыі і яе прадстаўленне. *Другім звяном* ІКС з'яўляюцца сэрвісныя галіны, якія вырабляюць інфармацыйныя тавары і паслугі: публікацыя электронных газет і іншых інтэрнэт-выданняў, распаўсюджванне ПЗ, тэле- і радыёвяшчанне і тэлекамунікацыйныя паслугі па перадачы тэксту, гуку і выявы на адлегласць, кансалтынгавыя інтэрнэт-паслугі, правайдарскія паслугі па доступе ў інтэрнэт і пошуку інфармацыі і інш. (мал. 206).

Пералічаныя віды вытворчасцей і паслуг сектара ІКТ абумоўліваюць рост усіх галін сусветнай гаспадаркі, нацыянальных эканомік і свету ў цэлым.

У свеце ўсё ўзаемазвязана. Як узровень развіцця інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій залежыць ад узроўню развіцця краіны?

ІКТ уяўляюць з сябе *самастойны сектар сусветнай гаспадаркі* і з'яўляюцца магутным рухавіком сусветнага эканамічнага развіцця. Яны ствараюць перадумовы для фарміравання глабальнага інфармацыйнага грамадства.

Клуб знаўцаў-эканомікагеографаў. У 2000 г. у Японіі была прынята Акінаўская хартыя, якая абвясціла, што ўсе людзі без выключэння павінны мець аднолькавую магчымасць карыстацца перавагамі глабальнага інфармацыйнага грамадства. Аднак нягледзячы на хуткае развіццё ІКТ у свеце на шляху да глабальнага інфармацыйнага грамадства ляжыць «лічбавая прорва» (Digital divide) (ЛП). Дадзены тэрмін азначае сацыяльна-эканамічны разрыў паміж насельніцтвам, бізнесам і геаграфічнымі тэрыторыямі ў даступнасці да інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій. Магчымасці насельніцтва і прыватных кампаній атрымліваць перавагі ад выкарыстання інтэрнэту ў развітых краінах значна вышэйшая за магчымасці краін, якія развіваюцца. Напрыклад, у Нарвегіі доступ да інтэрнэту мае 97 % насельніцтва, у Ліберыі — 0,07 %.

ІКС уносіць вялікі ўклад у развіццё постындустрыяльнай эканомікі. На гэты час ён з'яўляецца найбуйнейшым сегментам сусветнай гаспадаркі. Яго прадукцыя складае

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Мал. 206. Склад сектара інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій

6,0 % сусветнага ВУП, занятасць — 6–8 % агульнай колькасці эканамічна актыўнага насельніцтва, інвестыцыі — 14–20 % кошту прадукцыі.

Свет і Беларусь. Што вы ведаеце аб Парку высокіх тэхналогій? Якія дасягненні ІКТ актыўна ўкараняюцца ў Беларусі і даступныя для масавага карыстання грамадзянамі нашай краіны?

Міжнародны геаграфічны падзел працы ў ІКС. Геаграфія вытворцаў сектара ІКТ прадстаўлена трыма асноўнымі цэнтрамі. На працягу доўгага часу назіраецца ўстойлівае лідарства ЗША. Міжнароднае развіццё сектара ІКТ да пачатку 2000-х гг. характарызавалася вядучымі пазіцыямі развітых краін. Аднак на пачатку 2010-х гг. назіраецца зрух вытворчасці ІКТ-тавараў і паслуг у КНР, Індыю і іншыя краіны

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Азіі, якія развіваюцца. Таму трыма асноўнымі цэнтрамі развіцця ІКТ з'яўляюцца ў цяперашні час ЗША, Еўропа і лідзіруючая група азіяцкіх краін — Кітай, Рэспубліка Карэя, Японія і Індыя.

Інтэрнацыяналізацыя індустрыі ІКТ суправаджаецца паглыбленнем спецыялізацыі краін і перадачай асобных відаў вытворчасцей або паслуг у аўтсорсінг замежным кампаніям.

Аўтсорсінг — перадача прадпрыемствам/арганізацыяй пэўных відаў або функцый вытворчай прадпрымальніцкай дзейнасці іншай кампаніі, што дзейнічае ў патрэбнай галіне.

У выніку ў развіцці індустрыі ІКТ за апошнія гады адбыліся істотныя змены, якія характарызуюцца значным зрухам вытворчасці тавараў і паслуг ІКТ з развітых краін у краіны Азіі, якія развіваюцца.

У сегменце тэлекамунікацыйнага абсталявання і камп'ютараў пераважае гандаль паміж развітымі краінамі, а электронных кампанентаў — паміж краінамі, якія развіваюцца. У гандлі відэаабсталяваннем пераважаюць пастаўкі з краін, якія развіваюцца, у развітыя. КНР стала найбуйнейшым у свеце экспарцёрам тавараў ІКТ, апярэдзіўшы ў 2004 г. ЗША.

Па аб'ёмах вытворчасці сродкаў сувязі вядучыя пазіцыі ў сектары ІКТ займаюць Кітай, Індыя і краіны Азіяцка-Ціхаакіянскага рэгіёна (АЦР). Пры гэтым Кітай кантралюе 11 % сусветнага рынку, толькі на 1 % саступаючы Японіі.

У свеце ТНК. У 2017 г. галоўнымі вытворцамі камунікацыйнага абсталявання ў свеце з'яўляліся тры ТНК: **Cisco Systems** (ЗША), **Nokia** (Фінляндыя) і **ZTE** (Кітай). Асноўнымі кампаніямі па прадастаўленні камп'ютарных паслуг шырокага спектру ў свеце з'яўляюцца **Alphabet** (ЗША), **IBM** (ЗША) і **Facebook** (ЗША). Па вытворчасці праграмнага забеспячэння лідзіруючыя пазіцыі займаюць **Microsoft** (ЗША), **Oracle** (ЗША) і **SAP** (Германія).


У рэгіянальным плане лідарамі з'яўляюцца краіны Азіяцка-Ціхаакіянскага рэгіёна, асноўны прадстаўнік якога — Кітай. Найлепшую дынаміку дэманструюць таксама індыйскія кампаніі. Краіны, якія развіваюцца, з эканомікай, што хутка расце, усё сур'ёзней акцэнтуюць увагу на вытворчасці інавацыйных прадуктаў ІКТ і ўзмацняюць канкурэнтны патэнцыял сусветнага рынку. Некаторыя з іх, напрыклад Рэспубліка Карэя, Сінгапур, Тайвань, Малайзія, ПАР, дабіліся значных поспехаў у інфарматызацыі сваіх эканомік.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Паразважаем. Н. Ротшыльд, заснавальнік вялікай банкаўскай дынастыі Ротшыльдаў, сказаў: «Хто валодае інфармацыяй, той валодае светам». Патлумачце дадзенае выказванне.

Узровень развіцця ІКТ у свеце і адрозненні паміж развітымі краінамі і краінамі, якія развіваюцца. Сусветны сегмент ІКТ атрымаў найбольш актыўнае развіццё на пачатку XXI ст. і з таго часу паказвае інтэнсіўны рост. Сусветны рынак інфармацыйных паслуг у развітых краінах падышоў да заканчэння інтэнсіўнага развіцця і перайшоў да задавальнення гэтымі паслугамі масавага спажыўца. Краіны, якія развіваюцца, не змаглі яшчэ ў поўным аб'ёме ўзняць узровень ІКТ-індустрыі да развітых краін. Яны імкнуцца пераадолець інфармацыйную адсталасць за кошт маштабнага ўкаранення камп'ютараў і інфармацыйных тэхналогій у эканоміку, навуку і хатнія гаспадаркі.

Адным з асноўных крытэрыяў, які характарызуе развіццё ІКТ, з'яўляецца ўзровень выкарыстання інтэрнэту (колькасць карыстальнікаў, хуткасць, кошт). Так, адбываецца рост колькасці абанентаў мабільнай сотавай сувязі і скарачаецца — фіксаванай тэлефоннай. Пры агульным росце колькасці інтэрнэт-карыстальнікаў сёння ў свеце каля 50 % насельніцтва не мае доступу да яго. Няўхільна з 2010 г. адбываецца павелічэнне колькасці абанентаў мабільнай шырокапалоснай сувязі (мал. 207).




Мал. 207. Дынаміка развіцця сектара ІКТ у свеце, на 100 чал.

Існуе значны разрыў паміж развітымі краінамі і краінамі, якія развіваюцца, па ўзроўні развіцця ІКТ. Напрыклад, у развітых краінах у два разы больш абанентаў высакахуткаснай сувязі, чым у краінах, якія развіваюцца. Гэтыя адрозненні таксама істотныя ў выкарыстанні інтэрнэту. Колькасць хатніх гаспадарак, якія маюць падключэнне, у развітых краінах амаль удвая вышэйшая, чым у краінах, якія развіваюцца (мал. 208).


Значныя адрозненні існуюць паміж рэгіёнамі свету (мал. 209–211).

У большасці краін Афрыкі праверыць электронную пошту зможа толькі трэцяя частка насельніцтва. Менш за ўсё шанцаў далучыцца да інтэрнэту ў жыхароў Эфіопіі. Кошт мабільнага інтэрнэту тут складае 150 дол. ЗША ў месяц за 30 Гб. Адзіная краіна ў свеце, дзе інтэрнэт забаронены на дзяржаўным узроўні, — гэта КНДР. Замест яго створаны інтранэт (нацыянальная сетка) Кванмен.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне




Мал. 208. Адрозненні ў развіцці ІКТ паміж развітымі краінамі і краінамі, якія развіваюцца, 2017 г., на 100 чал.



Мал. 209. Колькасць абанентаў мабільнай сотавай сувязі па рэгіёнах, 2017 г., на 100 чал.



Мал. 210. Колькасць абанентаў мабільнай шырокапалоснай сувязі па рэгіёнах, 2017 г., на 100 чал.



Мал. 211. Доля індывідуальных інтэрнэт-карыстальнікаў па рэгіёнах, 2017 г., %

У свеце цікавага. У КНДР навіны, электронныя кнігі, свая пошукавая сістэма праходзяць праверку ў спецыяльным Цэнтры камп'ютарнай інфармацыі. Аднак для турыстаў зрабілі крок насустрач, дазволіўшы карыстацца тэлефонамі і мабільным інтэрнэтам унутры краіны. Да 2013 г. гаджэты трэба было здаваць на захоўванне ў аэрапорце. Сеткі Wi-Fi даступныя толькі на тэрыторыі замежных амбасад і міжнародных арганізацый. Да 2014 г. Wi-Fi можна было выкарыстоўваць без абмежаванняў, але закон зрабілі больш жорсткім з-за спроб грамадзян КНДР далучыцца да бясплатнага, а галоўнае — свабоднага інтэрнэту. Спробы злавіць сетку каля будынкаў консульстваў хутка спыніліся.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Самы хуткі інтэрнэт у свеце зарэгістраваны ў Нацыянальным упраўленні па аэранаўтыцы і даследаванні касмічнай прасторы — НАСА (ЗША) — 91 Гігабіт/с, а самы павольны — у Іране (3 Мбіт/с).

Для комплекснай характарыстыкі ўзроўню развіцця ІК-сектара выкарыстоўваецца індэкс развіцця інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій (ICT Development Index — IDI). Гэта камбінаваны паказчык, які быў распрацаваны Міжнародным саюзам электрасувязі — спецыялізаваным падраздзяленнем ААН у галіне ІКТ. Ён уключае 11 паказчыкаў па трох асноўных раздзелах: доступ да ІКТ, выкарыстанне ІКТ і навыкі ІКТ. Напрыклад, паказчыкам доступу да ІКТ з'яўляецца колькасць абанентаў мабільнай сувязі на 100 чал., паказчыкам выкарыстання — працэнт карыстальнікаў сеткі Інтэрнэт, паказчыкам навыкаў — сярэдняя працягласць навучання.

Па даных за 2017 г., Еўропа застаецца вядучым рэгіёнам у развіцці ІКТ. Краінамі з найбольш высокім узроўнем развіцця ІКТ у свеце з'яўляюцца **Ісландыя**, **Рэспубліка Карэя**, **Швейцарыя**, Данія і Вялікабрытанія. Самыя адсталыя краіны па развіцці ІКТ у свеце — афрыканскія дзяржавы Эрытрэя, ЦАР, Чад, Гвінея-Бісау, Бурундзі.

Лічбавізацыя сусветнай гаспадаркі. Хуткае развіццё ІКТ не толькі прывяло да з'яўлення новых відаў эканамічнай дзейнасці, але і выступіла найважнейшым фактарам фарміравання лічбавай эканомікі свету.



По вызначэнні Сусветнага банка, **лічбавая эканоміка — гэта сістэма эканамічных, сацыяльных і культурных адносін, заснаваных на выкарыстанні лічбавых інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій.**

У выніку лічбавізацыі сусветнай гаспадаркі на змену ранейшым вытворчым адносінам тыпу «чалавек — машына», прыходзяць новыя «машына — машына (M2M)», дзе чалавек можа ўжо не выступаць суб'ектам.



У свеце ТНК. Прыкладамі паспяховага стварэння арганізацыйна-тэхналагічных лічбавых платформ з'яўляюцца новыя віды інтэрнэт-паслуг. Напрыклад, у транспартнай сферы — гэта мабільны дадатак **UBER**, беспілотны транспарт; у сферы арэнды жылля — гэта анлайн-пляцоўка для размяшчэння, пошуку і кароткатэрміновай арэнды прыватнага жылля па ўсім свеце **Airbnb**; у сферы інтэрнэт-камерцыі — гэта **Alibaba**; у сферы камунікацыі — найбуйнейшая сацыяльная сетка ў свеце **Facebook** і інш.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



У свеце цікавага. Сучасныя медыцынскія паслугі развіваюць лічбавыя генетычныя тэхналогіі, якія дазваляюць яшчэ да нараджэння чалавека карэкціраваць генетычныя адхіленні і з дапамогай некалькіх ін'екцый вылечваць хваробы, якія раней лічыліся невылечнымі. Сучасная будаўнічая галіна сёння дазваляе ствараць лічбавыя мадэлі будынкаў, максімальна аператыўна мяняць праекты, кіраваць будаўніцтвам будынкаў.

Па прагнозах экспертаў у галіне лічбавай эканомікі, прыкладна да 2020 г. каля паловы тавараў і паслуг будуць абсалютна або адносна «новымі разумнымі» («разумны горад», «разумны дом», «разумная дарога», «разумная машына», «разумнае адзенне» і г. д.).

Лічбавымі краінамі-лідарамі на сённяшні дзень з'яўляюцца Нарвегія, Швецыя і Швейцарыя. У топ-10 уваходзяць ЗША, Вялікабрытанія, Данія, Фінляндыя, Сінгапур, Рэспубліка Карэя і Ганконг.



Падвядзём вынікі. Інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі актыўна ўкараняюцца ва ўсе сферы дзейнасці чалавечага грамадства. Постындустрыяльныя краіны займаюцца вытворчасцю ... . Краіны, якія развіваюцца, актыўна ўкараняюць дасягненні ІКТ ва ўсіх сферах гаспадаркі. Аўтсорсінг — гэта ... . Лічбавая эканоміка — гэта ... .



Праверым свае веды. 1. Якія асноўныя тэндэнцыі распаўсюджвання ІКТ? 2. У чым адрозненні ў МГПП у сектары ІКТ? 3. Якія існуюць адрозненні ва ўзроўні развіцця ІКТ паміж развітымі краінамі і краінамі, якія развіваюцца?



Ад простага да складанага. Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, падрыхтуйце паведамленне «ІКТ і геаграфія». Выкажыце сваё меркаванне па пытанні: распрацоўка мабільных дадаткаў — новы павеў ці доўгачаканы сэрвіс?



Ад тэорыі да практыкі. Складзіце калаж «Як ІКТ змянілі жыццё маёй сям'і?».



Падарожжа па Глабальнай сетцы.
Сайт Міжнароднага саюза электрасувязі.



§30-1

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

АБАГУЛЬНЯЛЬНАЕ ПАЎТАРЭННЕ ПА РАЗДЗЕЛЕ III

Праверым свае веды.

1. Галіна сусветнай гаспадаркі — гэта... .
2. Прасторавая структура сусветнай гаспадаркі — гэта... .
3. Міжнародны геаграфічны падзел працы — гэта... .
4. ВУП па ППЗ — гэта... .
5. ТНК — гэта... .
6. Транснацыяналізацыя — гэта... .
7. Альтэрнатыўная энергетыка — гэта... .
8. Транспартная сістэма свету — гэта... .
9. Якія прычыны і падзеі спрыялі фарміраванню сусветнай гаспадаркі?
10. Якія галіны ўваходзяць у першасны, другасны, трацічны сектары эканомікі?
11. Якімі найноўшымі зменамі характарызуецца міжнародны геаграфічны падзел працы?
12. Якія існуюць вядучыя эканамічныя інтэграцыйныя аб'яднанні свету?
13. Якую ролю ў сусветнай эканоміцы адыгрываюць ТНК?
14. Якія існуюць геаграфічныя тыпы сельскай гаспадаркі?
15. Які ўплыў аказала НТР на развіццё прамысловасці?
16. Якія адрозненні сектара паслуг развітых краін і краін, якія развіваюцца?
17. Чаму існуюць станоўчыя і адмоўныя бакі ТНК?
18. Чаму інтэграцыйныя працэсы ахопліваюць усе сферы дзейнасці чалавечага грамадства?
19. Чаму ў цяперашні час актыўна выкарыстоўваюцца найноўшыя спосабы вырошчвання раслін?
20. Чаму існуе прамая залежнасць паміж узроўнем развіцця краіны і колькасцю спажыванай энергіі?
21. Чаму ў хімічнай прамысловасці і машынабудаванні часцей за ўсё ўкараняюцца навукова-даследчыя і доследна-канструктарскія распрацоўкі?
22. Чаму новыя індустрыяльныя краіны ператварыліся ў асноўных вытворцаў хімічнай прадукцыі?
23. Чаму ў свеце хуткімі тэмпамі растуць аб'ёмы вытворчасці харчовай і лёгкай прамысловасці, а доля гэтых галін у структуры апрацоўчай прамысловасці свету скарачаецца?
24. Чаму маштабы развіцця турысцкай галіны пастаянна павялічваюцца?

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Папрацуем з атласам.

1. Пакажыце на карце тры вядучыя краіны: па аб'ёмах валавога збору пшаніцы, аб'ёмах валавога збору кукурузы, аб'ёмах валавога збору рысу.

2. Пакажыце на карце тры вядучыя краіны: па пагалоўі буйной рагатай жывёлы, пагалоўі свіней, пагалоўі авечак.

3. Пакажыце на карце тры вядучыя краіны: па аб'ёмах разведаных запасаў нафты, аб'ёмах разведаных запасаў прыроднага газу, аб'ёмах разведаных запасаў вугалю.

4. Пакажыце на карце тры вядучыя краіны па аб'ёмах разведаных запасаў жалезных руд.

5. Пакажыце на карце тры вядучыя нафтаздабыўныя краіны, тры вядучыя газаздабыўныя краіны, тры вядучыя вуглездабыўныя краіны.

6. Пакажыце на карце тры галоўныя краіны — вытворцы электраэнергіі.

7. Пакажыце на карце тры буйнейшыя: АЭС свету, ГЭС свету.

8. Пакажыце на карце тры галоўныя краіны-вытворцы: сонечнай энергіі, ветравой энергіі, геатэрмальнай энергіі.

9. Пакажыце на карце тры вядучыя вытворцы: чыгуну, сталі, першаснага алюмінію, рафінаванай медзі, рафінаванага цынку, рафінаванага свінцу.

10. Пакажыце на карце тры вядучыя краіны-вытворцы: марскіх суднаў, легкавых аўтамабіляў, станкоў.

11. Пакажыце на карце тры вядучыя краіны-вытворцы: калійных угнаенняў, азотных угнаенняў, фосфарных угнаенняў, хімічных валокнаў, швейнай прадукцыі.

12. Пакажыце на карце тры вядучыя краіны: па аб'ёме імпарту паслуг, аб'ёме экспарту паслуг.

13. Пакажыце на карце тры вядучыя марскія парты па грузаабароце.

14. Пакажыце на карце тры вядучыя аэрапорты свету па пасажыраабароце.

15. Пакажыце на карце тры вядучыя дзяржавы па колькасці турысцкіх прыбыццяў.

Прагназуем.

1. Якія змены адбудуцца ў структуры сусветнай гаспадаркі ў бліжэйшыя 100 гадоў?

2. Якія новыя галіны прамысловасці могуць з'явіцца ў бліжэйшыя дзесяцігоддзі?

3. Якія праблемы, на ваш погляд, могуць абвастрыцца ў сувязі з узмацненнем глабалізацыі?

4. Як зменіцца энергетычны баланс у бліжэйшыя 100 гадоў?

5. Як магчыма вырашыць харчовую праблему для насельніцтва Зямлі?

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

ЗАКЛЮЧЭННЕ

Мы завяршылі вывучэнне вучэбнай дысцыпліны па сацыяльна-эканамічнай геаграфіі свету. У кожнага з вас сфарміраваўся свой багаж уражанняў. Гэта звязана з тым, што для кагосьці пэўныя тэмы засталіся ў памяці як самыя цікавыя, а каму-небудзь з вас часам было складана. Але, напэўна ж, усе вы сталі ўладальнікамі сучасных, актуальных і нават унікальных ведаў па сацыяльна-эканамічнай геаграфіі свету, якімі не валодалі вашы папярэднікі, таму што пяць, а тым больш 10 гадоў таму свет развіваўся зусім па-іншаму.

У пачатку вывучэння вучэбнай дысцыпліны мы з вамі гаварылі аб хуткім і інтэнсіўным развіцці свету. Доказам гэтаму з'яўляюцца падзеі ў развіцці сусветнай гаспадаркі і насельніцтва, якія адбыліся за гэты навучальны год. Паспрабуйце ўспомніць і пералічыць некалькі найбольш важных з іх.

Вы выканалі шмат заданняў рознага ўзроўню. Аднак за значным аб'ёмам матэрыялу па сацыяльна-эканамічнай геаграфіі свету стаяць зараз не толькі шырокія веды. З'яўляючыся сучаснікамі інфармацыйнай эпохі і эпохі паслуг, вы сталі інфармацыйна пісьменнымі асобамі, таму што дзякуючы пастаянным падарожжам на ўроках па глабальнай павуціне вы асвоілі кампетэнцыі сацыяльна-эканамічнай і дэмаграфічнай Web-навігацыі, чым не валодалі вашы папярэднікі. Цяпер у вас за плячыма шырокі набор найбольш рэпрэзентатыўных сайтаў па кожнай вывучанай тэме.

Вы авалодалі навыкамі характарыстыкі геаграфіі сусветнай гаспадаркі і дэмаграфічных працэсаў, атрымалі тлумачэнне іх прычын і наступстваў. У выніку ў вас сфарміраваўся геаграфічны вобраз мыслення, а таксама вырас узровень геаграфічнай культуры.

З-за дынамізму сацыяльна-эканамічных працэсаў свету многія навукоўцы-географы сёння, нягледзячы на багатую гісторыю, называюць сацыяльна-эканамічную геаграфію маладой навукай. Тлумачаць яны гэта з'яўленнем у яе структуры вялікай колькасці новых напрамкаў (успомніце некаторыя з іх) і прыкладной значнасцю эканамічнай геаграфіі ў XXI ст., якая пастаянна расце.

Ад поспехаў развіцця сучаснай сацыяльна-эканамічнай геаграфіі напрамую залежыць жыццё чалавечага грамадства. Эканоміка-геаграфічныя даследаванні аказваюцца неабходнымі для вырашэння праблем і пошуку найбольш рацыянальных шляхоў арганізацыі грамадства: размяшчэння насельніцтва, эфектыўнага выкарыстання прыродных рэсурсаў, размяшчэння прадпрыемстваў, будаўніцтва дарог і іншых мерапрыемстваў, якія павінны ажыццяўляцца ў інтарэсах не толькі сённяшняга, але і будучых пакаленняў.

Менавіта таму адным з найбольш важных вынікаў вывучэння вамі сацыяльна-эканамічнай геаграфіі свету стаў атрыманы вопыт вызначэння сучасных праблем палітычнай геаграфіі і геаканфлікталогіі, насельніцтва, развіцця галін сусветнай

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

гаспадаркі і веданне вядучых міжнародных арганізацый, каардынуючых іх. Гэты вопыт спатрэбіцца вам, таму што глабальныя праблемы сацыяльна-эканамічнага развіцця свету стануць аднымі з асноўных аб'ектаў вывучэння геаграфіі ў наступным навучальным годзе.

Вы даведаецеся аб асноўных дэмаграфічных праблемах (дэпапуляцыі, дэмаграфічным старэнні, міжнароднай міграцыі), іх наступствах і шляхах вырашэння. Адной з важных глабальных праблем чалавецтва з'яўляецца харчовая. Якая яе сутнасць, геаграфічныя праявы і галоўныя наступствы, вам яшчэ трэба будзе вывучыць. Вы таксама даведаецеся аб праблеме вычарпальнасці рэсурсаў, энергетычнай і шэрага іншых. Асноўнымі прынцыпамі іх вырашэння стануць распрацаваныя ААН Мэты ў галіне ўстойлівага развіцця (ГУР) да 2030 г., якія з'яўляюцца своеасаблівым заклікам да дзеяння, якое зыходзіць ад усіх краін — бедных, багатых і сярэднеразвітых, і нацэлены на паляпшэнне дабрабыту і абарону нашай планеты.

Насустрач новым ведам аб глабальных праблемах чалавецтва!

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

КАРОТКІ СЛОЎНІК ТЭРМІНАЎ І ПАНЯЦЦЯЎ

Агламерацыя — кампактная форма прасторавага размяшчэння гарадскіх паселішчаў, аб'яднаная разнастайнымі інтэнсіўнымі сувязямі ў складаную сістэму.

Альтэрнатыўная электраэнергетыка — галіна электраэнергетыкі, якая ўключае спосабы вытворчасці энергіі з аднаўляльных рэсурсаў і прыродных з'яў (вецер, сонечныя прамяні, патокі вады, якія рухаюцца, геатэрмальныя воды і інш.).

Аўтсорсінг — перадача прадпрыемствам/арганізацыяй пэўных відаў або функцый вытворчай прадпрымальніцкай дзейнасці іншай кампаніі, што дзейнічае ў патрэбнай вобласці.

Галіновая структура сусветнай гаспадаркі — сукупнасць яе частак (галін, падгалін, відаў эканамічнай дзейнасці), якія гістарычна склаліся ў выніку грамадскага падзелу працы.

Геаграфічны тып сельскай гаспадаркі — устойлівае спалучэнне прыродна-абумоўленых і вытворчых прыкмет сельскай гаспадаркі, якія гістарычна склаліся на канкрэтнай тэрыторыі, што ўключаюць: 1) аграрныя адносіны, 2) спецыялізацыю, 3) інтэнсіўнасць вытворчасці, 4) узровень матэрыяльна-тэхнічнай аснашчанасці, 5) сістэмы земляробства і жывёлагадоўлі.

Геаканфлікталогія — навука, якая вывучае ў адзінстве геаграфічныя, палітычныя і іншыя фактары, што аказваюць уплыў на ўзнікненне, развіццё і выхад палітычных, у тым ліку ўзброеных канфліктаў.

Геапалітыка — раздзел палітычнай геаграфіі, які вывучае геаграфічныя адносіны паміж цэнтрамі палітычнай сілы ў свеце і залежнасць знешняй і ўнутранай палітыкі дзяржаў і міжнародных адносін ад сістэмы палітычных, ваенна-стратэгічных, эканамічных, экалагічных фактараў і палітыка-геаграфічнага становішча краіны.

Геапалітычнае поле — прастора, якая кантралюецца дзяржавай або аб'яднаннем.

Глабалізацыя сусветнай гаспадаркі — працэс фарміравання і наступнага развіцця агульнасусветнай фінансава-эканамічнай, палітычнай, сацыяльна-культурнай, інфармацыйна-камунікацыйнай прасторы.

Глабальны горад — гэта постындустрыяльны цэнтр, інтэграваны ў сусветную гаспадарку і які з'яўляецца важным элементам сусветнай эканамічнай сістэмы.

Дэмаграфічная сітуацыя — стан дэмаграфічных працэсаў і полаўзроставай структуры насельніцтва ў дынаміцы, якія праходзяць на канкрэтнай тэрыторыі (краіна, рэгіён, паселішча) у пэўны час.

Дэмаграфічны пераход — карэнныя дэмаграфічныя перамены ў гісторыі чалавецтва, якія характарызуюцца пераходам ад высокай нараджальнасці і смяротнасці насельніцтва да нізкай і прыводзяць да змены тыпаў узнаўлення насельніцтва.

Дэмаграфічнае старэнне — павелічэнне колькасці і долі асоб пажылога і старога ўзросту (60/65+) у структуры насельніцтва, якое з'яўляецца следствам росту ўзроўню сацыяльна-эканамічнага развіцця грамадства.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Квазідзяржава — палітыка-тэрытарыяльнае ўтварэнне, якое, валодаючы асноўнымі прыкметамі дзяржавы, пазбаўлена міжнароднага прызнання, з прычыны чаго не валодае суверэнітэтам.

Крыптавалюта — разнавіднасць лічбавай валюты (электронныя або віртуальныя грошы, створаныя па тэхналогіі крыптаграфіі), якая не мае фізічнага выражэння і служыць для правядзення ананімных фінансавых аперацый і плацяжоў з высокім узроўнем абароненасці.

Лічбавая эканоміка — сістэма эканамічных, сацыяльных і культурных адносін, заснаваных на выкарыстанні лічбавых інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій.

Мегалаполіс — найбольш буйная форма гарадскога рассялення, урбанізаваная зона, якая ўтвараецца пры зрастанні вялікай колькасці суседніх гарадскіх агламерацый.

Мегасіці — звышбуйныя гарады з колькасцю насельніцтва больш за 10 млн чалавек.

Міграцыйны пераход — эвалюцыя міграцыі насельніцтва, якая адлюстроўвае заканамерны пераход ад нізкай міграцыйнай рухомасці на аграрнай стадыі да яе росту ў перыяд індустрыяльнага і постындустрыяльнага грамадства ў выніку сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў.

Міграцыйная палітыка — сістэма прынцыпаў, мэт і дзеянняў, з дапамогай якіх дзяржава рэгулюе патокі міграцыі.

Міжнародная эканамічная інтэграцыя — найвышэйшая ступень інтэрнацыяналізацыі, пры якой адбываецца зрошчванне нацыянальных гаспадарак на аснове глыбокіх устойлівых узаемасувязей і падзелу працы і фарміруецца агульная прастора з адзінай валютна-фінансавай, прававой сістэмай і каардынацыяй эканамічнай палітыкі дзяржаў.

Міжнародны геаграфічны падзел працы — прасторавая форма грамадскага падзелу працы, якая выяўляецца ў спецыялізацыі асобных цэнтраў, раёнаў і краін на вытворчасці пэўных відаў прадукцыі і паслуг, прызначаных для рэалізацыі за іх межамі.

Міжнародны фінансавы цэнтр — цэнтр засяроджвання буйных міжнародных капіталаў і маштабнага правядзення разнастайных міжнародных фінансавых аперацый.

Навукова-тэхнічная рэвалюцыя — карэнныя пераўтварэнні ў сістэме навуковых ведаў і ў тэхніцы, якія адбываюцца ў непарыўнай сувязі з гістарычным працэсам развіцця чалавечага грамадства.

Натуральны рух насельніцтва — сукупнасць нараджэння і смярцей, якія змяняюць колькасць насельніцтва натуральным шляхам.

Палітыка-геаграфічнае становішча — становішча аб'екта (краіны, яе часткі, групы краін) у адносінах да іншых дзяржаў і іх групах як палітычных аб'ектаў.

Палітычная геаграфія — асобая геаграфічная навука, якая вывучае прасторавую арганізацыю палітычнага жыцця грамадства і тэрытарыяльныя спалучэнні палітычных сіл.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Парытэт пакупной здольнасці — адносіны паміж дзвюма валютамі розных краін, якія былі разлічаны на аснове іх пакупной здольнасці адносна пэўнага набору тавараў і паслуг.

Полаўзроставая структура насельніцтва — гэта размеркаванне насельніцтва канкрэтнай тэрыторыі па ўзроставых групах і паводле полу ў адпаведнасці са значэннямі гэтых дэмаграфічных прыкмет.

Размяшчэнне насельніцтва — працэс асваення і засялення насельніцтвам тэрыторыі айкумены і фарміравання сеткі паселішчаў на пэўны момант часу.

Рассяленне — працэс размеркавання і пераразмеркавання насельніцтва з наступным фарміраваннем сеткі паселішчаў.

Сепаратызм — рух за аддзяленне часткі дзяржавы і стварэнне новага дзяржаўнага ўтварэння або за прадастаўленне частцы краіны аўтаноміі па нацыянальным, моўным або рэлігійным прынцыпе.

Транснацыяналізацыя — працэс перанясення часткі вытворчасцей з адной краіны ў іншую з дапамогай укладу капіталу больш развітых краін з мэтай арганізацыі філіялаў і ўстанаўлення кантролю над замежнымі кампаніямі, якія становяцца залежнымі.

Транснацыянальная кампанія/карпарацыя (ТНК) — прадпрыемства, якому належаць або якое кантралюе вытворчасці, што знаходзяцца па-за межамі краіны базавання, маюць шырокую сетку філіялаў і займаюць вядучыя месцы ў свеце па вытворчасці таго ці іншага тавару або паслугі.

Транспартная сістэма свету — сукупнасць усіх відаў транспарту, звязаных эканамічнымі, тэхналагічнымі, тэхнічнымі і нарматыўна-прававымі адносінамі.

Турысцка-рэкрэацыйныя рэсурсы — прыродна-кліматычныя, гісторыка-культурныя і сацыяльна-эканамічныя аб'екты і з'явы, якія з'яўляюцца перадумовамі для развіцця розных відаў турызму і адпачынку і здольныя задавальняць патрэбы, якія ўзнікаюць пры гэтым.

Узнаўленне насельніцтва — бесперапыннае аднаўленне і змена людскіх пакаленняў, якія забяспечваюцца працэсамі нараджальнасці, смяротнасці і натуральнага прыросту.

Электаральная геаграфія — напрамак палітычнай геаграфіі, які вывучае тэрытарыяльныя адрозненні ў палітычных перавагах выбаршчыкаў, выніках выбараў і ўплыў грамадскіх, эканамічных, рэлігійных, этнічных фактараў на іх вынікі.

П$_1$

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

ДАДАТАК 1

Складанне дэмаграфічнага профілю краіны

Тыпавы план.

1. Выберыце са статыстычных даных асноўныя паказчыкі для складання дэмаграфічнага профілю краіны (на выбар) і сярэднесусветныя значэнні:

– колькасць насельніцтва, млн;
– агульны каэфіцыент нараджальнасці, ‰;
– агульны каэфіцыент смяротнасці, ‰;
– агульны каэфіцыент натуральнага прыросту/змяншэння, ‰;
– доля насельніцтва ва ўзросце да 15 гадоў, %;
– доля насельніцтва ва ўзросце старэй за 65 гадоў, %;
– каэфіцыент сальда міграцыі, ‰.

Крыніца даных: www.prb.org — Афіцыйны сайт Даведачнага бюро па пытаннях народанасельніцтва.

Даныя запішыце ў табліцу ў сшытку.

Асноўныя паказчыкі для складання дэмаграфічнага профілю краіны

Краіна	Асноўныя дэмаграфічныя паказчыкі, _____ г.						
	Колькасць насельніцтва, млн чал.	Агульны каэфіцыент нараджальнасці, ‰	Агульны каэфіцыент смяротнасці, ‰	Агульны каэфіцыент натуральнага прыросту, ‰	Доля насельніцтва ва ўзросце да 15 гадоў, %	Доля насельніцтва ва ўзросце старэй за 65 гадоў, %	Каэфіцыент сальда міграцыі, ‰
…..							
Свет							

2. Пабудуйце ў сшытку для практычных і індывідуальных работ макет дэмаграфічнага профілю — справа і злева начарціце восі *Y* і злучыце іх воссю *X*. Для кожнага дэмаграфічнага паказчыка пабудуйце асобную вось *Y*. Усяго павінна быць сем восей *Y*.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Злева адлюструйце восі *Y* для паказчыкаў колькасці насельніцтва і натуральнага руху, справа — для ўзроставай структуры і міграцыі. Вертыкальныя маштабы для кожнага паказчыка выберыце адвольна.

3. Падпішыце адзінкі вымярэння на восях *Y*.

4. Пабудуйце на атрыманым макеце слупковыя дыяграмы для кожнага паказчыка і падпішыце назву малюнка.

Дэмаграфічны профіль _____
назва краіны



5. На гэтай жа дыяграме пабудуйце графік сярэднесусветных дэмаграфічных паказчыкаў.

6. Параўнайце асноўныя дэмаграфічныя паказчыкі абранай краіны з сярэднесусветнымі значэннямі і запішыце ў табліцу ў сшытку.

Краіна _____	Параўнанне з сярэднесусветным паказчыкам (вышэй/ніжэй за сярэдні)
Нараджальнасць	
Смяротнасць	
Доля насельніцтва ва ўзросце да 15 гадоў	
Доля насельніцтва старэй за 65 гадоў	

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

ДАДАТАК 2

Два партрэты ўрбанізацыі: падабенства і адрозненні паміж развітымі краінамі і краінамі, якія развіваюцца

Тыпавы план.

1. Выберыце са статыстычных даных асноўныя паказчыкі для параўнання ўрбанізацыі ў развітых краінах і краінах, якія развіваюцца, (на выбар) і сярэднесусветныя значэнні:

– доля гарадскога насельніцтва, %;

– тэмп штогадовага росту гарадскога насельніцтва, %.

Крыніца даных: https://population.un.org/wup/ — афіцыйны сайт Аддзела народа-насельніцтва ААН, Перспектывы сусветнай урбанізацыі.


Даныя запішыце ў табліцу ў сшытку.

Асноўныя паказчыкі для параўнання ўрбанізацыі развітых краін і краін, якія развіваюцца

Краіна	Асноўныя паказчыкі ўрбанізацыі, _____ г.	
	Доля гарадскога насельніцтва, %	Тэмп штогадовага росту гарадскога насельніцтва, %
…		
…		
Свет		

2. Пабудуйце ў сшытку для практычных і індывідуальных работ макет дыяграмы ўрбанізацыі — справа і злева начарціце восі *Y* і злучыце іх воссю *X*. Для кожнага паказчыка пабудуйце асобную вось *Y*.

Злева начарціце вось *Y* для паказчыка долі гарадскога насельніцтва, справа — для тэмпаў штогадовага росту гарадскога насельніцтва. Вертыкальныя маштабы для кожнага паказчыка выберыце адвольна. Падпішыце адзінкі вымярэння на восях *Y*.



3. Пабудуйце на атрыманым макеце слупковыя дыяграмы для кожнага паказчыка і для дзвюх выбраных краін, падпішыце назву малюнка.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

4. На гэтай жа дыяграме адзначце лініяй паказчыкі ўрбанізацыі свету.

5. Параўнайце асноўныя паказчыкі ўрбанізацыі развітой краіны і краіны, якая развіваецца, з сярэднесусветнымі значэннямі і запішыце ў табліцу ў сшытку.

Развітая краіна _____	Параўнанне з сярэднесусветным паказчыкам (вышэй/ніжэй за сярэдні)	Краіна, якая развіваецца _____	Параўнанне з сярэднесусветным паказчыкам (вышэй/ніжэй за сярэдні)
Доля гарадскога насельніцтва			
Тэмп штогадовага росту гарадскога насельніцтва			

6. Выкарыстоўваючы матэрыялы вучэбнага дапаможніка, успомніце стадыі ўрбанізацыі і вызначыце стадыі ў выбраных вамі краінах:

Стадыя ўрбанізацыі развітой краіны _____

Стадыя ўрбанізацыі краіны, якая развіваецца, _____

7. Выкарыстоўваючы рэсурсы інтэрнэту і дадатковую літаратуру, напішыце прыклады найбуйнейшых гарадоў, агламерацый (калі ёсць) і мегалаполісаў (калі ёсць) у выбраных краінах:

Найбуйнейшыя гарады, агламерацыі і мегалаполісы _____

назва краін

Назва развітой краіны _____			Назва краіны, якая развіваецца _____		
Горад	Агламерацыя	Мегалаполіс	Горад	Агламерацыя	Мегалаполіс
…	…	…	…	…	…
…	…	…	…	…	…
…	…	…	…	…	…

8. Зрабіце вывад пра падабенствы і адрозненні ўрбанізацыі развітой краіны і краіны, якая развіваецца, па асноўных паказчыках.

Падабенства: _____

_____

Адрозненні: _____

_____

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

ДАДАТАК 3

Геаграфічныя тыпы сельскай гаспадаркі свету

Катэгорыя сельскай гаспадаркі		Геаграфічны тып	
1	Нетаварная (спажывецкая) традыцыйная сельская гаспадарка	1	Земляробства ў спалучэнні са збіральніцтвам (клубняплоды, збожжавыя, бабовыя, алейныя), паляваннем і рыбалоўствам
			Геаграфія: *зона трапічных лясоў Афрыкі, Паўднёвай Амерыкі і Азіі*
		2	Качавая пашава-жывёлагадоўчая гаспадарка з рознымі відамі жывёлы (вярблюды, авечкі, коні, алені)
			Геаграфія: *засушлівыя вобласці трапічнай і ўмеранай зоны Афрыкі і Азіі. Зона тундры Азіі і Паўночнай Еўропы*
2	Таварная і паўтаварная традыцыйная сялянская і памешчыцка-латыфундыцкая гаспадарка	3	Земляробчая гаспадарка — працаінтэнсіўнае рысаводства
			Геаграфія: *Азія*
		4	Земляробчая і земляробча-жывёлагадоўчая гаспадарка. Асноўныя культуры — харчовыя збожжавыя (рыс, кукуруза, прасяныя). Галоўныя таварныя культуры — бананы, кава, гарбата, какава-бабы, сізаль, каўчуканосы. Экстэнсіўная жывёлагадоўля (прадукцыйная і цяглавая жывёла) не звязана з раслінаводствам
			Геаграфія: *Афрыка, Азія і Лацінская Амерыка*
		5	Шматгаліновая земляробча-жывёлагадоўчая гаспадарка. Разнастайнасць вырошчваемых таварных і спажывецкіх культур, а таксама відаў жывёлы. Жывёлагадоўля цесна звязана з земляробствам. Кукуруза, рыс, прасяныя, пладовыя, стымулюючыя і тэхнічныя культуры (бананы, кава, какава-бабы, гарбата, каўчуканосы, валакністыя расліны)
			Геаграфія: *Азія і Лацінская Амерыка, часткова Паўднёвая і Заходняя Еўропа*

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Заканчэнне табліцы

Катэгорыя сельскай гаспадаркі		Геаграфічны тып	
3	Таварная спецыялізаваная сельская гаспадарка (фермерская, дзяржаўна-кааператыўная, сялянская, карпаратыўная)	6	Экстэнсіўная збожжавая гаспадарка (пшаніца, кукуруза)
			Геаграфія: *Паўночная Амерыка, Аўстралія, Расія*
		7	Экстэнсіўная пашавая жывёлагадоўля
			Геаграфія: *Паўночная Амерыка, Аўстралія, ПАР, Аргенціна, Уругвай, Расія, Казахстан*
		8	Інтэнсіўнае земляробства (збожжавыя, тэхнічныя, пладовыя, агародніннyя культуры)
			Геаграфія: *Заходняя Еўропа, Паўночная Амерыка, Японія, Кітай*
		9	Інтэнсіўная жывёлагадоўля (малочная і малочна-мясная жывёлагадоўля, свінагадоўля, птушкагадоўля)
			Геаграфія: *Заходняя Еўропа (Вялікабрытанія, Германія), ЗША, Новая Зеландыя, Украіна, Расія*
		10	Інтэнсіўная земляробча-жывёлагадоўчая гаспадарка (агародніцтва, пладаводства, малочна-мясная жывёлагадоўля, свінагадоўля, птушкагадоўля), часта прыгараднага тыпу
			Геаграфія: *Паўночная Амерыка, Заходняя Еўропа*
		11	Плантацыйная раслінаводчая гаспадарка (пладовыя, стымулюючыя, тэхнічныя культуры) у трапічных і субтрапічных абласцях
			Геаграфія: *Азія, Афрыка, Лацінская Амерыка*

Спіс выкарыстаных крыніц

1. *Липец, Ю. Г.* География мирового хозяйства / Ю. Г. Липец, В. А. Пуляркин, С. Б. Шлихтер. — М. : Гуманит. изд. центр ВЛАДОС, 1999. — 400 с.

2. Социально-экономическая география : словарь-справочник / отв. ред. А. П. Горкин. — Смоленск : Ойкумена, 2013. — 328 с.

3. *Максаковский, В. П.* Общая экономическая и социальная география : в 2 ч. / В. П. Максаковский. — М. : Гуманит. изд. центр ВЛАДОС, 2009. — Ч. 2. — 525 с.

4. *Родионова, И. А.* Мировая экономика: индустриальный сектор : учеб. пособие / И. А. Родионова. — М. : РУДН, 2010. — 606 с.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

ЗМЕСТ

АД АЎТАРАЎ 3

УВОДЗІНЫ 6

§ 1. Сацыяльна-эканамічная геаграфія свету, прадмет і задачы ў забеспячэнні ўстойлівага развіцця 6

РАЗДЗЕЛ I. СУЧАСНАЯ ПАЛІТЫЧНАЯ КАРТА СВЕТУ І ПАЛІТЫЧНАЯ ГЕАГРАФІЯ 13

ТЭМА 1. ДЫНАМІКА ПАЛІТЫЧНАЙ КАРТЫ СВЕТУ 14

§ 2. Аб'екты палітычнай карты свету 14
§ 3. Рэгіянальныя і лакальныя канфлікты ў свеце 20

ТЭМА 2. ПАЛІТЫЧНАЯ ГЕАГРАФІЯ І ГЕАПАЛІТЫКА 27

§ 4. Палітычная геаграфія 27
§ 5. Геапалітыка, месца ў сістэме геаграфічных навук 33

РАЗДЗЕЛ II. ГЕАГРАФІЯ НАСЕЛЬНІЦТВА СВЕТУ 39

ТЭМА 3. ГЕАГРАФІЯ ДЭМАГРАФІЧНЫХ ПРАЦЭСАЎ 40

§ 6. Дэмаграфічныя працэсы і іх геаграфія 40
§ 7. Полаўзроставая структура насельніцтва свету 47
§ 8. Тэорыя дэмаграфічнага пераходу 53

ТЭМА 4. ГЕАГРАФІЯ МІЖНАРОДНАЙ МІГРАЦЫІ 60

§ 9. Фактары і віды міграцыі насельніцтва 60
§ 10. Міжнародная міграцыя ў сучасным свеце 66
§ 11. Бежанства ў сучасным свеце 72

ТЭМА 5. ГЕАГРАФІЯ РАССЯЛЕННЯ СВЕТУ 78

§ 12. Размяшчэнне насельніцтва свету 78
§ 13. Геаграфія рассялення свету 84

АБАГУЛЬНЯЛЬНАЕ ПАЎТАРЭННЕ ПА РАЗДЗЕЛАХ I, II 91

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

РАЗДЗЕЛ III. ГЕАГРАФІЯ СУСВЕТНАЙ ГАСПАДАРКІ 93

ТЭМА 6. СТРУКТУРА І ФАКТАРЫ РАЗВІЦЦЯ СУСВЕТНАЙ ГАСПАДАРКІ 94

§ 14. Сусветная гаспадарка, фарміраванне і развіццё 94
§ 15. Міжнародны геаграфічны падзел працы 101
§ 16. Транснацыяналізацыя сусветнай гаспадаркі 107
§ 17. Міжнародная эканамічная інтэграцыя 113

ТЭМА 7. ГЕАГРАФІЯ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ СВЕТУ 120

§ 18. Структура і геаграфічныя тыпы сельскай гаспадаркі свету. Геаграфія раслінаводства свету 120
§ 19. Геаграфія жывёлагадоўлі 127

ТЭМА 8. ГЕАГРАФІЯ ПРАМЫСЛОВАСЦІ СВЕТУ 133

§ 20. Прамысловасць свету, агульная характарыстыка 133
§ 21. Геаграфія энергетыкі свету 138
§ 22. Геаграфія металургіі свету 144
§ 23. Геаграфія машынабудавання свету 151
§ 24. Геаграфія хімічнай прамысловасці свету 158
§ 25. Геаграфія лёгкай і харчовай прамысловасці свету 163

ТЭМА 9. ГЕАГРАФІЯ СЕКТАРА ПАСЛУГ СВЕТУ 171

§ 26. Сектар паслуг у сусветнай гаспадарцы 171
§ 27. Геаграфія транспарту свету 176
§ 28. Геаграфія міжнароднага турызму 181
§ 29. Геаграфія фінансавых паслуг у свеце 187
§ 30. Геаграфія сектара інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій свету 193

АБАГУЛЬНЯЛЬНАЕ ПАЎТАРЭННЕ ПА РАЗДЗЕЛЕ III **201**

ЗАКЛЮЧЭННЕ **203**

КАРОТКІ СЛОЎНІК ТЭРМІНАЎ І ПАНЯЦЦЯЎ **205**

ДАДАТАКІ **208**

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

(Назва ўстановы адукацыі)

Навучальны год	Імя і прозвішча вучня	Клас	Стан вучэбнага дапаможніка пры атрыманні	Адзнака вучню за карыстанне вучэбным дапаможнікам
20 /				
20 /				
20 /				
20 /				
20 /				
20 /				

Вучэбнае выданне

Анціпава Кацярына Анатольеўна
Гузава Вольга Мікалаеўна

ГЕАГРАФІЯ. САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАЯ ГЕАГРАФІЯ СВЕТУ

Вучэбны дапаможнік для 10 класа
ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай мовай навучання
(з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню)

Рэдактар *Т. К. Слаута*
Мастакі *В. Ю. Лагун, К. К. Шастоўскі, К. У. Максімава*
Мастацкі рэдактар *К. К. Шастоўскі*
Тэхнічны рэдактар *В. Ю. Лагун*
Мастак вокладкі *К. У. Максімава*
Камп'ютарны набор *В. Ю. Лагун*
Камп'ютарная вёрстка *В. Ю. Лагун*
Карэктар *Г. Н. Казловіч*

Падпісана да друку 10.01.2020. Фармат 70 × 90 $^{1}/_{16}$. Папера афсетная. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 15,79. Ул.-выд. арк. 15,0. Тыраж 11 210 экз. Заказ

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецтва "Адукацыя і выхаванне"».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/19 ад 02.08.2013.
Вул. Будзённага, 21, 220070, г. Мінск.

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецтва "Беларускі Дом друку"».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/102 ад 01.04.2014.
Пр-т Незалежнасці, 79, 220013, г. Мінск.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Дэмаграфічнае старэнне свету, 2019 год



Доля асоб, старэйшых за 65 гадоў, у структуры насельніцтва, %:

менш за 4 % | 4–7 % | 7–14 % | 14 % і больш